**ЛЕАНІД МАРАКОЎ**

# РЭПРЭСАВАНЫЯ ПРАВАСЛАЎНЫЯ СВЯШЧЭННА І ЦАРКОЎНАСЛУЖЫЦЕЛІ БЕЛАРУСІ 1917 – 1967

**ЧАСТКА 2**

*© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2018*
*© PDF: Камунікат.org, 2018*

Kamunikat.org

***ДАДАТАК*** ___
***УДАКЛАДНЕННІ да біяграфій, змешчаных у І—ІІ тамах*** ___
***ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК*** ___
***ДАДАТАК ІІ*** ___

Kamunikat.org

**ЛАБЯК (ЛОБЯК) Емяльян Іванавіч** [1877, Магілёў — 2.4.1938, Магілёў, НКВД]. Беларус. Да арышту стараста адной з цэркваў Магілёва. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 17.2.1938. Асуджаны з шэрагам свяшчэннаслужыцелей 9.3.1938 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю супраць мерапрыемстваў савецкай улады» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1960 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Л. і інш. № 9105 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

11.11.1936 органамі НКВД арыштаваны кладаўшчык Магілёўскай шаўковай фабрыкі Лабяк Сцяпан Іванавіч (н. 2.8.1880 у Магілёве), верагодна, брат Емяльяна *Лабяка.* Абвінавачваўся ў правядзенні «антысавецкай дзейнасці». У перыяд з 7.12.1936 да 11.1.1937 пастановай пракурора Магілёва справа Л. (№ 3413; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) спынена, а ён вызвалены. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛАГАЦКІ (ЛОГАЦКИЙ) Якаў Міхайлавіч** [1896, в. Астравы Мінскай губ. — ?], актыўны прыхаджанін падвор'я КіеваПячэрскай Лаўры. Арыштаваны 22.12.1933 у Ленінградзе па справе «еўлогіеўцаў». Асуджаны 25.2.1934 да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Л. № п66773 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

**ЛАДЫШЭЎСКІ (ЛАДЫШЕВСКИЙ) Андрэй Вавілавіч** [1880 ці 1882 — ?]. Беларус. З сям'і царкоўнаслужыцеля (?). Скончыў курсы настаўнікаў пачатковых вучылішч. Рукапаложаны ў іерэя (1909). З 1910 настаяцель Свята-Георгіеўскай царквы ў в. Загалле (тагачасны паштовы адрас: ст. Забалацце) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкага храма в. Рудабелка (тагачасны паштовы адрас: ст. Забалоцце) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл.,

РаствaБагародзіцкай царквы в. Парэчча Бабруйскага пав., цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл., узнагароджаны скуф'ёй (1922). Быў жанаты, меў дачку. Арыштаваны ў 1933 (?). Асуджаны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губернш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67.

**ЛАЗАРАЎ (ЛАЗАРЕВ) Антоній Паўлавіч** [1887, в. Большы Рай Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ. — 1.10.1938, Магілёў, НКВД]. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1930я г. настаяцель аднаго з храмаў Магілёва. Арыштаваны 1.3.1938. Асуджаны 21.9.1938 тройкай НКВД як «удзельнік шпіёнскапаўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Л. і інш. № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛАЗАРАЎ (ЛАЗАРЕВ) Іван Іванавіч. Гл.: ІОНА (ЛАЗАРАЎ).**

**ЛАЗУРКЕВІЧ (ЛАЗУРЬКЕВИЧ) Сергій Мікалаевіч** [1869, в. СтараКозлава (?) Цвярскай губ., Расія — 7.10.1937 (?), Віцебск, турма НКВД], свяшчэннаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны ў 1937 у в. Зарэчча, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Асуджаны 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Л. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЛАМАКА (ЛОМАКО) Яўфімій Ігнатавіч** [1899, в. Дрычын Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 9.8.1938, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. дыякан Беларускай аўтаномнай

Kamunikat.org

праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Паводле некаторых звестак, служыў у царкве в. Траскоўшчына Ракаўскага прыхода Мінскага пав., цяпер тэрыторыя Мінскага р-на (вёска не існуе). Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 12.4.1933 у в. Варонка тагачаснага Заслаўскага, цяпер Мінскага рна. Асуджаны калегіяй АДПУ 8.5.1933 «як член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. 25.5.1938 тройкай НКВД БССР прыгавораны за «шпіянаж на карысць Полыпчы» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.7.1958 трыбуналам БВА. Асабовая справа Л. № 11070с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мпнской епархіш; БНДЦЭД.*

**ЛАНКОЎСКАЯ (ЛАНКОВСКАЯ) Меланія Андрэеўна** (Ануфрыеўна) [1893, в. Водва Віцебскай губ. — ?], манахіня. З сялянскай сям'і. У 1915—18 знаходзілася ў МалаКірылавым манастыры на Волхаве Ноўгарадскага пав. Потым да сак. 1931 служыла пры Мікалаеўскай царкве ў с. Пушкіна Маскоўскай вобл. Арыштавана 9.3.1931. На допытах трымалася мужна, вінаватай сябе не прызнала. Асуджана 25.3.1931 калегіяй АДПУ Маскоўскай вобл. за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 16.3.1990.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархн.*

**ЛАПАВУХАЎ (ЛОПОУХОВ) Парфён Ануфрыевіч** [1867, в. Латкова Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — 1930 (?), Віцебск, АДПУ], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 29.1.1930 у роднай вёсцы. Асуджаны 12.4.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.6.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Л. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛАПАЕЎ (ЛАПАЕВ, ЛОПАЕВ) Сімяон Фёдаравіч** [1884, в. Каверзіна Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны 23.11.1937 у с. Ветажэтка Калінінскай (Цвярской) вобл. Асуджаны 26.11.1937 да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны прэзідыумам Вярхоўнага суда СССР 16.1.1989. Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархп.*

**ЛАПАЦІН (ЛОПАТИН) Марк Якаўлевіч** [1878, Мінская губ. — ?], актыўны прыхаджанін храма пры Іаанаўскім манастыры. Арыштаваны 19.4.1922 у Петраградзе. Праходзіў па справе «аб супраціве канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей». 23.5.1922 вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. Далейшы лёс невядомы. Групавая справа Л. і інш. № п36314 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *Санкт Петербургской епархіш Снноднк.*

**ЛАПІЦКАЯ (ЛАПИЦКАЯ) Марыя Трафімаўна** [1888, в. Пузавічы Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — ?], актыўная прыхаджанка Богаяўленскага сабора. Арыштавана 25.11.1932 у Ленінградзе па «царкоўнай справе». Асуджана 8.12.1932 да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Л. № ып80743 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.*

**ЛАТОЦКІ (ЛАТОЦКИЙ) Яўстафій** [1872, в. Дубянцы Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — ?], протаіерэй, сын Міхаіла Латоцкага. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894). Рукапаложаны ў іерэя (1897). З 1901 павятовы назіральнік царкоўнапрыходскіх школ пры Успенскім саборы ў Рэчыцы Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. З 1902 другі Свята-р, у 1920я г. настаяцель Рэчыцкага Успенскага сабора. З 23.12.1913 духоўны следчы храмаў Рэчыцкага пав. 25.7.1914 духавенствам цэркваў 1й акругі Рэчыцкага пав. выбраны памочнікам благачыннага.

Арыштаваны 26.8.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ 27.9.1930 да высылкі ў Сібір з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.11.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Мынской губерніш; Памятная КИНжка Мннской епархнн; Лачный состав епархнального управленыя; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**ЛАЎРОЎ (ЛАВРОВ) Міхаіл**. Свята-р. Першы раз арыштаваны, хутчэй за ўсё, у студз. 1919 у Віцебскай губ. Зняволены ў Віцебскай турме. Верагодна, у 1930я г. асуджаны да ВМП.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ЛАЎРОЎСКІ (ЛАВРОВСКШЙ) Яўгеній Мікалаевіч** [1896, Віцебск — ?], свяшчэннаслужыцель. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. Служыў у адным з храмаў ПолацкаВіцебскай епархіі. Быў жанаты, гадаваў трое дзяцей. Арыштаваны 8.8.1937 у Дуброўне Віцебскай вобл. Асуджаны 15.9.1937 з шэрагам Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі тройкай НКВД як «член антысавецкай царкоўнай групоўкі» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Л. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**ЛАЎРЫНОВІЧ (ЛАВРННОВИЧ) Міхаіл Міхайлавіч** [1872, Дзісенскі пав. Віленскай губ. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў у адным з храмаў ПолацкаВіцебскай епархіі. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 31.1.1930 на хут. Раўнаванкі, цяпер тэрыторыя (хутар не існуе) Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 24.2.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Мікалаем *Любарскім,* Грыгорыем *Сінкевічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да

ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.6.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Л. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР.*

**ЛЕАНІД БІРУКОВІЧ** [1866 (?), хут. Ухвала Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Ухвала Крупскага р-на Мінскай вобл. — 25.8.1937, Мінск, турма НКВД], свяшчэннамучанік. Сын Платона *Біруковіча,* брат Паўла *Біруковіча.* Пасля сканчэння Мінскай духоўнай семінарыі служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскім храме мяст. Смалявічы Барысаўскага пав., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. 7.10.1894 (паводле інш. звестак 8.11.1894) рукапалажаны ў іерэя да Успенскай царквы в. Сморкі Барысаўскага пав. (з 1978 в. Зорычы Барысаўскага рна). З 1900 ва Успенскім храме в. Брадзец, дзе да гэтага настаяцелем быў яго бацька. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй (1914). Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны ў 1934. Абвінавачваўся ў «захоўванні ў сваёй хаце залатых манет царскай чаканкі». Праз шэсць тыдняў вызвалены. Зноў арыштаваны ў крас. 1935 за арганізацыю прыхаджан на абарону храма ад закрыцця. Асуджаны 21.10.1935 з Ганнай *Собаль* паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 6 гадоў ППК. Еызвалены датэрмінова зза рэзкага пагаршэння стану здароўя. Зноў арыштаваны 17.7.1937 у в. Брадзец Бярэзінскім раённым аддзелам НКВД. Адмовіўся даваць паказанні, але пасля катаванняў паставіў подпісы пад пратаколамі допытаў. 22.8.1937 прыгавораны тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 26.3.1989, пленумам Вярхоўнага суда БССР 22.12.1989. Справы Б. № 29321с і № 21659с (з фотаздымкам) захоўваюцца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку новапакутнікаў.

Паводле некаторых звестак сын Свята-ра Аляксандр расстраляны бальнавікамі ў падлеткавым узросце.

**ЛЕБЕДЗЬ** (ЛЕБЕДЬ) **Пімен Якімавіч** [1881, мяст.

Высабохаўка Палтаўскага пав., цяпер Украіна — ?], іераманах. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 28.4.1932 у в. Зімніца Быхаўскага р-на Магілеўскай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 3.9.1932 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 16.1.1989. Групавая справа Л. і інш. № 10669 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

*Кр.:НАРБ,ІКБР.*

**ЛЕВАШОЎ** (ЛЕВАШЕВ) **Павел Мікалаевіч** [1873, в. Чорная Града Наўгародскай губ., Расія — 1.11.1937, Гомель, турма НКВД], протаіерэй. Скончыў духоўную семінарыю. З 1908 настаяцель Спаса-Праабражэнскага храма ў Гомелі. З 1913 служыў у Гомельскім ПетраПаўлаўскім саборы, благачынны цэркваў горада. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны 30.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.7.1988.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш;* Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**ЛЕВУСАЎ** (ЛЕВУСОВ) **Каліна Шменавіч** [1872, в. Валымер Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. (вёска не існуе) — ?], царкоўны староста. Беларус. З сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 27.2.1932. Асуджаны з братамі Анісімам, Максімам, Свята-ром Аляксіем *Мазгайлам і* інш. калегіяй АДПУ 9.4.1932 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом СССР 16.1.1989. Групавая справа Л. і інш. захоўваеццаў архіве УКДБ Магілеўскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ЛЕПЯШЫНСКІ** (ЛЕПЕШИНСКИЙ) **Грыгорый Лявонцевіч** [1878, Ульянаўская вол. Сенненскага пав.

Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. У 1920я г. настаяцель Уваскрасенскага храма ў мяст. Лукомль Сенненскага пав., цяпер вёска Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 15 крас. або 15 мая 1931. Асуджаны 27.8.1931 з інш. свяшчэннаслужыцелямі ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.10.1988 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа Л. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл., ф. 1070, в. 1, с. 32, л. 98—119.

**ЛЕЦКА** (ЛЕЦКО) **Ксенія Гаўрылаўна** [1892, Навагрудскі пав. Мінскай губ. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. У першай палове 1920х г. насельніца Спаса-Праабражэнскага манастыра ў Мінску. Потым прыхаджанка Мікалаеўскай царквы ў пас. Козырава. Падчас арышту працавала хатняй работніцай у прафесара Руфіма Выдры. Арыштавана 27.4.1933 у Мінску па адрасе: зав. Маляўскі, д. 28, кв. 2. Асуджана 7.6.1933 з інш. манахінямі і Свята-рамі Мінскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 12.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Л. і інш. № 24819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Сшюдпк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**ЛЁГКІ** (ЛЕГКИЙ) **Іакаў Савіч** [1.4.1906, Дзвінск Віцебскайгуб., цяпер Даўгаўпілс, Латвія — 15.5.1982, Рэзекне, Латвія], протаіерэй. З сям'і вядомага латгальскага Свята-ра. Скончыў СІП і гімназію, Рыжскую духоўную семінарыю. Рукапаложаны ў дыякана (1928), Свята-ра (1932). У 1932—41 настаяцель Кораўскай царквы Абрэнскага пав. Латвіі. Адначасова служыў у храме на

Старым Фарштаце ў Даўгаўпілсе. Арыштаваны 22.6.1941 супрацоўнікамі Абрэнскага НКВД. Неўзабаве разам са 100 інш. Пад следнымі перавезены ў Астроўскую турму. Вызвалены немцамі. У 1944 пасля прыходу Чырвонай арміі набыў пры дапамозе знаёмага ўрача фіктыўны пашпарт. Свята-р Дзімітрый *Акаловіч* дапамог Л. ўладкавацца на лесазавод у Салацгрыве. Зноў арыштаваны ў чэрв. 1949. Асуджаны 19.11.1949 асобай нарадай пры МДБ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Мінеральны канцлагер МДБ Комі АССР (Інта). Вызвалены ў 1954. Вярнуўся ў Латвію. З вялікімі цяжкасцямі аднавіў сваё сапраўднае імя. З 1954 служыў у Рэзекне. У апошнія гады жыцця жыў у Малце. Сын Л. таксама стаў Свята-ром.

Кр.: *ГолнковА.,* свяш,., *Фомнн С.* Кровью убеленные. Мученнкн н нсповедннкн СевероЗапада Росснн н Прнбалтнкн (1940 — 1955); Мартнролог православных свяіценнослужнтелей Латвнн, репресснрованных в 1940 — 1952 г. М., 1999; *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ЛІННІК** (ЛИННИК) **Палікарп Іванавіч** [1882, в. Старыца Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г., верагодна, служыў у Спаса-Праабражэнскім храме ў роднай вёсцы. Арыштаваны 5.12.1929. Асуджаны 13.2.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» (казаў, што «савецкая ўлада рабуе сялян») да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Котласкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. Пасля вызвалення 4.12.1939 зноў служыў Свята-ром. Рэабілітаваны 2.7.1965 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Л. № 19271с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру н церковь Хрнстову постра давшнх в Мынской епархші.*

**ЛІСІЦКІ (ЛИСИЦКИЙ) Антоній Пятровіч** [1883, Мінск — 8.10.1937, Томск, турма НКВД]. Беларус. З 1912 настаяцель Міхайлаўскага храма в. Азяраны (тагачасны

паштовы адрас: ст. Тураў) Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Старажоўцы (паштовы адрас: Тураў) Мазырскага пав. Арыштаваны 24.7.1937 у в. НоваСяргееўка Кажэўнікаўскага р-на Томскай вобл., дзе хутчэй за ўсё знаходзіўся ў ссылцы. Асуджаны 28.9.1937 як «член ПАВ» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.10.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Кнша памятн томнчей.*

**ЛІСОЎСКІ (ЛИСОВСКИЙ) Аляксандр Іванавіч** [1872, Слуцк Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сям'і рабочага. Да арышту служыў псаломшчыкам у адным з храмаў Слуцка. Арыштаваны 14.3.1933 у Слуцку па адрасе: вул. Глухая, д. 4. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі Слуцкага вікарыяцтва асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Л. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр..НАРБ, ІКБР.*

**ЛІСОЎСКІ (ЛИСОВСКИЙ) Георгій Самуілавіч** [1878, в. Пацава Слабада Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. — 2.12.1940, ГУЛАГ]. Беларус. Верагодна, малодшы сын Самуіла Лісоўскага[1]. У ліку лепшых скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1898?), рукапалажаны ў іерэя (1900). Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Паўлавічы Бабруйскага пав. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны 19.10.1937 з Матфеем *Комарам,* Платонам *Арэшкам* і інш. тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Карагандзінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 4.2.196ІЫ Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Л. і інш. Свята-роў № 7275сн захоўваецца ў архіве

КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Мпнской губерніш; Пажятная княжка Мннской епархш; Лычный состав епархнального управленыя;* НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; *БНДЦЭД.*

**ЛІСТРАЦЕНКА** (ЛИСТРАТЕНКО) **Грыгорый Сяргеевіч** [29.9.1889, в. Гладкава Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў дыяканам у Свята-Духавым храме ў роднай вёсцы. Арыштаваны 27.2.1932. Асуджаны 9.4.1932 калегіяй АДПУ за «контррэвалюцыйную работу» і «падрыў гаспадарчай палітыкі партыі ў вёсцы» да 5 гадоў ППК. Пасля датэрміновага вызвалення — у адной з цэркваў Магілёва. Зноў арыштаваны 19.3.1935. Абвінавачваўся ў «антысавецкай дзейнасці». 22.4.1935 вызвалены і рэабілітаваны пастановай Магілёўскага аддзела НКВД БССР. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага суда СССР. Асабовыя справы Л. № 5071 і № 10058 захоўваюцца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

*Кр..НАРБ, ІКБР.*

**ЛІТВІНАЎ** (ЛИТВИНОВ) **Грыгорый Захаравіч** [1899, в. Бурбін Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сененскі р-н Віцебскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Рускі. З сялянскай сям'і. Служыў у Мінскай духоўнай семінарыі. Арыштаваны 17.4.1921. Асуджаны 4.10.1921 калегіяй АДПУ за «супрацоўніцтва з дэфензівай» да 2 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.8.1992 пракуратурай БВА. Групавая справа Л. і інш. № 34451с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.:НАР5, *ІКБР.*

**ЛІЯРАНЦЭВІЧ** (ЛИОРАНЦЕВИЧ) **Фёдар Сямёнавіч** [1870, в. Беліца Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. — 22.4.1938, Магілёў, НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную акадэмію. У 1910я г. выкладчык і

справавод Магілёўскага мужчынскага духоўнага вучылішча. Арыштаваны 2.3.1938. Асуджаны тройкай НКВД 14.3.1938 як «удзельнік контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны Магілёўскім абл. судом 2.9.1961. Групавая справа Л. і інш. № 7486сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губертш; НАРБ, ІКБР.*

**ЛОБАЧ Уладзімір Сцяпанавіч** [1901, в. Кукшавічы Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — 1.11.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. З 1911 псаломшчык Пакроўскай царквы ў мяст. Койданава Мінскага пав., цяпер Дзяржынск. З 1923 дыякан храма св. Марыі Магдаліны на вул. Старажоўскай. Арыштаваны 28.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Мопра, д. 102, кв. 2. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.5.1960 трыбуналам БВА. Групавая справа Л. і інш. Свята-роў № 23379с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

29.7.1937 (?) у Мінску на сваёй кватэры арыштавана жонка Уладзіміра *Лобача* і дачка Антонія Урбановіча[1] Вера (н. ў 1899). 25.10.1937 тройкай НКВД яна была асуджана за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК і этапавана ў Сібірскі канцлагер НКВД Новасібірскай вобл. (Марыінск). Вызвалена 29.7.1947. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 11.3.1958 трыбуналам БВА.

Кр.: *БНДЦЭД;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення.

**ЛОБАЧ Ціт Паўлавіч** [1873, Барысаў Мінскай губ. — 10.3.1938, Барысаў, турмаНКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Член царкоўнага савета Андрэеўскага храма ў Барысаве. Арыштаваны 5.2.1938 у Барысаве па адрасе: вул. Дымкі, д. 20. Асуджаны 14.2.1938 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай групы» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны.

Рэабілітаваны 1.6.1957 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа Л. і інш. № 10397с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ЛОГІНАЎ (ЛОГИНОВ) Гаўрыіл Яфімавіч** [1888, в. Хотавіж Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. служыў у Свята-Духавай царкве ў роднай вёсцы. Арыштаваны 16.1.1930. Асуджаны 9.3.1930 з актыўнымі прыхаджанамі калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 27.7.1989. Групавая справа Л. і інш. № 10340сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛУЗГІН (ЛУЗГИН) Васілій** [каля 1890 — 28.11.1918], верагодна, сын Сергія Георгіевіча Лузгіна, унук Георгія Мікалаевіча Лузгіна, брат Дзімітрыя Лузгіна[3]. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (1912). З 1913—14 настаяцель Мікалаеўскага храма ў в. Глазомічы Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл., Расія. Падчас паўстання сялян супраць бальшавікоў у баі пад Веліжам (15.11.1918) перавязваў параненых і прычашчаў Св. Тайнам. Расстраляны пры падаўленні паўстання.

Кр.: *Памятная кшіжка Внтебской губерніш;* Новые мученнкн росснйскне. В 2х ч. Сост. протопресвнтер Польскій М. Ч. 2. С. 238. Рэпрынтнае выданне. М., год не пазначаны. Арыгінальнае выданне выйшла ў НьюЁрку ў 1957.

**ЛУЗГІН (ЛУЗГИН) Дзімітрый Георгіевіч** [1867, мяст. Клясціцы Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. — ?], брат Іаана Георгіевіча Лузгіна[1] і Сергія Георгіевіча *Лузгіна.* Беларус. З мяшчанскай сям'і. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Вышадцы Гарадоцкага пав.

Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 6.12.1930. Праходзіў па адной справе з актыўнымі прыхаджанамі Якавам Цімафеевічам Зайкіным (1894), Фёдарам Еўдакімавічам Кароткім (1891), Іванам Васілевічам Малахавым (1875). Асуджаны 17.5.1931 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Л. і інш. № 17108п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная кныжка Внтебской губерннн; НАРБ, ІКБР.*

**ЛУКАШЭВІЧ (ЛУКАШЕВИЧ) Гаўрыіл Харытонавіч** [1863, Брэсцкі пав. Гродзенскай губ. — 20.3.1938, Омск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту служыў псаломшчыкам у царкве в. Таўрыцкая Омскай вобл. Арыштаваны 4.3.1938. Асуджаны тройкай НКВД 14.3.1938 за «контррэвалюцыйную агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Омскай вобл. 23.6.1989.

Кр.: *КИНга памятн жертв полнтыческых репресснй Омской областн.*

**ЛУКАШЭВІЧ (ЛУКАШЕВИЧ) Дзмітрый** [1870 — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Жыў у в. Хаткі Лоеўскага р-на Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1933 з жонкай Дар'яй (н. ў 1885). Далейшы лёс невядомы.

Кр.:НАРБ, *ІКБР.*

**ЛУКАШЭВІЧ (ЛУКАШЕВИЧ) Дзімітрый Дзмітрыевіч** [1881, в. Хвастоўцы Чарнігаўскай губ. — ?]. у 1930я г. — настаяцель Мікалаеўскага храма в. Бракава Магілёўскага рна. Арыштаваны 14.1.1935. Праходзіў па адной справе з актыўньші прыхаджанамі Васілём Фядосавічам Гаўрыленкам (1880), Іванам Іванавічам Гаўрыленкам (1904), Іванам Ісідаравічам Гаўрыленкам (1880), Свірыдам Шліпавічам Лаўрэнавым (1904), Арцёмам Іванавічам Рэпетуевым (1898), Паўлам Фёдаравічам Тарасенкам (1895). Асуджаны 7.4.1935 пастановай НКВД СССР за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан.

Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Л. і інш. № 13320 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілеўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.* "

**ЛУКАШЭВІЧ (ЛУКАШЕВИЧ) Еўдакія Антонаўна** [1895, Навагрудскі пав. Мінскай губ. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. У першай палове 1920х г. насельніца Спаса-Праабражэнскага манастыра ў Мінску. Потым прыхаджанка Мікалаеўскай царквы ў пас. Козырава. Арыштавана 27.4.1933 у Мінску па адрасе: Маляўскі зав., д. 28, кв. 2. Асуджана 7.6.1933 з інш. манахінямі і Свята-рамі Мінскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоўжыцьу 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 12.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Л. і інш. № 24819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру п церковь Хрыстову пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**ЛУКАШЭВІЧ (ЛУКАШЕВИЧ) Міхаіл** [1870, в. Далматаўшчына Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — ?] протаіерэй. Беларус. Сын Лаўрэнція Лукашэвіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1893). З 1900 павятовы назіральнік царкоўнапрыходскіх школ пры Слуцкім Свята-Мікалаеўскім саборы. Узнагароджаны набедранікам (да 1904), скуф'ей, нагрудным крыжам, санам протаіерэя (1914). З 1916 другі Свята-р сабора. Арыштаваны 17.4.1927 у Слуцку па адрасе: вул. К.Лібкнехта, д. 19. Асуджаны 17.6.1927 з Аляксандрам *Крыкуновым,* Антонам *Царанковым* асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў г. Гадзяч Палтаўскай вобл., Украіна. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.4.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа Л. № 32886с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памяпгная кнажка Мннской губерніш; Спгапшсггшическне сведення о церквах н прнчтах Мннской епархіш; Памятная КИНж ка Мннской епархіш; Лнчный состав епархішльного управлення.*

**ЛУКАШЭНКА (ЛУКАШЕНКА) Аляксандр Феадосіевіч** [1886, в. Юркаўшчына Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н — ?]. Беларус. 3 духоўнага саслоўя. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. 5.11.1906 прызначаны псаломшчыкам у Мсціслаўскі Мікалаеўскі сабор. У 1910я г. памочнік класнага настаўніка Мсціслаўскай мужчынскай гімназіі. У 1920я г. выкладчык Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума. Быў жанаты, гадаваў сына і дачку. Арыштаваны 27.2.1931. Праходзіў па адной справе з настаўнікамі Архіпавым Мікалаем Дзмітрыевічам (н. ў 1892), Бурдзілавым Васіліем Прохаравічам (1886), Гіркант Апалоніей Іванаўнай (1880), Дзянішчыкам Астапам Іванавічам (1888), Маісеенкам Фамой Андрэевічам (1892), Пудавым Ільёй Савічам (1893), Саўчыкам Іванам Фёдаравічам (1891), Шулякоўскім Аляксандрам Андрэевічам (1900) і інш. Асуджаны 26.7.1931 за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.11.1992. Асабовая справа Л. № 9782 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Могнлевской губерніш; БНДЦЭД.*

**ЛУКІН (ЛУКИН) Захар Аляксавдравіч** [24.3.1884, Магілёў — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. 3 сям'і рабочага. Арыштаваны 2.10.1935. Асуджаны 21.4.1936 з шэрагам Свята-роў і актыўных прыхаджан тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.2.1969 пастановай пленума Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа Л. і інш. № 9394 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЛУТОВІЧ (ЛУТОВИЧ) Андрэй Сямёнавіч** [1895, в. Таль

Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. Да арышту псаломшчык Свята-Троіцкага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 20.3.1933. Праходзіў па адной справе са Свята-ром храма Сергіем *Радакоўскім* і інш. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 27.12.1989. Групавая справа Л. і інш. № 29903с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛУШЧЫКАЎ (ЛУЩИКОВ) Іван Яфімавіч** [1884, Магілёў — 1.10.1938, Магілёў, НКВД], царкоўнаслужыцель. Беларус. З духоўнага саслоўя. Служыў у адным з храмаў Магілёўскай епархіі. Арыштаваны 1.3.1938. Асуджаны 21.9.1938 тройкай НКВД як «удзельнік шпіёнскапаўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Л. і інш. № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ЛЮБАРСКІ (ЛЮБАРСКИЙ) Мікалай Пятровіч** [1886, Навагрудак Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гродзенскай. вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. У 1910я г. настаяцель Пакроўскага храма ў мяст. Рукойні (Руйкані), потым — Спаса-Праабражэнскага ў мяст. Рудаміна Віленскага пав., благачынны Шумскага благачыння. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Валосавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл., Мікалаеўскага храма в. Горкі Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 5.2.1930 на хут. Баброва Лепельскага рна. Асуджаны 24.2.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Міхаілам *Лаўрыновічам,* Грыгорыем *Сінкевічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.9.1989 пракуратурай

Віцебскай вобл. Групавая справа Л. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Внленской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЛЮБІЧ** (**ЛЮБИЧ**) **Міхаіл** [1867 ці 1868, в. Паўлавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ. цяпер Кіраўскі р-н Магілеўскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Сын Марціна Любіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894), рукапаложаны ў іерэя (1896). З 1897 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма в. Вітунічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. У другой палове 1920х г. служыў у Свята-Духавай царкве в. Лошніца Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі рн. Арыштаваны 19.10.1930. Асуджаны 25.11.1930 з шэрагам інш. Свята-роў асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь. Зноў арыштаваны 15.2.1935 у Оршы па адрасе: вул. Сацыялістычная, д. 12. Асобай нарадай пры НКВД 2.8.1935 прыгавораны як «агент польскай разведкі» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лес невядомы. Па першай справе (№ 29091с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 23.12.1989, па другой (захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) пракуратурай БВА 28.8.1989.

22.5.1938 у Мінску па адрасе: вул. Пуліхава, д. 25, кв. 2 арыштаваны фінінспектар наркамфіна БССР Любіч Яўген Міхайлавіч (н. ў 1900 у в. Вітунічы) сын Міхаіла *Любіча.* 11.10.1938 тройкай НКВД асуджаны як «член контррэвалюцыйнай дыверсійнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК і этапаваны ў Цемнікаўскі канцлагер (Асоблаг № 3) НКВД Мардоўскай АССР. Вызвалены і рэабілітаваны ў перыяд 22.12.1954— 4.2.1955. Далейшы лёс невядомы. Яго асабовая справа № 4159с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памхтная КИНжка Мннской губернті; Памятная КИНж ка Мынской епархіш; Лнчный состав епархіального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЛЮДМІЛА (ПАЛЯНСКАЯ)** [1880, в. Гладкае Курскай губ. — ?]. Руская. З сялянскай сям'і. Да 1925 манахіня Спаса-Праабражэнскага манастыра ў Мінску. Потым прыхаджанка Мікалаеўскай царквы ў пас. Козырава. Арыштавана 17 або 27 крас. 1933 у Мінску па адрасе: Маляўскі зав., д. 28, кв. 2. Асуджана 13.8.1933 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 12.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Л. і інш. № 24819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**ЛЯВІЦКІ** (ЛЕВИЦКИЙ) **Хрысанф Мікалаевіч** [1875, в. Косня Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. — 30.10.1937, Ленінград, турма НКВД], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1900—10я г. служыў у Гродзенскай епархіі (?). Падчас арышту працаваў майстрам на лесаыарыхтоўках у в. Івашкава тагачаснага Дзедавіцкага (Дзядовіцкага) р-на Ленінградскай вобл. Арыштаваны 2.9.1937 (паводле інш. звестак 17.8.1937) Асуджаны тройкай НКВД Ленінградскай вобл. 10.9.1937 ці 22.10.1937 за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.7.1989.

Кр.: *ЛеннноградсКИЙ марпшролог; Не предать забвенню. Псков.*

**ЛЯДКОЎСКІ (ЛЕДКОВСКИЙ) Андрэй Сямёнавіч** [1882, мяст. Вула Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД], Свята-р (?). Беларус. З сялянскай сям'і. Верагодна, скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. У 1910я г. (?) член Саюза рускага народа. Падчас арышту — вартаўнік клуба «Прафінтэрн». Жонка Л. Марыя Фёдараўна Валянцёнак (42 гадоў) працавала швачкай у клубе «Прафінтэрн». Сыны: Валянцін (9 гадоў) і Генадзь (16) жылі з бацькамі, Вячаслаў (19) знаходзіўся ў ссылцы «за

шкодніцтва». Дочкі: Фаіна (10) — жыла з бацькамі, Серафіма (24) — вучылася ў Бабруйску на рабфаку, Ганна (узрост невядомы) — жыла ў Ленінградзе. Арыштаваны 22.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. Дзмітрава, д. 51а. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Асабовая справа Л. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархп.*

**ЛЯЛЯЎСКІ (ЛЕЛЯВСКИЙ) Уладзімір** [1889, в. Астрагляды Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Брагінскі р-н Гомельскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Верагодна, сын Даменціяна (Дамецій) Ляляўскага і сваяк Іосіфа Ляляўскага. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913), накіраваны псаломшчыкам ва Успенскі храм в. Вялікія Заўшыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. 15.8.1914 ажаніўся са Смігельскай Вольгай Уладзіміраўнай. 24.8.1914 архіепіскапам Мінскім і Тураўскім Мітрафанам (Краснапольскім) рукапаложаны ў дыякана, 29.8.1914 — у іерэя Свята-Духавай царквы в. Дабраслаўка Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1917 настаяцель РаствaБагародзіцкага храма ў мяст. Грэск Слуцкага пав., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 1.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. свяшчэннаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК (заменена высылкай у Валагодскую вобл.). Пасля вяртання прыняты ў клір МінскаБеларускай епархіі. Прызначаны настаяцелем Свята-Духава храма ў Бабруйску (1941). З 10.1.1950 (пасля закрыцця храма) — звышштатны Свята-р Бабруйскага Мікалаеўскага сабора. З 28.2.1950 другі Свята-р Свята-Сафійскай могілкавай царквы ў Бабруйску. 21.8.1950 прызначаны настаяцелем КасмаДаміянаўскага храма в. Любонічы Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. З 1951 клірык Смаленскай епархіі. Далейшы лёс невядомы.

Узнагароджаны нагрудным крыжам (1931), санам протаіерэя (1946). Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Л. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Опнсанпе церквей н прнходов Мннской епархіш; Памяпгная КИНжка Мннской губернші; Памяпгная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 434.

**ЛЯНЧЭЎСКІ** (**ЛЕНЧЕВСКИЙ**) **Іван Феліксавіч** [1869, в. Пацкі Мінскага пав., цяпер Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. — 1930 (?), Мінск, турма НКВД], селянінаднаасобнік. Беларус. Да арышту стараста Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Вітаўка Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі рн. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 22.2.1930. Асуджаны 26.2.1930 са Свята-ром Аркадзіем *Акаловічам* і актыўнымі прыхаджанамі калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа Л. і інш. № 23234с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Сыноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мішской епархгш.*

**ЛЯСКОЎ (ЛЕСКАЎ) (ЛЕСКОВ) Емяльян Іванавіч** [1871, в. Сычоўка, цяпер Уманскі р-н Чаркаскай вобл., Украіна — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Украінец. З духоўнага саслоўя. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту служыў у Ільінскім храме в. Казакова тагачаснага Суражскага (цяпер Віцебскага) рна. Быў жанаты, меў дачок Таццяну (1903), Ніну (1911), сыноў Сяргея (1906), Мікалая (1908), Дзмітрыя (1917). Арыштаваны 13.3.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа Л. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр.:НАРБ,ІКБР.*

**ЛЯСКОЎСКІ** (**ЛЕСКОВСКИЙ**) **Петр Аляксандравіч.**
Гл.: **ПАМФІЛ (ЛЯСКОЎСКІ).**

**ЛЯСНЕЎСКІ** (**ЛЕСНЕВСКИЙ**) **Сергій Ігнатавіч** [1882, Васількаў *(уЎазіШбю)* Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — ?]. Беларус. 3 духоўнага саслоўя. Вучыўся ў духоўнай семінарыі ў Феадосіі (цяпер Украіна). Падчас арышту ўдавец, гадаваў сына. Арыштаваны і 27.12.1920 асуджаны за «спробу ўцячы з белагвардзейцамі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 3.10.1994 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа Л. № п21373 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ЛЯЎЦОЎ** (**ЛЕВЦОВ**) **Фёдар Ягоравіч** [1890 — ?], дыякан. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г. служыў ва Успенскай царкве в. Рудзянец (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 з жонкай Антанінай (н. ў 1907). Далейшы лёс невядомы.
Кр.: ДАГомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 1.

**ЛЯХ Фёдар Сцяпанавіч** [1890 (паводле інш. звестак 1884), в. Зелянковічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілёўскай вобл. — 14.11.1937, турма НКВД]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Скончыў народнае вучылішча. У 1920я г. дыякан Свята-Троіцкага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны 14.8.1930 у в. Гарохавічы (цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл.). Асуджаны 26.10.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 6 месяцаў пазбаўлення волі. Пасля вызвалення служыў ва Уваскрасенскай царкве ў Глуску. Зноў арыштаваны 19.9.1937. Прыгавораны тройкай НКВД 8.10.1937 як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па першай справе (№ 12206; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 16.1.1989, па другой (№ 8162сн; захоўваецца тамсама) 26.7.1956.
Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЛЯХОЎСКІ** (**ЛЯХОВСКИЙ**) **Антон М.** [1881 — ?], дыякан. Беларус. Верагодна, служыў у Георгіеўскай царкве в. Копцавічы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў дваіх непаўналетніх дзяцей. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл., ф. 152, в. 5, с. 2, л. 40.

**ЛЯЦЯЕЎ** (**ЛЕТЯЕВ**) **Інакенцій Аляксеевіч.** Гл.: **ІНАКЕНЦІЙ (ЛЯЦЯЕЎ).**

**ЛЯШКЕВІЧ** (**ЛЕШКЕВИЧ**) **Аляксандр Дзмітрыевіч** [1874, в. Лоўжа Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. (паводле інш. звестак Расоны Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл.). — ?], верагодна, брат Свята-ра Мітрафана *Ляшкевіча.* Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. 3 1904 настаяцель РаствaБагародзіцкага храма в. Расоны Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл., выкладаў у пачатковай народнай школе в. Азярцоўская Полацкага пав. У 1920я г. настаяцель Увазнясенскай царквы ў Расонах. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 21.6.1927. Асуджаны 16.9.1927 пастановай калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю і дапамогу шпіёну» да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Л. № 22027п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Внтебской губернші; НАРБ, ІКБР.*

**ЛЯШКЕВІЧ** (**ЛЕШКЕВИЧ**) **Андрэй Грыгор'евіч** [1883, в. Дубянец (?) Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель, брат Нікана *Ляшкевіча.* Беларус. З дваранскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў у адным з храмаў Мінскай епархіі. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 22.2.1932 у в.

Новая Ніва Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Асуджаны 21.4.1932 з актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа Л. і інш. № 29423с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. . Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ЛЯШКЕВІЧ** (**ЛЕШКЕВИЧ**) **Мітрафан** [1876, в. Даўгаполле Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД], верагодна, брат Аляксандра *Ляшкевіча.* Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. Выкладаў Закон Божы ў царкоўнапрыходскай школе в. Халамер'е Гарадоцкага пав. У 1920я г. настаяцель Успенскага храма в. Азаркава таго ж пав., Успенскай царквы в. Белахвостава Невельскага пав., цяпер Пскоўская вобл., Расія, Успенскага храма в. Віраўля Гарадоцкага пав. Меў жонку Антаніну (56 гадоў), сыноў: Міхаіла (22, манцёр Белэнерга), Дзмітрыя (18), дачку Зінаіду (18). З 1935 працаваў агранщчыкам на Віцебскім цагляным заводзе № 2. Арыштаваны 19 або 24 верас. 1937 у Віцебску па адрасе: вул. 3я Гутараўская, д. 34 або 35. Асуджаны 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа Л. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Внтебскон губертш; БНДЦЭД.*

**ЛЯШКЕВІЧ** (**ЛЕШКЕВИЧ**) **Нікан Грыгор'евіч** [1.2.1886, в. Дубянец (?) Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], протаіерэй, брат Андрэя *Ляшкевіча.* Беларус. З дваранскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту настаяцель царквы в. Крывічы былога Слуцкага пав. Мінскай губ, цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 7.5.1935. Асуджаны 11.9.1935 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10

гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаІжэмскі канцлагер НКВД Комі АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.4.1990 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Л. № 31097с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ЛЯШЧЫНСКІ** (**ЛЕЩИНСКИЙ**) **Іакім Іванавіч** [1885, Дзвінск, цяпер Даўгапілс, Латвія — 31.5.1948, ГУЛАГ]. З сям'і чыгуначніка бел. паходжання. Вучыўся ў Дзвінскім рэальным вучылішчы, Віцебскай духоўнай семінарыі (1898—1904). Працаваў настаўнікам народных школ у вёсках Эстоніі. У 1908 рукапаложаны ў іерэя. Служыў у прыходах Латвіі. З 1912 настаяцель Уваскрасенскай царквы в. Межава Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі рн, Пакроўскага храма в. Туржэц Полацкага пав., цяпер Полацкі рн. З пачаткам 1й сусветнай вайны — Свята-р 237га пяхотнага палка 60й пяхотнай дывізіі. У 1917—18 настаяцель Лазоўскай царквы (каля Юр'ева, цяпер Тарту, Эстонія). З 1 чэрв. або ліп. 1919 да лют. 1920 — палкавы Свята-р 53га пяхотнага Валынскага палка арміі генерала М.Юдзеніча. У 1923—25 настаяцель Дубінскага храма Бельскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Польшча. У 1925—28 служыў у царкве в. Рыбалы Бельскага пав., цяпер Польшча. У 1928—30 — ва Успенскім храме в. Быцень Слонімскага пав., цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. У 1930—37 благачынны Гарадзішчанскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Потым настаяцель царквы ў мяст. Юшкаў Ваўкавыскага пав. Беластоцкага ваяв., цяпер Польшча. З 1938 служыў у Пакроўскім храме в. Алекшыцы, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, уступіў у арганізацыю «Беларускі камітэт», старшыней якой быў літаратар Хведар Ільяшэвіч. Арыштаваны супрацоўнікамі НКВД 13.12.1944. Абвінавачваўся ў «здрадніцкай дзейнасці на карысць немцаў». 5.5.1945 на закрытым паседжанні ваеннага трыбунала войск НКВД Гродзенскай вобл. асуджаны да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй

маёмасці. 7.9.1945 мера пакарання зніжана да 15 гадоў. Этапаваны ў Марыінскі канцлагер МДБ Кемераўскай вобл. Загінуў у зняволенні. Асабовая справа Л. № 3719 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл. 17.8.1957 жонка Л. звярнулася да Генеральнага пракурора СССР з просьбай аб перагдядзе справы мужа, але ёй было адмоўлена. У маі 1995 пракуратура Гродзенскай вобл. разгледзела справу Л. і прызнала яго пакаранне справядлівым.

Кр.: *Памятная КИНжка Вытебской губерншш; Черегшца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненгцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 2. Гродно, 2005. С. 237—242.

**МАГДАЛША (КУНІЦКАЯ)** [Марыя Дамінікаўна; 1887, в. Слабодка Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], манахіня, сястра Марфы *Куніцкай.* У пачатку 1920х г. прыхаджанка Іаанаўскага манастыра. У 1929 тайна прыняла манашаскі постырг. Арыштавана 9.1.1932. Асуджана 22.3.1932 да 5 гадоў ППК. Этапавана ў Цемнікаўскі канцлагер АДПУ. Вызвалена 22.3.1933 датэрмінова з пазбаўленнем правоў жыць у 12 вызначаных местах. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: *СанктПепгербургской епархіш Снноднк.*

**МАГЕР Алена Кірылаўна** [1876, в. Бачэйкава Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларуска. 3 сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчыца Ільінскай царквы ў Бешанковічах. Мела двое дзяцей. Арыштавана 7.3.1932 у роднай вёсцы. Асуджана 5.6.1932 са Свята-ром Андрэем *Кошалевым,* старастам царквы Васілём *Талстым* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапавана ў Зах.Сібірскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 6.10.1988 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД. • '*

**МАЗГАЙЛА (МАЗГАЙЛО) Аляксій Міхайлавіч** [1892, в. Доўгавічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. Верагодна, сын Міхаіла Мазгайлы. У 1920я г. служыў у РаствaБагародзіцкай царкве ў роднай вёсцы. Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 24.2.1932. Праходзіў па адной справе з актыўнымі прыхаджанамі: настаўнікам Крычаўскай сямігодкі Васілём Яўціхіевічам Яўціхіевым (1889), сялянамі, братамі Каліны *Левусава,* Анісімам Піменавічам Левусавым (1877), Максімам Піменавічам Левусавым (1885), сялянамі Іванам Астапавічам Ляднеўскім (1887), Андрэем Іванавічам Філіпенкам (1880). Асуджаны калегіяй АДПУ 9.4.1932 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом СССР 16.1.1989. Групавая справа М. і інш. № 13210 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. *Кр.: НАРБ, ІКБР.*

**МАЗОЛЬ Яўмен Іванавіч** [1867, в. Вялікія Негнавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 10.3.1938, Барысаў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Падчас арышту — пенсіянер, старшыня царкоўнага савета храма св. Андрэя Юродзівага ў Барысаве. Арыштаваны 5.2.1938 у Барысаве па адрасе: вул. Урыцкага, д. 96. Асуджаны 14.2.1938 з актыўнымі прыхаджанамі, членам савета Мікалаем Грыгор'евічам Бараўлём (1890), Антонам Сцяпанавічам Быкавым (1870), Аляксеем Фёдаравічам *Вячэрскім* (1897), Цітам Паўлавічам Лобачам (1873), Раманам Грыгор'евічам Самцэвічам (1883), Васілём Адольфавічам Станкевічам (1864), Андрэем Яфімавічам ІПапчыцам (1876) тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай групы» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1957 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа М. і інш. № 10397с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру п церковь Хрнстову пострадавшых в Мннской епархіш.*

**МАІСЕЕЎ** (МОИСЕЕВ) **Іван Маісеевіч.** Гл.: **ІААН (МАІСЕЕЎ).**

**МАКАРАНКА** (МАКАРЕНКО) **Нікіфар Паўлавіч.** Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель Міхайлаўскага храма ў мяст. Церахоўка (тагачасны паштовы адрас: ст. Насавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер г.п. Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Меў сям'ю з 8 чалавек. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 61, 69, с. 80, л. 237.

**МАКСІМЮК** (МАКСИМЮК) **Міхаіл** [1900 — чэрв. 1941 (?)], настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Леніна Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Арыштаваны 22.6.1941. Абвінавачваўся ў тым, што «ведае нямецкую мову і таму можа быць карысны немцам». Верагодна, расстраляны.

Кр.: *Снноднк за веру н церковь Хрнстпову пострадавшых в Мынской епархші.*

**МАЛАХА Мікалай Раманавіч** [1895, паводле некаторых звестак Навагрудскі пав. Мінскай губ. — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту настаяцель царквы в. Кустын Брэсцкага рна. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 17.12.1944. Асуджаны 1.4.1946 са Свята-ром Кірылам *Ганчуком* асобай нарадай МДБ за «здраду радзіме» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.6.1993 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа М. № 11635 захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

**МАЛАХАЎ (МАЛАХОВ) Васілій Якаўлевіч** [? — 1934 (?), ГУЛАГ], Свята-р. Скончыў гісторыкафілалагічны фт

Маскоўскага ун-та, Маскоўскую духоўную семінарыю (?). Рукапаложаны ў іерэя. Выкладаў у Жытомірскай духоўнай семінарыі (Украіна). Выхаваў шэраг будучых Свята-роў і епіскапаў, якія памяталі пра свайго настаўніка ўсё жыццё. Пасля забароны правіць богаслужэнні ў Жытомірскай царкве адпраўлены бальшавікамі ў маленькую бел. вёску на Палессе. Разам з жонкай Марыяй, былой настаўніцай, тайна здзяйсняў богаслужэнні на даму ў сялян. У канцы 1920х г. пра дзейнасць сям'і М. стала вядома ў АДПУ. Арыштаваны з жонкай па дарозе ў Маскву пры спробе ўцячы ад карных бальшавіцкіх органаў. Высланы на Поўнач. Загінуў у зняволенні ад тыфу. Лёс жонкі невядомы.

Кр.: Новые мученнкн российскіе. В 2х ч. Сост. протопресвнтер *Польскш М.* Ч. 2. С. 164—165. Рэпрынтнае выданне. М., год не пазначаны. Арыгінальнае выданне выйшла ў НьюЁрку (1957).

**МАЛАЧЫНСКІ (МОЛОЧИНСКИЙ) Міхаіл Андронікавіч** [1872, мяст. Копысь Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у АлександраНеўскім храме в. Крапіўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі рн. 12.1.1906 пераведзены ў Пакроўскі храм в. Вейна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. 26.1.1906 перавод ануляваны. У 1920я г. служыў у адной з цэркваў Оршы. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 3.4.1932. Асуджаны 9.8.1932 з інш. Свята-рамі, манахамі, манахінямі, царкоўнымі служачымі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 21.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 6я Свярдлова, д. 19. Асуджаны 28.9.1937 з 40 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Па першай справе (групавая №

6739п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 9.2.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Па другой 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда.

Кр,: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; Могнлевскне Епархаальные Ведомостн; БНДЦЭД.*

**МАЛЕЙ Пётр Іосіфавіч** [1890, в. Сар'янскае Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер в. Сар'я Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту настаяцель Георгіеўскай царквы ў мяст. Асвея Верхнядзвінскага рна. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 21.1.1933 у в. Вялікая Дзехцерава тагачаснага Дрысенскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 3.3.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.9.1989. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**МАЛЧАНАЎ** (**МОЛЧАНОВ**) **Уладзімір Дзпгітрыевіч** [14.7.1906, Краснадар, Расія — ?]. протаіерэй. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Екацярынаслаўскае духоўнае вучылішча (1919), Краснадарскую школу 2й ступені, Вышэйшыя курсы інжынераў шляхоў зносін пры Маскоўскім інстытуце інжынераў транспарта(192б), Маскоўскую багаслоўскую акадэмію (1931), Маскоўскую кансерваторыю. У 1925 у Краснадары ажаніўся з Анастасіяй Фамінічнай Бакір. У 1931 абнаўленчым мітрапалітам Віталіем (Увядзенскім) рукапаложаны ў іерэя. На працягу 5 гадоў узнагароджаны протаіерэйствам, паліцай і мітрай. У 1937 арыштаваны і асуджаны да 10 гадоў ППК. Пасля вызвалення ў 1947 прыняты ў зносіны з РПЦ. 23.10.1947 епіскапам Данецкім і Варашылаградскім Ніканам (Пеціным) перарукапаложаны ў дыякана, 24.10.1947 — у іерэя. 2.8.1948 узведзены ў сан протаіерэя з ускладаннем нагруднага крыжа і прызначаны епархіяльным сакратаром Данецкай епархіі. З 25.10.1947

другі Свята-р Мікалаеўскага кафедральнага сабора ў Варашылаваградзе. З 23.3.1948 настаяцель Варашылаваградскага ПетраПаўлаўскага храма. З 16.11.1948 служыў у Мікалаеўскай царкве Жданава (Марыупаля) Данецкай вобл., Расія. З17.5.1950 па ўласным прашэнні пераведзены ў ГродзенскаБрэсцкую епархію і прызначаны настаяцелем Казанскага храма в. Толкава Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. Не атрымаўшы на працягу некалькіх месяцаў дазволу на прапіску ў памежнай зоне, выехаў у Вялікалуцкую епархію (Пскоўская вобл., Расія). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Архіў Міыскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 523. ***62***

**МАЛЬЦАЎ (МАЛЬЦЕВ) Майсей**. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Карма Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 39.

**МАЛЮШЧЫЦКІ** (**МАЛЮЩИЦКИЙ**) **Данііл Мікалаевіч** [1864, в. Машкова Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскім храме ў Крычаве Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. З 1912 настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Родня Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. У 1920я г. служыў у Пакроўскім храме ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 27.3.1929. Асуджаны 19.6.1929 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.6.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа М. і інш. № 22052п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Могнлевской губерніш; БНДЦЭД.*

**МАЛЯЎКА (МАЛЯВКО) Фама Андрэевіч [**1913, мяст. Асвея Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — ?], манах. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Арыштаваны 22.11.1932 у родным мястэчку. Асуджаны 8.1.1933 са Свята-ром Максімам *Зубарам* асобай нарадай пры АДПУ за «групавую антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 22.6.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. № 15166п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**МАМЫКА (МАМЫКО) Пётр Васілевіч** [1890, в. Ігрушка Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г., верагодна, служыў у Канстанцінаўскай царкве в. Салаўі (Вялікія Салаўі) Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 13.1.1930. Асуджаны 12.3.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Леанідам *Кліндуховым,* Дзмітрыем *Розавым,* Міхаілам *Саракалетавым* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**МАНДЗІК (МАНДЗИК) Ілья Флоравіч** [1894, в. Самойлавічы Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. — 23.3.1933, Мінск, турма АДПУ], Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. Падчас 1й сусветнай вайны служыў пісарам у царскан армн. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Станькава Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 24.12.1932.

Асуджаны 15.3.1933 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі (усяго каля 20 чалавек) асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як арганізатар контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа М. і інш. № 30000с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Разам з М. асуджаны (да высылкі ў Паўночны край) яго жонка Ганна Іванаўна (н. 1901), дочкі Зінаіда (н. ў 1927), Таіса (1925) і сын Георгій (1929).

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Дзяржынскага раена. Мн., 2004.

**МАНЕЦІН (МОНЕТИН**) [імя і імя пабацьку невядомы]. Свята-р. Арыштаваны ў 1937. Са спецпаведамлення ад 16.4.1937 наркама ўнутраных спраў Бермана сакратару ЦК КП(б)Б Шаранговічу: *«9 апреля 1937 г. группа в чнсле свыше 100 человек явнлась в РаснянсКИЙ сельсовепг Дрнбннского района с тпребованнем немедленного опгкрытпня бездейстпвуюіцей, но офнцнально закрытпой Раснянской* (СвятаТроіцкай. — Л.М.) *церквн.*

**МАРАКОЎ (МОРЯКОВ) Дзмітрый Захаравіч** [21.9.1880, в. Азяроўка Пскоўскай губ. — 18.11.1968, Мінск], удзельнік антыкамуністычнага руху, бацька В., Л. і У. Мараковых, дзед Л.У.Маракова. Паводле некаторых звестак, удзельнік рускаяпонскай вайны 1904—05,1 Усебеларускага кангрэса (верагодна, як дэлегат ад бежанцаў або эсэраў). З успамінаў пісьменнікаў С.Шушкевіча і П.Пруднікава вядома, што вуліца Вялікаморская, дзе М. паставіў (каля 1906—07) першы дом, спачатку мела назву *Марская,* а потым, калі пашырылася, перайменавана ў Вялікаморскую. Паводле сфабрыкаванай у НКВД справы адзін з арганізатараў (старшыня царкоўнага савета) рэлігійнай антысавецкай арганізацыі ў пас. Козырава[1] (1933—35). Асуджаны 10.8.1935 са Свята-рамі Козыраўскага Мікалаеўскага храма і актыўнымі прыхаджанамі да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Тайшэцкі канцлагер НКВД (працаваў на шахце ў Кісялёўску

Kamunikat.org

Кемераўскай вобл.). Вызвалены 29.7.1940, але ў сувязі з забаронай уезду ў Беларусь дадому вярнуўся толькі праз 12 гадоў. М. неаднаразова выклікалі ў НКВДКДБ. Апошні раз дапытвалі ў 1960 (у 80 гадоў!). М. ні разу не атрымаў пенсіі, бо не меў дакументаў (НКВД згубіў іх і асабовую справу), якія б пацвердзілі яго працоўны стаж прыкладна з 1897—98.

Кр.: *ІПушкевіч С.* Вяртанне ў маладосць. Мн., 1968; *Маракоў Л.* Валеры Маракоў: Лёс, хроніка, кантэкст. Мн., 1999; *Яго ж.* Знявечаныя жыцці // *Голас Радзімы.* 1999. 15— 22 крас.; *Дамашэвіч У.* Трэцяе нараджэнне // *ЛіМ.* 2006. 21 крас.

Падрабязней у арт.: Біруля Уладзімір Вікенцевіч.

**МАРДВІЛКА (МОРДВИЛКО) Пётр Канстанцінавіч** [1875, в. Ліцвяны Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — ?], бацька навукоўца і перакладчыка Аркадзя *Мардвілкі* і, верагодна, сын Канстанціна Мардвілкі[1]. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1896?). З канца 1890х г. псаломшчык, з 1903 настаяцель Спаса-Праабражэнскага храма в. Языль Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. З ліп. 1914 член будаўнічага камітэта цэркваў 3й акругі Бабруйскага пав. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 14.3.1933 у Слуцку па адрасе: вул. 4я Працоўная, д. 20. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР. Вызвалены 14.3.1936. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа М. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятпная КИНжка Мннской губерШш; Памятная КИНжка Мннской епархнн; Лнчный состав епархыального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67.

**МАРКОЎСКІ** (МАРКОВСКИЙ) **Іаан Іванавіч (Ісакавіч)**

[1867, в. Дварэц Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і царкоўнаслужыцеля. Служыў дыяканам. Арыштаваны 27.11.1929. Асуджаны 13.1.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «кулак» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.11.1990 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 152, воп. 5, сп. 2, л. 5, 18.

**МАРОЗАЎ (МОРОЗОВ) Іосіф Мікалаевіч** [1894, в. ВолькаАброўскае Слонімскага пав. Гродзенскай губ. — ?]. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту настаяцель Пакроўскай царквы ў Маладзечне Мінскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 13.3.1940 у Маладзечне па адрасе: вул. Пушкіна, д. 52. Асуджаны 4.9.1940 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў Каргапольскі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. Вызвалены 1.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.7.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа М. № 26459с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр.: НАРБ, ІКБР.*

**МАРОЗАЎ (МОРОЗОВ) Максім Уласавіч** [1867, Магілёўская губ. — 9.10.1937, Магілёў, турмаНКВД], стараста Багародзіцкай царквы в. Галоўчыцы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 9.10.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.5.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа М. № 12131 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**МАРОЗАЎ (МОРОЗОВ) Марцініян Андрэевіч** [1873, в. Хамінічы Горацкага (або Сенненскага) пав. Магілёўскай губ.

— ?], манах. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 1.2.1931 у роднай вёсцы. Асуджаны 16.4.1931 са Свята-ром Андрэем *Трусам* асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**МАРТЫШКА (МАРТЫШКО) Пётр Грыгор'евіч** [1884, мяст. Каратунь (?), цяпер Украіна — 2.4.1938, Магілёў, НКВД], манах. Арыштаваны 17.2.1938 у Магілёве. Асуджаны 9.3.1938 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю супраць мерапрыемстваў савецкай улады» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.9.1965 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Групавая справа М. і інш. № 9105 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**МАРЧАНКА** (МАРЧЕНКО) **Данііл Сяргеевіч** [1898, с. Плешкані, цяпер Украіна — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў у Георгіеўскай царкве в. Балонаў Сялец Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл., цяпер Быхаўскі рн. Арыштаваны 2.4.1936. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 17.6.1937 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ІІІІК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 29.11.1991. Асабовая справа М. № 14437 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

*Кр.:НАРБ,ШБР.*

**МАРЧЭЎСКІ** (МАРЧЕВСКИЙ) **Гаўрыіл Грыгор'евіч** [1868, г. Сямёнаўка Чарнігаўскай губ., цяпер Украіна — ?], Свята-р. Украінец. Скончыў духоўную семінарыю. Арыштаваны 18.4.1937. Асуджаны тройкай НКВД 7.8.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 16.1.1989. Групавая справа М. і інш. № 9797

захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

*Кр..НАРБ, ІКБР*

**МАР'ІНА** (МАРЬНБА) **Марыя Грыгор'еўна** [1909, мяст. Гарадзец Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. — ?], псаломшчыца Гомельскай Спаса-Праабражэнскай царквы. Арыштавана 24.8.1949. Асуджана асобай нарадай пры МДБ 14.12.1949 да высылкі ў Казахстан. Вызвалена ў 1954. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 29.11.1991.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**МАСКАЛЕВІЧ** (МОСКАЛЕВИЧ) **Аляксандр Іванавіч** [1870, Рэчыцкі пав. Мінскай губ. — ?]. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1900—20я г. псаломшчык КасмаДаміянаўскай царквы в. Клінок Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 31.1.1930. Асуджаны 6.3.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа М. і інш. № 22642с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской епархіш.*

**МАСКАЛЕВІЧ** (**МОСКАЛЕВИЧ**) **Аляксандр** [1904, в. Крынка Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Канстанціна Маскалевіча[1]. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Да арышту настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Труханавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 24.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. 15.8.1946 Запарожскім абл. судом прыгавораны да 10 гадоў ППК. Вызвалены 18.12.1954. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа М. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ

Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**МАСКАЛЕВІЧ (МОСКАЛЕВИЧ) Уладзімір** [1874, мяст. Гайна Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Сын Рамана Маскалевіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1897?), рукапалажаны ў іерэя. З 1904 настаяцель Успенскага храма в. Камень Барысаўскага пав., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. У 1906 змяніў бацьку на пасадзе настаяцеля Успенскай царквы. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 19.4.1932. Праходзіў па адной справе са Свята-ром Іванам *Жыдком і* інш. Асуджаны 23.5.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 22.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа М. і інш. № 25893с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мынской губернші; Лнчный* ***состав*** *епархыального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**МАСЛОК Міхаіл Захаравіч** [1869, Мсціслаў Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З мяшчанскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя (1890). З 1904 служыў ва Уваскрасенскім саборы ў Оршы Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл., старшыня павятовага аддзялення Магілёўскага епархіяльнага вучылішчнага савета, законанастаўнік Аршанскай жаночай гімназіі, благачынны цэркваў 1й акругі Аршанскага пав. Арыштаваны 28.9.1927. Асуджаны 18.1.1929 асобай нарадай пры АДПУ да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.11.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Могнлевской губерннн; НАРБ,*

*ІКВР.*

**МАТЛАХАЎ (МАТЛАХОВ) Яўстрацій Георгіевіч** [1877, в. Вугольнчына Магілёўскага пав., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Да арышту служыў у прыпіснай царкве в. Літвягі Сенненскага пав. Віцебскай губ. Арыштаваны 26.2.1932. Асуджаны 3.9.1932 тройкай НКВД за ўдзел у «контррэвалюцыйнай групоўцы» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 прэзідыумам Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа М. і інш. № 10669 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.* , . ,.

**МАТФЕЙ КРЫЦУК** [Матфей Аляксандравіч; 1892, в. Карацк (Малы Карацк) Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. — канец 1950 (?), ГУЛАГ], свяшчэннамучанік. Протаіерэй. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1905 скончыў пачатковую школу. У снеж. 1914 пасля працяглай самаадукацыі вытрымаў іспыт на званне народнага настаўніка. У 1921 паступіў у Віленскую духоўную семінарыю. 23.3.1924 рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскім храме мяст. Ястрабель Навагрудскага пав., цяпер Бярозаўскі р-н Брэсцкай вобл., Пакроўскай царкве мяст. Крывошын Навагрудскага пав., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл., храме ў гонар Сергія Раданежскага в. Мілавіды Навагрудскага пав., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. У снеж. 1932 прызначаны настаяцелем Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Вялікая Лысіца (Лысіца) былога Навагрудскага пав., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. Зза нязгоды з увядзеннем польскай мовы ў набажэнства знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У 1938 сумесна з прыхаджанамі наладзіў святкаванне 950годдзя хрышчэння Русі, зза чаго на яго польскімі ўладамі заведзена следчая справа. Пасля 17.9.1939 пад наглядам НКВД. Ад арышту К. выратаваў пачатак 2й сусветнай вайны. Падчас нямецкай акупацыі

служыў у сваёй царкве. Меў вялікі аўтарытэт сярод вернікаў. Арыштаваны 28 (або 29) ліп. 1950. Абвінавачваўся ў«прыналежнасці даБНС» і ў «захоўванні забароненай рэлігійнафіласофскай літаратуры». 13.10.1950 судовай калегіяй па крымінальных справах Баранавіцкага абл. суда асуджаны да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 10.9.1993 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда Беларусі. Асабовая справа К. № 35639с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку новапакутнікаў.

Літ.: Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленных[г]ь святых н Подвнжннковь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявшнх'ь (от'ь царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнх'ь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); *Жнтгшя свяіценномученаков Манской епархіш;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**МАХНАВЕЦ (МАХНОВЕЦ) Іаан Сільвестравіч** [30.8.1894, в. Вялікая Былка Кралявецкага пав. Чарнігаўскай губ., цяпер Сумская вобл., Украіна — пасля 1962], Свята-р, брат Савы Махнаўца[1]. З сялянскай сям'і. Скончыў вясковую і настаўніцкую школы. З 1914 працаваўу царкоўнапрыходскай школе в. Забалотава Кралявіцкага пав. У 1915—18 на ваеннай службе. Пасля дэмабілізацыі працаваў на ўласнай гаспадарцы. З 1926 — на чыгунцы ў Днепрапятроўскай вобл. У пачатку 2й сусветнай вайны вярнуўся на радзіму. Пісар, сакратар вясковай управы. 23.8.1943 у Чарнігаве вытрымаў экзамен на званне Свята-ра і архіепіскапам Чарнігаўскім і Нежынскім Сімяонам (Іваноўскім) рукапаложаны ў іерэя. Служыў у с. Алтынаўка Кралявецкага рна. Арыштаваны 13.9.1943 (?). Асуджаны за «супрацоўніцтва з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» да 10 гадоў ППК. Пасля сканчэння тэрміну — у ссылцы. Вызвалены 17.9.1955 са зняццем судзімасці. У снеж. 1955 вярнуўся на радзіму. З 24.1.1956

настаяцель Свята-Троіцкай царквы с. Будзёнаўка. З 29.10.1959 служыў у Мікалаеўскім храме в. Вяркіеўка Нежынскага р-на Чарнігаўскай вобл. Узнагароджаны набедранікам (1956), скуф'ёй (1959). 29.8.1962 прыняты ў клір Мінскай епархіі і прызначаны настаяцелем Пакроўскай царквы в. Радастава Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл.

Кр.: Архіў Мшскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в 2 с 472.

**МАЦВЕЕНКА (МАЦВЕЕЙКО, МАТВЙЕНКО) Васілій Яфрэмавіч.**

**Гл.: ІААН (МАЦВЕЕНКА).**

**МАЦВЕЕЎ (МАТВЕЕВ) Серафім Мацвеевіч** [1875, Петраградская губ. — ?]. З сялянскай сям'і. Да арышту іераманах Полацкага Богаяўленскага мужчынскага манастыра. Арыштаваны 9.9.1919 у Полацку Віцебскай вобл. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці». Вызвалены 24.10.1919. Рэабілітаваны 24.10.1919 асобым аддзелам Зах. Фронту. Дапейшы лёс невядомы. Асабовая справа М. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**МАЦВІЕНКА (МАЦВИЕНКО, МАТВИЕНКО) Іаан Анісімавіч** [1906, Расія — ?], Свята-р. Арыштаваны 18.9.1937 у Гомелі. Асуджаны 30.10.1937 да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.7.1988.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**МАЦКЕВІЧ** (**МАЦКЕВИЧ**) **Іаан** [1881, в. Слаўкавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілёўскай вобл. — 10.3.1938, Мінск, турма НКВД], протаіерэй. Сын Мікалая Мацкевіча. Скончыў духоўную семінарыю. З 1912 служыў у Свята-Троіцкай царкве в. Бродаўка Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі рн. У 1920я г. настаяцель Андрэеўскага храма ў Барысаве. Арыштаваны 27.12.1937 у Барысаве па адрасе:

вул. Савецкая, д. 155. Асуджаны 30.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.9.1956 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа М. і інш. № 7096с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерннн; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67.

**МАЦКЕВІЧ (МАЦКЕВИЧ) Мікалай** [1881, в. Дабея Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р, сын Льва Мікалаевіча Мацкевіча[1]. У 1915 змяніў бацьку на яго пасадзе. Арыштаваны 29.12.1929. Праходзіў па адной справе з псаломшчыкам царквы Іванам *Валадуцкім.* Асуджаны 13.4.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа М. і інш. № 21052п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная кнажка Внтебской губерш.*

**МАЦКЕВШ (МАЦКЕВИЧ) Мікалай Сцяпанавіч. Гл.: МІКАЛАЙ МАЦКЕВІЧ.**

**МАЦКЕВІЧ (МАЦКЕВИЧ) Нікіфар Грыгор'евіч** [1887, Віцебская губ. —5.10.1937, Тара, турмаНКВД], Свята-р. Арыштаваны 29.7.1937 у г. Тара Омскай вобл. Асуджаны 29.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.11.1956 Омскім абл. судом.

Кр.: *КИНга памятіі жертв полнтыческнх репрессый Омской областн.*

**МАЦКЕВІЧ (МАЦКЕВИЧ) Уладзімір Вікенцевіч** [1859 — ?]. У 1890—1900я г. член Ігуменскага аддзялення епархіяльнага настаўніцкага савета пры Мікалаеўскім брацтве. У 1920я г. настаяцель Казанскай царквы в. Заспа Рэчыцкага пав., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл.

Арыштаваны 7.12.1929. Асуджаны 31.1.1930 да 3 гадоў высылкі ў Сібір. У 1933 тэрмін падоўжаны. Высланы ў Архангельскую вобл. Вызвалены 4.4.1936. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 9.10.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской епархіш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**МАЦЮШКІН (МАТЮШКИН) Еўдакім Фаміч** [1882 — 18.11.1942, ГУЛАГ], Свята-р. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Агародня (АгароднbackГомельская) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. У 1937 асуджаны да 10 гадоў ППК. Загінуў у канцлагеры. Рэабілітаваны 17.3.1958.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 90, л. 29; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Добрушскага раена. У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1999.

**МАЧНЁЎ (МАЧНЕВ, МОЧНЕВ) Мялецій Нікіфаравіч. Гл.: МЯЛЕЦІЙ (МАЧНЁЎ).**

**МАЧУЛЬСКІ (МАЧУЛЬСКИЙ) Сергій** [1878, в. Лаўрышава Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Мікалая Мачульскага[1] і, верагодна, брат Аляксандра Мачульскага. 3 1909служыўу РаствaБагародзіцкай царкве в. Панюшкавічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. 3 1914 настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Аздзяцічы (тагачасны паштовы адрас: ст. Чарняўка) Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Потым — ва Успенскай царкве в. Сморкі Барысаўскага пав. (з 1978 в. Зорычы Барысаўскага рна). Арыштаваны ў 1920. Неўзабаве вызвалены. Адмовіўся ад сана. Працаваў настаўнікам у школе ў в. Сморкі. Зноў арыштаваны 18.3.1933. Асуджаны 10.5.1933 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы.

Рэабілітаваны 26.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа М. № 22819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**МЕЛІЁРАЎ (МЕЛИОРОВ) Аляксій Мікалаевіч** [1869, Холм, цяпер рай-цэнтр Наўгародскай вобл., Расія — ?]. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. З 1908 служыў у РаствaБагародзіцкім храме в. Уборкі (Уборак) Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Лоеўскі р-н Гомельскай вобл., духаўнік паўднёвай часткі 1й акругі цэркваў Рэчыцкага пав. З 1915 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Вызна Слуцкага пав. Мінскай губ. (з 1923 в. Красная Слабада, цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл.), памочнік, з 1917 благачынны цэркваў 4й акругі Слуцкага пав. Арыштаваны 18.2.1930. Асуджаны 27.4.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа М. № 29016с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мынской губерннн; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**МЕЛХІСЕДЭК (ПАЕЎСКІ)** [Міхаіл Львовіч; верас. 1878, в. Вітулін Канстанцінаўскага пав. Седлецкай губ., цяпер Падляшскае ваяв., Полыпча —17.5.1931, Масква], мітрапаліт, царкоўны дзеяч. Сын Льва Сямёнавіча Паеўскага. Скончыў Сімферопальскую духоўную семінарыю (вучобу пачынаў у СанктПецярбургскай), Казанскую духоўную акадэмію (1904). Выкладаў у Магілёўскай духоўнай семінарыі, выконваў абавязкі настаяцеля Магілёвабрацкага Богаяўленскага манастыра, быў сябрам Магіпёўскага царкоўнаправаслаўнага брацтва. 18.12.1906 прызначаны настаяцелем Брацкага манастыра ў сане ігумена. Узнагароджаны паліцай. 24.1.1907 пераведзены ў Бялыніцкі манастыр Магілёўскага пав. ў сане архіепіскапа. З верас. 1907 настаяцель Херсонскага Уладзіміраўскага манастыра Таўрычаскай губ. У 1909 пераведзены ў Спаса-Праабражэнскі манастыр у г. НоўгарадСеверскі

Чарнігаўскай губ. З 1910 назіральнік Уладзікаўказскага духоўнага вучылішча. З 1914 рэктар Тыфліскай духоўнай семінарыі. 8.9.1916 хіратанісаны ў епіскапа Кранштацкага, вікарыя Петраградскай епархіі. З 17.6.1917 епіскап Ладажскі. З 1919 вікарны епіскап Слуцкі, з 1921 епіскап Мінскі і Тураўскі. Выступаў супраць абнаўленцаў, якія арганізавалі Беларускую аўтаномную праваслаўную царкву. Быў прыхільнікам стварэння Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. У маі — чэрв. 1922 выклікаўсяў АДПУз мэтай схіліць да супрацоўніцтва з абнаўленцамі. Адзін з ініцыятараў склікання 10.7.1922 сходу бел. праваслаўнага духавенства. З ліп. 1922 мітрапаліт Мінскі і Беларускі. З 1.6.1924 знаходзіўся пад следствам. Абвінавачаны ва ўтойванні царкоўнай маёмасці. Арыштаваны 22.12.1925. Вызвалены 4.5.1926. У студз. 1926 ухіліўся ў грыгарыянскі раскол. У канцы чэрв. 1926 пакаяўся перад мітрапалітам Сергіем (Страгародцавым) і падаў прашэнне аб складанні сана архіепіскапа. 4.6.1927 зноў арыштаваны. Вызвалены 17.9.1927. На Вялікдзень 1928 у сане архіепіскапа прызначаны на Енісейскую і Краснаярскую кафедру. Меў намер вярнуцца ў Беларусь. У маі 1931 выкліканы ў Маскву на Сінод РПЦ. Раптоўна памёр у час службы ў маскоўскім Дарагамілаўскім саборы.

Літ.: *Елевферnй, мнтрополшп.* Неделя в Патрнархнн. Парнж, 1933. С. 140—141; *Мартос А.,* архнепнскоп. Беларусь в нсторнческой государственной н церковной жнзнн. Мн., 1990. С. 259—262; *Працька Т.* Пакутнік за веру і бацькаўшчыну. Мн., 1996; *Гарбшскі БРД; ЭГБ,* т. 5; *Правятцне архнерен Мннской епархіш.*

**МЕЛЬНІК (МЕЛЬННК) Васілій Ананевіч** [1887, в. Лошніца Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 16.10.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета Свята-Духавай царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 15.8.1937. Асуджаны тройкай НКВД 4.10.1937 за «сістэматычнае правядзенне падрыўной работы сярод насельніцтва» да ВМП з канфіскацыяй

маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны Мінскім абл. судом 2.2.1957. Асабовая справа М. № 9993с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *НАРБ, ІКБР.*

**МЕЛЬНІКАЎ (МЕЛЬНИКОВ) Мікалай**. Беларус. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Перарост Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 34.

**МЕЛЬНІКАЎ** (МЕЛЬНИКОВ) **Сергій Аляксеевіч** [1904, в. Дзмітрыеўская (Сабалёўка) Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 3.11.1929. Асуджаны 6.3.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа М. № 14516 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**МЕЛЬЯЧЭНКА** (**МЕЛЬЯЧЕНКО**) **Гаўрыіл Фёдаравіч** [1878, в. Будзіна Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў ва Успенскім храме ў мяст. Пустынкі Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны 5.11.1937 са Свята-рамі Магілёўскай епархіі Дзмітрыем *Случаноўскім,* Антоніем *Сцяпанавым,* дыяканам Фамой *Казловым* і інш. тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.9.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа М. № 14092сн з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**МІГАЙ (МИГАЙ) Леанід** [1900, в. Дзяражычы Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Лоеўскі р-н Гомельскай вобл. — 24.3.1955, ГУЛАГ], Свята-р, службовец, сын Сергія *Мігая.* У 1920я г. служыў, верагодна, разам з бацькам. У пачатку 1930х г. працаваў рахункаводам у мяст. Нароўля. Быў жанаты, гадаваў сына Уладзіміра (н. ў 1932). Арыштаваны 23.4.1934. Асуджаны 16—17.10.1934 трыбуналам БВА як «рэзідэнт польскай разведкі» да 5 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Пазней зноў арыштаваны і асуджаны. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны Вярхоўным судом СССР 22.11.1968. Асабовая справа М. № 19751с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Пажяпгная КИНжка Мннской губерннн; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**МІГАЙ (МИГАЙ) Сергій Якаўлевіч** [1874 — ?], Свята-р, бацька Леаніда *Мігая.* Скончыў народнае вучылішча. Рукапаложаны ў дыякана (1900). Служыў у Мікалаеўскім храме в. Дзяражычы Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Лоеўскі р-н Гомельскай вобл., потым у Спаса-Праабражэнскай царкве мяст. Сноў Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. З 1909 настаяцель Свята-Іаанаўскага храма в. Хобнае Рэчыцкага пав., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. служыў у ІаанаБагаслоўскай царкве ў мяст. Нароўля Рэчыцкага пав., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Арыштаваны 21.6.1927. Асуджаны 7.10.1927 да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Вызвалены 23.5.1930. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.11.1992.

Кр.: *Лнчный состав епархыального управлення; Памятная кніїжка Мннской губернш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Нараўлянскага раена. Мн., 1998.

**МІКАЛАЙ ВАСЮКОВІЧ** [28.3.1882, в. Коскі Мінскагапав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — 26.9.1937, Мінск, турмаНКВД], свяшчэннамучанік. Сьш Васілія Васюковіча. Пасля сканчэння Мінскага духоўнага

вучылішча (1908) працаваў настаўнікам у народных школах горада. З 1913 псаломшчык царквы в. Ліцвяны, дзе Свята-ром служыў яго бацька. Пасвячоны ў дыякана. У часы бальнавіцкага панавання вылучаўся прынцыповым стаўленнем да пытанняў веры. У адну з начэй 1930 мясцовыя пракамуністычныя актывісты спалілі царкву ў Ліцвянах. Назаўтра М. публічна заявіў: *«Хіба гэта ўлада, калі пры ўладзе бальшавікі. Гэта не людзі ...>, а банда прайдзісветаў, якія здзекуюцца над праваслаўным народам!»* У 1936, калі праводзіўся прымусовы подпіс на дзяржаўную пазыку, М. пры сведках адмовіўся ад набыцця аблігацый: *«Падпісвацца не буду, няма патрэбы ўмацоўваць гэтую ўладу».* Вядома, такія словы яму не маглі дараваць. Арыштаваны Уздзенскім раённым аддзелам НКВД 6.8.1937. Асуджаны тройкай НКВД 16.9.1937 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 23.3.1989. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

**МІКАЛАЙ МАЦКЕВІЧ** [Мікалай Сцяпанавіч; 4.5.1878, Барысаў Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — пасля 1937, ГУЛАГ]. свяшчэннамучанік. Беларус. Скончыў Слуцкае духоўнае вучылішча, Мінскую духоўную семінарыю (1899), рукапаложаны ў іерэя (1900). З 1901 настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Парэчча Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. З 1911 павятовы назіральнік царкоўнапрыходскіх школ пры Барысаўскім Уваскрасенскім саборы. У 1920я г. настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Бродаўка Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі рн. Арыштаваны ў 1933. Праз месяц вызвалены. Служыў у Андрэеўскім храме ў Барысаве (верагодна, да канца 1933). Неаднаразова выклікаўся ў АДПУ. Ад Свята-ра патрабавалі публічна адмовіцца ад сана. Зноў арыштаваны 15.8.1937 у Барысаве па адрасе: вул. Калгасная, д. 21. На допытах вінаватым сябе не прызнаў. 30.11.1937 тройкай НКВД асуджаны да 10 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны пракуратурай БССР

30.4.1989. Асабовая справа М. № 23534с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

**МІКАЛАЙ (ПАКРОЎСКІ) [**Мікалай Уладзіміравіч; 1851, Суздаль Уладзімірскай губ., цяпер рай-цэнтр Уладзімірскай вобл., Расія — 18.7.1933], архіепіскап. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў СанктПецярбургскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Да 1902 выкладаў у мужчынскай і жаночай гімназіях Уладзіміра. З 1902 служыў ва Уваznясенскай царкве горада. Узнагароджаны санам протаіерэя. У чэрв. 1919 хіратанісаны ў епіскапа Глазаўскага, вікарыя Вяцкай епархіі, з 1921 епіскап Табольскі. 12.4.1925 падпісаў акт аб перадачы вышэйшай царкоўнай улады мітрапаліту Круціцкаму Пятру (Палянскаму), месцазахавальніку Патрыяршага прастола РПЦ. З 1925 епіскап Пскоўскі. З 1927 у ссылцы. У крас. 1929 заняў ПолацкаВіцебскую кафедру. Арыштаваны 24.3.1931 у Віцебску па адрасе: вул. Тадулінская, д. 14. Асуджаны 14.7.1932 з 15 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. З лют. 1933 да 5(18).7.1933 кіраваў Іжэўскай епархіяй. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 12.9.1989. Групавая справа М. І інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**МІКАЛАЙ (ШАМЯЦІЛА)** [1877, в. Аброва Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 23.6.1933, Мінск, турма АДПУ], епіскап. Са шматдзетнай сям'і Іаана Шамяцілы[1], брат Феафана *ІПамяцілы,* Якава Шамяцілы, бацька Барыса *Шамяцілы.* Беларус. Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча, у ліку лепшых Мінскую духоўную семінарыю (1897?). Ажаніўся. Рукапаложаны ў іерэя (1899). Прызначаны настаяцелем у ПараскеваПятніцкую царкву в. Мясяцічы Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер вёска Шнскага р-на Брэсцкай вобл. З 1902 выкладаў Закон Божы ў Мінскім жаночым вучылішчы

на вул. Шырокай. З 1903 настаяцель Свята-Троіцкага храма в. Белавуша Пінскага пав., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. У 1904 паступіў у Маскоўскую духоўную акадэмію, якую скончыў (з Міхаілам *Валасевічам,* Паўлам Фларэнскім) са ступенню кандыдата багаслоўя (1908). Вярнуўся ў Беларусь. Служыў у Міхайлаўскай царкве ў Востраве, прадмесці Слуцка. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй, камілаўкай, нагрудным крыжам. 22.4.1914 прызначаны настаяцелем Слуцкага Мікалаеўскага кафедральнага сабора, старшынёй Слуцкага аддзялення Епархіяльнага вучылішчнага савета з наданнем сана протаіерэя. У перыяд польскасавецкай вайны 1919—20 падтрымліваў кантакты са Слуцкім беларускім нацыянальным камітэтам, культурнаасветніцкім таварыствам «Папарацькветка». Выказваў ідэі бел. нацыянальнага адраджэння. У пачатку 1920х г. ідэйна зблізіўся з прыхільнікамі аўтакефаліі праваслаўнай царквы Беларусі епіскапам Бабруйскім *Філарэтпам* (Раменскім), Свята-ром Уладзімірам *Бірулям* і інш. У сак. 1923 мітрапалітам Мелхіседэкам (Паеўскім) хіратанісаны (як удовы протаіерэй) у епіскапа Слуцкага, вікарыя Мінскай епархіі. Арыштаваны 21.8.1926. Абвінавачваўся ў «захоўванні вершаў С.Ясеніна антысавецкага зместу». У верас. 1926 вызвалены пад падпіску аб нявыездзе. Следчая справа закрыта ў чэрв. 1927 зза недаказанасці абвінавачання. У ліп. 1927 у епіскапа здарыўся інсульт з частковай паралізацыяй. Зноў арыштаваны 13.3.1933 у Слуцку па адрасе: Сялянскі зав., д. 5. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі Слуцкага вікарыяцтва асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную прапаганду і агітацыю» і як «кіраўнік Слуцкага контррэвалюцыйнага філіяла арганізацыі «Езуіт» да 8 гадоў ППК. Закатаваны ў Мінскай унутранай турме АДПУ. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ш. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

25.4.1933 органы АДПУ арыштавалі Феадору Пранько (н. ў 1865), сястру епіскапа Мікалая. Неўзабаве яна была асуджана да высылкі за межы БССР. Далейшы яе лёс

невядомы.

**МІКЛУІН** (**МИКЛУИН**) **Віктар Вікенцевіч** [1876, в. Блужа Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 1933 (?), Магілёў, НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту настаяцель прыпісной царквы в. Селішча Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 23.2.1933. Асуджаны 21.4.1933 з шэрагам актыўных прыхаджан (усяго каля 10 чалавек) калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.6.1961 пастановай прэзідыума Магілёўскага абл. суда. Групавая справа М. і інш. № 7436сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**МІЛАНОВІЧ** (**МИЛАНОВИЧ**) **Васілій Андрэевіч** [1877, в. Недраска Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 21.10.1937, Гомель, турмаНКВД]. У 1920я г. настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Дземяхі Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны ў 1932. Вызвалены ў 1933. Зноў арыштаваны 14.9.1937. Прыгавораны 16.10.1937 тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.10.1989.

5.11.1937 у в. Дземяхі арыштавана Мілановіч Ганна Васілеўна (н. ў 1872 у в. Міхалькі, цяпер Гомельскі рн), жонка Свята-ра. 30.11.1937 асуджана асобай нарадай пры НКВД да 10 гадоў ППК. Этапавана, хутчэй за ўсе, у Акмолінскі канцлагер НКВД Казахскай ССР. Загінула ў зняволенні 27.12.1941. Рэабілітавана 13.9.1965.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**МІЛАЎЗОРАЎ (МИЛОВЗОРОВ) Андрэй Васілевіч** [1875, в. Навасёлкі Спаскага пав. Разанскай губ., цяпер Спаскі р-н Разанскай вобл., Расія — ?]. Рускі. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў настаяцелем царквы в. Клапы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер

тэрыторыя (вёска не існуе) Ушацкага р-на Віцебскай вобл. Арыштаваны 7.1.1933. Асуджаны 1.2.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа М. № 20365п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

*Кр..НАРБ.ІКБР.*

**МІЛЕР** (**МИЛЛЕР**) **Юліян Фёдаравіч** [18.6.1891, Жытомір, цяпер Украіна — ?], протаіерэй. Украінец. З сям'і вайскоўца. Скончыў Жытомірскую духоўную семінарыю. З 1.10.1910 служыў псаломшчыкам у Жытомірскім кафедральным саборы. Ажаніўся з дачкой генералмаёра генштаба Расійскай арміі Нінай Фастыкоўскай (н. ў 1911), меў двое дзяцей. 18.9.1911 рукапаложаны ў дыякана. З 1914 санітарамдабраахвотнікам 1й роты 408 Кузнецкага палка ўдзельнічаў у 1й сусветнай вайне. Узнагароджаны Георгіеўскім крыжам і медалём «За мужнасць». У 1917 пераведзены пазаштатным дыяканам у Бранскі ваенны шпіталь, скончыў фельчарскія курсы. 6.12.1918 Жытомірскім епіскапам Аверкіем (Кедравым) рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве Гданьска (Польшча). У 1919 прызначаны настаяцелем храма ў мяст. Мацыёва на Валыні. У 1920 пераведзены ў царкву мяст. Несухонжы Гродзенскага пав., цяпер Полыпча. З 1922 настаяцель Міхайлаўскага храма в. Вітонічы Луцкага пав. Валынскай епархіі. З 1925 служыў у РастваБагародзіцкай царкве в. Таракані Кобрынскага пав., цяпер в. Суботы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. Скончыў фт тэалогіі Віленскага ун-та. З 1927 настаяцель храма мяст. Курашэва Бельскага пав., цяпер Польшча. У 1935 перамешчаны ва Успенскую царкву в. Лаўрышава, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З 1937 псаломшчык Свята-Сергіеўскага храма в. Мілавіды, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1939 настаяцель АляксандраНеўскай царквы в. Сталовічы, цяпер Баранавіцкі рн, Занёманскага храма ў Гродне. Узнагароджаны паліцай (1940), нагрудным крыжам з упрыгожаннямі (1943). Арыштаваны 13.12.1944. Асуджаны

ваенным трыбуналам войск НКВД 7.6.1945 за «антысавецкую агітацыю» і «пасобніцтва немцам» да 10 гадоў ППК. Вярнуўся ў Гроднаў 1954. З 29.4.1955 — другі Свята-р Анненскай царквы ў Стоўбцах Мінскай вобл. З 31.8.1955 настаяцель Свята-Сергіеўскага храма в. Мілавіды. З 8.6.1956 настаяцель ПараскеваПятніцкай царквы в. Дзевяткавічы Слонімскага р-на Гродзенскай вобл. 12.12.1957 забаронены ў свяшчэннаслужэнні і 20.12.1957 пазбаўлены сана (і як следства — пенсіі) зза паўторнага шлюбу і выведзены з кліра МінскаБеларускай епархіі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Гродзенскім абл. судом 8.10.1992. Асабовая справа М. № п15355 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 463.; *Черепыца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненгцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 257—258. Гродно, 2000.

**МІРАЛЮБАЎ (МИРОЛЮБОВ) Грыгорый Фёдаравіч** [1873, в. Востраў Слонімскага пав. Гродзенскай губ. — 14.12.1929, Масква, НКВД], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1910я г. служыў у Міхайлаўскай царкве в. Кісялёўцы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны 2.9.1929 у в. Ачка Сергацкага р-на Ніжагародскай вобл. Асуджаны паводле пастановы калегіі АДПУ 3.12.1929 за «контррэвалюцыйную прапаганду» да ВМП. Расстраляны і пахаваны разам з інш. ахвярамі на Ваганькаўскіх могілках. Рэабілітаваны 30.1.1993.

**МІРАНОВІЧ (МИРОНОВИЧ) Вячаслаў Аляксандравіч** [1877, мяст. Перабороддзе Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. У 1910я г. служыў у Пакроўскай царкве в. Богінь (Богіна) Дзісенскага пав., цяпер Браслаўскі рн. Арыштаваны 1.12.1929ув. Будзёная Белгародскай вобл. Асуджаны 28.12.1929 асобай нарадай АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да

3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.10.1994.

Кр.: *Пажятнал КИНжка Вцленской губертш; Кнша памятн Белгородской обл.*

**МІРАШНІЧЭНКА** (**МИРОШНИЧЕНКО**) **Дзімітрый Кірылавіч** [1888, Казінцы Палтаўскай губ., цяпер Украіна — ?], протаіерэй. Украінец. З сялянскай сям'і. 16.4.1914 прызначаны псаломшчыкам ПетраПаўлаўскай царквы в. Гаруцішкі Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. Падчас арышту настаяцель храма в. Вялікае Сяло Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі рн. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 18.2.1932. Асуджаны 15.4.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Вызвалены ў 1934. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа М. і інш. № 34309с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Дзяржынскагараена. Мн., 2004.

**МІРКОВІЧ** (**МИРКОВИЧ**) **Сергій Андрэевіч** [1877, в. Гутава (Гутаў) Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. — 31.12.1937, Яраслаўль, турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 11.10.1937 у в. Спас Пераслаўскага р-на Яраслаўскай вобл. Асуджаны тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.5.1989.

Кр. : *Не предать забвенню. Ярославль.*

**МІРОНАЎ** (**МИРОНОВ**) **Макар Фёдаравіч** [1878, Віцебская губ. (?) — 5.1.1938, Калінінская вобл., турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 21.12.1937 ув. Завідаўская Горка Калінінскай вобл. Асуджаны 30.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.3.1989 Цвярской абл. пракуратурай.

Кр.: *Кнша памяігш жерте полнтнческых репресснй Калнннноской областн.*

**МІСКЕВІЧ** (МИСКЕВИЧ) **Мікалай Уладзіміравіч** [1879, в. Белае Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 14.2.1938 у Красным Халме Цвярской вобл., Расія. Асуджаны 26.2.1938 тройкай НКВД па Калінінскай вобл. за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 16.1.1989. Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**МІСЮК (МИСЮК) Максім Фёдаравіч** [1874, Гродзенская губ. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 1.3.1930 у в. Манок Аскізскага р-на Хакаскай вобл. Асуджаны 26.4.1930 за «контррэвалюцыйную дзейнасць сярод вернікаў» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны паводле пастановы пракурора Краснаярскага краю 12.12.1989.

Кр.: *Кнша памятн жертв полнтнческнх репресснй Республпкн Хакасыя.*

**МІСЯЮК (МИСЕЮК, МИСЯЮК) Анатолій Іванавіч** [1917, в. Старая Рудня, цяпер Гараднянскі р-н Чарнігаўскай вобл., Украіна — пасля 1991], Свята-р. Беларус. З сям'і псаломшчыка, потым Свята-ра Гродзенскай епархіі. Вучыўся ў Бельскай і Дзярэчынскай (над Бугам) гімназіях, на медыцынскім фце Варшаўскага ун-та. Працаваў настаўнікам. З пачаткам 2й сусветнай вайны — псаломшчык Спаса-Праабражэнскага храма в. Дзярэчын (цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл.), дзе настаяцелем быў яго бацька. У 1942 рукапалажаны ў сан дыякана, у верас. 1943 — Свята-ра. Накіраваны ў РаствaБагародзіцкую царкву ў в. Масаляны, цяпер Бераставіцкі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 28.11.1945. Асуджаны 4.12.1946 Гродзенскім абл. судом за «антысавецкую агітацыю» і «пасобніцтва немцам» да 7 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. У снеж. 1991 жыў у г. Рыга. Рэабілітаваны 31.7.1992 Вярхоўным судом Беларусі. Асабовая справа М. № п19304 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Черепнца В.Н.* Очеркн нсторнн

Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 258—259. Гродно, 2000.

**МІТРАФАН (КРАСНАПОЛЬСКІ)** [Дзмітрый Іванавіч; 22.10.1869, в. Мікалаеўка Біргочанскага пав. Варонежскай губ. — 6.7.1919, ЧК], свяціцель, архіепіскап, царкоўны дзеяч. З сялянскай сям'і. У 1884 пасля заканчэння Біргочанскага духоўнага вучылішча паступіў у Варонежскую духоўную семінарыю (скончыў у 1890). Рукапаложаны ў дыякана. У 1893 паступіў у Кіеўскую духоўную акадэмію. Пасля смерці жонкі прыняў манашаскі пострыг (21.8.1896) з імем Мітрафан. У 1897 скончыў духоўную акадэмію, рукапаложаны ў іераманаха і накіраваны служыць інспектарам Іркуцкай духоўнай семінарыі. Узнагароджаны набедранікам, нагрудным крыжам. У 1902 прызначаны рэктарам Магілёўскай духоўнай семінарыі і ўзведзены ў сан архімандрыта. З 1906 член новазацверджанага епархіяльнага місіянерскага савета. 11.2.1907 у Свята-Троіцкім саборы АляксандраНеўскай лаўры СанктПецярбурга адбылася архіерэйская хіратонія М. ў епіскапа Гомельскага, вікарыя Магілёўскай епархіі. Адначасова прызначаны настаяцелем МагілёваБрацкага манастыра. У тым жа годзе выбраны ў III Дзяржаўную думу. Узнагароджаны ордэнамі св. Анны I (1911) II ступені (1905), св. Уладзіміра III ступені (1908). 9.11.1912 прызначаны епіскапам Мінскім і Тураўскім. Ва ўмовах 1й сусветнай вайны працягваў кіраваць Мінскай епархіяй, клапаціўся пра богаслужэнні ў храмах ваеннай зоны. У 1916 прызначаны епіскапам Астраханскім і Енатаеўскім. У Астраханскай епархіі таксама ўзначальваў місіянерскую дзейнасць. З 1917 іменаваўся архіепіскапам Астраханскім і Цараўскім. У 1918 узведзены ў сан архіепіскапа. Арыштаваны карнымі органамі савецкай улады 25.5.1918. Расстраляны без суда і следства. У 2002 св. Сінод Беларускага Экзархата пастанавіў далучыць архіепіскапа Мітрафана да ліку Сабора Беларускіх Святых.

Кр.: *Степанов (Русак) В.* Свндетельство обвннення. 1993. Т. 1. С. 181; *Правяцне архнереы Мімской епархіш;*

Православный календарь на 2004 год. Сост. *Кулаженко Л. Е., Матрунчнк Т.А.* Мн., 2003. С. 91. . ,

**МІХАІЛ НАВІЦКІ** [1889, в. Сіманічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. — 30.4.1935, Узда], сввяшчэннамучанік. Протаіерэй. Адзін з 13 дзяцей протаіерэя Канстанціна Навіцкага[1]. Скончыў гісторыкафілалагічны фт Санкт-Пецярбургскага ун-та. З 1914 выкладчык лацінскай мовы і гісторыі ў Мінскай мужчынскай гімназіі. У тым жа годзе ажаніўся з Зіновіяй Корзун, дачкой протаіерэя Мікалая Феафілавіча Корзуна (бацька Анатолія *Корзуна).* З 1915 яны знаходзіліся ў бежанстве ў Омску, Расія. Вярнуліся ў Мінск у канцы 1919. У лют. 1920 вікарным епіскапам Слуцкім *Мелхіседэкам* (Паеўскім) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем у ПетраПаўлаўскую царкву ў мяст. Узда Ігуменскага пав. Мінскай губ. У сярэдзіне 1920х г. благачынны цэркваў 2й акругі Ігуменскага пав. У 1933 савецкія ўлады храм зачынілі і Н. перайшоў служыць у маленькую старожку, што стаяла на царкоўным пагосце. Улады прапанавалі Свята-ру адрачыся ад Бога, але ён адмовіўся. У крас. 1935 да яго нечакана з'явіўся незнаёмец і стаў патрабаваць аддаць царкоўныя каштоўнасці. М. не аддаў і быў збіты да паўсмерці. Праз некалькі дзён ён памёр. Жонка засталася адна з пяццю дзецьмі. Неўзабаве яна была выслана. У 1939 у Фінскую вайну загінуў старэйшы сын Свята-ра Георгій. З 2й сусветнай не вярнуўся другі яго сын Васіль. 10.10.1942 трэці сын Свята-ра Мікалай закрыў сваім целам амбразуру нямецкага дзота. 31.3.1943 яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Дачка Свята-ра Наталля ўдзельнічала ў баях на Ленінградскім фронце. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы М. кананізаваны і далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

**МІХАІЛ ПЛЫШЭЎСКІ** [1.11.1862, в. Варонічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 19.8.1937, Мінск, турмаНКВД], свяшчэннамучанік. Сын Пятра Плышэўскага. Скончыў Мінскае духоўнае

вучылішча (1881), Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1890). З 1893 настаяцель Пакроўскай царквы в. Пагарэлае (тагачасны паштовы адрас: ст. Лапічы) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1912 служыў у Ільінскім храме в. Шацк Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі рн. 25.7.1914 духавенствам цэркваў 2й акругі Ігуменскага пав. выбраны на трохгадовы тэрмін дэпутатам на епархіяльны з'езд. Узнагароджаны нагрудным крыжам (1917). З прыходам да ўлады бальнавікоў шмат разоў арыштоўваўся: у 1929 (прабыў у зняволенні 1 год і 6 месяцаў), у 1932 (3 месяцы), у 1933 (3 тыдні). У чацвёрты, апошні раз, арыштаваны 17.7.1937. Пад следствам знаходзіўся ў Чэрвеньскай турме НКВД. Свята-ру прапаноўвалі адмовіцца ад сана, але ён гэтага не зрабіў. Асуджаны 12.8.1937 са Свята-ром Іаанам *Варанцом,* старастам царквы Аляксандрам *Шпакоўскім* тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 21.3.1989 пракуратурай БССР. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў. Групавая справа П. і інш. № 21266с з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губерніш; Памятпная кныжка Мынской епархіш; Лычный состав епархыального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67; Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленныхь святых н Подвнжннков<sup>г</sup>ь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявшнх'ь (огь царствованія царямученнка НІІколая II Александровіча і до нашнх'ь дней). СПб., 2001. Т. 2 (август'ьдекабрь); *Жытня свяіценномученыков Мынской епархіш.*

**МІХАІЛ (ПОСТНІКАЎ)** [Міхаіл Сцяпанавіч; 30.9.1878, Варонеж, Расія — пасля 1947], епіскап. Скончыў Варонежскую духоўную семінарыю (1900), 2 курсы медыцынскага фта Томскага ун-та, Яраслаўскі (Дзямідаўскі) ліцэй са ступенню кандыдата права (1904), гісторыкафілалагічны фт Маскоўскага ун-та са ступенню

магістра гістарычных навук (1911). Працягваў адукацыю за мяжой. Да 1920 працаваў у наркамаце народнай адукацыі. Аўдавеў. Пастрыжаны ў расафор. 20.3.1920 рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Казанскай царкве с. Усмані Варонежскай епархіі. У 1922 ухіліўся ў абнаўленчы раскол і прызначаны ўпаўнаважаным па Варонежскай епархіі ў сане протаіерэя. 14.10.1922 хіратанісаныў епіскапа Вольскай вікарнай кафедры. Са снеж. 1924 часова кіруючы Пскоўскай епархіяй, з 20.2.1925 — ВялікаУсцюжскай, з 10.3.1925 — Уральскай. 14.5.1927 узведзены ў сан архіепіскапа (абнаўленчага). З 1928 архіепіскап Касімаўскі, вікарый Разанскай епархіі. З 1929 узначальваў Разанскую, з 27.11.1931 — Калінінскую епархіі. 26.12.1931 звольнены на пакой, жыў у Разані. 2.9.1932 заняў Віцебскую кафедру (абнаўленчую). Арыштаваны супрацоўнікамі АДПУ БССР 10.3.1933. Асуджаны да 5 гадоў ППК. З 1942 юрысконсульт Маскоўскага епархіяльнага ўпраўлення. У 1943 пасля пакаяння прыняты ў зносіны з кананічнай Царквой у сане епіскапа. У лют. 1944 прызначаны кіруючым Архангельскай епархіяй, з ліп. 1944 — епіскап Пензенскі і Саратаўскі, з 27.1.1947 — Іванаўскі і Шуйскі. 19.6.1947 звольнены на пакой. Арыштаваны 25.6.1947 у Іванаве. Асуджаны да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Крнвонос Ф., свягц.* МученнческКИЙ н нсповеднннческКИЙ подвнг Могнлевскнх святнтелей XX века: Феодосня (Ваіцннского), сіцмч. Павлнна (КрошечКИНа), Александра (Раевского). Мн., 2002. С. 13;

**МІХАІЛ (СВІДЗЕРСКІ)** [Міхаіл Фадзеевіч; 28.3.1883, Віцебская губ. — 28.9.1937, Смаленск, турма НКВД], мітрапаліт (абнаўленчы). Беларус. Скончыў Кіеўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Ажаніўся, рукапаложаны ў іерэя (1903). Служыў у Свята-Духавай царкве в. Высачаны Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. З 1913 назіральнік Мсціслаўскага духоўнага вучылішча. З 1915 дырэктар Мсціслаўскага музея старажытнасцей. У 1917 прызначаны дырэктарам Мсціслаўскай прыватнай гімназіі. З 1921

Kamunikat.org

павятовы місіянер, зноў служыў у Высачанах. У 1922 ухіліўся ў абнаўленчы раскол. 8.7.1923 хіратанісаны ў епіскапа ВеліжскаВысачанскага, вікарыя Віцебскай епархіі. З 1924 — епіскап Веліжскі, Невельскі і Высачанскі. Узведзены ў сан архіепіскапа (1926). З 1930 архіепіскап Вялікалуцкі, з 1934 Смаленскі, кіруючы Зах. мітраполіяй. Узведзены ў сан мітрапаліта. Са снеж. 1935 мітрапаліт Смаленскі (абнаўленчы). Арыштаваны 2.2.1937. Асуджаны 17.9.1937 з інш. свяшчэннаслужыцелямі тройкай НКВД за «ўдзел ва ўзброеным паўстанні» і «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Пажятная КИНжка Могнлевской губерніш; СмоленсКИЙ мартнролог.*

**МІХНЮК (МИХНЮК) Антоній Ульянавіч** [1911, Гродзенская губ. (?) — пасля 1976]. З 1938 служыў псаломшчыкам у Георгіеўскай царкве в. Валавель, цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. З 1944 дыякан Уваскрасенскага храма мяст. Антопаль Драгічынскага рна. З 1945 працягваў служыць у МінскаБеларускай епархіі. З 1957 настаяцель храма ў г. Мглін Арлоўскай епархіі. З 1958 — у ПетраПаўлаўскай царкве в. Косічы Брэсцкага рна. Арыштаваны ў 1961. Асуджаны да 3 гадоў ППК. Выключаны з кліра Мінскай епархіі. Вызвалены датэрмінова ў 1963. Служыў рэгентам у адной з цэркваў Бранска. Пасля вяртання на радзіму (1965) — у розных прыходах Мінскай епархіі, у тым ліку ў Пакроўскім саборы ў Баранавічах Брэсцкай вобл., ПетраПаўлаўскай царкве ў Кобрыне Брэсцкай вобл. З 27.11.1972 на пенсіі.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 531.

**МІЦКЕВІЧ** (**МИЦКЕВИЧ**) **Уладзімір Уладзіміравіч** [31.7.1886, в. Ворань Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Віцебскае духоўнае вучылішча (1908). З 1911—12 другі Свята-р Свята-Троіцкай царквы в. Зайкава Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер

Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. У 1930я г. служыў у Свята-Троіцкай царкве ў мяст. Янавічы, цяпер Віцебскі рн. Арыштаваны 12.1.1937. Асуджаны 15.11.1937 з архіерэем ПолацкаВіцебскай епархіі *Гаўрыілам* (Свідзерскім), Свята-ром ПолацкаВіцебскай епархіі Іосіфам *Гусаковым,* старастам царквы ў Яновічах Іванам *Старычэнкам,* актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа М. і інш. № 20107п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Пажятная кныжка Внтебской губерншї; БНДЦЭД.*

**МІЦУЛЯ** (**МИЦУЛЯ**) **Іаан Савіч** [1881 — 27.9.1937, Мазыр, турма НКВД]. Служыў у ПараскеваПятніцкай царкве ў в. Вялікія Аўцюкі (Аўцюцэвічы) Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Калінкавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Калінкавіцкага раена. Мн., 1999.

**МУЛЕР** (**МУЛЛЕР**) **Грыгорый Аляксандравіч** [1888, Смаленская губ. — 27.10.1937, Смаленск, НКВД], Свята-р. Беларус. У пачатку 1900х г. паслушнік Магілёўскага архіерэйскага дома. 31.3.1906 вытрымаў экзамен на званне псаломшчыка і прызначаны ў Мікалаеўскую царкву в. Рымінка Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі рн. У 1910—13 вучыўся ў СанктПецярбургскай духоўнай акадэміі. Арыштаваны 26.7.1937 у Хіславіцкім р-не Смаленскай вобл. Асуджаны 18.10.1937 са Свята-ром Іаанам *Курневічам,* дыяканам Васіліем *Пашыным* тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Кр.: *Смоленскый марпгыролог.*

**МУЛЕР** (**МУЛЛЕР**) **Леў Аляксандравіч** [1887, Магілёў — 30.6.1952], протаіерэй. У 1910—13 вучыўся ў СанктПецярбургскай духоўнай акадэміі. 3 ліст. 1913

епархіяльны місіянер і прапаведнік Мінскай епархіі. У 1914—15 выкладаў у мінскіх навучальных установах. З другой паловы 1915 служыў у Міністэрстве шляхоў зносін. З 1918 да крас. 1922 у Наркамаце шляхоў зносін. 7.5.1922 рукапаложаны ў іерэя. Служыў настаяцелем царквы каля ст. Ушакі Наўгародскай губ., цяпер Тосненскі р-н Ленінградскай вобл. (1922—1924), Пакроўскага храма с. Рыбацкае Ленінградскага р-на (1925—30), Крыжаўздзвіжанскай царквы на Петраградскай старане (да лют. 1932), КнязьУладзімірскага сабора (да 14.11.1936) у сане протаіерэя, Богаяўленскага сабора (да 5.2.1937), Афонскай царквы Новадзявочага манастыра ў СанктПецярбургу (да 22.4.1937), грэчэскага храма вялікамучаніка Дзмітрыя Салунскага (да 30.8.1937), ІаанаПрадцечанскай царквы на Лігаўскам праспекце (да 10.11.1937), зноў КнязьУладзімірскага сабора (да 4.3.1938). У далейшым, паводле некаторых звестак, рэпрэсаваны.

Літ.: *СанкпгПетербургской епархіш Снноднк.*

**МУРАВЕЙКА (МУРАВЕЙКО) Аляксей Фёдаравіч** [1874 або 1875, в. Таль Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. — пасля крас. 1933, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1930я г. стараста Свята-Троіцкай царквы в. Таль. Арыштаваны 22.3.1933. Асуджаны 21.4.1933 з настаяцелем царквы *Сергіем* Радакоўскім паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 27.12.1989. Асабовая справа М. № 29903с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Літ.: *БНДЦЭД; Жнтня свяіценномученнков Мннской епархіш.*

**МУХІН (МУХИН) Грыгорый Андрэевіч** [1874, в. Валачок, цяпер Дарагабужскі р-н Смаленскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД]. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Шмат гадоў служыў настаяцелем у цэрквах Раслаўля Смапенскай

вобл. Быў жанаты на Мухінай Любові Паўлаўне, меў трох сыноў: Міхаіла (бухгалтар, жыў у г. Ельня Смаленскай вобл.), Аляксандра (жыў у г. Пачынок Смаленскай вобл.), Івана (месцажыхарства невядома). У 1935 архіепіскапам Смаленскім Серафімам накіраваны ў Віцебск. Арыштаваны 19.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 2я Фрунзе, д. 11а. Асуджаны 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэннаі царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа М. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віпебскай вобл.

*Кр..НАРБ, ІКБР.*

**МУШТУКОВА** (МУШТУКОВА) **Марыя Кірылаўна** [1882, Горкі Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 4.4.1932 у Оршы Віцебскай вобл. Асуджана 9.8.1932 з інш. манахінямі, манахамі, царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 9.2.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа М. і інш. № 6739п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.* ""'

**МЯЖУЕВА (МЕЖУЕВА) Васіліса Прохараўна** [1888, в. Нарэйкава, цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 19.6.1932 у в. Нарэйкава. Асуджана 9.8.1932 з інш. манахінямі, манахамі, царкоўнымі служачымі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лес невядомы. Рэабілітавана 9.2.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа М. і інш. № 6739п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**МЯЖЫНСКІ (МЕЖИНСКИЙ) Нікіта Харытонавіч** [1882, в. Васдльеўка Кіеўскай губ., цяпер Украіна — ?]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў настаяцелем царквы ў Тушкава Горацкага р-на Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 2.5.1933. Асуджаны 31.10.1933 з шэрагам актыўных прыхаджан асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду супраць калгасаў» да 5 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 24.10.1989 пракуратурай Магілеўскай вобл. Асабовая справа М. № 11561 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

*Кт?.: НАРБ, НКБР.*

**МЯЛЕЦІЙ (МАЧНЁЎ)** [Мяленцій Нікіфаравіч; 1879 ці 1881, в. Зяленая Тамбоўскай губ., Расія — 7.10.1937, Віцебск, турмаНКВД], архімандрыт. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту служыў у Віцебскай Сімяонаўскай царкве. Арыштаваны 11.1.1932 у Віцебску па адрасе: вул. Троіцкая, д. 34. Асуджаны 14.7.1932 з 15 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Пасля вызвалення вярнууся ў Віцебск. Узведзены ў сан архімандрыта. Зноў арыштаваны 18.9.1937 у Віцебску па адрасе: пр. Бебеля, д. 16. Прыгавораны 28.9.1937 з 40 свяшчэннаі царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Па першай справе рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Па другой 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Справы М. захоўваюцца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**МЯТЛІЦКІ (МЕТЛИЦКИЙ) Міхаіл Андрэевіч** [1878 або 1885, в. Астрагляды Рэчыцкага пав. Магілеўскай губ., цяпер Брагінскі р-н Гомельскай вобл. — 21.7.1938, Гомель, турма НКВД]. Скончыў народную школу (1899). Вытрымаў экзамен на званне псаломшчыка пры Мінскай духоўнай семінарыі (5.6.1908). З 10.12.1912 служыў у Свята-

Kamunikat.org

Антоніеўскай царкве ў мяст. Рубяжэвічы Мінскага пав., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў дачку Алену (н. 9.11.1904), сына Уладзіміра (10.5.1907). У 1920я г., верагодна, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у адной з цэркваў Гомеля. Арыштаваны 3.3.1938. Асуджаны тройкай НКВД 25.5.1938 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989. •

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хронікгс'Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**НАВІЦКІ** (**НОВИЦКИЙ**) **Валерыян Васілевіч.** Гл.: **ВАЛЕРЫЯН НАВІЦКІ.**

**НАВІЦКІ** (**НОВИЦКИЙ**) **Леанід** [1887 — ?]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913), рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Какуевічы Рэчыцкага пав., Мінскай губ., з 20.4.1939 в. Чкалава Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1925. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67;

**НАВІЦКІ** (**НОВИЦКИЙ**) **Міхаіл Канстанцінавіч. Гл.: МІХАІЛ НАВІЦКІ.**

**НАВІЦКІ** (**НОВИЦКИЙ**) **Сяргей Васілевіч. Гл.: ВЕНІЯМШ (НАВІЦКІ).**

**НАЗАРАНКА** (**НАЗАРЕНКО**) **Елісей Пятровіч** [1883, в. Гардуны Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. — 1.11.1937, Гомель, турма НКВД]. Пасля сканчэння пастырскіх курсаў, рукапаложаны ў іерэя. 3 1913 служыў у АляксандраНеўскай царкве в. Ніўкі Гомельскага пав. , цяпер Добрушскі р-н . У 1920я г. настаяцель Свята-Троіцкага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны ў в. ПясочнаяБудаГомельскагапав., цяпер Гомельскі рн. Асуджаны ў студз. 1930 да 5 гадоў ППК. Вызвалены 22.8.1933 датэрмінова. Зноў арыштаваны 6.8.1937 у Гомелі. 30.10.1937 прыгавораны да ВМП.

Расстраляны. Рэабілітаваны 11.7.1988.

Кр.: *Пажятная КІНжка Могнлевской губерншї;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 89, л. 8; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Добрушскага рна. У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1999.

**НАРАНОВІЧ** (**НАРАНОВИЧ**) **Мікалай** [1892, в. Глівін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Аляксія Нарановіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913). Служыў у адным з храмаў Мінскай губ. (?). У 1930я г. працаваў настаўнікам у няпоўнай СІП у мяст. Смалявічы Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 11.2.1935. Асуджаны 11.5.1935 з шэрагам настаўнікаў мяст. Смалявічы і Жодзіна пазасудовым органам НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 24.7.1957. Групавая справа Н. і інш. № 14740 захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**НАРАНОВІЧ (НАРАНОВИЧ) Феадосій Аляксандравіч** [1880, в. Волма Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. З 1905 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Раманава Слуцкага пав. Мінскай губ. (з 1921 — в. Леніна Слуцкага р-на Мінскай вобл.) З 1913 служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Дарасіно Слуцкага пав., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. Падчас арышту настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Замошша (Замошская Слабада) Любанскага рна. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 3.10.1932. Асуджаны 2.12.1932 з актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Н. і інш. № 27142с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш.*

**НАРКО (НОРКО) Сцяфан.** Псаломшчык царквы в. Градзянка Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1937. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Снкодак за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархші.*

**НАСЕКАЙЛА (НАСЕКАЙЛО) Ісідор Львовіч** [14.2.1884, Вілейскі пав. Віленскай губ. — 23.3.1967], мітрафорны протаіерэй, бацька протаіерэя Мінскай епархіі Яўгенія Насекайлы. З 10.9.1906 настаўнік прыходскай школы пры Спаса-Праабражэнскай царкве ў в. Даўбені Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў дыякана (13.3.1911), іерэя (20.3.1911). Прызначаны настаяцелем Даўбеніцкай царквы. З 1923 служыў у Свята-Троіцкім храме в. Маркава Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. З 1939 у Пакроўскай царкве в. Ласіца Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. З 1944 настаяцель Мікалаеўскага храма ў Паставах (цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл.), благачынны цэркваў Пастаўскай акругі. У 1948 абараняў царкву ад закрыцця і передачы пад дом культуры, за што і быў арыштаваны супрацоўнікамі МДБ ў навагоднюю ноч з 31.12.1948 на 1.1.1949. Вызвалены датэрмінова 30.8.1954. Паводле некаторых звестак, у 1930я г. рэпрэсаваны сваякі Н.

Жонка Свята-ра Ірына Нікіфараўна (н. ў 1894) жыла ў Вілейцы Мінскай вобл., у другой палове 1970х г. пераехала ў Талін.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**НАУМОВІЧ (НАУМОВИЧ) Нікан Якаўлевіч** [24.3.1903, в. Мілевічы Мазырскага пав. Мінскай губ. — 29.6.1983], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў вышэйшае пачатковае вучылішча ў мяст. Леніна Пінскага пав. Мінскай губ. (1914 ці 1919), вытрымаў экзамен на званне

псаломшчыка пры ПінскаНавагрудскай духоўнай кансісторыі (5.4.1922). Прызначаны служыць у царкву в. Новая Чэрвішча тагачаснага КаменьКашырскага рна, цяпер Украіна. Ажаніўся з Яўгеніяй Кіпрыянаўнай Неслухоўскай (н. 22.9.1922), меў дачку Галіну (12.11.1929), сыноў Генадзя (1923), Георгія (5.5.1927). З 9.7.1936 псаломшчык Мікалаеўскага храма в. Бучын Любяшоўскага р-на Валынскай вобл., Украіна. У 1940—41 выкладаў у Бучынскай вясковай школе. У 1941—44 працаваў на сельскай гаспадарцы ў мяст. Любяшоў. Са студз. 1945 прыслужваў у Любяшоўскім храме. 25.5.1945 епіскапам Валынскім і Ровенскім Мікалаем рукапаложаны ў дыякана, 29.5.1945 — у Свята-ра. Прызначаны настаяцелем Мікалаеўскай царквы в. Бучын. З 10.3.1948 служыў у Пакроўскім храме в. Дзеравок Любяшоўскага рна. Арыштаваны ў ліст. 1948. Асуджаны да 15 гадоў ППК. Вызвалены 9.10.1956 па амністыі. З канцлагера выйшаў інвалідам. Пахаваны ў в. Старыя Мілевічы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Асабовая справа Н. захоўваецца ў архіве пракуратуры г. Луцка Валынскай вобл., Украіна.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 537.

НАЎРОЦКІ (НАВРОЦКИЙ) Аляксандр [1877, в. Блужа Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — 1.11.1937, Мінск, турма НКВД], сын Якава Наўроцкага, старэйшы брат Іаана *Наўроцкага.* Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. У 1930я г. бухгалтар Мінскага юрыдычнага інстытута (?). Арыштаваны 3.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 20/2, кв. 3. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.3.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа Н. і інш. Свята-роў № 23379с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**НАЎРОЦКІ (НАВРОЦКИЙ) Георгій Сяргеевіч** [1883, мяст. Расасна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. — 3.3.1930, Магілёў, турма АДПУ], верагодна, брат Іаана Сяргеевіча Наўроцкага[1] . Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (?), рукапаложаны ў іерэя. З 1908 настаяцель Свята-Духавай царквы в. Прылессе Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілеўскай вобл. З 1911 другі Свята-р Свята-Міхайлаўскага храма в. Кошалёў (Кашалёва) Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл., адначасова выкладаў у царкоўнапрыходскай школе. Арыштаваны 14.2.1930. Асуджаны 3.3.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Верагодна, рэпрэсаваны і сваякі Н. Рэабілітаваны 24.7.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Н. № 13545сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная кныжка Могнлевской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**НАЎРОЦКІ (НАВРОЦКИЙ) Іаан** [1897, в. Блужа, цяпер Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — ?], сын Якава *Наўроцкага,* малодшы брат Аляксандра *Наўроцкага.* У 1920я г. дыякан Успенскай царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 16.2.1930. Асуджаны 5.3.1930 са Свята-ром царквы Пятром *Іўліевым* і шэрагам актыўных прыхаджан асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР (Кем). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа Н. і інш. № 29919с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**НАЎРОЦКІ (НАВРОЦКИЙ) Мікалай Аляксандравіч** [1887, в. Ольна Аршанскі пав. Магілёўскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1910). З 1911 настаяцель Міхайлаўскай царквы

в. Сідаравічы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі рн. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 14.9.1929. Асуджаны 4.11.1929 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.10.1992 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Н. № 15299 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**НЕВЯРОЎСКІ** (**НЕВЕРОВСКИЙ**) **Георгій Ігнатавіч** [крас. 1881, в. Вялікія Лукі Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. 3 сям'і псаломшчыка. Скончыў духоўную семінарыю. У 1920я г., верагодна, служыў у царкве в. Траскоўшчына Мінскага пав. (з 1978 у межах Мінска), ва Ушэсцеўскай царкве в. Кіявічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 4.12.1929 у в. Домантавічы Капыльскага рна. Асуджаны 20.1.1930 з інш. Свята-рамі, старастам, актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа Н. № 29418с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**НЕДБАЙЛІН (НЕДБАЙЛІК) (НЕДБАЙЛИН, НЕДБАЙЛИК) Мікалай Ульянавіч** [1873, мяст. Жыровічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. — ?], протадыякан. У 1914 — 31 служыў у Фёдараўскім саборы Царскага Сяла. Арыштаваны 21.4.1931. 7.9.1932 высланы. Асабовая справа Н. № п83017 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *Санкт Петербургской епархіш Снноднк. .....*

**ШКАЛАЕВІЧ** (**ННКОЛАЕВИЧ**) **Аляксандр Фядотавіч**

[1870, Слуцкі пав. Мінскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Мінскую (?) духоўную семінарыю. З 1904 настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Турын Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 12.12.1937. Асуджаны 31.12.1937 з *Уладзімірам* Зубковічам тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.6.1956 калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Н. № 1972с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; Лнчный состав епархнального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**НІКАЛАЕВІЧ** (**НИКОЛАЕВИЧ**) **Міхаіл** [каля 1890 — ?]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. 8.9.1914 епіскапам Мінскім і Тураўскім Мітрафанам (Краснапольскім) прызначаны псаломшчыкам Слуцкага Мікалаеўскага сабора. Арыпггаваны ў 1933 (?). Высланы на Поўнач. Загінуў у зняволенні.

Кр.: *СІноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мынской епархіш.*

**ШКАЛАЕЎ** (**ШКОЛАЕВ**) **Дзімітрый Якаўлевіч** [1877, в. Папоўшчына Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., з 1941 в. Зарэчча Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. У 1910я г. служыў у РаствaБагародзіцкай царкве в. Папараткі Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл., у 1920я г. — у роднай вёсцы. Арыштаваны 26.2.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 15.4.1932 з актыўнымі прыхаджанамі Андрэем Сцяпанавічам Міхальчанкам (1874), Аляксандрам Міхайлавічам Хайноўскім (1901), Сцяпанам Грыгор'евічам Карачанкам (1865) за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 11.7.1989. Групавая справа Н. і інш. № 10070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Могьıлевской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**ШКАЛЕНКА (НИКОЛЕНКО) Валянцін Іванавіч** [1875, мяст. Вярхоўка, цяпер Украіна — ?]. Да арышту настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Бракава Магілёўскага пав., цяпер Магілёўскі рн. Арыштаваны 25.5.1932. Асуджаны 3.9.1932 з шэрагам Свята-роў і актыўных прыхаджан (усяго каля 20 чалавек) калегіяй АДПУ за «ўдзел у контррэвалюцыйнай групе» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа Н. і інш. № 10669 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ШКАН (ВАРАБ'ЁЎ)** [Мікалай Мікалаевіч; 4.5.1894, в. Мікшына Бежацкага пав. Цвярской губ., Расія — 7.9.1963, Гжацк, цяпер Гагарын, Расія], ігумен. Рускі. Са шматдзетнай сялянскай сям'і. Пасля сканчэння (1914) у ліку лепшых рэальнага вучылішча ў Вышнім Валачку Цвярской губ. паступіў у Петраградскі Псіханеўралагічны (?) інстытут, які праз 2 гады пакінуў і паступіў у Маскоўскую духоўную акадэмію. Пасля яе закрыцця ў 1919 выкладаў матэматыку ў школе ў Сасновіцах, потым пераехаў у Маскву, служыў псаломшчыкам у БарысаГлебскім храме. 7.4.1931 у Мінску епіскапам Мінскім Феафанам (Семянякам) пастрыжаны ў манашаскі сан з імем Шкан і рукапаложаны ў іерадыякана, 26.12.1932 — у іераманаха. Служыў у Мікалаеўскай царкве пас. Козырава (цяпер у межах Мінска.) Арыштаваны 5.4.1933 у Мінску ў доме па вул. Безымяннай. Праходзіў па адной справе з архімандрытам *Гаўрыілам* (Горбачам), Свята-рамі Мікалаем *Цімінскім,* Аляксандрам *Яхневічам,* манахінямі Еўфрасінняй *Гутар,* Еўдакіяй *Лукашэвіч,* Людмілай *Палянскай,* Наталляй *Сон (Зон),* актыўнымі прыхаджанамі Аленай Галкінай (н. ў 1888), Пятром Каладкевічам (1876), Ксеніяй Лецка (1892) і інш. Асуджаны 7.6.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з лагпунктаў АДПУ КамсамольсканаАмуры Далёкаўсходняга краю. У

зняволенні некаторы час знаходзіўся з епіскапам Магілёўскім Феадосіем (Вашчынскім), ад якога 19.1.1937 атрымаў своеасаблівую даведку, дзе былі і такія радкі: *«Іераманах Нікан <...> крыж сярод лагерных нёс цярпліва, без пгугі і смупгку, падаючы сваім жыццём добры прыклад усім».* Пасля вызвалення (1937), не маючы магчымасці працягваць свяшчэннаслужэнне, працаваў памочнікам урача ў Ніжнім Валачку. У 1944 епіскапам Калужскім Васіліем прызначаны настаяцелем Благавешчанскага храма ў Казельску (другі Свята-р храма Рафаіл Шэйчанка адбыў у сталінскіх канцлагерах больп за 20 гадоў). 3 1948 служыў у Белеве, потым у Яфрэмаве, Смаленску, Гжацку. Узведзены ў сан ігумена (1956). Аўтар успамінаў, духоўных кніг. Рэабілітаваны 12.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Н. і інш. № 24819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Тв.: Нам оставлено покаянне. М., 1997; Пнсьма духовным детям. Клнн, 2003.

**ШКАН (ДЗЕГЦЯРЭНКА)** [Мікалай Іванавіч; да 1890, Глухаў Чарнігаўскай губ. — ?], епіскап Магілёўскі (1924—25). Арыштаваны 20.11.1925 па справе мітрапаліта Пятра (Палянскага). Вызвалены. 3 5.10.1927 епіскап Енісейскі. 3.2.1928 звольнены на пакой. Далейшы лёс невядомы.

**ШКІФАРОВІЧ (ЯЦКЕВІЧ) (ШКІФОРОВІЧ, ЯЦКЕВІЧ) Пётр (Сцяпан) Сямёнавіч** [1878, в. Вялікі Стахаў Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета Барысаўскага Уваскрасенскага сабора. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 24.4.1931 у роднай вёсцы. Асуджаны калегіяй АДПУ 27.8.1931 за «падпал» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 20.7.1989. Групавая справа Н. і інш. № 26678с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

*Кр.:НАРБ,ШБР;НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

Kamunikat.org

**ШКІЦЕНКА (ШКИТЕНКО) Сімяон Цімафеевіч** [1896 в. Кругавец Гомельскага пав. Магілёўскай губ., з 1920 в. КругавецКалініна, цяпер Добрушскага р-на Гомельскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я служыў у Мікалаеўскай царкве в. Барталамееўка Гомельскага пав., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Зноў арыштаваны і ў студз. 1933 асуджаны да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 9.8.1989.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 4; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Добрушскага раена. У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1999.

**НОВІКАЎ** (**НОВИКОВ**) **Грыгорый Фёдаравіч** [1873, в. ІПыманаўка (?) Горацкага пав. Магілёўскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчык Мікалаеўскага (?) храма ў Горках Магілёўскай вобл. Арыштаваны 9.5.1935. Асуджаны 25.5.1935 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 13.7.1990 Магілёўскім абл. судом. Асабовая справа Н. № 13820сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**НЯДЗЕЛЬСКІ (НЕДЕЛЬСКИЙ) Елісей Яўгенавіч** [14.06.1890, в. Уладзіміраўка Адэскай губ. — 1.5.1957, Бахмач, Чарнігаўская вобл., Украіна]. Украінец. З сям'і Свята-ра. Скончыў Тыўраўскае духоўнае вучылішча КамянецПадольскай епархіі, цяпер Вініцкая вобл., Украіна. Рукапаложаны ў дыякана (1907). З 1909 псаломшчык, рэгент у храмах КамянецПадольскай епархіі. З 1912 служыў у дамавой царкве пры Варшаўскім шпіталі. У 1914 пераведзены ў РаствaБагародзіцкі храм у Адэсе, пасля яго закрыцця ў 1931 за штатам. Арыштаваны. Асуджаны да 10 (?) гадоў ППК. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. З 1942 дыякан Свята-Мікалаеўскай царквы ў мяст. Карма Гомельскай вобл. 5.9.1943 у Мінску архіепіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім Філафеем (Нарко)

рукапалажаны ў іерэя і накіраваны ў Свята-Духаў храм в. Дварэц Гомельскай вобл. З 1946 служыў у Сімяонаўскай царкве в. Баслаўцы Слуцкага р-на Мінскай вобл. З 1.10.1948 настаяцель КасмаДаміянаўскага храма ў мяст. Гарадок Глускага р-на Магілёўскай вобл. 24.3.1952 пераведзены згодна з прашэннем у Чарнігаўскую епархію.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**НЯМШЭВІЧ (НЕМШЕВИЧ, НЯМШЕВИЧ) Яраслаў [**1874, в. Барань Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 24.5.1959, Бабруйск], протаіерэй. Сын Пятра Нямшэвіча[1]. Скончыў духоўнае вучылішча. Служыў псаломшчыкам, з 1900 дыяканам у Пакроўскай царкве ў мяст. Турэц Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. Рукапалажаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Галынка (тагачасны паштовы адрас: ст. Свіслач) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл., Свята-Троіцкай царквы в. Цялуша Бабруйскага пав., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 5.9.1935. Асуджаны да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. З 1944 зноў служыў Свята-ром.

Кр.: *НГАВ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш;*

**НЯРОНСКІ** (**НЕРОНСКИЙ**) **Уладзімір Андрэевіч** [1877, в. Цітва Ігуменскі пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — 1938 (?), Магілёў, НКВД]. Беларус. З 1912 настаяцель Ільінскай царквы в. Рубеж (тагачасны паштовы адрас: ст. Халопенічы) Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 15.2.1938 у Магілёве. Асуджаны 21.9.1938 з шэрагам Свята-роў Магілёўскай епархіі тройкай НКВД як «польскі шпіёндыверсант» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. Свята-роў № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная кныжка Мннской губерннн; НАРБ, ІКБР.*

**ОЗЕРАЎ (ОЗЕРОВ) Іаан Аляксеевіч** [1884, в. Пятроўскае Багародскага пав. Маскоўскай. губ., Расія — ?], протадыякан (абнаўленчы). З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Удзельнічаў у Пленуме абнаўленчага Беларускага Праваслаўнага Свяшчэннага Сінода (25—27 снеж. 1928, Орша). У *НГАБ* (Ф. 2786, в. 2, с. 3) захаваўся групавы фотаздымак удзельнікаў Пленума. Быў жанаты, гадаваў сямёра дзяцей. Арыштаваны 27.3.1932 у в. Папарэйская Гара тагачаснага Суражскага (цяпер Віцебскага) рна. Асуджаны 23.5.1932 са свяшчэннаслужыцелямі Яўціхіем *Блахіным,* Міхаілам *Курносавым* і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа О. і інш. № 17191п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НГАБ. Ф.* 2786, в. 2, с. 3.

**ОСІПАЎ (ОСИПОВ) Феадот Грыгор'евіч** [1874, в. Гілі Сененскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. — 31.3.1933, Магілеў, турма АДПУ], абнаўленчы Свята-р, верагодна, брат Ксенафонта Грыгор'евіча Осіпава[1] і Іаана Грыгор'евіча Осіпава[2]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Міхайлаўскай царкве в. Маляўка Сененскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Падчас арышту настаяцель Свята-Троіцкага храма ў мяст. Шапялевічы Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 3.2.1933. Асуджаны 21.3.1933 з інш. свяшчэннаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.9.1964 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа О. і інш. № 8920сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш; НАРБ,*

*ІКБР.*

**ОСІПАЎ (ОСИПОВ) Ціт Емяльянавіч** [1878, в. Пнявічы, цяпер Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту старшыня царкоўнага савета Мікалаеўскага храма ў Горках Магілёўскай вобл. Арыштаваны 26.12.1932. Асуджаны 30.4.1933 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 3.7.1962. Асабовая справа О. № 8188сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**ПАВЕЛ (ВІЛЬКОЎСКІ)** [23.8.1870, Нікалаеў Херсонскай губ., Расія — 7.5.1933, РастоўнаДане, турма НКВД], архіепіскап. Сын псаломшчыка Якава Вількоўскага. Скончыў Херсонскае духоўнае вучылішча, Адэскую духоўную семінарыю (1881), Кіеўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (1895). Служыў карэктарам у сінадальнай друкарні ў СанктПецярбургу. З 1896 паслушнік Макар'еўскай пустыні (Наўгародская губ.). Рукапаложаны ў манаха, іераманаха (1898). З 1900 настаяцель Пасольскай царквы ў Канстанцінопалі, выкладаў у рускіх школах пры храме Святога Сцяфана, у камерцыйным вучылішчы, быў карэспандэнтам час. «Церковные ведомостн». З 1910 архімандрыт, назіральнік Тарапецкага духоўнага вучылішча (Пскоўская губ., Расія). З 1911 рэктар Таўрычаскай духоўнай семінарыі. З 1912 настаяцель Уфімскага Успенскага манастыра. У 1913 рэктар Уфімскай духоўнай семінарыі. 1.10.1914 у Петраградзе хіратанісаны ў епіскапа Ялецкага, вікарыя Арлоўскай епархіі. У 1917 епіскап Міхайлаўскі, вікарый Разанскай епархіі. Удзельнік Свяшчэннага Сабора РПЦ (1917—18, Масква). У 1918 жыў ва Украіне. З 1919 епіскап Бакінскі, вікарый Грузінскага экзархата. З 1924 епіскап Ахански (?), вікарый Пермскай епархіі. Арыштаваны за «антысавецкую дзейнасць». У 1925 высланы ў

Ніжагародскую губ. 3 ліст. 1927 епіскап Мінскі. Узведзены ў сан архіепіскапа. 3 13.12.1930 архіепіскап Пяцігорскі. У1931 выйшаў на пакой, жыў у г. Старая Руса Наўгародскай вобл. Арыштаваны 19.2.1933. Абвінавачваўся ў сувязі з замежным «Братствам Русской Правды». Асуджаны калегіяй АДПУ 2.4.1933 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.5.1990. Асабовая справа П. № П48721 захоўваецца ў архіве УКДБ Краснадарскага краю.

**ПАВЕЛ (ГАЛЬКОЎСКІ)** [9.1.1864, мяст. Усвяты Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл., Расія — 19.10.1945], мітрапаліт. Сын Свята-ра Міхаіла Галькоўскага. Скончыў Віцебскую духовную семінарыю. Служыў з 1882. Рукапаложаны ў іераманаха (1898). 3 1900 (?) настаяцель царквы Раства Хрыстова ў Віцебску, член Полацкай духоўнай кансісторыі. 3 1905 служыў у Віцебскім Уваскрасенскім храме, выкладаў Закон Божы ў Заручаеўскай царкоўнапрыходскай школе, быў членам Віцебскай духоўнай кансісторыі. 3 1915 (?) — у Пакроўскім кафедральным саборы ў Віцебску, старшыня губернскага «Союза Русского народа». 3 1919 духаўнік Афонскага па двор'я. 5.8.1921 хіратанісаны ў епіскапа Бузулукскага, вікарыя Самарскай епархіі. 3 1921 часова кіруючы Самарскай епархіяй. Арыштаваны ў 1924. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Краснаводск, цяпер Туркменбашы, Туркменія. 3 28.9.1927 кіраваў Ягор'еўскай епархіяй. 3 14.2.1928 часова кіруючы Варонежскай, з 31.12.1928 Уладзімірскай епархіямі. 3 31.10.1929 епіскап ІванаваВазнясенскі. 9.4.1930 узведзены ў сан архіепіскапа. У крас. 1931 удзельнічаў у зімовай сесіі Свяшчэннага Сінода. 1.5.1932 узнагароджаны правам нашэння крыжа на клабуку. У 1935 узведзены ў сан мітрапаліта ІванаваВазнясенскага. Зноў арыштаваны 8.3.1936. Абвінавачваўся ў «кіраўніцтве контррэвалюцыйнай арганізацыяй, захоўванні і распаўсюджванні кнігі «Протоколы сноискнх мудрецов» і інш. 21.6.1936 асобай нарадай пры НКВД СССР прыгавораны да ссылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1990. Кр.: *Памятная КИНжка*

*Внтебской губерніш;*

**ПАДЛУЖНЫ (ПОДЛУЖНЫЙ) Кузьма Фядотавіч** [1870, Чэрыкаўскі пав. Магілёўскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. З 1913—14 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Малынічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Старыя Малынічы Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. Арыштаваны 27.9.1929 у в. Хонава (Вялікае Хонава), цяпер Магілёўскі рн. Асуджаны 15.12.1929 капегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.10.1992 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа № 15202 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш; БНДЦЭД.*

•

**ПАДСЫПАННІКАВА (ПОДСЫПАННИКОВА) Фёкла Антонаўна** [1892, в. Жаролы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 23.11.1937. Асуджана асобай нарадай НКВД 2.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана Вярхоўным судом БССР 16.1.1989. Асабовая справа П. № 12093 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

**ПАЕЎСКІ (ПАЕВСКИЙ) Міхаіл Львовіч. Гл.: МЕЛХІСЕДЭК (ПАЕЎСКІ).**

**ПАЖАРЫЦКІ (ПОЖАРНЦКИЙ) Фёдар Паўлавіч** [1883, мяст. Горкі Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — 1930 (?), турма АДПУ], Свята-р. Беларус. Скончыў гарадское вучылішча. З 1912 настаяцель Свята-Духавай царквы в. Пярэвалачная (Пярэвалачня) Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. З 1913—14 служыў у Пакроўскім храме в. Чырвоная Буда (тагачасны паштовы адрас: ст. Насавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл.

Быў жанаты, меў шасцёра непаўналетніх дзяцей. Арыштаваны 9.1.1930 у Горках. Асуджаны калегіяй АДПУ 3.3.1930 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць супраць калектывізацыі сельскай гаспадаркі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 26.9.1989. Асабовая справа П. № 16850п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**ПАЗНЯК (ПОЗНЯК) Аляксій Філіпавіч** [1912 — 1973], протаіерэй. З 1936 настаяцель Ільінскай царквы в. Радашковічы, цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. У 1939 пераведзены ў РаставаБагародзіцкі храм в. Рымкі Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл. З 1944 служыў у Мікалаеўскай царкве в. Блошнікі Мёрскага р-на Віцебскай вобл. Меў жонку Веру Усцінаўну (н. ў 1908), дачку і сына. Арыштаваны ў 1951. Асуджаны да 10 (?) гадоў ППК. Вызвалены ў 1956. Служыў у Арлоўскай епархіі. З 1962 у Георгіеўскай царкве в. Гняздзілава Докшыцкага р-на Віцебскай вобл. У 1963 пераведзены ў РаствaБагародзіцкі храм у мяст. Лужкі Шаркаўшчынскага рна.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**ПАІСІЙ (ЯНУКОВІЧ)** [Пётр Цімафеевіч; 1880, Старобін Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД],ігумен. Беларус. Арыштаваны ў верас. (?) 1937 у в. Алехавая (?) Магілёўскага рна. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа П. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**ПАКРОЎСКІ (ПОКРОВСКИЙ) Грыгорый Пятровіч** [1889 — 1937], протаіерэй. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. З 1911 служыў псаломшчыкам у Пакроўскай царкве в. Лутна Невелькага пав. Віцебскай губ.

Рукапаложаны ў дыякана (1920). Служыў у Мікалаеўскім храме в. ІПацілава Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. У 1921 пасвячоны ў Віцебску ў іерэя. Прызначаны настаяцелем царквы в. Чайкі Ідрыцкага р-на Калінінскай вобл., цяпер Вялікалукская вобл., Расія. Арыштаваны НКВД у 1937. Загінуў у зняволенні.

Жонка Свята-ра Марыя Аляксееўна (н. ў 1897) пасля арышту мужа засталася адна з сынамінвалідам. Памерла 19.12.1983 у Віцебску.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**ПАКРОЎСКІ (ПОКРОВСКИЙ) Мікалай Уладзіміравіч. Гл.: МІКАЛАЙ (ПАКРОЎСКІ).**

**ПАКРОЎСКІ** (**ПОКРОВСКИЙ**) **Сцяфан Міхайлавіч** [1882, в. Дабея Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю, СанктПецярбургскую духоўную акадэмію (1911). Верагодна, служыў у адным з храмаў Віцебскай губ. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. У 1930я г. рахункавод няпоўнай СІП № 35 у Віцебску. Арыштаваны 18.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 8я Полацкая, д. 2. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 Віцебскім абл. судом. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАЛАЎЧЭНЯ** (**ПОЛОВЧЕНЯ**) **Якаў Міхайлавіч** [1877, в. Языль Бабруйскі пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. — 1933 (?), Мінск, турмаАДПУ], селянінаднаасобнік, стараста Спаса-Праабражэнскага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны 27.12.1932 з братам Лявонам на хут. Глінішча тагачаснага Старадарожскага рна. Праходзіў па адной справе з настаяцелем храма *Уладзімірам* Хрышчановічам і шэрагам актыўных прыхаджан. Асуджаны 12.2.1933 як «член

контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Сям'я выслана за межы БССР. Рэабілітаваны 31.3.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа П. і інш. № 22818с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**ПАЛЕСКІ-ШЭПІЛА** (**ПОЛЕССКИЙ-ШЕПИЛО**) **Канстанцін Іванавіч** [1876 — 6.12.1937, Смаленск, турма НКВД], манах. Беларус. Арыштаваны 28.11.1937 у в. Проніна Ельнянскага р-на Смаленскай вобл. Асуджаны тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *СмоленсКИЙ мартыролог.*

**ПАЛІТЫКА (ПОЛИТЫКО, ПОЛИТИКО) Афанасій Паўлавіч** [1862, мяст. Крычаў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — 21.12.1938, ГУЛАГ]. Беларус. Да арышту стараста і вартаўнік Мікалаеўскай царквы ў родным мяст. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны 5.10.1937 з другім вартаўнікам Ягорам Іванавічам Масіхам (1904) тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Загінуў у канцлагеры. Рэабілітаваны 21.11.1964 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Групавая справа П. і інш. № 8946 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАЛОНСКІ** (**ПОЛОНСКИЙ**) **Георгій Іванавіч** [1889 ці 1890 — 18 або 19 верас. 1918, Віцебск], службовец, рэлігійны дзеяч. Скончыў унт, абараніў дысертацыю са ступенню кандыдата юрыдычных навук. Служыў *136* гласным у Віцебскай гарадской думе, потым — да 1917 — ва Упраўленні інспектара Ваеннапаветранага флота на пасадзе оберафіцэра для даручэнняў. Прымаў удзел у Свяшчэнным Саборы РПЦ 1917—18 ад Полацкай епархіі. 3.7.1918 у Віцебску з членам Сабора Б.А.БялыніцкімБірулем узяты заложнікам «у адказ на забойства Урыцкага і раненне Леніна». 18.9.1918 Віцебскай губ. ЧК асуджаны да ВМП.

Расстраляны.

Кр.: *Афіцыйны сайпг Віцебскай епархіі. » і*

**ПАЛЯК (ПОЛЯК) (ПОЛЯК) Іаан Герасімавіч** [1881, в. Вітунічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. — 9.1.1938, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю (?). У 1920я г. настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Нача (тагачасны паштовы адрас: ст. Прыяміна) Барысаўскага пав., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. У 1930я г. служыў у РаствaБагародзіцкай царкве в. Сёмкаў Гарадок Заслаўскага (цяпер Мінскага) рна. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 5.1.1937. Нягледзячы што падчас катаванняў адмовіўся ад сана, 28.12.1937 асуджаны тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа П. № 22182с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Снноднк за веру н церковь Хрыстову пострадавних в Мннской епархіш; Сннодпк СанктПетербургской епархіш.*

**ПАЛЯНСКАЯ (ПОЛЯНСКАЯ) Ганна Якаўлеўна. Гл.: ЛЮДМІЛА (ПАЛЯНСКАЯ).**

**ПАЛЯНСКІ (ПОЛЯНСКИЙ) Пётр Фёдаравіч. Гл.: ПЁТР (ПАЛЯНСКІ).**

**ПАМІНАЛЬНЫ (ПОМННАЛЬНЫЙ) Васілій Філіпавіч. Гл.: ВАРСАНОФІЙ (ПАМІНАЛЬНЫ).**

**ПАМФІЛ (ЛЯСКОЎСКІ)** [Пётр Аляксандравіч; 5.10.1883, Віцебская губ. — 23.1.1935 або 10.1.1936], епіскап. Скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію, прыняў манашаскі пострыг (1907). З 1.11.1907 выкладчык Валынскага жаночага вучылішча, з 16.9.1910 — Жытомірскага духоўнага вучылішча. 30.5.1911 рукапаложаны ў іераманаха. З 7.6.1911 выкладчык

Валынскай духоўнай семінарыі. 10.12.1912 прызначаны рэктарам Палтаўскай духоўнай семінарыі. 26.12.1921 хіратанісаны ў епіскапа Старадубскага, вікарыя Чарнігаўскай епархіі. З 6.3.1928 епіскап Бугучарскі, потым епіскап Расошанскі. З 13.9.1930 епіскап Уральскі, з 17.9.1931 — Чабаксарскі, з 2.10.1932 — Багародскі, з 20.10.1932 — Падольскі. З 23.11.1932 кіраваў Курскай епархіяй. 11.9.1933 прызначаны епіскапам Краснадарскім і Кубанскім. 23.1.1935 (паводле інш. звестак 10.1.1936) знойдзены ў садзе каля свайго дома (?) павешаным на дрэве.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ПАНАМАРОЎ** (**ПОНОМАРЕВ**) **Васілій Авдрэевіч** [1869, в. Барадзіно Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў царкоўна-прыходскую школу. З 1910 настаяцель Мікалаеўскага храма в. Мужычок (Мужычкі) Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., з 1964 в. Азёрная Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 15.9.1929. Асуджаны 15.12.1929 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.10.1992 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа № 15253 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлееской губернші.*

**ПАНАСЮК** (**ПАНАСЮК**) **Хеазара Пятроўна** [1872? в. Навасёлкі Брэсцкага пав. Гродзенскай губ. — ?], манахіня. Жыла ў Ленінградзе. Арыштавана 17.2.1932. Асуджана калегіяй АДПУ 22.3.1932 да 3 гадоў ссылкі ў Сярэднюю Азію. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.*

**ПАНКРАТОВІЧ (ПАНКРАТОВИЧ) Іаан Фёдаравіч. Гл.: ІААН ПАНКРАТОВГЧ.**

**ПАНУРЫН** (**ПАНУРИН**) **Елісей Паўлавіч** [1892, Быхаў Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы ў мяст. Семежава Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 13.4.1929. Асуджаны 26.7.1929 са Свята-рамі Юліянам *Аспгроўскім, Уладзімірам* Хіраскам і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 3 гадоў ссылкі 16.11.1931 справа перагледжана, прыгавораны за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.6.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа П. № 26111с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ПАНЦЫРАЎ** (**ПАНЦЫРЕВ**) **Дзеамід Іванавіч** [1888, Сувалкі Беластоцкага пав., цяпер Польпча — ?]. З сялянскай сям'і. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў настаяцелем ва Успенскай царкве в. Апідамы, цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 24.3.1949. Асуджаны 13.6.1949 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 13.12.1954. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 2.12.1987 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.* ——

**ПАНЬКЕВІЧ** (**ПАНЬКЕВИЧ**) **Іаан Канстанцінавіч** [2.11.1885, в. Навасёлкі Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту служыў у Магілёве ў царкве пры могілках. Арыштаваны 11.11.1936. Абвінавачваўся ў антысавецкай дзейнасці і распаўсюджванні чутак пра хуткую вайну». Асуджаны не быў. 7.1.1937 пастановай Магілёўскага раённага аддзела НКВД вызвалены і рэабілітаваны. Групавая справа П. і інш. М 5187сн захоўваецца ў архіве

КДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАНЬКО Канстанцін Канстанцінавіч** [1886, маёнтак Новая Весь (?) Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер тэрыторыя Польшчы — 1.10.1938, Мінск, турма НКВД], царкоўнаслужыцель Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. 10.6.1914 прызначаны псаломшчыкам Крыжаўздзвіжанскага храма в. Аброва Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл. У 1930я г. служыў у адной з цэркваў Слуцка Мінскай вобл. Арыштаваны 4.3.1938. Асуджаны 20.9.1938 паводле пастановы калегіі НКВД як «агент царскай ахранкі» і за «шпіянаж на карысць Польшчы» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.10.1959 трыбуналам БВА. Асабовая справа П. № 14808с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.
Кр.:ЯАРБ,ЖБР.

**ПАПЕЙКА (ПОПЕЙКО) Грыгорый Фаміч** [1869, в. Вядзец Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. — 1.11.1937, Смаленск, турма НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Успенскай царкве в. Красавічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1910 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма в. Браздзечына Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 9.8.1931. Асуджаны 28.9.1931 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў. Да другога арышту (20.7.1937) настаяцель царквы в. Вараб'ёва тагачаснага Гжацкага р-на Смаленскай вобл. 23.10.1937 тройкай НКВД прыгавораны за «тое ж злачынства» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 26.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. № 21028п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.
Кр.: *Памятная кньжка Могнлевской губерннн; Смолен сКИЙ мартыролог.*

**ПАПКОЎ (ПОПКОВ) Малах Міхайлавіч** [1873, в.

Ладыжана Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], царкоўнаслужыцель Магілёўскай епархіі. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны ў 1937 у роднай вёсцы. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа П. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР. '* •

**ПАПКОЎ (ПОПКОВ) Цімафей Яфрэмавіч** [1872, в. Слабада Аршанскага пав. Магілёўскай губ. — 16.2.1939, Магілёў (паводле інш. звестак — Гомель), турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў царкоўнанастаўніцкую школу. Служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскім храме в. Касцюковічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. 6.7.1906 рукапаложаны ў дыякана. У 1910я г. член павятовага аддзялення Магілёўскага епархіяльнага вучылішчнага савета. Арыштаваны 9.3.1938 у Чавусах Магілёўскай вобл. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». 16.2.1939 справа П. (№ 13611сн; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) спынена зза смерці падследнага. Рэабілітаваны 27.6.1990 пракуратурай Магілёўскай вобл.

Кр.: *Пажятная КИНжка Могнлевской губернш; БНДЦЭД.*

**ПАРАШЧАНКА** (**ПАРАЩЕНКО**) **Міхаіл Мартынавіч** [1879 — ?]. З сялянскай сям'і. У пачатку 1900х г. — запасны царкоўнік ваеннага ведамства. 6.6.1906 прызначаны псаломшчыкам Успенскага храма мяст. Астроўна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1918). У 1924 арыштаваны за «антысавецкую агітацыю», але неўзабаве вызвалены. З другой паловы 1920х г. настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Касянічы, цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ПАРОМЕНСКІ (ПОРОМЕНСКИЙ) Аляксандр Васілевіч** [1878, в. Вярхоў'е Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — 1933 (?), Віцебск, турма АДПУ], іерэй, брат Фёдара *Пароменскага.* Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. Служыў у адной з цэркваў ПолацкаВіцебскай епархіі. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 7.4.1933 у роднай вёсцы. Асуджаны 30.4.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Рэабілітаваны 8.3.1958 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ.ІКБР.*

**ПАРОМЕНСКІ (ПОРОМЕНСКИЙ) Лявонцій Міхайлавіч** [1869, в. Усвяты Веліжскага пав Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — 7.10.1937, Віцебск, турма НКВД], іерэй. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў 4 класы (курсы) Віцебскай духоўнай семінарыі. З 1905 настаяцель Мікалаеўскага храма в. Шацілава Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі рн. У 1920я г. служыў у адной з цэркваў г. Сураж Віцебскага пав., цяпер Віцебскі рн. Меў жонку Марыю Кузьмінічну (н. ў 1870 (?) і сыноў: Яўгена (1897) і Паўла (1906; жыў у Грузіі). У 1930 арыштаваны і асуджаны калегіяй АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Працаваў вартаўнікам у Віцебскім медыцынскім тэхнікуме. Зноў арыштаваны 10.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. Гутараўскася, д. 4. Прыгавораны тройкай НКВД 8.9.1937 за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Вытебской губерннн; БНДЦЭД; Афі цыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ПАРОМЕНСКІ (ПОРОМЕНСКИЙ) Фёдар Васілевіч** [1877, в. Вярхоў'е Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер

Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], іерэй, брат Аляксандра *Пароменскага.* Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. З 1911—12 настаяцель Успенскай царквы в. Вядрэнь Лепельскага пав., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл., законанастаўнік пачатковага вучылішча ў в. Баяры Лепельскага пав. Меў шасцера дзяцей. Арыштаваны 16.10.1933. Асуджаны 25.2.1934 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Іосіфам *Первавым,* Якавам *Счансновічам,* Грыгорыем *Шпаком,* дыяканам Васілём *Цыпкевічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Вытебской губернш; БНДЦЭД.*

**ПАРФЁНЧЫК (ПАРФЕНЧИК) Васілій Мацвеевіч** (Майсеевіч) [1882 ці 1884, в. Лунін Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту настаяцель Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Глівін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі рн. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 19.4.1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі Уладзімірам *Дзелякторскім,* Пятром *Ражко,* Канстанцінам *Семянюком,* Мікалаем *Тарановічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення служыў у храме в. Ахоцічы, цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Зноў арыштаваны 13.5.1937 у в. Навасёлкі Кіраўскага рна. Прыгавораны 8.8.1937 тройкай НКВД за «агітацыю супраць савецкай улады» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (групавая № 27206с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай БССР 31.5.1989, Па другой (№ 13413сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 20.3.1990.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ПАРФІРЫЙ (БАЙДАКОЎ)** [Грыгорый Дарафеевіч; 2.1.1906, в. Шыхаў Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. — 1994], схіархімандрыт. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў 4класнае народнае вучылішча (1917), Мінскую духоўную семінарыю (1959). Не маючы магчымасці вучыцца падчас грамадзянскай вайны, працаваў з бацькам на гаспадарцы. У 1933 арыштаваны і асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Томск, адкуль уцёк. Жыў і працаваў заўмагам у Смаленску. Аднчасова вучыўся ў вячэрняй школе. Падчас 2й сусветнай вайны мабілізаваны, адпраўлены на фронт. У пасляваенныя гады пры дзяржправерцы супрацоўнікам бяспекі выяўлены факт пра ўцёкі з месцаў зняволення. Зноў арыштаваны і прыгавораны да 4 гадоў ППК. Этапаваны ў Дубраўны канцлагер МДБ Мардоўскай АССР. Вызвалены 24.4.1954 са зняццем судзімасці. Прыехаў у Жлобін да свайго брата, працаваў сталяром. З 7.9.1955 паслушнік Успенскага Жыровіцкага манастыра, адначасова вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі. 27.2.1957 пастрыжаны ў манашаскі сан з імем Яўфімій. Рукапаложаны ў іерадыякана (29.3.1957), іераманаха (20.5.1970), ігумена(1972), архімандрыта (1985). Да 7.4.1986 выконваў абавязкі эканома манастыра. 6.12.1986 пастрыжаны ў вялікую схіму з імем Парфірый. Узнагароджаны нагрудным крыжам (1971), паліцай, крыжам з упрыгожаннямі (1977), ордэнам Сергія Раданежскага (1986). Памёр і пахаваны ў Жыровічах.

Літ.: *БНДЦЭД;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 51; *Жыровіцкая Абіцель.* 2000, № 5 (18).

**ПАРФІРЫЙ РУБАНОВІЧ** [1880 ці 1883, в. Лемяшэвічы Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. — 1943, ваколіцы Гомеля], *свяшчэннамучанік.* Протаіерэй, сын Адама Рубановіча[1]. Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча, Мінскую духоўную семінарыю. З 1909 настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Дабраслаўка Пінскага пав. 9.8.1914 пераведзены ў Спаса-Праабражэнскі храм у

kamunikat.org

Заслаўі, благачынны цэркваў 2й акругі Мінскага пав. У 1925 ухіліўся ў абнаўленчы раскол, але неўзабаве вярнуўся ў кананічную Царкву. Першы раз арыштаваны ў 1928 за «не ўплату падаткаў». Знаходзіўся пад следствам тры з паловай месяцы. Пасля вызвалення вярнуўся ў Заслаўе. У 1935 храм быў зачынены, а царкоўны іканастас спалены, і Свята-р пачаў служыць у царкве пры Заслаўскіх могілках. У чэрв. 1936 яму як «палітычна ненадзейнаму» загадалі пакінуць Заслаўе, і ён быў вымушаны пераехаць далей ад мяжы — у Быхаў. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны тройкай НКВД 31.10.1937 як «незадаволены палітыкай савецкай улады» і за «распаўсюджванне чутак пра хуткую вайну» да 10 гадоў пазбаўлення волі. Пакаранне адбываў каля Гомеля. Вызвалены ў другой палове 1941, але неўзабаве забіты партызанамі. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 13.11.1989. Асабовая справа Р. № 12618сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губернші; Памятная кныжка Мынской епархіш; Лнчный состав епархнального управленыя; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Заслаўя. Мн., 2000. С. 170—172; Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленных'ъ святых н Подвнжнннков'ъ Благочестія, вг Русской Православной Церквн просіявшнхь (отт> царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); *Жнтня свяіценномученнков Мннской епархіш; ПІнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). Мн., 2006.

**ПАСЕВІЧ (ПАСЕВИЧ) Гаўрыіл Аляксеевіч** [1874, в. Воля Мінскай губ. — 1938, турма НКВД]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1930я г. старшыня савета царквы ў г. Алушта, цяпер Крымская вобл., Украіна. Арыштаваны 8.2.1938. Асуджаны 15.2.1938 тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

**ПАСЛАЎСКІ (ПОСЛАВСКИЙ) Міхаіл Міхайлавіч.** Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Успенскай царкве в. Радомль Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі рн. З 1910 настаяцель Пакроўскай царквы в. Брацькавічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл. З 1913—14 настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Недайка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. настаяцель Успенскай царквы в. Чарацянка Гомельскага пав., цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 44.

**ПАСТЭРНАЦКІ (ПАСТЕРНАЦКИЙ) Уладзімір Іларыёнавіч. Гл.: УЛАДЗІМІР ПАСТЭРНАЦКІ.**

**ПАЎЛІН (КРОШАЧКІН)** [Пётр Кузьміч; 9.12.1879 (паводле інш. звестак 19.12.1879), Макшаны Пензенскай губ., Расія — 3.11.1937, ГУЛАГ], свяшчэннамучанік, архіепіскап. Рускі. З сялянскай сям'і. Пасля сканчэння прыходскай школы, вучыўся ў гарадскім вучылішчы ў Макшанах. У 1895 паступіў у Сароўскую Пустынь. З 1898 у МіколаБабаеўскім манастыры Кастрамской губ., потым паслушнік Спаса-Якаўлеўскага — у Растове. У 1902 вярнуўся ў МіколаБабаеўскі манастыр. У 1904 прыняты ў Маскоўскі НоваСпаскі манастыр. У 1911 паступіў экстэрнам у духоўную семінарыю, чатырохгадовы курс прайшоў на працягу года. У 1916 скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. У Маскоўскім НоваСпаскім манастыры ўзведзены ў іераманаха з імем Паўлін. У 1919 накіраваны выкладчыкам у Грыгор'ева-Бізюкаў манастыр Херсонскай епархіі. Узведзены ў сан архімандрыта. У 1920 намеснік НоваСпаскага манастыра. 15.5.1921 хіратанісаны ў епіскапа Рыльскага, вікарыя Курскай епархіі. У 1925 арыштаваны органамі АДПУ і этапаваны ў Маскву. У зняволенні ў камерыадзіночцы

Kamunikat.org

прабыў каля года. Пасля вызвалення некаторы час жыў у Маскве ў знаёмых. З 27.10.1926 — епіскап ПолацкаВіцебскі. Зноў арыштаваны ў снеж. 1926. Вызвалены ў 1927. Атрымаў прызначэнне на Пермскую кафедру з тутылам епіскап Пермскі і Салікамскі. Са снеж. 1930 да восені 1933 епіскап Бароўскі Калужскай епархіі. У канцы жн. 1933 пераведзены ў Магілёўскую епархію з тытулам архіепіскап Магілёўскі. Карыстаўся усеагульнай любоўю прыхаджан і глыбокай пашанай мясцовага духавенства. Шмат каму дапамагаў матэрыяльна. Па дамоўленасці з епіскапам Філарэтам (Раменскім) у 1935 накіраваў мітрапаліту Сергію рапарт з хадайніцтвам аб далучэнні бел. аўтакефалістаў да кананічнай Царквы.

2.10.1935 арыштаваны органамі НКВД і пасаджаны ў Магілёўскую турму. Праз некаторы час пераведзены ў Мінскую ўнутраную турму НКВД.

21.4.1936 асуджаны тройкай НКВД з інш. свяшчэннаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі за «антысавецкую агітацыю» і «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Сібірскі канцлагер НКВД Новасібірскай вобл. 28.10.1937 лагернай тройкай прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.2.1969 пастановай пленума Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа П. і інш. (усяго каля 30 чалавек) № 9394 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. У 2000 на Юбілейным саборы РПЦ кананізаваны як свяшчэннамучанік.

Літ.: *Нх страданыямы очыстнтся Русь.* М., 1996. С. 200—237; *Кравонос Ф., свяш,.* Мученнкн н нсповедннкн Могнлевскне XX века: Феодоснй (ВаіцннсКИЙ), свмч. Павлнн (КрошечКИН), Александр (РаевсКИЙ). Мн., 2002. С. 15—19; Православный календарь на 2004 год. Сост. *Кулаженко Л.Е., Матрунчнк ТА.* Мн., 2003. С. 97.

**ПАЎЛОВІЧ (ПАВЛОВИЧ) Сяргей Канстанцінавіч** [псеўданім: Паляшук; 13(25).9.1875, в. Асаўцы Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. — 16.9.1940, Вільня], педагог, публіцыст, грамадскі і

культурны дзеяч. З духоўнага саслоўя. Скончыў Віленскую семінарыю, Кіеўскую духоўную акадэмію (1899). Працаваў у царкоўных установах, выкладчыкам мужчынскай 4класнай настаўніцкай семінарыі, рэальнага вучылішча імя Іопшынай, прыватнай жаночай гімназіі імя Анісімавай у Рагачове Магілёўскай губ. (1909—12), інспектарам народных школ Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. (1913—18). З пачатку 1920х г. жыў у Вільні. Член Беларускага навуковага таварыства, адзін з кіраўнікоў Таварыства беларускай школы. У 1925—28 настаўнік і дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. Прапагандаваў ідэі працоўнай школы. Актыўна выступаў супраць паланізацыі. Крытыкаваў прымусовае ўвядзенне ў бел. школах лацінкі (брашура «Некалькі ўваг аб беларускім «Лемантары» Ст.ЛюбічМаеўскага», 1929). Аўтар школьных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў. У публіцыстыцы (найперш на старонках час. «Беларускі летапіс») шмат увагі надаваў пытанням самаадукацыі і хатняга выхавання, культурнаасветнай рабоце, рэлігійнай адукацыі. Арыштоўваўся польскімі ўладамі ў 1930 і 1933. У 1937 выдаваў час. для дзяцей «Снапок».

Тв.: Свяшчэнная гісторыя Старога Завету. Вільня, 1926; Пазашкольная асвета. Культурнаасветная праца ў гуртках ТБІП. Вільня, 1928; Пішы самадзейна: Развіццё навыку самастойнага пісьма. Ч. 1. Вільня, 1928; Метадычныя ўвагі да пасобніка «Пішы самадзейна». Вільня, 1929; Свяшчэнная гісторыя Новага Завету. Вільня, 1936; Першыя зерняткі. Вільня, 1936.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Могылееской губерніш; Антологня педагогнческой мыслн Белорусской ССР.* М., 1986; *Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі (1917—1945).* Мн., 1993; *ВабішчэеічА.* Каб жыць пад сваім небам: Навуковапедагагічная спадчына Сяргея Паўловіча // *Голас Радзімы.* 1996, 19, 26 снеж.; *ЭГБ,* т. 5; *Рэпрэсаваныя...*

**ПАЎЛОЎСКІ (ПАВЛОВСКІЙ) Яўфімій Іванавіч** [1876, в. Красновічы, цяпер Украіна — ?]. Украінец. З сям'і

свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаяы ў іерэя. Да арышту настаяцель Георгіеўскай царквы в. Прылепы, цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 5.1.1933 у в. Усяжа (Казённая Усяжа) Смалявіцкага рна. Асуджаны 16.1.1933 са Свята-ром Якавам *Трахановічам,* старастам і актыўнымі прыхаджанамі царквы асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як арганізатар антысавецкай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа П. і інш. № 25544с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПАЎСКІ** (**ПАВСКИЙ**) **Грыгорый Аляксандравіч** [1880, в. Максаціха Цвярской губ., Расія — 17.9.1937, Калінінская вобл., турма НКВД], свяшчэннаслужыцель, настаўнік, брат Дзімітрыя *Паўскага.* Беларус. З духоўнага саслоўя. Скончыў духоўную семінарыю. У 1900я г. выкладаў рускую мову, гісторыю, геаграфію ў Мінскім жаночым духоўным вучылішчы. Арыштаваны 29.7.1937. Асуджаны 13.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1989 Цвярской абл. пракуратурай.

Кр.: *Памятная КИНжка Мынской губерннн; КИНга памятн жертв полнггшческнх репресснй Калнннннской областн.*

**ПАЎСКІ (ПАВСКИЙ) Дзмітрый Аляксандравіч. Гл.: ДЗІМГГРЫЙ ПАЎСКІ.**

**ПАЦЯЮК (ПАТЕЮК) Міхаіл Мікітавіч** [1887, в. Новая Беліца (Наваъеліца), цяпер у межах Гомеля — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту, верагодна, служыў у АляксандраНеўскай царкве ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў дачку Надзею (н. ў 1913) і сына Дзмітрыя (1916).

Арыштаваны 4.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік

контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Вызвалены ў 1938. Вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 23.6.1941. Прыгавораны асобай нарадай НКВД да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справаП. іінш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр.: НАРБ, ІКБР.*

**ПАШЫН (ПАШИН) Васілій Дзмітрыевіч** [1865, в. Храпавічы Віцебскага пав. — ?], Свята-р. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1886). Служыў другім Свята-ром у саборы Раства Хрыстова ў Себежы Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл., Расія, выкладаў Закон Божы ў Себежскім гарадскім 4класным вучылішчы. Арыштаваны 25.11.1929. Асуджаны 13.1.1930 з шэрагам інш. Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Ватебской губерпш; НАРБ, ІКБР.*

**ПАШЫН (ПАШИН) Васілій Іванавіч** [1874 — 4.11.1937, Смаленск, турма НКВД]. Беларус. Да арышту дыякан царквы ў пас. Хіславічы Смаленскай вобл.

Арыштаваны 15.9.1937. Асуджаны са Свята-рамі Грыгорыем *Мулерам,* Іаанам *Курневічам* 18.10.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *СмоленсКИЙ мартнролог.*

**ПАШЫН (ПАШИН) Іван Дзмітрыевіч. Гл.: ІААН (ПАШЫН).**

**ПАШЫН (ПАШИН) Мікалай Пятровіч** [1888, в. Жарноўка (Жырнаўка) Смаленскай (?) вобл. — 4.9.1937, Калінін, турма НКВД], Свята-р. Беларус. Арыштаваны

1.8.1937 у в. Святое Асташкаўскага р-на Калінінскай вобл. Асуджаны са Свята-рамі Сімяонам *Садаўнічым,* Максімам *Стуканавым* і інш. 31.8.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1989 пастановай Цвярской абл. пракуратуры.

Кр.: *КИНга памятн. жертв полытнческнх репресснй Калішннской областн.*

**ПЕРАБІЛА** (**ПЕРЕБИЛЛО**) **Міхаіл** [1882 — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Івольск (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 3. —

**ПЕРАПЕЧКА (ПЕРЕПЕЧКО) Нікандр Архіпавіч** [1900, Быхаў Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?, АлмаАта, турма НКВД], Свята-р. Скончыў духоўную семінарыю. Арыштаваны 21.8.1937 у АлмаАце. Асуджаны 17.10.1937 тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.4.1989 пракуратурай АлмаАцінскай вобл.

**ПЕРАПЕЧЫН (ПЕРЕПЕЧИН) Георгій Васілевіч** [1880, мяст. Скароднае Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер веска Ельскага р-на Гомельскай вобл. — 6.4.1933, Мінск, турма АДПУ]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. З 1914 настаяцель РаставаБагародзіцкай царквы ў мяст. Пухавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер вёска Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. З чэр. 1915 — памочнік, з ліп. 1917 — благачынны цэркваў 4й акругі Ігуменскага пав. Арыштаваны 7.2.1933. Асуджаны 2.4.1933 з шэрагам актыўных прыхаджан асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі «Партыя вызвалення сялян» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з

канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Сем'я выслана ў Паўночны край. Рэабілітаваны 5.11.1956 калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа П. і інш. № 7458с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Пажятная КИНжка Мннской губерннн; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ПЕРВАЎ (ПЯРВОЎ) (ПЕРВОВ) Іосіф Аўраамавіч** [1886, Кіеў, Украіна — ?], Свята-р. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Арыштаваны 2.12.1933 у Віцебску па адрасе: вул. Рыжская, д. 2а. Асуджаны 25.2.1934 з інш. свяшчэннаслужыцелямі ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ПЕРЛАШКЕВІЧ (ПЕРЛАШКЕВИЧ) Уладзімір Кліменцевіч** [1879, в. Юрцава Высоцкай вол. Аршанскага пав. Магілёўскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю (?). Служыў псаломшчыкам у Пакроўскай царкве в. Ланінка (Ланенка) Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 12.4.1929. Асуджаны 26.6.1929 з настаяцелем царквы Ферапонтам *Атрошчанкам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.4.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ПЕРМІНАЎ (ПЕРМИНОВ) Андрэй Мікалаевіч (**Якаўлевіч) [1918, Віцебская губ. — 2.7.1949, ГУЛАГ], царкоўнаслужыцель. Меў незакончаную вышэйшую адукацыю. З 1941 сакратарбухгалтар «Пскоўскай духоўнай

місіі». Арыштаваны 24.11.1944. Асуджаны 15.5.1945 трыбуналам войск НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 15 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 17.12.1956 трыбуналам Ленінградскай ВА.

Кр.: *Афіцыйны сайпг Віцебскай епархп; Снноднк СанктПетербурескай епархіш.*

**ПЕРХАРОВІЧ (ПЕРХАРОВИЧ) Іаан** [1.7.1884, в. Цыр Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Валынская вобл., Украіна— 7.7.1938, Мінск, турмаНКВД]. Беларус. Сын Іакіма Перхаровіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1905). 15.12.1905 прызначаны настаўнікам 1класнай царкоўнапрыходскай школы ў в. Старажоўцы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл. З 15.9.1906 2класнай школы ў в. Багушэвічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. З 29.6.1908 епіскапам Міхаілам (Цемнарусавым) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны ў ПетраПаўлаўскую царкву в. Сеніца Мінскага пав. (цяпер у межах горада). Разам з жонкай Любоўю Сцяпанаўнай (н. ў 1886 у сям'і Свята-ра, скончыла Мінскае духоўнае вучылішча) гадаваў дачок Галіну (1911), Вераніку (1912), сына Міраслава (1909). У 1930 адмовіўся ад сана. Арыштаваны 25.7.1932. Неўзабаве вызвалены. У другой палове 1930х г. працаваў на Цагляным заводзе № 6 у Мінску. Зноў арыштаваны ў лют. (альбо ў сак.) 1938. Праходзіў па адной справе з абнаўленчым мітрапалітам Пятром *Бліновым.* 25.5.1938 тройкай НКВД асуджаны як «агент польскай разведкі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 4.12.1958. Групавая справа П. і інш. № 15173с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Отшсанне церквей н прнходов Мннской епархпн; Памятпная кныжка Мннской губерніш; Памятная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *НАРБ, ІКР; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мннской епархіш.*

**ПЁТР БЛІНОЎ** [Пётр Фёдаравіч; 1893, в. Нова-Рызадаева

Сызранскага пав. Сімбірскай губ., цяпер Ульянаўская вобл., Расія — 1.7.1938, Мінск, турмаНКВД], мітрапаліт, адзін з лідэраў абнаўленцтва. З сям'і паляўнічага. Падлеткам вандраваў па краіне, 2 гады быў паслушнікам аднаго з сібірскіх манастыроў. Прыехаўшы ў Томск, ажаніўся, паступіў на багаслоўскія курсы пры Тамбоўскай духоўнай семінарыі. У верас. 1914 рукапаложаны ў дыякана і прызначаны псаломшчыкам Мікалаеўскага храма ў Томску. 24.4.1916 пасвячоны ў іерэя і накіраваны Свята-ром у 38ы

Сібірскі стралковы палк. У 1917 пераведзены настаяцелем у царкву св. Іаана Лествічніка ў Томску. 5.10.1922 арганізаваў «Сібірскі Сабор», на якім быў выбраны старшынёй. 8.10.1922 хіратанісаны ў «епіскапа Томскага і Сібірскага». Узначаліў абнаўленчае Сібірскае царкоўнае ўпраўленне. 16.11.1922 узведзены ў сан мітрапаліта «усяе Сібіры». У 1923 узначаліў дэлегацыю Маскоўскага абнаўленчага сабора, уручыў патрыярху Ціхану (Бялавіну) пастанову аб пазбаўленні яго сана і манашаства. У 1924—34 служыў у Сібіры. З 31.1.1935 абнаўленчы мітрапаліт Мінскай епархіі, служыў у АляксандраНеўскай царкве. Арыштаваны 4.2.1938. Асуджаны 25.5.1938 са Свята-ром Юльянам *Астроўскім* і інш. тройкай НКВД як «агент польскай і японскай разведак» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны трыбуналам БВА 4.12.1958. Асабовая справа П.Б. № 15173с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**ПЁТР ГРУДЗІНСКІ** [Пётр Феафілавіч; 1877, мяст. Глуск Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — пасля 23.2.1930, Слуцк (?) АДПУ], *свяшчэннамучанік.* З мяшчанскага саслоўя, бацька працаваў арандатарам на царкоўнай зямлі. Скончыў народную школу і гарадское вучылішча. У 1900— 10я г. член Губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі, страхавы інспектар. Меў аўтарытэт сярод жыхароў пав. — у 1905 на губернскім сходзе абраны дэпутатам ад сялян у 2ю Дзяржаўную Думу. З прыходам да ўлады бальшавікоў прыняў мужнае рашэнне стаць Свята-ром. Адразу пасля

Kamunikat.org

рукапалажэння накіраваны настаяцелем у Мікалаеўскую прыходскую царкву ў мяст. Цімкавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны Цімкавіцкім пагранатрадам АДПУ 13 ці 15 студз. 1930, зняволены ў Слуцкай турме. Чэкісты дамагліся ад жонкі Свята-ра Ірыны, каб яна даслала яму ў турму ліст з заклікам адмовіцца ад веры. У адказ Свята-р напісаў: *«Гэтпы ліст агаломшыў больш за арышт, і толькі ўсведамленне, шпго ён прадыктпаваны горам і нястпачай, крыху супакоіла мяне... Калі б я пагадзіўся і выканаў пгваю просьбу, пгы. сама б хупгка зненавідзела мяне»*. 23.2.1930 паводле пастановы калегіі АДПУ асуджаны са Свята-рамі *Валерыянам* Навіцкім, Аляксандрам *Радакоўскім* за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 28.4.1989. Асабовая справа П.Г. № 26764с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

**ПЁТР (ПАЛЯНСКІ)** [Пётр Фёдаравіч; 28.6.1862, с. Старажавое Каратаяцкага пав. Варонежскай губ. — 10.10.1937, турмаНКВД], свяшчэннамучанік.

Мітрапаліт. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Варонежскую духоўную семінарыю, Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (1892). Абараніў дысертацыю на званне магістра. Служыў памочнікам інспектара акадэміі. У снеж. 1896 прызначаны назіральнікам Жыровіцкага духоўнага вучылішча. У маі 1899 за асаблівыя працу і руплівасць у справе ўладкавання царкоўнапрыходскіх школ узнагароджаны граматай і ордэнам св. Станіслава 3й ступені. Адначасова выконваў абавязкі члена апякунства аб народнай цвярозасці і ганаровага міравога суддзі Слонімскай акругі. З 1906 пераведзены ў вучэбны камітэт пры Свяшчэнным Сінодзе. З кастр. 1917 — у чыне стацкага саветніка. 25.9.1920 хіратанісаны ў епіскапа Падольскага, вікарыя Маскоўскай епархіі. У 1923 узведзены ў сан архіепіскапа, у 1924 — мітрапаліта. 12.4.1925 пасля смерці патрыярха Ціхана

саборам 37 рускіх іерархаў выбраны Месцаблюсціцелем Патрыяршага Прастола. Арыштаваны ў 1925. Асуджаны да 3 гадоў зняволення. Улетку 1927 знаходзіўся за Палярным кругам у пас. Хэ Абдорскага рна. 3 1928 жыў у Табольску. Тэрмін пакарання працягнуты на 2 гады. У 1930 прыгавораны да 5 гадоў пазбаўлення волі. Прайшоў праз турмы НКВД у Свярдлоўску, Екацярынбургу, Верхнеўральску. У 1935 асуджаны да 3 гадоў ППК. 2.10.1937 тройкай НКВД Чэлябінскай вобл. прыгавораны да ВМП. Расстраляны ў 75 гадоў. Месца пахавання невядома. Кананізаваны ў ліку новамучанікаў (1997).

**ПЕТРАЧУК Вера Мікалаеўна** [1.10.1884, в. Давыдаўка Гродзенскай губ. — ], манахіня, насельніца Новадзявочага манастыра ў СанктПецярбургу. Арыштавана 18.4.1932. Асуджана да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.*

**ПЕТРАЧЭНКА** (**ПЕТРАЧЕНКО**) **Антоній Мікалаевіч** [17.1.1877, Магілёўская губ. — ?], манах. 3 сялянскай сям'і. Пастрыжаны ў манашаскі сан у 1901 у Ленінградзе. Арыштаваны 17.4.1932. Асуджаны 16.6.1932 да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Л. захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.* ц

**ПЕТРУКЕВІЧ (ПЕТРУКОВІЧ) (ПЕТРУКЕВИЧ, ПЕТРУКОВИЧ) Андрэй Емяльянавіч** [1901, Гродзенская губ. — ?], Свята-р. Да арышту настаяцель царквы в. Емуратка Самарскай вобл. Асуджаны 3.11.1929 тройкай АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.10.1992.

Кр.: КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй. Ульяновск, 1996. Т. 1.

**ПЕТРУСЕНКА** (**ПЕТРУСЕНКО**) **Елісей Міронавіч** [1882, в. Шарыпы Горацкага пав. Магілёўскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. настаяцель Успенскай царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 28.2.1930. Асуджаны 10.4.1930 з інш. свяшчэннаслужыцелямі Магілёўскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.9.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа П. і інш. № 14047сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

*Кр.:НАРБ,ІКБР.*

**ПЕТУХОВА** (**ПЕТУХОВА**) **Екацярына Яфрэмаўна** [1873, в. Міхеевічы, цяпер Крычаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 1933 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларуска. З сялянскай сям'і. Да арышту манахіня малітоўнага дома ў 1ым Крычаўскім пас. Арыштавана 14.2.1933 у в. Міхеевічы. Асуджана 14.2.1933 з актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «ўдзел у кулацкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляна. Рэабілітавана 9.7.1960 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа П. і інш. № 7100сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПЕТУХОВІЧ** (**ПЕТУХОВИЧ**) **Леанід Васілевіч** [1888, в. Бохат (Бахот) Мсціслаўскага пав., цяпер Манастыршчынскі р-н Смаленскай вобл., Расія — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўныя вучылішча і семінарыю. Да арышту служыў у царкве в. Горы, цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 29.4.1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі Аляксіем *Ганкевічам* асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Справа П. № 12890 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПІГУЛЕЎСКІ** (**ПИГУЛЕВСКИЙ**) **Віктар** [1871, в. Новы Двор Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. Сын Аляксія Пігулеўскага[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. 17.9.1894 накіраваны псаломшчыкам ва Успенскі храм в. Хатынічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Ганцавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1896). Прызначаны настаяцелем у ПетраПаўлаўскую царкву в. Навасёлкі Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Падчас арышту настаяцель Слуцкага Міхайлаўскага сабора. Арыштаваны 14.3.1933 у Слуцку па адрасе: вул. Могілкавая, д. 16. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа П. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; Памятная кныжка Мннской епархіы; Лнчный состав епархнального управленая.*

**ПІГУЛЕЎСКІ** (**ПИГУЛЕВСКИЙ**) **Канстанцін Хрысанфавіч** [1887, Віцебск — ?]. З духоўнага саслоўя. Актыўны прыхаджанін храмаў падвор'я КіеваПячэрскай Лаўры. Арыштаваны 22.12.1933 у Ленінградзе па справе «еўлогіеўцаў» . Асуджаны 25.2.1934 да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа П. № п66773 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.* , .

**ПІГУЛЕЎСКІ** (**ПИГУЛЕВСКИЙ**) **Міхаіл** [1870, мяст. Капаткевічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Ільы Пігулеўскага . Скончыў духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Глівін Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Падчас арышту служыў у ПетраПаўлаўскім храме в.

Кішчына Слабада Барысаўскагарна. Арыштаваны 14.4.1932. Асуджаны 23.7.1932 са Свята-ром Захарам *Стальмаковым,* псаломшчыкам, старастам і актыўнымі прыхаджанамі царквы асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.7.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа П. № 26162с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

*Кр.:НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67. .,.

**ПІГУЛЕЎСКІ (ПИГУЛЕВСКИЙ) Уладзімір Дзмітрыевіч** [1886, Вільня — ?]. З сям'і псаломшчыка. Вучыўся ў Літоўскай (Віленскай), Магілёўскай духоўных семінарыях, на рэгенцкіх курсах. У 1907—18 рэгент Крыжаўздзвіжанскай царквы і архіерэйскага хору ў Магілёве. У 1918 архіепіскапам Магілёўскім Канстанцінам (Булычовым) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Магілёўскага ТрохСвяціцельскага кафедральнага сабора. У 1921 пераехаў у Мінск. Служыў у Мінскім кафедральным соборы. Адрокся ад сана, перайшоў у абнаўленцтва. У 1922 — 33 выкладаў спевы ў Мінскіх СШ. З 1934 нам. хормайстра Беларускага дзяржаўнага опернага тэатра. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Па прапанове мітрапаліта Мінскага і ўсяе Беларусі Панцеляімана (Ражноўскага) арганізаваў царкоўны хор, якім кіраваў да прыходу савецкіх войск. 14.8.1944 асобай нарадай пры НКВД СССР асуджаны да 8 гадоў ППК. Пасля вызвалення ў 1952 пастановай архіепіскапа Мінскага і Беларускага Піцірыма прызначаны рэгентам у Горкі Магілёўскай вобл., потым рэгентам Мінскай Крыжаўздзвіжанскай царквы. З 10.2.1954 выкладчык і рэгент хора Мінскай духоўнай семінарыі.

Літ.: *Черегшца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 162. Гродно, 2000; *Ён жа.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненгцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 2. С. 155. Гродно, 2005.

**ПІМЕНАЎ (ПИМЕНОВ) Сімяон Філіпавіч** [1883, Віцебск — ?], Свята-р, верагодна, сын Філіпа Піменава. Да арышту жыў у в. Карабоўка Гразінскага р-на Ліпецкай вобл. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі і прапагандзе». Асуджаны да 5 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Внтебской губерніш;* Помннть понменно. КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй Лнпецкого края с ноября 1917 года. Лнпецк, 1997. Т. 1.

**ПІНЕВІЧ (ПИНЕВИЧ) Міхаіл Сяргеевіч** [1876, в. Гарадзец Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], верагодна, брат Пятра Сяргеевіча Піневіча[2]. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. 31915 настаяцель Успенскай царквы в. Кісялі (тагачасны паштовы адрас: мяст. Ляды) Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. У 1920я г. настаяцель Успенскага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны 11.2.1928. Асуджаны 12.3.1930 са Свята-рамі Максімам *Галубковым,* Фёдарам *Івановым,* Уладзімірам *Коршунавым,* Кірылам *Сухабаеўскім* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.8.1973 Магілёўскім абл. судом. Асабовая справа П. № 9501 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерннн.*

**ПІНЕВІЧ (ПИНЕВИЧ) Павел Фёдаравіч** [1890, в. Палуж Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Падчас арышту настаяцель Успенскай царквы в. Кісялі (тагачасны паштовы адрас: мяст. Ляды) Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 23.2.1935. Асуджаны 8.8.1935 паводле пастановы калегіі НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці.

Kamunikat.org

Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.3.1992 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. *Кр.:НАРБ,ІКБР.*

**ПІНЕВІЧ (ПИНЕВИЧ) Сергій Іванавіч** [1877, в. Рэпухава Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — 12.1.1938, ГУЛАГ], Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Свята-Троіцкай царкве в. Галавічы Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дрыбінскі р-н Магілёўскай вобл., выкладаў Закон Божы ў СтараПрыбужскай царкоўнапрыходскай школе. З 1912 настаяцель Мікалаеўскага храма ў Чавусах, член Чавускага павятовага вучылішчнага савета, назіральнік царкоўнапрыходскіх школ. З 1915 старшыня Клімавіцкага аддзялення епархіяльнага вучылішчнага савета. Падчас арышту настаяцель храма в. Зарэчча (прадмесце Чавусаў). Быў жанаты, меў дачку Галіну (н. ў 1911), сыноў Віктара (1906), Серафіма (1914), Мікалая (1920). З 1929 зноў служыў у Чавусах. Арыштаваны 14.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Сібірскі канцлагер АДПУ. 28.12.1937 лагернай тройкай НКВД прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа П. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерннн; НАРБ, ІКБР.*

**ПІНКЕВІЧ** (**ПИНКЕВИЧ**) **Уладзімір** [1889 — ?]. З 1913 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма в. Старчыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. У 1914 выбраны членам будаўнічага камітэта цэркваў 4й акругі Слуцкага пав. Арыштаваны 27.3.1938 у Таганрогу. Асуджаны да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная кныжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Сннодык за веру н церковь Хрнстову*

*пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**ПІРАГОЎ (ПИРОГОВ) Георгій Васілевіч** [1885, с. Пакроўскае, цяпер Харольскі р-н Палтаўскай вобл., Украіна — ?], Свята-р. Украінец. З сям'і святчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Падчас арышту служыў у Магілёве. Быў жанаты, гадаваў сыноў Леаніда (н. ў 1921), Мікалая (1923) і дачок Еўдакію (1926), Галіну (1932). Арыштаваны 19.1.1933 у Магілёве па адрасе: вул. Грамадзянская, д. 56. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 як «вандроўны Свята-р, удзельнік царкоўнапаўстанцкай контррэвалюцыйнай арганізацыі» і «антысавецкі агітатар» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа П. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**ПІХТЭЛЬ (ЕРМАКОЎ)** (**ПИХТЕЛЬ, ЕРМАКОВ**) **Адрыян Філіпавіч** [25.8.1871, в. Нізы Горацкага пав. Віцебскай губ. — ?], манах. Арыштаваны 23.6.1930 у Маскве. Асуджаны асобай нарадай пры АДПУ 18.9.1930 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.3.1989. Асабовая справаП. № Р33787 захоўваецца ў архіве УФСБ Маскоўскай вобл. Кр.: *Афіцыйны. сайт Віцебскай епархіі.*

**ПІШЧУЛІН (ПИЧУЛИН) Уладзімір Фёдаравіч. Гл.: УЛАДЗІМІР ПІШЧУЛІН.**

**ПЛАТОН ЗВЕРАЎ (ЗВЕРЕВ**) [Пётр Дзмітрыевіч; 1875, в. Глыбокае, цяпер Маскоўская вобл., Расія — ?], верагодна, бацька педагога Дзмітрыя Пятровіча Зверава. Рускі. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту ігумен КіеваПячэрскай лаўры. Арыштаваны ў верас. 1937 у в. Доўгі Мох (?), цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа П.З. і інш. № 9171

захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.
*Кр.: НАРБ, ІКБР.*

**ПЛЫШЭЎСКІ (ПЛЫШЕВСКИЙ) Дзімітрый, Іванавіч. Гл.: ДЗІМІТРЫЙ ПЛЫШЭЎСКІ.**

**ПЛЫШЭЎСКІ** (**ПЛЫШЕВСКИЙ**) **Іаан** [1863 — ?]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1895?). Рукапалажаны ў іерэя. З 1906 другі Свята-р Мікалаеўскага сабора ў Бабруйску Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 26.10.1925. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі». Неўзабаве вызвалены. Далейшы лёс невядомы.
Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мнннской епархнн.*

**ПЛЫШЭЎСКІ** (**ПЛЫШЕВСКИЙ**) **Міхаіл Пятровіч. Гл.: МІХАІЛ ПЛЫШЭЎСКІ.**

**ПОЛАЗ** (**ПОЛОЗ**) **Серафім Грыгор'евіч.** Гл.: **СЕРАФІМ (ПОЛАЗ).**

**ПОМЕР Яніс.** Гл.: **ІААН (ПОМЕР).**

**ПОСТНІКАЎ** (**ПОСТНИКОВ**) **Міхаіл Сцяпанавіч. Гл.: МІХАІЛ (ПОСТНІКАЎ).**

**ПОТАШ Васілій Фаміч** [1878, в. Гарадзькі Ашмянскага пав. Віленскай губ. — 8.12.1937, Масква, турма НКВД], Свята-р. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Арыштаваны 27.9.1937 у в. Нікіцінскае Старажылаўскага р-на Разанскай вобл. Асуджаны 12.11.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» і «контррэвалюцыйную прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.8.1989.
Кр.: *БутовсКИЙ Полнгон.*

**ПРАКОПАЎ** (**ПРОКОПОВ**) **Іосіф Васілевіч** [1887, в. Язвы

Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., з 1964 в. Усходняя Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 1937 (?), Віцебск, турма НКВД], Свята-р ПолацкаВіцебскай епархіі. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Арыштаваны 5.8.1937 у в. Славені Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 29.8.1937 са Свята-ром Мікалаем *Цімінскім* і інш. тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 12.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**ПРАНЕВІЧ** (**ПРОНЕВИЧ**) **Лявонцій** [1893, в. Лядзец Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Сын Мікалая Іосіфавіча Праневіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы ў мяст. Малыя Гарадзяцічы Мазырскай акругі, цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 14.9.1929. Асуджаны 3.11.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 7 гадоў ППК. Этапаваны ў Беламорска-Балтыйскі канцлагер НКВД Карэльскай АССР Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 22.11.1989 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Асабовая справа П. № 28519с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; Памятная КИНж ка Мннской епархші; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ПРАСАЛОВІЧ (ПРОСОЛОВИЧ) Андрэй Ігнатавіч** [1882, в. Зарэчча Магілеўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілеўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. служыў у Пакроўскай царкве в. Язеры (тагачасны паштовы адрас: ст. Шклоў) Магілеўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 7.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Далёкаўсходні канцлагер АДПУ. 27.11.1934 уцёк з канцлагера. Далейшы лёс невядомы.

Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа П. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**ПРАТАСЕВІЧ (ПРОТАСЕВИЧ) Іосіф Віктаравіч** [1906 — 1937 (?), НКВД], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 15.12.1937. Асуджаны 30.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.8.1989. Кр.: *Не предать забвенню.*

**ПРОРВІЧ (ПРОРВИЧ) Міхаіл Фаміч** [кастр. 1870, в. Латыголічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. 3 сялянскай сям'І. У 1900я г. псаломшчык ПараскеваПятніцкага храма в. Чарніхаў Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мінскай епархіі. Арыштаваны 28.5.1936 у в. Мікулічы былога Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. Асуджаны 14.9.1936 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.4.1990 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа П. № 31267с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПРОХАРАЎ (ПРОХОРОВ) Васілій Прохаравіч** [1882, в. Цярэні Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 13.10.1937, Віцебск альбо Магілёў, турма НКВД]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1930я г. настаяцель прыпісной царквы в. Ермакі, цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду супраць калгасаў» да ВМП.

Расстраляны. Рэабілітаваны 5.9.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа П. № 11112 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**ПРОЦІК (ПРОЦИК) Вера Адамаўна** [1892, в. Адамаўка Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 18.11.1937 у в. Падроўнае Рэчыцкага рна. Асуджана асобай нарадай пры НКВД 28.11.1937 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапавана ў Рыбінск Яраслаўскай вобл. Вызвалена ў 1947. Зноў арыштавана 24.8.1949. Прыгаворана 4.3.1950 да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Канчаткова вызвалена ў 1954. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 19.10.1959.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн, Кн. 1. Мн., 1998.

**ПРУСАКОЎ (ПРУСАКОВ) Філгіп Міхайлавіч** [1880, в. Маркава Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 19.3.1934 у с. Ясенскае Асташкаўскага р-на Калінінскай (Цвярской) вобл. Асуджаны 31.3.1936 за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны прэзідыумам Вярхоўнага суда СССР 16.1.1989.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ПРЫГАРОЎСКІ (ПРИГОРОВСКИЙ) Іосіф Іванавіч** [1.4.1861, в. Гарбачэва Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Расонскі р-н Віцебскай вобл. — 21.10.1937, Полацк, турма НКВД], Свята-р, верагодна, брат Мікалая Іванавіча Прыгароўскага[1]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1883). Служыў ва Успенскай царкве в. Сутокі Себежскага пав. Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл., Расія. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 19.9.1937 у роднай вёсцы. Асуджаны 8.10.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.9.1989

пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная кныжка Вытебской губерніш; БНДЦЭД.*

**ПРЫЖЭНАЎ (ПРИЖЕНОВ) Грыгорый Паўлавіч** [1871, Магілёўская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 17.1.1933 у Самары. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі і прапагандзе». 4.6.1933 калегіяй АДПУ вызвалены з улікам тэрміну папярэдняга зняволення. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны. Кр.: *Белая КИНга.*

**ПРЫХОДЗЬКА (ПРИХОДЬКО) Ціхан** І. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель Раства-Багародзіцкай царквы в. Глыбоцкае (тагачасны паштовы адрас: ст. Дабранка Чарнігаўскай губ.) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 59.

**ПРЫХОДЧАНКА (ПРИХОДЧЕНКО) Лука Сямёнавіч** [1880, Гомельскі пав. Магілёўскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 3.11.1930 у в. НоваСаратаўка Балкашынскага р-на Акмолінскай вобл. Казахскай ССР. Асуджаны Петрапаўлаўскім АДПУ 6.12.1930 за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны генеральнай пракуратурай Рэспублікі Казахстан 5.9.1998.

Кр.: *Храннть вечно.*

**ПРЭЖЫН (ПРЕЖИН) Карней Аляксеевіч**. Дыякан. Беларус. У 1920я г. жыў у в. Мар'іна Гомельскага пав., потым Веткаўскага (цяпер Добрушскага) р-на Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 5.

**ПУПКОЎ (ПУПКОВ) Феафан Цімафеевіч** [1893,

Бабруйск Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Вучыўся ў духоўнай семінарыі. Да арышту настаяцель Ільінскай царквы в. Добасна (паштовы адрас: ст. Дварэц), цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 29.7.1935. Асуджаны 29.2.1936 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 6 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.8.1990 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа № 13831 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПУЦІЛЕЎСКІ (ПУТИЛЕВСКИЙ) Канстанцін Хрыстафоравіч** [1877, Віцебск — ?], Свята-р (?). З мяшчанскай сям'і. Арыштаваны 22.12.1933 па «царкоўнай справе». Асуджаны да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа П. № п66773 захоўваецца ў архіве УФСБ па СанктПецярбургу і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанкпгПетербургской епархіш Снноднк.*

**ПУЦЯТА (ПУТЯТО) Пётр** [28.12.1903, в. Чалюшчавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Аляксандра Пуцяты. Падчас арышту настаяцель Успенскай царквы в. Блужа Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 6.8.1937 у в. Каменка Пухавіцкага рна. Асуджаны 17.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Цемнікаўскі канцлагер НКВД Мардоўскай АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.3.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа П. № 24968с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Лнчный состав епархнального управлення; НАРБ, ІКБР.*

**ПУЧЫКАЎ** (**ПУЧИКОВ**) **Панцеляіман Нікіфаравіч** [1880, мяст. Дуброўна Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г.

служыў у Георгіеўскай царкве в. Мардашэвічы Аршанскай акругі, цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 23.8.1929. Асуджаны 20.11.1929 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Ігнаціем *Іасафатавым,* Сергіем *Самсанёнкам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.4.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПУШКІН** (**ПУШКИН**) **Сергій** [пачатак 1890х г., в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.— ?], сын Ільі Пушкіна, брат Яўгенія Ільіча Пушкіна[1] і Канстанціна Ільіча Пушкіна[2]. Скончыў Мінскія духоўныя вучылішча (1910?) і семінарыю (1914). 5.7.1914 прызначаны псаломшчыкам Мазырскага Міхайлаўскага сабора. 9.8.1914 пераведзены ў Іаанаўскі храм мяст. Нараўляны Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Свята-Іаанаўскай царкве в. Міхалёва Бабруйскай акругі, цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1934. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Лнчный состав епархнального управлення; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мннской епархіш.*

**ПУШНОЙ Фёдар Дзмітрыевіч** [1886, Чарнігаўская губ., цяпер Украіна — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 28.1.1930 у пас. Алейскі Алтайскага краю. 26.4.1930 асуджаны тройкай АДПУ Сібірскага краю за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Алтайскага краю 20.9.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческнх репресснй в Алтайском крае. 1919—1930. Барнаул, 1998. Т. 1.

**ПЦІЧКІН** (**ПТИЧКИН**) **Васілій Мікітавіч** [1891, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Да арышту жыў у Невельскім р-не Пскоўскай вобл. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны 25.11.1937 тройкай НКВД СССР па Калінінскай вобл. за

«антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Рэабілітаваны 22.9.1989

Кр.: Не предать забвенню: КИНга памятн жертв полнтнческнх репрессній. Псков, 1998. Т. 5. С. 295; *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**ПЦІЧКІН** (**ПТИЧКИН**) **Парфірый Сямёнавіч** [1895, в. Гаварухі (?) Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 17.9.1937, Калінінская вобл., турма НКВД], царкоўнаслужыцель. Арыштаваны 11.8.1937 у в. Борзыні Есенавіцкага р-на Калінінскай вобл. Асуджаны 13.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.5.1989 Цвярской абл. пракуратурай.

Кр.: *КИНга памятн жерте полнтнческнх репрессній Калннннской областн.*

**ПЫЖЫКАЎ** (**ПЫЖИКОВ**) **Іван Якаўлевіч** [1890 — 6.4.1955 пас. Падлужжа, Чачэрскі р-н Гомельскай вобл.]. З 1909 псаломшчык Мікалаеўскай царквы в. Рагінь Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. З 1923 служыў у РаствaБагародзіцкім храме в. Скіток Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі рн. З 1928 у царкве в. Крукі (?), цяпер Светлагорскі р-н Гомельскай вобл. У 1941—44 настаяцель Свята-Троіцкага храма в. Цялуша, цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1944. Асуджаны да 10 гадоў ППК. Вызвалены 6.3.1955.

Жонка Свята-ра Ксенія Фядосаўна памерла 6.12.1957.

**Кр.:** Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**ПЫЛІНСКІ** (**ПЫЛИНСКИЙ**) **Віктар Філімонавіч** [1873, в. Малыя Сліжы Шклоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — 8.12.1937, Масква, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У пачатку 1900х г. — псаломшчык Ільінскага храма в. Целяшы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ. (тагачасны паштовы адрас: ст. Прыдарожжа Чавускага пав.). 12.10.1906 рукапаложаны ў

дыякана. Арыштаваны 28.11.1937 у в. РуднеНікіцкае Кураўскага р-на Маскоўскай вобл. Асуджаны тройкай НКВД 1.12.1937 за «контррэвалюцыйную агітацыю» да ВМП. Расстраляны на палігоне НКВД «Аб'ект Бутава». Рэабілітаваны 28.8.1989. Асабовая справа П. захоўваецца ў ДА РФ. Кр.: *БупговсКИЙ Полшон.*

**ПЫЛІНСКІ** (ПЫЛИНСКИЙ) **Пімен Віктаравіч** [1905, Магілёў — 1937 (?), турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 31.8.1937 у Вязніках Уладзімірскай вобл. Асуджаны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Боль н память: КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй Владнмнрской областн. Владнмнр, 2001. Т. 1.

**ПЫСК Нікіфар Мітрафанавіч** [1905, в. Більцавічы Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. — 23.5.1995, Вілейка]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю (1930), багаслоўскі фт Варшаўскага ун-та (1934). Служыў у прыходах Гродзенскай епархіі. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, настаяцель АляксандраНеўскай царквы ў мяст. Крэва, цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў шасцёра дзяцей. 27.6.1943 у Мінску са Свята-рамі М.Лапіцкім і І.Кушнерам служыў паніхіду па забітых акаўцамі грамадскіх дзеячах Л.Маракову (сын Дз.Моракова) і Ю. *Саковічу.* Арыштаваны 7.2.1945. Асуджаны ваенным трыбуналам войск НКВД 25.3.1946 за «антысавецкую агітацыю» да 6 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўленнем правоў. Этапаваны ў Іркуцкую вобл. Вызвалены 27.5.1950. У 1959 настаяцель царквы ва Уладзівастоку. Пазней вярнуўся на радзіму. У 1992 жыў у г. Вілейка. Рэабілітаваны 8.10.1992 прэзідыумам Гродзенскага абл. суда. Групавая справа П. і інш. № п15197 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Черепнца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненгцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 259. Гродно, 2000.

**ПШЧОЛКА (ПЩЕЛКО) Вера Мікалаеўна** [1878, Вільня — ?]. З сям'і ваеннага бел. паходжання. Падчас 2й сусветнай вайны заставалася на акупаванай тэрыторыі, рызнічая ПетраПаўлаўскага (Кацярынінскага) сабора на вул. Няміга ў Мінску. Арыштавана 28.7.1944 у Мінску па адрасе: вул. Астроўскага, д. 8, кв. 3. Абвінавачвалася ў «правядзенні антысавецкай агітацыі», «супрацоўніцтве з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» і «перакладзе на нямецкую мову артыкулаў мітрапаліта Панцеляімана (Ражноўскага)». Асуджана 17.10.1944 да 8 гадоў ППК і 2 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 5.4.1995 Мінскім абл. судом. Асабовая справа П. № 36249с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру н церковь Хрнспгову посгпрадавшпх в Мішской епархіш.*

**ПЯКАРСКІ (ПЕКАРСКИЙ) Платон Мацвеевіч** [1883, в. Каменка Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. З сялянскай сям'і. Падчас арышту стараста Мікалаеўскай царквы в. Станькава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 24.12.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 15.3.1933 як «член антысавецкай групоўкі» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці (заменены на 5 гадоў высылкі). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 29.8.1989. Групавая справа П. і інш № 30000с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**ПЯСКОЎСКІ (ПЕСКОВСКИЙ) Мікалай Леанідавіч** [1874, мяст. Абчуга Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — 30.9.1937, Орша, турма НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, брат Герасіма Леанідавіча Пяскоўскага[1]. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Вуць Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі рн. З 1911 настаяцель Свята-Духава храма ў г. Копысь Горацкага пав. Магілёўскай

губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. У 1930я г. служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Абольцы Аршанскай акругі, цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны 15.9.1937 з дыяканам Пятром *Цівам* тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 20.10.1959 Віцебскім абл. судом. Групавая справа П. і інш. № 863 7п захоўваецца ў архіве УКДБ Відебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш; НАРВ, ІКБР.*

**ПЯТРАШЫН** (**ПЕТРАШИН**) **Міхаіл** [1896 — ?], сваяк Пятра Іванавіча Пятрашына. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я г. настаяцель царквы в. Рудзянец (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Буда-Кашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 з маці (н. ў 1869) і жонкай Аляксандрай (1897). Далейшы лёс П. і яго сям'і невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губертш;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 1.

**ПЯТРОВІЧ (ПЕТРОВИЧ) Міхаіл Васілевіч** [1881 ці 1882, в. Бранавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 21.2.1931. Асуджаны 26.3.1931 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 1 года ППК. Пасля вызвалення служыў у прыпісной царкве ў Асіповічах Бабруйскай акругі, цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Зяоў арыштаваны 6.7.1937. Асуджаны 20.10.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 29549с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 3.11.1989 пракуратурай Мінскай вобл., па другой (№ 8901; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) 1.9.1963 пастановай Магілёўскага абл. суда. Кр.: *БНДЦЭД.*

**ПЯТРОВІЧ** (**ПЕТРОВИЧ**) **Петр** [каля 1890 — ?]. Скончыў

Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1903). Служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Якімавічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны пасля 1925.

Кр.: *Лнчный состав епархнального управлення; Памятная КИНжка Мынской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ПЯТРОЎСКІ (ПЕТРОВСКИЙ) Георгій** [1899, в. Межава Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р (?), верагодна, сын Сцяфана *Пяпгроўскага.* Арыштаваны 3.9.1930. Асуджаны 2.1.1931 да ППК. Тэрмін зняволення і далейшы лёс невядомы. Асабовая справа П. № п66675 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк. " '*

**ПЯТРОЎСКІ (ПЕТРОВСКИЙ) Захар Сямёнавіч** [1865 — ?]. Беларус. 3 сям'і святчэннаслужыцеля. 3 1909 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Старая Рудня Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. У 1930 асуджаны як кулак да высылкі з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 739, воп. 1, с. 596, л. 27.

**ПЯТРОЎСКІ (ПЕТРОВСКИЙ) Сцяфан Іванавіч** [1867, в. Міхалінава Горацкі пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. — 12.10.1937, Віцебск, турма НКВД], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, бацька Георгія *Пятроўскага,* брат Пятра Іванавіча Пятроўскага. Скончыў духоўную семінарыю. Арыштаваны 23.9.1937 у в. Міхееўка Дубровенскага рна. Асуджаны тройкай НКВД 28.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 18.4.1989. Асабовая справа

П. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Вшпебской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**ПЯТРУЛІН** (ПЕТРУЛИН) **Іларыён Ермалаевіч** [1880, в. Палошкава Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. У пачатку 1900х г. выкладаў у 2класнай прыходскай школе пры Пакроўскай царкве в. Пачынічы Клімавіцкага пав. (тагачасны паштовы адрас: ст. Пятровічы), цяпер Смаленская вобл., Расія. 20.9.1906 вытрымаў экзамен на дыякана і прызначаны ва Успенскі храм мяст. Астроўна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. З 1911 настаяцель Георгіеўскай царквы в. Буй Сенненскага пав., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 8.3.1928. Асуджаны 8.6.1928 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Нарымскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.6.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа П. № 22086п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губернші; НАРБ, ІКБР.*

**ПЯЧЭНКА** (**ПЕЧЕНКО**) **Павел Іосіфавіч** [1877, в. Асінаўка Мінскага пав. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1898?). З 1902 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Жыцін Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 18.3.1937. Асуджаны 4.8.1937 з актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.8.1960 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа П. і інш. № 16737с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Пажятная княжка Мынской губерш;. НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**РАБЦАЎ (РЯБЦЕВ) Андрэй.** Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. З 1913—14 настаяцель Міхайлаўскай царквы в. Харошаўка (тагачасны паштовы адрас: ст. АгароднаГомельская) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш;* Дзяржаўны архіўГомельскайвобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 41, с. 80, л. 203.

**РАБЦАЎ (РЯБЦЕВ) Леанід Мікалаевіч** [1875, в. Спасінакаўшчына (?) Разанскай губ., Расія — ?]. Рускі. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. У 1910я г. выкладчык Мінскай гарадской гандлёвай школы. У 1920я г. настаяцель царквы на — могілках каля в. Кайкава Мінскага пав., цяпер Мінскі рн. Карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод вернікаў. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 20.10.1929. Праходзіў па адной справе з актыўнымі прыхаджанамі Ігнатам Войцікам (1892), Іванам Дзяўго (1905), Дзмітрыем Драздом (1880), Міхаілам Казакевічам (1880), Васілём Матрунчыкам (1898), Каралем Міцкевічам (1893), Фёдарам Падабедам (1879), Ірынеем Станішэўскім (1855). Асуджаны 21.3.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.4.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа Р. і інш. № 26850с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Пажятная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Снноднк за веру н церковь Храстову пострадавшах в Мннской епархіш. (*

**РАВІНСКІ (РОВИНСКИЙ) Канстанцін Іпалітавіч** [4(16).6.1862, с. Спаса-Руцкае Духаўшчынскага пав. Смаленскай губ., цяпер Расія — 1942 ці 1943], краязнавец, мемуарыст, Свята-р. Беларус. З дваранскай сям'і. Скончыў Пецярбургскі унт са ступенню кандыдата юрыдычнага права (1886). Служыў у арміі, атрымаў чын унтэрафіцэра

(1887). З 1888 служыў у акруговым судзе ў СанктПецярбургу, потым падатковым інспектарам і ў земскіх установах у Сычаўскім пав. Смаленскай губ. З 1906 рэвізор Міністэрства фінансаў. З 1910 кіраваў Курляндскай, з 1915 — Тульскай, потым — Арлоўскай казённымі палатамі. У 1918 памочнік рэвізора Арлоўскай кантрольнай палаты. З 1919 рахункавод Іверскай абшчыны сясцер міласэрнасці ў Маскве. Рукапаложаны ў іерэя Іверскай царквы (1921). Пасля закрыцця храма перайшоў у Мікалаеўскую царкву ў Кленіках (Масква). Узнагароджаны санам протаіерэя. Арыштаваны 29.10.1929. Асуджаны 20.11.1929 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў. Высланы ва Уладзімір. Рэабілітаваны 28.2.1991. Як гісторыккраязнавец дэбютаваў у 1887 у «Смоленском вестннке» артыкулам пра апошні перыяд Смаленскага княства. Ініцыятар адкрыцця ў Смаленску вучонай архіўнай камісіі і таварыства вывучэння Смаленскага краю. У 1890 надрукаваў у «Смоленском вестннке» бел. паэму «Энеіда навыварат» і паведаміў звесткі пра аўтара — свайго дзеда В.П.Равінскага.

Тв.: Беседы старого свяіценнннка. СПб., 1995.

Кр.: тдгупу.Iшг.рвiЫ.ссав.гаI; *ЭГБ,* т. 6—1.

**РАГАЧУКІРЫЦКІ (РОГАЧУКИРИЦКИЙ) Андрыян (Адрыян) Іванавіч** [1883, Мяжрэчча Сядлецкай губ., цяпер Полынча — ?]. Украінец. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў псаломшчыкам у Дзімітрыеўскай царкве в. ПІчорсы Навагрудскага пав., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 15.10.1939. Асуджаны 2.7.1940 асобай нарадай пры НКВД СССР як «сацыяльнанебяспечны элемент» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў Салікамскі канцлагер НКВД Молатаўскай (цяпер Пермскай) вобл. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Гродзенскай вобл. 26.7.1989. Асабовая справа P.I. № 12239 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

**РАДАКОЎСКІ (РОДАКОВСКИЙ) Аляксандр** [1876, мяст.

Лахва Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. Сын Кірылы Радакоўскага. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1900). Служыў ва Успенскай царкве в. Новы Двор Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1914 настаяцель Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Івань (Іванаўскія Агароднікі) Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 9.2.1930. Праходзіў па адной справе з актыўнымі прыхаджанамі. Асуджаны 23.2.1930 з Пятром *Грудзінскім, Валерыянам* Навіцкім і інш. асобай нарадай пры АДПУ як «кіраўнік антысавецкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Р. і інш. (усяго каля 10 чалавек) № 23827с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Манской епархнн; Памятная КИНж ка Мннской губерніш.*

**РАДАКОЎСКІ (РОДАКОВСКИЙ) Сяргей Пятровіч. Гл.: СЕРГІЙ РАДАКОЎСКІ.**

**РАДАНЕЖСКАЯ (РАДОНЕЖСКАЯ) Ефалія Аляксандраўна** [1906, Омск — ?], навучэнка. Дачка Аляксандра Раданежскага[1]. Падчас арышту студэнтка 2га курса Віцебскага медыцынскага інстытута. Арыштавана 18.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. Вінчэўскага (?), д. 21. Асуджана тройкай НКВД 25.9.1937 за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Вызвалена і рэабілітавана 15.3.1940. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**РАДЗІВІНОВІЧ (РАДЗИВИНОВИЧ) Іаан** [ліст. 1869, в. Новыя Дарогі Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. — 17.9.1937, Слуцк, турмаНКВД]. Беларус. Сын Якава Радзівіновіча[2]. Атрымаў хатнюю адукацыю. Служыў псаломшчыкам у Георгіеўскай царкве в. Пукава (Пукаў) Ігуменскага (Слуцкага) пав.

Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. З 1910 настаяцель ПараскеваПятніцкага храма в. Бастынь Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 21.9.1929. Асуджаны 1.12.1929 са Свята-ром Міхаілам *Смірновым* і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую прапаганду» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 6.8.1937. Прыгавораны тройкай НКВД 10.8.1937 за тое ж «злачынства» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па першай справе (№ 32253с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай Беларусі 12.3.1992, па другой (№ 21146с) 28.3.1989.

10.1.1933 у в. Пукава арыштаваны бацька дваіх дзяцей Сцяпан Радзівіновіч (н. ў 1900 у в. Пукава), сын Іаана Радзівіновіча. 14.2.1933 тройкай АДПУ асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК і этапаваны ў Дзмітраўскі канцлагер АДПУ Маскоўскай вобл. Загінуў у зняволенні 9.12.1936. Рэабілітаваны 6.5.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Р. № 22685с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная княжка Мннской епархіш; Памятная КИНжка Мннской губерніш.*

**РАДЗІВІНОВІЧ** (**РАДЗИВИНОВИЧ**) **Канстанцін** [1886, в. Кабылянка Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Знаменка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Сын Дзіянісія Радзівіновіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1911). Служыў павятовым назіральнікам Навагрудскага вучылішчнага савета ад епархіяльнага ведамства. З 1914 настаяцель Міхайлаўскага храма ў мяст. Зембін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер вёска Барысаўскага р-на Мінскай вобл. З 1917 благачынны цэркваў 4й акругі Барысаўскага пав. Арыштаваны 8.4.1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі Мінскай епархіі Уладзімірам *Дзелякторскім,* Васіліем *Парфёнчыкам,*

Пятром *Ражко,* Канстанцінам *Семянюком,* Мікалаем *Тарановічам,* старастам Данілам *Сяліцкім,* актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Пакаранне адбываў на будаўніцтве канала МаскваВолга. Пасля вызвалення жыў у Магілёве. З кастр. 1941 настаяцель ТрохСвяціцельскай царквы (цяпер кафедральны сабор) у Магілёве. Тамсама служыў пасля вайны. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Р. і інш. № 27206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**РАДЗІМІНСКІ (РАДЗИМИНСКИЙ) Іаан Лявонцевіч** [1873, в. Бабінічы (Бабонічы) Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Віцебскі р-н — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (?). З 1906—07 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Казловічы Віцебскага пав., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. У 1920я г. настаяцель Ільінскага храма в. Мішневічы Віцебскага пав., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 28.11.1929. Асуджаны 13.1.1930 з шэрагам інш. Свята-роў асобай нарадай пры АДТТУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 13.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Внтебской губернші; БНДЦЭД.*

**РАДЧАНКА (РАДЧЕНКО) Навум Мікалаевіч** [1885, в. СтараЮркавічы (Старыя Юркавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ. — ?], абнаўленчы протаіерэй. Беларус. У 1910я г. выкладаў у 2класнай Баранаўскай царкоўнапрыходскай школе Гомельскага пав., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна. У 1920я г. настаяцель Свята-Духавай царквы в. Сава Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 15.11.1929. Асуджаны 3.1.1930 асобай нарадай пры АДТТУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989

указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Групавая справа Р. і інш. № 10818 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**РАЕЎСКІ** (**РАЕВСКИЙ**) **Аляксандр Сямёнавіч.** Гл.: **АЛЯКСАНДР (РАЕЎСКІ).**

**РАЖКО Пётр Цімафеевіч** [1886, в. Шаросаўка Чарнігаўскай губ., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. У 1920я г. (?) настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Вяляцічы Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны ў 1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі Канстанцінам *Радзівіновічам,* Васіліем *Парфёнчыкам,* Канстанцінам *Сетянюком,* Мікалаем *Тарановічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Р. і інш. № 27206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**РАЖКОЎ** (**РОЖКОВ**) **Філіп Восіпавіч** [1869 — ?], дыякан. Беларус. Атрымаў хатнюю адукацыю. Служыў у адной з цэркваў Магілёўскай епархіі. У 1910я г. сакратар аддзялення «Союзарусского народа» ў мяст. Стрэшын Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. жыў у в. Нівы Рагачоўскага пав., цяпер Жлобінскі рн. Быў жанаты, меў шэсць дзяцей (з іх трое непаўналетніх). У 1930 асуджаны як кулак да высылкі з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**РАЖКОЎСКІ** (**РОЖКОВСКИЙ**) **Сцяфан Міхайлавіч** [1864, в. Вузла Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Мядзельскі р-н Мінскай вобл. — 10.11.1937, Ленінград, турма НКВД], Свята-р. Беларус. У 1910я г. служыў у Віленскай епархіі. Падчас арышту настаяцель храма

Афонскага падвор'я ў Ленінградзе. Арыштаваны 2.10.1937 у Ленінградзе па адрасе: вул. 7я Чырвонаармейская, д. 30, кв. 71. Асуджаны камісіяй НКВД і пракуратуры СССР 3.11.1937 за «ўдзел у контррэвалюцыйнай шпіенскай тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны.

**РАЖНОЎ** (**РОЖНОВ**) **Вячаслаў Філіпавіч** [1882, мяст. Чашнікі Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і службоўца. Скончыў Віцебскую (?) духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель царквы в. Вайханы Гарадоцкага пав Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 20.12.1929. Асуджаны 13.1.1930 з шэрагам інш. Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.4.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**РАКАЎ** (**РАКОВ**) **Міхаіл Дзмітрыевіч** [1888 або 1893 — 1947 (?), ГУЛАГ], іерэй. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. З 1914 псаломшчык Ціханаўскай царквы в. Івакі Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл., потым Пакроўскага храма в. Целяшы Гомельскага пав., цяпер Гомельскі рн, Міхайлаўскай царквы в. Гадзілавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі рн. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў на Гомельшчыне. З 1923 настаяцель храма в. Камень Рагачоўскага пав., потым царквы в. Азершчына Рэчыцкай акругі, цяпер Рэчыцкі рн, РастваБагародзіцкага храма в. Сведскае Рэчыцкага рна, УсяСвяцкай царквы в. Старое Сяло Рагачоўскага рна, РастваБагародзіцкага храма ў мяст. Свержань Рагачоўскага рна. Апошняе месца служэння — Пакроўская царква в. Рэпкі Рагачоўскага рна. Арыштаваны пасля закрыцця храма ў 1937. Асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Жонка Р. Наталля Канстанцінаўна засталася адна з 4 непаўналетнімі дзецьмі.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 343.

**РАМАНАВА** (**РОМАНОВА**) **Аграфена (Агрыпіна) Ісаафаўна** [чэрв. 1872, в. Кандрашы Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], манахіня. У 1930 прыняла тайны постры́г. Член прыходскага савета Маісееўскай царквы на вул. Парахавых (?) у Ленінградзе. Арыштавана 5.10.1932. Асуджана 8.12.1932 да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.*

**РАМАНКЕВІЧ** (**РОМАНКЕВИЧ**) **Сцяфан Дзмітрыевіч** [1881, Магілёўская губ. — ?], протаіерэй. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (?), рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Георгіеўскай царкве в. Мардашавічы (тагачасны паштовы адрас: мяст. Дуброўна) Новатухінскай вол. Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Мардахі (?) Дубровенскага р-на Віцебскай вобл. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол. У 1923 з міранінам Каяшкевічам паехаў у Маскву да патрыярха Ціхана (Бялавіна) для высвятлення ўмоў вяртання ў кананічную царкву. Удзельнічаў у складанні пакаяльнага прашэння ад імя ўсіх гамяльчан. Арыштаваны 16.8.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ 26.8.1930 да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Сібір. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.10.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш;* Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998; *Шнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). Мн., 2006.

**РАМАНОВІЧ (РОМАНОВИЧ) Агаф'я Маркаўна** [1888, Аршанскі пав. Магілёўскай губ. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 4.4.1932 у Оршы Віцебскай вобл. Асуджана 9.8.1932 з інш. манахінямі, манахамі, царкоўнымі служачымі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3

гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 9.2.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Р. і інш. № 6739п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**РАМАНОЎСКІ (РОМАНОВСКИЙ) Мікіта Іванавіч** [1881, Кіеў — ?]. Рускі. З сям'і кадравага ваеннага. Атрымаў хатнюю адукацыю. У 1900—10я г. служыў у Чэрыкаўскім казначэйстве, Магілёўскай казённай палаце, Магілёўскім губернскім распарадчым камітэце. Падчас арышту настаяцель царквы в. Палыкавічы Магілёўскага рна. Арыштаваны 6.11.1935 у Магілёве. Асуджаны 17.4.1936 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.2.1992 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа № 15061 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш.*

**РАМАНОЎСКІ (РОМАНОВСКИЙ) Пётр Васілевіч** [1891, в. Вялікае Сяло Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчык царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 20.2.1932 з настаяцелем царквы Дзімітрыем *Мірашнічэнкам,* актыўнымі прыхаджанамі Трафімам Міхнеевым, Аляксандрам Раманоўскім (братам Р.), Яфімам Халадком. Асуджаны калегіяй АДПУ 15.4.1932 за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру ы церковь Хрысniову пострадавшнх в Мннской епархны.*

**РАМАНЮК (РОМАНЮК) Трафім Андрэевіч** [1894 — верас. 1937 (?), Пскоў, турма НКВД], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 11.10.1937 у в. Ласіцы Лядскага (цяпер Плюскага) р-на Пскоўскай вобл. Асуджаны 15.11.1937 з Вікенціем *Агінскім* і інш. тройкай НКВД Ленінградскай вобл. за «антысавецкую прапаганду» і «ўдзел

у контррэвалюцыйнай тэрарыстычнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны, хутчэй за ўсё, у верас. 1937. Рэабілітаваны 3.1.1958. Ч

**РАМЕНСКІ** (**РАМЕНСКИЙ**) **Фёдар Яўграфавіч.** Гл.: **ФІЛАРЭТ (РАМЕНСКІ).**

**РАПІН** (**РАПИН**) **Грыгорый Дарафеевіч** [31.2.1898 в. Зарэчка, цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. — 2.5.1968], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў народнае вучылішча ў в. Ляхавічы (1913), курсы псаломшчыкаў пры Яблачынскім манастыры (Полыпча). У 1927 ажаніўся з Нінай Уладзіміраўнай Валасевіч (н. ў 1901). У 1938 архіепіскапам Палескім і Пінскім Аляксандрам (Іназемцавым) прызначаны псаломшчыкам у РаствaБагародзіцкую царкву в. Ляхавічы, цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны і асуджаны ў 1945 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў канцлагераў. Этапаваны ў адзін з канцлагераў Краснаярскага краю. Вызвалены ў 1956. 19.11.1958 епіскапам Новасібірскім Данатам (Шчогалевым) рукапалажаны ў дыякана, 13.3.1960 — у Свята-ра. З 1958 дыяканпсаломшчык, з 1960 настаяцель храма г. Кызыл Новасібірскай вобл. і епархіі. Узнагароджаны набедранікам, камілаўкай (1964), нагрудным крыжам (16.4.1968). Памёр падчас службы. Рэабілітаваны.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**РАСАХОНАЎ** (**РАССАХОНОВ**) **Яфім Янавіч.** Дыякан. Беларус. У 1920я г. служыў у Мікалаеўскай царкве в. Стаўбун Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 18.

**РАСОЎСКІ** (**РОССОВСКИЙ**) **Пётр Міхайлавіч** [1883, в. Пярсцілы, цяпер Магілёўскі р-н — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў

Магілёўскую духоўную семінарыю, рукалаложаны ў іерэя. Служыў у Свята-Троіцкім храме в. Батунь Магілёўскага пав., цяпер Магілёўскі рн, выкладаў Закон Божы ў Батуньскай царкоўнапрыходскай школе. З 1912 настаяцель Пакроўскага храма в. Доўск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны ў 1937 у Магілёве. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Р. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Могнлевской губернни; БНДЦЭД.*

**РАТМІРАЎ** (**РАТМИРОВ**) **Васілій Міхайлавіч. Гл.: ВАСІЛІЙ РАТМІРАЎ.**

**РАЎТОВІЧ** (**РАВТОВИЧ**) **Іосіф Маркавіч** [1880, в. Дабраволя Ваўкавыскага пав., Гродзенскай губ. цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Загусціна Клімавіцкага рна, цяпер Смаленская вобл., Расія. Быў жанаты, меў сына. Арыштаваны 21.1.1930. Асуджаны 24.2.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.3.1989 пракуратурай Гродзенскай вобл. Групавая справа Р. і інш. № п9735 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр. *НАРБ, ІКБР.*

**РАХАНАЎ** (**РАХАНОВ**, **РОХАНОВ**) Міхаіл Мікалаевіч [1880 ці 1881, Віцебскі пав. — ?], актыўны прыхаджанін Богаяўленскага храма ў Дарагамілаве Маскоўскай губ. Арыштаваны 7.4.1922 у Маскве па «справе аб супраціве канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей». Асуджаны 8.5.1922 Маскоўскім рэвалюцыйным трыбуналам да ВМП. 27.5.1922 на пасяджэнні прэзідыума УЦВК па справе «царкоўнікаў» расстрэл заменены на 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**РАЧКО Мікалай Іванавіч** [1885, хут. Новы Двор Гродзенскай губ. — ?]. Скончыў 3класнае рэальнае вучылішча ў Навагрудку (1907), псаломшчыцкапастырскія курсы пры Яблачынскім Свята-Ануфрыеўскім манастыры (1938). 15.7.1941 мітрапалітам Беларускім Панцеляіманам (Ражноўскім) у Жыровіцкім Успенскім манастыры рукапалажаны ў дыякана, 18.7.1941 — у іерэя і прызначаны ў Крыжаўздзвіжанскую царкву в. Войневічы, цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. 3 24.12.1946 без месца. 3 19.3.1947 другі Свята-р РаствaБагародзіцкага храма ў Міжэвічах, цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. Арыштаваны 9.8.1947. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**РАЧКОЎСКІ** (**РАЧКОВСКИЙ**) **Васілій Раманавіч** [1873, Слуцк Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Да арышту псаломшчык Уваскрасенскага храма ў Слуцку. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі Слуцкага вікарыяцтва асобай нарадай пры АДТТУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Р. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: *БНДЦЭД.*

**РАШАНЦАЎ (РЯШЕНЦЕВ) Віктар Сцяпанавіч. Гл.: ВАРЛААМ (РАШАНЦАЎ).**

**РАШЧЫНСКІ (РОЩИНСКИЙ) Уладзімір Васілевіч** [1902, в. Казловічы Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Да арышту служыў у Мітрафанаўскай царкве ў роднай вёсцы. Быў жанаты, гадаваў трое дзяцей. Арыштаваны 1.3.1932. Асуджаны 19.6.1932 асобай нарадай

пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. № 20875п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. . ;

Кр.: *БНДЦЭД.* ''

**РАШЭТНІК (РЕШЕТНИК) Васілій Міронавіч** [1891, в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчык Спаса-Праабражэнскай царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны ў крас. 1933. Асуджаны 19.7.1933 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Р. і інш. № 2 7206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**РЖАВУЦКІ (РЖАВУЦКИЙ) Аляксій Сцяпанавіч**. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, брат Пятра *Ржавускага.* Скончыў духоўную семінарыю. 3 1908 настаяцель Пакроўскай царквы в. Карма (тагачасны паштовы адрас: ст. АгароднясГомельская) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл., благачынны 3й акругі Гомельскага пав. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерниі;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 40.

**РЖАВУЦКІ (РЖЭЦКІ) (РЖАВУЦКИЙ, РЖЕЦКИЙ) Андрэй Антонавіч.** Дыякан. Беларус. 3 сям'і псаломшчыка (?). У 1920я г. жыў у в. Станкі (Стайкі) Гомельскага пав., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

**РЖАВУЦКІ (РЖАВУЦКИЙ) Пётр Сцяпанавіч** [1867, в. Баханы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. — 22.4.1938, Магілёў, турма НКВД].

Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, брат Аляксія *Ржавускага.* Скончыў духоўную семінарыю. З 1915 настаяцель Міхайлаўскай царквы ў в. Язёры Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 2.3.1938 у Магілёве. Асуджаны 14.3.1938 тройкай НКВД за «ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 2.9.1961 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Р. і інш. № 7486сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Могнлевской губерніш; БНДЦЭД.*

**РОВІН** (**РОВИН**) **Даменціян Пракопавіч** [1870, в. Халопенічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З мяшчанскай сям'і. У 1920я г. служыў у царкве в. Зазерыца Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. Меў двое дзяцей. Арыштаваны 28.2.1930 у в. Доўжыца Чашніцкага рна. Асуджаны 16.6.1930 з шэрагам інш. Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Р. і інш. № 21074п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Дзяржаўны архіўВіцебскай вобл., ф. 152, в. 5, с. 2, л. 5,18,19.

**РОЗАЎ (РОЗОВ) Дзімітрый Ціханавіч** [1872, мяст. Сухары Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі р-н — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў гарадское вучылішча. Служыў дыяканампсаломшчыкам у Аршанскім Уваскрасенскім саборы. 28.12.1906 пераведзены ў Магілёўскі Успенскі храм. З 1908 другі Свята-р Успенскай царквы ў мяст. Краснаполле Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. З 1911 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма в. Калодніца (тагачасны паштовы адрас: ст. Чарэя) Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер

Крупскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 8.3.1930 у в. Вялікія Салаўі Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 12.3.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Леанідам *Кліндуховым,* Пятром *Мамыкам,* Міхаілам *Саракалетавым* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да высылкі (тэрмін не ўказаны). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**РОЛІЧ (РОЛИЧ) Вікенцій Васілевіч** [19.12.1889, в. Губы Віленскай губ. — ?], псаломшчык. Беларус. Скончыў настаўніцкую семінарыю (1902), Віленскі настаўніцкі інстытут (1915) з кваліфікацыяй педагогфілолаг. Асуджаны ў 1937 да 10 гадоў ППК. З 1946 служыў псаломшчыкам у царкве на станцыі Дакшукіна Казахскай ССР (?). У тым жа годзе пераведзены ў храм станіцы Александрыйская Стаўрапольскага краю. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**РУБАН Філіп Канстанцінавіч** [1893, в. Поплава Мінскай губ. — 1954], протадыякан. Беларус. З сям'і службоўца. Здаў экзамен на званне псаломшчыка і 13.12.1914 накіраваны ў Спаса-Праабражэнскі храм в. Язвінка Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. У 1915 мабілізаваны ў войска. Пасля сканчэння ваеннай школы, накіраваны на фронт у 208ы Ларыйскі полк. Паранены. Пасля лячэння вярнуўся ў Спаса-Праабражэнскі храм. Увосень 1924 вытрымаў экзамен на званне дыякана і накіраваны на службу ў Пружаны, потым у Пінск. З кастр. 1934 протадыякан Гродзенскага кафедральнага сабора. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 13.12.1944. Асуджаны 7.6.1945 за «ўдзел у антысавецкай арганізацыі» і «пасобніцкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. З канцлагера вызвалены смяротна хворым. Памёр неўзабаве

пасля вяртання на радзіму. Рэабілітаваны 8.10.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Р. № п15357 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Черепнца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. Гродно, 2000. С. 257; *Яго ж.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 2. Гродно, 2005. С. 94.

**РУБАНОВІЧ** (**РУБАНОВИЧ**) **Міхаіл Сямёнавіч** [1857, в. Мілашавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. — 1.11.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. Скончыў Слуцкае духоўнае вучылішча (1881). Служыў псаломшчыкам у Крыжаўздзвіжанскай царкве в. Сямёнавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. 31.3.1883 пастановай Мінскай духоўнай кансісторыі пераведзены ў Георгіеўскі храм в. Астроўкі Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл., адначасова выкладаў у царкоўнапрыходскай школе, пасвячоны ў сціхар (23.8.1884). 9.5.1887 епіскапам Мінскім і Тураўскім Варлаамам (Чарняўскім) рукапаложаны ў дыякана. З 11.4.1890 псаломшчык Свята-Троіцкай царквы в. Беразавец Навагрудскага пав., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл., выкладаў у царкоўнапрыходскай школе. З 28.2.1891 служыў у Мікалаеўскім храме ў мяст. Мір Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі рн. З 1901 дыякан Мінскай духоўнай кансісторыі, эканом епархіяльнага інтэрната. 16.1.1905 епіскапам Мінскім і Тураўскім Міхаілам (Цемнарусавым) рукапаложаны ў іерэя РаставаБагародзіцкай царквы в. Арэвічы Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Хойніцкі р-н Гомельскай вобл. 1.1.1911 духавенствам 4й благачыннай акругі Рэчыцкага пав. выбраны дэлегатам на акруговы настаўніцкі з'езд. З 16.10.1912 настаяцель Георгіеўскага храма в. Тарасава (тагачасны паштовы адрас: ст. Ратамка) Мінскага пав., цяпер Мінскі рн. 14.8.1914 епіскапам Мінскім і Тураўскім Мітрафанам (Краснапольскім) зацверджаны на пасаду

дэпутата на Мінскі акруговы настаўніцкі з'езд. Узнагароджаны медалём у памяць рускаяпонскай вайны 1904—05, сярэбраным медалём Чырвонага Крыжа. У 1930я г. служыў у царкве св. Марыі Магдаліны на вул. Старажоўскай у Мінску. Арыштаваны 28.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Старaслабадская, д. 26, кв. 1. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.3.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа Р. і інш. Свята-роў № 23379с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятпная КИНжка Мннской губерш; Статнстпческне сведеныя о церквах н прнчтах Мннской епархіш; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управленая; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**РУБАНОВІЧ (РУБАНОВИЧ) Парфірый Адамавіч. Гл.: ПАРФІРЫЙ РУБАНОВІЧ.**

**РУБАНОВІЧ (РУБАНОВИЧ) Уладзімір** [1889 — 14.1.1938, Мінск (?), турма НКВД], протаіерэй. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля (?). Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1911). Рукапаложаны ў іерэя. Служыў настаяцелем ва Увазнясенскім храме в. Вялікі Рожан Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. З 18.1.1914 — законанастаўнік царкоўнапрыходскіх вучылішч пры ст. Баранавічы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер горад Брэсцкай вобл, настаяцель чыгуначнага храма ў мяст. Баранавічы. У 1920я г. настаяцель Свята-Троіцкай царквы ў мяст. Смілавічы Ігуменскага пав., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Верагодна, служыў і ў Спаса-Увазнясенскім храме в. Вялікі Рожан Слуцкага рна. Арыштаваны 24.12.1937. Асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. *67; Снноднк за веру н церковь Хрнстпову пострадавшнх в Мннской епархіш;* л\г\у\.peieг§'еп.сот.

**РУБАНОВІЧ (РУБАНОВИЧ) Фёдар** [1890, в. Баравая Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. — 20.5.1946, Орша, турма НКВД]. Беларус. СынКанстанцінаРубановіча[1]. З 1908 псаломшчык царквы в. Невель, цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 1916 служыў ва Увазнясенскім храме Століна, цяпер рай-цэнтр Брэсцкай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1920). Прызначаны настаяцелем ПараскеваПятніцкай царквы в. Бастынь, цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. З 1921 служыў у Пакроўскім храме в. Паручын, цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1931 — у ПараскеваПятніцкай царкве в. Чэрніхава, цяпер Баранавіцкі рн. З 1936 — у Свята-Духавым храме в. Падлессе, цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 3.4.1945. Праходзіў па адной справе з Васілём Тарандам (н. ў 1896, да арышту працаваў на «Буддвары» БеларускаЛітоўскай чыгункі). Асуджаны 25.3.1946 асобай нарадай МДБ за «здраду радзіме» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Закатаваны ў Аршанскай турме МДБ. Рэабілітаваны 2.10.1956 трыбуналам БВА. Асабовая справа Р. № 2755с захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 565.

**РУДАКОЎСКІ (РУДАКОВСКИЙ) Іаан** [каля 1860 — ?]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Служыў псаломшчыкам ва Увазнясенскім храме в. Кіевічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (27.10.1885), прызначаны ў Спаса-Праабражэнску царкву в. Камень Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. 8.11.1885 пераведзены ў ПетраПаўлаўскі храм в. Бучаціна Слуцкай пав., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў дачок: Аляксандру, Анастасію, Людмілу, Юлію (пасля замужжа жыла ў Зах. Беларусі), Яўгенію і сыноў: Васіля, Віктара (памёр юнаком), Віталя, Мікалая, Сяргея. Узнагароджаны набедранікам (да 1901), скуф'ёй (да 1904). У

другой палове 1920х г. пераехаў з сям'ёй у Мінск. 9.11.1932 у Мінску паадрасе: Вайсковызав., д. 21, кв. 1 органамі АДПУ арыштаваны Р. і яго сыны Васіль (н. 15.10.1893; атрымаў вышэйшую адукацыю; у 1920я г. служыў з бацькам у ПетраПаўлаўскім саборы; у пачатку 1930х г. працаваў бухгалтарам у «Белдарбудзе»), Сяргей (н. ў 1901; атрымаў вышэйшую адукацыю; да арышту працаваў ветэрынарным урачом у «Белпташтрэсце») і дочкі Аляксандра (атрымала вышэйшую адукацыю; да арышту супрацоўніца наркамата асветы БССР), Анастасія (атрымала вышэйшую адукацыю; да арышту настаўніца адной з мінскіх СІП), Яўгенія (н. ў 1892 у в. Бучаціна; вышэйшую адукацыю атрымала ў СанктПецярбургу; у пачатку 1930х г. настаўніца Мінскай СІП № 1; у 1933 не вытрымала катаванняў, звар'яцела на допытах у Мінскай турме АДПУ і была адпраўлена ў Магілёўскую псіхіятрычную бальніцу). 10.4.1933 калегіяй АДПУ дачка Р. Аляксандра асуджана за «неданясенне» да 10 гадоў ППК, Анастасія да 3 гадоў ППК. Сыны 5.5.1933 за «шпіянаж на карысць Полыпчы» прыгавораны да ВМП і 7.5.1933 расстраляны ў Мінскай турме АДПУ. Малодшых дзяцей Р. Людмілу і Віталя двое невядомых адвезлі ў дзіцячы дом. У 1936 са зняволення вярнулася Анастасія Рудакоўская. Яна адшукала Людмілу, Віталя і забрала іх з дзіцячага дома. Групавая справа сям'і Р. і інш. № 25666с (усяго больш за 30 чалавек) захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве КДБ Беларусі. Рэабілітаваны 31.5.1968 трыбуналам БВА.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губернын; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Мінска. У 4х кн. Кн. 3я. Мн., 2004.

**РУЖЫНСКІ** (**РУЖИНСКИЙ**) **Аляксандр Дзмітрыевіч** [1895, Віцебск — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю (?). Арыштаваны 8.3.1941 у Віцебску па адрасе: вул. ВерхнеНабережная, д. 9. Асуджаны 25.4.1942 (?) асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 8

гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 7.6.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР*.

**РУЖЫЦКІ** (**РУЖИЦКИЙ**) **Грыгорый.** Дыякан. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я г. жыў у в. Яромаўка (?) Гомельскага пав. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 88, л. 16.

**РУЛШСКІ (РУЛННСКИЙ) Максім Іванавіч** [1899, в. Дзяніскавічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ганцавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і, бацька Мікалая *Рулінскага*[1]. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. Служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Галынка, цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1945 у Мінску па адрасе: вул. Апанскага, д. 96. Асуджаны 20.11.1945 паводле пастановы калегіі НКВД да 7 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў. У перыяд з 8.3.1951 да 5.5.1951 зноў арыштаваны і прыгавораны да 7 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.6.1956 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Р. № 6868с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**РУМЯНЦАЎ** (**РУМЯНЦЕВ**) **Аляксандр** [1881, в. Обаль Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — ?], сын Свята-ра, былога члена «Союза русского народа» Іаана Румянцава, брат Ільі *Румянцава* і, верагодна, Мікалая Іванавіча Румянцава. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. У 1913 сям'я Р. пераехала ў мяст. Вула Лепельскага пав. Віцебскай губ. (цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл.), дзе ў Свята-Троіцкай царкве яго брат пачаў служыць настаяцелем. У 1920я г. Р. — настаяцель Успенскага храма в. Лоўжа (знаходзілася за 20 кіламетраў

ад царквы ў мяст. Вула), цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 22.11.1929. Асуджаны 23.2.1930 са Свята-рамі Міхаілам *Козыравым,* Серафімам *Захаравым* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Р. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

28.11.1930 у в. Лоўжа арыштавана хатняя гаспадыня Румянцава Марыя Васілеўна (н. ў 1881 у сям'і Свята-ра), верагодна, жонка Аляксандра Румянцава. 14.4.1930 асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 26.6.1989.

20.12.1932 у Гарадку Віцебскай вобл. па адрасе: Невельская шаша, 19 арыштаваны планавік Лясной раённай гаспадаркі, бацька дваіх дзяцей Румянцаў Леанід Аляксандравіч (н. 1905 у в. Завічэлле Лепельскага р-на Віцебскай вобл.; атрымаў вышэйшую адукацыю), сын Аляксандра Румянцава. 10.9.1933 асуджаны тройкай НКВД за «шкодніцтва ў галіне лясной гаспадаркі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны калегіяй Вярхоўнага суда БССР 14.11.1955. Яго асабовая справа № 8061с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятпная КИНжка Вшпебской губерніш; НАРБ, ІКБР.*

**РУМЯНЦАЎ (РУМЯНЦЕВ) Ілья** [1886, в. Обаль Віцебскай губ., цяпер Шумілінскі р-н Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турмаНКВД], протаіерэй, сын Свята-ра Іаана Румянцава, брат Аляксандра *Румянцава* і, верагодна, Мікалая Іванавіча Румянцава. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю. З 1913 настаяцель Свята-Троіцкага храма ў мяст. Вула Лепельскага пав. Віцебскай губ. (цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. У 1920 арыштаваны Віцебскім губ. ЧК, але праз некаторы час вызвалены. У 1925 пераехаў у Віцебск, служыў у ІаанаБагаслоўскай царкве ПолацкаВіцебскай епархіі. Быў жанаты на Аляксандры Фёдараўне Уладзіміравай, меў сыноў: Вячаслава[1] і

Валянціна (вучыўся на рабфаку; далейшы лёс невядомы). Зноў арыштаваны ў 1927, але таксама праз некаторы час вызвалены. У трэці раз арыштаваны 2.11.1931 у Віцебску па адрасе: вул. Новапятроўская, д. 36а. Асуджаны 14.7.1932 з 15 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Пасля вызвалення вярнуўся ў Віцебск. З пачатку 1934 служыў настаяцелем царквы с. Дзісяды (?) НоваЗавідаўскага р-на Калінінскай вобл. З 1935 і да канца 1936 — настаяцель храма с. Упіравічы Высохаўскага р-на Калінінскай вобл., потым зноў вярнуўся ў Віцебск. Служыў у Свята-Троіцкай (Чорнай) царкве (прыпісной да ІаанаБагаслоўскага храма). Зноў арыштаваны 21.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 2я Валадарская, д. 36. Прыгавораны тройкай НКВД 28.9.1937 за «контррэвапюцыйную прапаганду» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па першай справе (захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл., па другой прэзідыумам Віцебскага абл. суда 28.7.1956.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Внтебской губерншi; Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**РУНКЕВІЧ (РУНКЕВИЧ) Аляксандр** [1891, мяст. Клічаў Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], сын Максіма Рункевіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1914), накіраваны псаломшчыкам у ПетраПаўлаўскую царкву в. Галынка Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. 25.4.1915 пераведзены ў ПетраПаўлаўскі храм в. Навасёлкі Слуцкага пав., цяпер Капыльскі рн. Рукапаложаны ў іерэя. З 1916 настаяцель Успенскай царквы в. Косіна Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі рн. У 1920я г. служыў у ПетраПаўлаўскай (?) царкве в. Бялевічы Слуцкага пав., цяпер Слуцкі рн, у Свята-Троіцкім храме ў Клічаве. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 17.1.1930. Асуджаны 23.2.1930 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Рэабілітаваны 7.7.1989 Магілёўскай абл. пракуратурай. Асабовая справа Р. № 10504сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

4.8.1937 у Бабруйску Магілёўскай вобл. арыштаваны юрыст завода імя Кірава Рункевіч Грыгорый Максімавіч (н. ў 1883 у в. Буйнавічы), атрымаў вышэйшую адукацыю), брат Аляксандра Рункевіча. 17.9.1937 асуджаны тройкай НКВД за «ўдзел у кулацкай контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці і 28.9.1937 расстраляны ў Бабруйску. Рэабілітаваны 3.9.1960 Магілёўскім абл. судом. Яго асабовая справа № 7160сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Опнсанне церквей н прнходов Мннской епархнн; Памятная кнажка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**РУНКЕВІЧ (РУНКЕВИЧ) Мікалай** [1876 — ?]. Беларус. Сын Парфірыя Рункевіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1898?). У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Станькава Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 31.8.1930. Асуджаны 25.11.1930 са Свята-ром Мінскай епархіі Міхаілам *Любічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.3.1992 пракуратурай і КДБ Беларусі. Асабовая справа Р. № 32238с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Дзяржынскага раена. Мн., 2004. ?!

**РУНКЕВІЧ (РУНКЕВИЧ) Мікалай Міхайловіч** [1872, в. Гарбацэвічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], протаіерэй. З духоўнага саслоўя. У ліку лепшых скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894), СанктПецярбургскую духоўную акадэмію (1900). У 1906—20х г. служыў у храмах СанктПецярбурга. Арыштаваны 1.11.1929. Асуджаны 5.2.1932 да ППК (тэрмін невядомы). Этапаваны ў Салавецкі

канцлагер АДПУ Карэльскай АССР. У 1934 высланы ў АлмаАту. Па звестках унучкі Арчашавай Вільгеміны Расціславаўны загінуў у зняволенні.

Літ.: *СанктпПетербургской епархші Сннодннк.*

**РУНКЕВІЧ (РУНКЕВИЧ) Сергій** [1887, в. Смядзін (Снядзін) Мазырскага пав., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Васілія Рункевіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (да 1912). З 1913 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Кішчына Слабада Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, гадаваў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 30.8.1929. Асуджаны 20.11.1929 са Свята-рамі Мінскай епархіі Яўгеніем *Каржанеўскім,* Васіліем *Цярноўцам,* дыяканам Слуцкага сабора Пракофіем *Зданко* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.3.1992 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа Р. № 33663с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**РУСЕЦКІ (РУСЕЦКИЙ) Павел Сцяпанавіч** [1888, в. Грыцкавічы Мінскага пав., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — 1938 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сям'і псаломшчыка. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1912). 8.12.1913 рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Уваскрасенскага храма ў мяст. Азарычы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл. У сярэдзіне 1920х г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Магільна Уздзенскага рна. Некаторы час, верагодна, служыў у Крыжаўздзвіжанскім храме в. Коўбча, цяпер Клічаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 30.1.1930. Асуджаны (верагодна, у тым жа годзе) калегіяй АДТТУ да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Працаваў чорнарабочым у Магілёўскім

«Камунбудзе». Зноў арыштаваны 26.2.1938. Прыгавораны асобай нарадай пры НКВД 21.9.1938 за «ўдзел у шпіёнскапаўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Па першай справе рэабілітаваны 16.1.1989, па другой (№ 5070, групавая; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) пастановай трыбунала БВА 24.12.1957.

Кр.: *Памятная кныжка Мннской епархнн; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Клічаўскага раена. Мн., 1995; \тапу.реі;ег§еп.сот.

**РУТКОЎСКІ (РУТКОВСКИЙ) Аляксій Грыгор'евіч** [1892, в. Цітаўка Смаленскай губ., Расія — ?], Свята-р. Рускі. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю (?). Служыў у РастваБагародзіцкай царкве ў мяст. Круглае былога Магілёўскага пав., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 22.9.1949. Асуджаны 1.3.1950 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 пастановай прэзідыума Вярхоўнага савета СССР. Асабовая справа Р. № 11063 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**РЫЖКОЎ (РЫЖКОВ) Уладзімір Іванавіч** [1871, в. Малыя Баўкі (Боўкі) Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Боўкі Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Прызначаны ў Свята-Троіцкую царкву ў мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. З 1912 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Крычаў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. У 1920я г. — ва Успенскай царкве в. Машанакі Горацкага пав., цяпер Магілёўскі рн. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол, але неўзабаве прынёс пакаянне архіепіскапу Магілёўскаму *Паўліну* (Крошачкіну) і вернуты ў зносіны з кананічнай Царквой. Працягваў служыць ва Успенскай царкве, пакуль у 1933 улады не адмовілі ў

рэгістрацыі храма. Арыштаваны ў 19 3 7 у Магілёве. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Р. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная кнпжка Могнлевской губершш; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Шнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн православной церквн в Белорусснн (1922—1939). Мн., 2006.

**РЫЖЫКАЎ** (**РЫЖИКОВ**) **Яўграф Цімафеевіч** [1880, в. Судзіловічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], дыякан. Беларус. З сялянскай сям'і. У пачатку 1900х г. выкладаў у школе граматы в. Макеевічы Клімавіцкага пав. 22.9.1906 вытрымаў экзамен і прызначаны псаломшчыкам Георгіеўскага храма в. Шэйка (Шыйка) Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. Падчас арышту дыякан РаствaБагародзіцкай царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 24.9.1929. Асуджаны 15.12.1929 са Свята-рамі Іаанам *Духоўскім,* Гаўрыілам (Тумерам) *Туманавым* і актыўнымі прыхаджанамі Міхаілам Вайніловічам (1896), Пятром Зянкевічам (1897), Аркадзем Ільінічам (1898), Васілём Ільінічам (1884), Васілём Ісачанкам (1895), Іванам Кашурам (1903), Іванам Мышкоўскім (1880) асобай нарадай пры АДПУ за «агітацыю супраць савецкай улады» да 3 гадоў ППК. Хутчэй за ўсё, этапаваны ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.9.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Р. і інш. № 11024 захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве КДБ Магілёўскай вобл. Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Клімавіцкага раена. Мн., 1995. ,. ,

РЫЛА (РЫЛО) Пётр Кузьміч [?, Магілёў — 1.11.1937, Гомель, турма НКВД], протаіерэй. У 1923 ухіліўся ў абнаўленчы раскол, член Гомельскага епархіяльнага ўпраўлення (абнаўленчага). У сак. 1924 на Гомельскім з'ездзе духавенства і міран з протаіерэямі Уладзімірам

Зубаравым і Паўлам Гінтаўтам, таксама нядаўнімі абнаўленцамі, далучыўся да кіраўніцтва з'езда, якое прызнала ціханаўскую кананічную Царкву. Арыштаваны 16.8.1937 у Гомелі. Асуджаны тройкай НКВД 30.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.7.1988.

**РЫЛЬКО Ілья Ігнатавіч** [1881, в. Рыдамля Сенненскага пав. Магілеўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. — 21.11.1937, Масква, турмаНКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У пачатку 1900х г. настаўнік школы граматы. 27.2.1906 вытрымаў экзамен на званне псаломшчыка і прызначаны ў Спаса-Праабражэнскі храм в. Хляўно Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кармянскі р-н Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. З 1913—14 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Усохская Буда Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. У 1930я г. служыў у храме в. Нікольскае НоваПятроўскага р-на Маскоўскай вобл. Арыштаваны 30.10.1937 Асуджаны 19.11.1937 з дыяканам царквы ў пас. Купаўна Маскоўскай вобл. Іосіфам *Счансновічам* тройкай НКВД за «антысавецкую агітацьгію» да ВМП. Расстраляны на палігоне НКВД «Аб'ект Бутава». Рэабілітаваны 30.6.1989. Асабовая справа Р. захоўваецца ў ДА РФ.

Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі Р.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губернші; БутовсКИЙ Полнгон.*

**РЫЛЬЦЭВІЧ (РЫЛЬЦЕВИЧ) Аляксій Аляксандравіч** [1879, Гродна — ?], Свята-р. Арыштаваны 8.6.1930 у Варонежскай вобл., Расія. Асуджаны 28.6.1930 да 5 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы.

**РЫМАШЭЎСКІ (РЫМАШЕВСКИЙ) Мікалай Данілавіч** [13.6.1889, в. СлабадаКучанка Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1930я г. настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Новыя Дарогі Старадарожскага р-на Мінскай вобл. Быў жанаты, меў трое

дзяцей. Арыштаваны 30.4.1936. Асуджаны 21.7.1936 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены ў 1941. Вярнуўся на радзіму. З другой паловы 1941 зноў служыў Свята-ром. Рэабілітаваны 4.4.1990 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Р. № 30797с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархш.*

**РЭЙТАРАЎСКІ** (**РЕЙТОРОВСКИЙ**) **Мікалай Іванавіч** [1873, в. Таболкі Дрысенскага пав. Полацкай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і царкоўнаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Свята-Духавым храме в. Паддуб'е Віцебскага пав. З 1910 настаяцель Ільінскай царквы в. Казакова Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Віцебскі рн. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 15.2.1930. Асуджаны 10.3.1930 за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракурорам Віцебскай вобл. Асабовая справа Р. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Разам з Мікалаем Рэйтараўскім арыштаваны і асуджаны да ссылкі ў Паўночны край яго сын Кранід н. ў 1905 у в. Паддуб'е). Далейшы лёс невядомы.

**РЭМУХАЎ** (**РЕМУХОВ**) **Ігнат Фаміч** [1874, в. Слабодка Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту староста царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты. Арыштаваны 3.1.1933. Асуджаны 16. 2. 1933 (з актыўнымі прыхаджанамі Антонам і Пятром Вераб'ёвымі, Грыгорыем Ермаковым, Фёдарам Рабцавым, Сямёнам Сямашкам) асобай нарадай пры АДТТУ за «антысавецкую агітацыю і ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 7.7.1956 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Р. і інш. М 1813сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Kamunikat.org

**РЭПКА** (**РЕПКО**) **Фёдар Фёдаравіч** [1892, Борздна, цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], дыякан. Служыўу адной з цэркваў Магілёва. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Р. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**САБАЛЕЎСКІ** (**СОБОЛЕВСКИЙ**) **Іаан Грыгор'евіч** [1891, в. Харлапава Дрысенкага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту дыякан Крыжаўздзвіжанскай царквы ў Лунінцы Брэсцкай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 6.8.1940. Асуджаны 9.1.1941 са Свята-ром Антонам *Семашкевічам* паводле пастановы калегіі НКВД як «агент польскай разведкі, член ПАВ і за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаІжэмскі канцлагер НКВД Вызвалены 27.8.1949 (?). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.7.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Асабовая справа С. № 9608с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

16.7.1935 у в. Харлапава арыштаваны селянінаднаасобнік, бацька чацвярых дзяцей Сабалеўскі Мяфодзій Грыгор'евіч (н. ў 1896 у в. Харлапава), брат Іаана Сабалеўскага. 2.11.1935 асобай нарадай пры НКВД асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Яго асабовая справа № 23392п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Рэабілітаваны 25.5.1993 Вярхоўным судом Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**САБІЛА (САБНЛЛО) Еўдакім Міхайлавіч** [29.7.1904, Мінск — 1964]. Беларус. З сям'і службоўца. Скончыў адукацыйную школу пры Мінскай духоўнай семінарыі (1916), СШ (1921). Служыў іпадыяканам у Мінскім ПетраПаўлаўскім кафедральным саборы. У 1925

Kamunikat.org

мітрапалітам Мінскім і Беларускім Мелхіседэкам (Паеўскім) рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мінскім кафедральным саборы. З 1925 настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Ахоцічы Бабруйскага пав., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Узнагароджаны камілаўкай (1926), нагрудным крыжам (1929). У 1930—34 працаваў маляром у «працоўным лагеры тылаапалчэння». Адрокся ад сана свяшчэннаслужыцеля (1934). У 1935—41 вадзіцель Мінскага гарадскога аддзела народнай адукацыі пры Мінскім гарадскім савеце. Быў жанаты, гадаваў дачку Тамару (н. ў 1941). Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, працаваў на біржы працы. З другой паловы 1944 у Чырвонай арміі, на фронце. З 1945 нарыхтоўшчык «ОРСа» ў мяст. Узда Мінскай вобл. У 1948—50 служачы «Белгалоўснаба» ў Мінску. Арыштаваны органамі МДБ 14.3.1950. Абвінавачваўся ў «здрадзе радзіме». Асуджаны да 15 гадоў ППК. Вызвалены пастановай Прэзідыума Вярхоўнага савета СССР ад 1.9.1956 са зняццем судзімасці. У 1955—56 працаваў майстрам у арцелі інвалідаў імя Гастэла. 31.7.1956 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам (Свірыдавым), які не ведаў пра адрачэнне С. ад сана, прызначаны настаяцелем Свята-Троіцкай царквы в. Целушы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Узведзены ў сан протаіерэя (1957).

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 494.

**САВАЦІЙ (ЗАСІМОВІЧ)** [Савацій Аўксенцевіч; 1.3.1863 ці 1873, в. Пагост Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. — ?], епіскап Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. З сялянскай сям'і. Пасля сканчэння Полацкага народнага вучылішча, памочнік эканома Мінскай духоўнай семінарыі, потым паслушнік Свята-Троіцкага манастыра ў Слуцку. У 1903 пераведзены ў Мінск да архіерэйскага дома. Рукапаложаны ў іераманаха (1906). Падчас 1й сусветнай вайны Свята-р 1га Мінскага палка, адначасова выконваў

пастырскія абавязкі пры шпіталі. Узнагароджаны двума ордэнамі Святой Анны. У чэрв. 1918 вярнууўся ў Слуцк. З 29.9.1920 настаяцель Свята-Троіцкага манастыра. У 1923 узведзены ў сан ігумена, 1.9.1926 — у архімандрыта (пасля ўхілення ў абнаўленчы раскол). 24.10.1926 Магілёўскім мітрапалітам (абнаўленчым) Іосіфам (Крэчатовічам)[1] і архіепіскапам Мінскім (абнаўленчым) *Даніілам* (Грамавенкам) хіратанісаны ў епіскапа Слуцкага. Арыштаваны 1.4.1933 у Слуцку па адрасе: вул. Урыцкага, д. 8. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі Слуцкага вікарыяцтва асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа С. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Шыленок Д., свтц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). Мн., 2006.

**САВІЦКІ** (**САВИЦКИЙ**) **Міхаіл Львовіч** [1869, в. Новая Лебяда (Мураваная) Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. — 17.9.1937, Слуцк, турма НКВД], протаіерэй. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1894). З 1898 настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Поўбераг Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З 1906 служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Вялікія Жухавічы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. З лют. 1915 настаяцель Мікалаеўскай царквы ў мяст. Старобін Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны 10.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 2.3.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа С. № 21195с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

8.9.1937 у Разані па адрасе: вул. Фрунзе, д. 4, кв. 2.

арыштаваны настаўнік Разанскай спецыяльнай школы № 15 Савіцкі Вадзім Міхайлавіч (н. ў 1903 у в. Паўбераг), сын Міхаіла Савіцкага. 19.10.1937 асуджаны камісіяй НКВД і пракуратуры СССР за «сістэматычную антысавецкую агітацыю і контррэвалюцыйную прапаганду сярод насельніцтва» да ВМП. Расстраляны ў Маскве на палігоне НКВД «Аб'ект Бутава» 21.10.1937. Рэабілітаваны 16.1.1989. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УФСБ Разанскай вобл. Расіі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерннн; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення; БутовсКИЙ Полыгон; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**САВІЦКІ (САВНЦКИЙ) Яраслаў Ісакавіч** [28.3.1882, в. Пухлае Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 8.12.1937, Масква, турма НКВД], протаіерэй. З сям'і дыякана. Пасля сканчэння духоўнай семінарыі (1903) працаваў настаўнікам. Праз некалькі месяцаў зацверджаны на пасаду псаломшчыка. У 1905 рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Чырвонастоцкім Гродзенскім РаствaБагародзіцкім жаночым манастыры (цяпер тэрыторыя Полыпчы). У 1906 ажаніўся з Вольгай Фёдараўнай (н. ў 1883), меў сыноў: Леаніда, Георгія (1907), дачку Ніну (1911). У пачатку 1й сусветнай вайны пераехаў у Екацярынінскую пустынь Падольскага пав. Маскоўскай губ. (цяпер каля Віднага), дзе ў той час знаходзіўся мужчынскі манастыр. У 1929 пасля закрыцця манастыра служыў у храме св. мучанікаў Флора і Паўла с. Ям Падольскага рна. Арыштаваны ў 1933. Асуджаны да 5 гадоў ППК, але справа была настолькі груба сфабрыкаваная, што неўзабаве Маскоўскі гарадскі суд адмяніў прысуд. Зноў арыштаваны 27.11.1937. Прыгавораны 1.12.1937 тройкай УНКВД па Маскоўскай вобл. за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 15.7.1989. У жн. 2000 Архіерэйскім Саборам РПЦ прылічаны да ліку новамучанікаў Расійскіх.

Кр.: *БутовсКИЙ Полнгон; Головко ЛА., Трофамов АА.* Жнтне Преподобномученнка Ноасафа н Свягценномученнка

Ярослава. М., 2002.

**САДАЎНІЧЫ (САДОВННЧНЙ) Сімяон Восіпавіч** [1875, в. Баранава Аршанскага (?) пав. Магілёўскай губ., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. — 4.9.1937, Калінінская вобл., турма НКВД], Свята-р. З сям'і царкоўнаслужыцеля. Арыштаваны 9.2.1930 у Лесахінскім сельсавеце Ільінскага р-на Калінінскай (Цвярской) вобл. 8.4.1930 асуджаны да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення жыў у в. Забор'е Тарапецкага рна. Арыштаваны ў 1936. Зняволены ў Тарапецкай турме НКВД. 31.9.1937 тройкай НКВД па Калінінскай вобл. прыгавораны з бел. Свята-рамі Мікалаем *Пашыным,* Максімам *Стпуканавым.* і інш. за «антысавецкую агітацыю сярод зняволенных» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.7.1989 Цвярской абл. пракуратурай.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі; Кнша памяты жертв полнтнческнх репрессай Калннннской областн.*

**САДОЎСКІ (САДОВСКИЙ) Міхаіл** [1864 — ?]. Сын Іакава Садоўскага[1], брат Сергія *Садоўскага.* Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1888), служыў псаломшчыкам у Плешчаніцкім храме. 14.9.1888 рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем КасмаДаміянаўскай царквы в. Свяда Барысаўскага пав. Мінскай губ., благачынны 2й акругі цэркваў Барысаўскага пав. (да 1914), член будаўнічага камітэта акругі. Узнагароджаны набедранікам (да 1901), скуф'ёй, нагрудным крыжам (1917).

Па ўспамінах родных у адну з начэй падчас ганенняў на духавенства чэкісты ўварваліся ў дом Свята-ра, адным канцом вяроўкі звязалі айцу рукі, а другі зачапілі за запрэжку з коньмі і пагналі іх наўгалоп. Гэтак Свята-ра цягнулі, пакуль не памёр. Родныя забралі цела айца, адвезлі дадому і пахавалі пры Свядаўскай царкве. Але праз два дні, дазнаўшыся пра гэта, чэкісты вярнуліся, выкапалі цела з магілы, рассеклі яго на кавалкі і кінулі на з'ядзенне сабакам.

1.3.1930 у в. Свяда арыштаваны Садоўскі Міхаіл Міхайлавіч (н. ў 1895; атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю), сын Міхаіла *Садоўскага.* 14.3.1930 калегіяй

АДПУ асуджаны за «шпіянаж на карысць Полыпчы і антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Вызвалены 20.9.1934. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.3.1958 трыбуналам БВА. Яго асабовая справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай губ.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерншi; Памятная кныж ка Мннской епархнн; Лнчный состав епархнального управлення; Снноднк за веру н церковь Хрыстову пострадавшнх в Мннской епархнн; Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**САДОЎСКІ** (**САДОВСКИЙ**) **Сергій** [19.2.1880, мяст. Плешчаніцы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — 1.11.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. Сын Іакава *Садоўскага,* брат Міхаіла *Садоўскага.* Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1902). Прызначаны псаломшчыкам у Мікалаеўскую царкву ў мяст. Смалявічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. Епіскапам Мінскім і Тураўскім Міхаілам (Цемнарусавым) рукапаложаны ў іерэя (25.9.1903). Служыў у Мікалаеўскім храме в. Гарадзішча Мінскага пав., цяпер Мінскі рн, выкладаў у царкоўнапрыходскай школе. З 1907 настаяцель Пакроўскай царквы ў мяст. Койданава (з 1932 Дзяржынск Мінскай акругі, цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл.), настаўнік царкоўнапрыходскай школы. З 1916 благачынны цэркваў 3й акругі Мінскага пав. Узнагароджаны набедранікам (1907). Быў жанаты, меў дачку Ганну (н. ў 1904), сына Іакава (1910). Арыштаваны 29.7.1937 у Дзяржынску па адрасе: 2і Мінскі зав., д. 7. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.3.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа С. і інш. Свята-роў № 23379с з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

29.11.1930 у Мінску па адрасе: вул. Маскоўская, д. 30, кв. 4 арыштаваны бацька дваіх дзяцей Садоўскі Іван Якаўлевіч (н. ў 1886 у мяст. Плешчаніцы; атрымаў

сярэднюю адукацыю; працаваў бухгалтарам), верагодна, брат Сергія і Міхаіла Садоўскіх. 26.3.1931 асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 3.11.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа С. № 29632с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губерніш; Лнчный состав епархыального упраеления; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; ф. 136, в. 1, с. 41145; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Дзяржынскага раена. Мн., 2004.

**САЗОНІК** (САЗОНИК) **Іаан Іванавіч** [1890, в. Бенцяі, цяпер Віцебскі р-н — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Падчас арышту выконваў абавязкі дыякана ў царкве ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 24.5.1928. Асуджаны 8.10.1928 асобай нарадай за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.4.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 17191п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**САКАЛОЎ** (**СОКОЛОВ**) **Аляксандр Аляксандравіч** [23.11.1917, Гомель — 15.11.2000]. З сям'і служачых. Бацька працаваў у Лясным ведамстве, маці загадвала бібліятэкай. Падчас грамадзянскай вайны сям'я С. пераехала ў Вільню. Скончыў рускую гімназію імя А.Пушкіна. З 1935 і да пачатку 2й сусветнай вайны вучыўся на багаслоўскім фце Варшаўскага ун-та. 6.8.1939 епіскапам Гродзенскім і Навагрудскім Савам (Саветавым) рукапаложаны ў дыякана, прызначаны ў Віленскі кафедральны сабор. 7.3.1942 епіскапам Ковенскім, вікарыем Літоўскай епархіі Даніілам (Юзьвюком) рукапаложаны ў іерэя і накіраваны ў сабор у Дзвінску, цяпер Даўгаўпілс, Латвія. Потым служыў у Вільнюсе, Каўнасе, Укмерге, Зарасаі Літоўскай епархіі. Узнагароджаны камілаўкай (1944). У 1945 арыштаваны і асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК і 5

гадоў пазбаўлення правоў. З 1955 — псаломшчыкрэгент Омскага храма. З 1959 — чытальнік Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора. З 1965 — рэгент сабornага хора ў Петрапаўлаўску (Казахская ССР). З 1967 служыў у Ільінскім храме мяст. Радашковічы Маладзечанскага р-на Мінскай вобл. 7.3.1978 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Антоніем (Мельнікавым) прызначаны настаяцелем Мікалаеўскай царквы в. Чарэсы Мёрскага р-на Віцебскай вобл. У 1980 служыў у Благавешчанскім храме в. Забрэжжа Валожынскага р-на Мінскай вобл. З 1981 другі Свята-р Пакроўскай царквы ў Маладзечне. У 1985 вярнуўся ў Благавешчанскі храм на Валожыншчыне. З 1995 за штатам. Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 576.

**САКАЛОЎ** (**СОКОЛОВ**) **Аркадзій Міхайлавіч.** Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, брат Міхаіла Міхайлавіча Сакалова[1]. У пачатку 1900хг. — псаломшчык Пакроўскага храма мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. 13.5.1906 пераведзены ў Георгіеўскую царкву в. Мардашэвічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ. Рукапаложаны ў іерэя (да 1907). Служыў настаяцелем Міхайлаўскай царквы ў мяст. Церахоўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер г.п. Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памяпіная КИНжка Могылевской губерніш;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в, 1, с. 43, л. 49, с. 80, л. 246.

**САКАЛОЎ** (**СОКОЛОВ**) **Віталій Іванавіч** [13.8.1880, в. Кішчына Слабада Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 11.4.1938, ГУЛАГ]. Беларус. З духоўнага саслоўя. Скончыў царкоўнапрыходскае вучылішча. З 1920 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Пагост Ігуменскага пав., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл., узнагароджаны набедранікам. У 1930я г. — садаводпчаляр калгаса «Камунар» Бярэзінскага рна.

Арыштаваны 11.11.1937. Асуджаны 19.11.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў БайкалаАмурскі канцлагер НКВД Далёка ўсходняга краю (г. Свабодны). Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 18.4.1989. Асабовая справа С. № 22550с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**САКАЛОЎ (СОКОЛОВ) Грыгорый Андрэевіч** [1870 — ?], дыякан. Беларус. 3 духоўнага саслоўя. Служыў у Пакроўскай царкве в. Лугавая Вірня Рагачоўскага пав., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны ў 1930 як кулак. Маемасць канфіскавана. Далейшы лес невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., с. 739, в. 1. '

**САКАЛОЎ (СОКОЛОВ) Сяргей Еўлампіевіч [1886,** Вілейка Віленскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — ?], доктар медыцыны, хірург, член прыходскага савета храма Свята-Троіцкай бальніцы ў СанктПецярбургу. Арыштаваны ў крас. 1922. Асуджаны 5.7.1922 па справе «аб супраціве канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей» да 2 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Асабовая справа С. № п36314 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *СанктПетербургской епархіш Снноднк.*

**САКАЛОЎСКІ (СОКОЛОВСКИЙ) Іаан Канстанцінавіч** [1867, в. Войхані Старыя Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 1943 (?)]. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. На працягу 30 гадоў прадаваў фельчарам. У 1930я г. прыняў мужнае рашэнне стаць Свята-ром. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Шацілава Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі рн. Арыштаваны 23.3.1933. Абвінавачваўся ў правядзенні антысавецкай агітацыі. 10.4.1933 вызвалены пастановай Полацкага ГРА АДПУ. Служыў у РаствaБагародзіцкім храме в. Юравічы Полацкага рна. Зноў арыштаваны 26.8.1936. Пад «следствам» знаходзіўся ў будынку ІаанаБагаслоўскай царквы (?), перарobленай пад

турму. Чэкісты патрабавалі ад Свята-ра адрачыся ад веры, але ен адмовіўся. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 17.9.1936 за «антысавецкую агітацыю» і «выступы супраць калгасаў» да 6 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. 4.10.1936 тэрмін зменшаны да 3 гадоў, але ўлічана гэта, верагодна, не было. Вызвалены немцамі ў другой палове 1941. Служыў у манастырскім Спаса-Праабражэнскім храме ў Полацку. Пахаваны каля сцяны Крыжаўздзвіжанскага сабора. На магіле быў пастаўлены чорны крыж без надпісу. Рэабілітаваны Вярхоўным судом Беларусі 10.12.1991. Асабовыя справы С. № 5349п і № 21943п захоўваюцца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

18.9.1937 арыштавана Сакалоўская Марыя Іванаўна (н. ў 1867 у в. Шацілава ў сям'і Свята-ра), верагодна, жонка Іаана Сакалоўскага. 26.9.1937 тройкай НКВД асуджана за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Этапавана ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер НКВД Карэльскай АССР. Загінула ў зняволенні 19.2.1940. Рэабілітавана 20.10.1959 Віцебскім абл. судом. Яе асабовая справа № 9004п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**САКАЛОЎСКІ (СОКОЛОВСКИЙ) Міхаіл Міхайлавіч** [май 1893, в. Беразіно Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. — 13.3.1938, Гомель, турма НКВД]. З сям'і псаломшчыка. Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча. З 12.2.1914 псаломшчык царквы в. Струг Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. 25.11.1914 мабілізаваны на вайсковую службу. 25.9.1914 рукапаложаны ў дыякана Мікалаеўскай царквы в. Локтышы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ганцавіцкі р-н Брэсцкай вобл. Потым, верагодна, служыў у Георгіеўскім храме в. Малькавічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Ганцавіцкі рн. У 1921 у Навагрудку рукапаложаны ў іерэя. Прызначаны ва Успенскую царкву в. Конкавічы, цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол (1923). Паводле некаторых звестак у сярэдзіне 1920х г. служыў у царкве в. Рогава, цяпер Мінскі рн. З 1930 — у Мікалаеўскім храме ў мяст.

Скрыгалава, цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. З 1935 — у Свята-Троіцкай царкве ў Ельску, цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. З 1937 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Васілевічы, цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны 7.2.1938. Асуджаны 15.2.1938 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Жонка С. Вольга Канстанцінаўна Шарупіч (н. ў 1897 у мяст. Раманава Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Леніна Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 24.9.1977, Пінск) засталася адна з малалетнімі дачкой Лідзіяй (н. ў 1925; памерла ад тыфу ў 1945) і сынам Лаўрам. Рэабілітаваны 2.6.1958. У тым жа годзе ў Рэчыцкім ЗАГСе з'явілася наступнае пасведчанне аб смерці: *«Гр. СоколовсКИЙ Мнханл МнхайлоВИЧ рожд. 1893 г. умер 11 октпября 1941 г.; прнчнна смерпгн: язва желудка...»*

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мынской епархіш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998; *ІПнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**САЛАМІЯ (ЗАГАРЭЛЬСКАЯ)** [Ганна Цімафееўна; 1881, Магілёў — ?], манахіня. З мяшчанскай сям'і. У першай палове 1920х г. насельніца Іаанаўскага манастыра. З 1926 жыла ў АляксандраНеўскай Лаўры. Арыштавана 17.2.1932. Асуджана да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: *СанктпПетербургской епархіш Снноды́к.*

**САЛАНОВІЧ (СОЛОНОВИЧ) Максім Платонавіч** [1888, в. Любонічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Атрымаў сярэднюю адукацыю. Служыў псаломшчыкам у царкве ў роднай вёсцы. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Арыштаваны 12.11.1944. Абвінавачваўся ў «здрадзе радзіме». Пастановай Бабруйскага раённага аддзела НКВД вызвалены і рэабілітаваны ў перыяд 27.6.1945—2.7.1945. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа С. № 890сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

**САЛОДКІ (САЛОДКИЙ) Ціхан Цітавіч. Свята-**р. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. жыў у в. Рэвут Пракопаўскага сельсавета Гомельскага пав., цяпер не існуе. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 45, с. 80, л. 283.

**САМІШЧ (СОМИШЧ) Васілій Іванавіч** [1894, мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель Уваскрасенскай царквы в. Жданавічы, цяпер IПклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 9.2.1930. Асуджаны 22.3.1930 з актыўнымі прыхаджанамі Мікалаем Біруковым, Мікалаем і Сцяпанам Бурдзілоўскімі (Будзілоўскімі), Пятром Вайтовым, Пятром Казловым, Іванам Калтыгіным, Раманам Лукашовым, Адамам і Сцяпанам Нядзвецкімі, Емяльянам Плаксіным, Цімафеем і Мікалаем Рыжанковымі, Міхасём Храмцовым, Нікіфарам Юр'евым асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны, хутчэй за ўсё, у адзін з Паўночных канцлагераў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.7.1964 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа С. і інш. № 8858 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

**САМІНІЧ** (**СОМИНИЧ**) **Грыгорый Дзмітрыевіч** [1874, Магілёў — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Прызначаны ў Пакроўскі храм в. Нямойта Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. 3 1911 настаяцель Георгіеўскай царквы в. Кароўчына Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дрыбінскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1937 у Магілёве. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая

справа С. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *Памятпная КИНжка Могнлевской губерніш.*

**САМОЙЛІК** (**САМОЙЛИК**) **Данііл Фадзеевіч** [1901, в. Грабяні Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер тэрыторыя Полынчы — ?], ігумен. 3 1922 у Дубненскім (цяпер Валынская вобл., Украіна), з 1925 ва Успенскім Жыровіцкім манастырах. Рукапаложаны ў іерадыякана, затым у іераманаха. У 1935 — 44 служыў на Брэстчыне. Арыштаваны ў ліп. 1945. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД да 20 гадоў ППК. Вызвалены ў пачатку 1955. Вярнуўся на радзіму. У крас. 1955 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам прызначаны настаяцелем Ільінскай царквы в. Міхайлоўшчына Ашмянскага р-на Гродзенскай вобл.

Літ.: *Черепьща В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 164. Гродно, 2000.

**САМОЙЛІК (САМОЙЛИК) Сцяпан Ігнатавіч** [1897 (паводле інш. звестак 1907), в. Грабяні Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер тэрыторыя Полынчы — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Служыў псаломшчыкам у царкве в. Дубічы (?), цяпер Ваўкавыскі р-н Брэсцкай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра непаўналетніх дзяцей. Арыштаваны 6.4.1940. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 26.8.1990 як «сацыяльнанебяспечны элемент» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаІжэмскі канцлагер НКВД Комі АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Брэсцкай вобл. 12.7.1989. Асабовая справа С. № 9268с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл. *Кр..НАРБ, ІКБР.*

**САМСАНЁНАК (САМСЁНАК) (САМСОНЕНОК, САМСЕНОК) Сергій Усцінавіч** [1872 ці 1879, в. Войханы (Войханы Старыя) Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сялянскай

сям'і. У 1920я г. настаяцель царквы в. Мехавое Гарадоцкага пав. Арыштаваны 21.8.1929. Асуджаны асобай нарадай АДПУ 20.11.1929 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 29.12.1932. Прыгавораны 21.5.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную прапаганду» да 5 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 22089п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 4.6.1992 пракуратурай Віцебскай вобл., па другой (№ 20805п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) 27.11.1989. Кр.: *БНДЦЭД, НАРБ, ІКБР.*

**САМЦЭВІЧ (САМЦЕВІЧ) Раман Грыгор'евіч** [1883, Барысаў Мінскай вобл. — 10.3.1938, Барысаў, турма НКВД]. Беларус. З сям'і рабочага. Член царкоўнага савета Андрэеўскай царквы ў Барысаве. Падчас арышту працаваў на лесазаводзе імя Молатава. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 5.2.1938 у Барысаве па адрасе: вул. Камсамольская, д. 156. Асуджаны 14.2.1938 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай групы царкоўнікаў» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1957 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа С. і інш. № 10397с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.
Кр.: *БНДЦЭД.*

**САПЕГА (САПЕГО) Логін Сцяпанавіч** [1880, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Да арышту жыў у Велікалукскім р-не Пскоўскай вобл. Арыштаваны 9.1.1932. Асуджаны 16.4.1932 калегіяй АДПУ СССР па Зах. вобл. за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Рэабілітаваны 16.1.1989
Кр.: Не предать забвенню: КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй. Псков, 1997. Т. 2. С. 416.

**САРАКАЛЕТАЎ (СОРОКОЛЕТОВ) Міхаіл Васілевіч** [1868, мяст. Уваравічы Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер

БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. З сям'і святчэннаслужыцеля, брат Канстанціна Васілевіча Саракалетава[1]. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Пакроўскім храме в. Кляпіна Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кармянскі р-н Гомельскай вобл. З 1912 настаяцель Уваскрасенскай царквы в. Зубрэвічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 19.2.1930. Асуджаны 12.3.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Леанідам *Кліндуховым,* Пятром *Мамыкам,* Дзімітрыем *Розавым* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа С. № 20988п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памяпгная кныжка Могнлевской губерннн.*

**САРАКАЛЕТАЎ (СОРОКОЛЕТОВ) Парфірый Іванавіч** [1892, Горкі Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — 7.4.1938, Мінск, турма НКВД], абнаўленчы Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Аршанскае гарадское вучылішча, духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай (?) царквы ў Горках. Быў жанаты, меў пяцярых непаўналетніх дзяцей. Арыштаваны 28.6.1931. Абвінавачваўся як «удзельнік кулацкацаркоўнай групы, у правядзенні антысавецкай работы, арганізацыі масавага выступлення сялян». Асуджаны 27.8.1931 калегіяй АДПУ да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 1.3.1938 у Горках па адрасе: вул. Куйбышаўская, д. 8. Прыгавораны 14.3.1938 тройкай НКВД за «выказванні тэрарыстычных намераў у адрас членаў урада і пагрозы расправай камуністам» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 10444сн; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 31.8.1989 Магілёўскай абл. пракуратурай, па другой 4.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**САРАЧЫНСКІ** (**СОРОЧИНСКИЙ**) **Канстанцін** [21.5.1881, Рэчыца Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. — ?], сын Пятра Сарачынскага[1]. У ліку лепшых скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1903). Служыў псаломшчыкам у РаствaБагародзіцкай царкве в. Мелешкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1904). Прызначаны настаяцелем Свята-Троіцкага храма в. Дудзічы Рэчыцкага пав., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл. З 1911 настаяцель Свята-Троіцкай царквы ў мяст. Лоеў Рэчыцкага пав., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл., адначасова выкладаў у Лоеўскім гарадскім 4класным вучылішчы. З ліп. 1914 член благачыннага савета, потым благачынны цэркваў 1й акругі Рэчыцкага пав. Быў жанаты, гадаваў дачку Ніну (н. ў 1905), сыноў Канстанціна (1911), Георгія (1913). Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй (1915). У пачатку 1930х г. настаяцель Успенскай царквы в. Сухары Магілёўскага рна. Арыштаваны 22.2.1932 на хут. (цяпер вёска) Кіркоры Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Асуджаны 9.8.1932 калегіяй АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» і «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення жыў у Магілёве. Зноў арыштаваны 3.10.1935. Прыгавораны 21.4.1936 асобай нарадай пры НКВД да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі С. Па першай справе (№ 10658; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 24.10.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл., па другой (№ 9394) пленумам Вярхоўнага суда БССР 27.2.1969.

Кр.: *Памятпная КИНжка Мннской епархіш; Памятная КИНжка Мннской губерніш; Лнчный состав епархнального управленыя;НГАБ,* ф. 873, в. 1, с. 12; *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**САСАЛЯШКЕВІЧ** (**САСОЛЕШКЕВИЧ**) **Васілій Мікалаевіч** [1860 ці 1861, в. Баркалабаў (Баркулабаў) Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Баркалабава Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. — 28.9.1937, Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля.

Скончыў юнкерскае вучылішча. У 1900—10я г. настаяцель Казанскага храма ў роднай вёсцы. Арыштаваны 8.3.1930. Асуджаны 21.3.1930 з шэрагам Свята-роў Магілёўскай епархіі, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 3 гадоў ППК умоўна. Пераехаў у Клімавічы Магілёўскай вобл. Служыў настаяцелем у Міхайлаўскай царкве. Зноў арыштаваны 4.8.1937. Прыгавораны 7.9.1937 са Свята-ром Нікіфарам *Валуськам* і інш. тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 10362сн) і па другой (№ 13903сн) рэабілітаваны адпаведна 20.7.1989 і 21.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерншi.*

**САСАЛЯШКЕВІЧ (САСОЛЕШКЕВИЧ) Міхаіл Канстанцінавіч** [1884, Мінская губ. (?) — 18.8.1937, Смаленская вобл., турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 21.7.1937 у с. Аселле Раслаўскага р-на Смаленскай вобл. Асуджаны 10.8.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Смоленскый мартнролог.*

**САСІНОЎСКІ (САСИНОВСКИЙ, СОСИНОВСКИЙ) Афанасій Цімафеевіч** [1889, Слуцкі пав. Мінскай губ. — 1.11.1937, Гомель, турма НКВД], Свята-р. З духоўнага саслоўя. Арыштаваны 19.8.1937 у Гомелі. Асуджаны тройкай НКВД 30.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.7.1988.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**САСФЕН (АЛЯКСЕЕНКА)** [Сяргей Паўлавіч; 1868, в. Заванары Віцебскай губ. — 26.10.1930], манах. У 1905—23 паслушнік НоваАфонскага СімонаКананіцкага манастыра (Абхазія). У крас. 1930 арыштаваны і этапаваны ў Новарасійскую турму АДПУ. Праходзіў па справе «манархічнай паўстанцкай арганізацыі імяслаўцаў, якая

дзейнічала ў 1927—30 у даліне Псоў і на возеры Рыца». Асуджаны 8.10.1930 за «контррэвалюцыйную прапаганду і арганізацыйную дзейнасць, накіраваную на падрыхтоўку і правядзенне контррэвалюцыйных злачынстваў» даВМП. Расстраляны 26.10.1930 на гарадскіх могшках, што на старых каменаломнях у Новарасійску. Рэабілітаваны 27.7.1990.

**САУЛЬСКІ** (**САУЛЬСКИЙ**) **Аляксандр Ерафеевіч.** Гл.: **АЛЯКСАНДР САУЛЬСКІ.**

**САУЛЬСКІ** (**САУЛЬСКИЙ**) **Сцяфан.** Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель РаstваБагародзіцкай царквы в. Кузьмінічы (тагачасны паштовы адрас: ст. АгароднягГомельская) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 42.

**САУЛЬСКІ** (**САУЛЬСКИЙ**) **Яўгеній Далматавіч** [24.11.1882, Магілёў — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя і 28.6.1906 (або 22.7.1906) прызначаны настаяцелем у РастваБагародзіцкую царкву в. Любінічы Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1915 служыў у Свята-Троіцкім храме в. Мхінічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. У 1930я г. ў Спаса-Праабражэнскай царкве ў Шклове, цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 29.4.1935 у в. Трыбушкі Шклоўскага рна. Абвінавачваўся ў «антысавецкай дзейнасці». Асуджаны не быў. Вызвалены 27.5.1935. Зноў арыштаваны ў верас. (?) 1937 у Магілёве. 28.9.1937 прыгавораны тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» з шэрагам Свята-роў Магілёўскай епархіі да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 5051; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны

27.5.1935 пастановай Магілёўскага раённага аддзела НКВД БССР, па другой (групавая, № 9171) 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.*

**САЎЧУК (САВЧУК) Мікалай Уладзіміравіч** [1891, Варшава — ?], Свята-р. Украінец. 3 сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Арыштаваны 24.6.1932 у Воўкавіцкім сельсавеце Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 4.10.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**САФОНАЎ (САФОНОВ) Аляксандр Карпавіч** [1888, в. Радомль Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер в. Радомля Чавускага р-на Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. 3 духоўнага саслоўя. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (?). Служыў ва Успенскай царкве ў роднай вёсцы. Арыштаваны 5.2.1930. Асуджаны 10.4.1930 з шэрагам інш. Свята-роў Магілёўскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.8.1989 Магілёўскай абл. пракуратурай. Асабовая справа С. № 10412сн захоўваецца ў архіве КДБ Матілёўскай вобл.

Таксама рэпрэсаваны брат С. селянінаднаасобнік Сафонаў Пётр Карпавіч (н. ў 1891). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.7.1992 Магілёўскім абл. выканкамам.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**САФОНАЎ (САФОНОВ) Аляксій Пятровіч [1895,** в. Цёплае Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. — ?], ігумен. Беларус. 3 сялянскай сям'і. 3 1915 служыў у арміі. 3 1920 працаваў на ўласнай гаспадарцы. У 1941 мабілізаваны на фронт. Пад НараФамінскам Маскоўскай вобл. трапіў у палон.

Вызвалены немцамі як былы царкоўнаслужыцель. З 1941 служыў у Свята-Духавым кафедральным саборы ў Мінску. У 1944 пастрыжаны ў манашаскі сан. Арыштаваны 26.7.1944 у Мінску па адрасе: вул. Бакуніна 3, кв. 2. Асуджаны 30.6.1945 з царкоўным старастам Міхаілам *Гагарэнкам* паводле пастановы калегіі НКВД як «сацыяльна небяспечны элемент» да 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. 19.11.1948 Краснаярскім краявым судом прыгавораны да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены ў 1954. Да канца 1956 знаходзіўся ва Успенскім Жыровіцкім манастыры. Рэабілітаваны 28.4.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа С. № 33171с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Літ.: *Черепшш В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 166. Гродно, 2000.

**САФРОНІЙ (ІВАНЦОЎ)** [Сяргей Мікалаевіч; 21.6.1880 — 24.12.1947, Краснаярск], епіскап (абнаўленчы). Скончыў юрыдычны (1906) і філалагічны (1914) фты Маскоўскага ун-та, Псіхалагічны эксперыментальны інстытут (1915). Мабілізаваны ў дзеючую армію (паручнік). З 1919 у Чырвонай арміі. У 1920 рэктар Чырвонаармейскага ун-та ў Маскве. У 1922 у Магілёўскім Брацкім Богаяўленскім манастыры пастрыжаны ў манаштва з імем Сафроній і рукапаложаны ў іераманаха. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол. Хіратанісаны ў Маскве ў епіскапа Магілёўскага. З 1923 епіскап Мінскі, з 1924 Кастрамскі (паводле інш. звестак — Праскураўскі). У маі 1924 добраахвотна стаў сакрэтным супрацоўнікам АДПУНКВД. Узведзены ў сан архіепіскапа Чарнігаўскага. У 1928 — Запарожскага. З 1933 архіепіскап Ірбіцкі, з 1934 НіжнеТагільскі. З 1935 за штатам, жыў у Кастраме. Арыштаваны 25.2.1935. Асуджаны да 3 гадоў ППК за «раскрыццё звестак пра сваё супрацоўніцтва са службай дзяржбяспекі». У лют. 1946 пасля пакаяння прыняты ў зносіны з Маскоўскай Патрыярхіяй у сане іераманаха і 7.2.1946 хіратанісаны ў епіскапа Ульянаўскага. З 4.8.1947 епіскап Краснаярскі, вікарый Новасібірскай

епархіі.

**САХАРАЎ (САХАРОВ) Пётр Аляксеевіч** [1873, Вічуга, цяпер Іванаўская вобл., Расія — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. Скончыў духоўную акадэмію. У 1910я г. сакратар Магілёўскай губернскай духоўнай кансісторыі, рэдактар афіцыйнай часткі «Могнлевскнх Епархіальных Ведомостей». Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа С. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятпная КИНжка Могнлевской губернші.*

**САХАРАЎ (САХАРОВ) Сяргей Пятровіч** [псеўданімы: Гісторык; Двннчаннн; Дзьвінчук; СкучаюІцнй; крыптанімы: С.; С.С.; 28.9.1880, Полацк Віцебскай губ. — 22.4.1954, Рыга], фальклярыст, этнограф, царкоўны гісторык, публіцыст, педагог. Скончыў Полацкае духоўнае вучылішча (1895), Віцебскую духоўную семінарыю (1901). Настаўнічаў у Люцынскім пав. і ў Люцыне. У 1907—11 вучыўся на юрыдычным фце Юр'еўскага (Тартускага) ун-та; адначасова слухаў лекцыі на гісторыкафілалагічным фце. З 1911 выкладаў у Віцебску ў гімназіях і на стаўніцкім інстытуце; адначасова працаваў сакратаром Віцебскай архіўнай камісіі. У 1913 прызначаны інспектарам народных вучылішчаў у Юр'еве. У 1917 С. давялося шмат павандраваць па Беларусі ў пошуках працы (Пінск, Барысаў, Мінск, Магілеў). З кастр. 1917 дырэктар Люцынскай рускай гімназіі. З 1921 старшыня бел. грамадскага культурнаасветнага таварыства «Бацькаўшчына». З пачатку 1922 жыў у Рызе. Кіраўнік бел. аддзела Міністэрства асветы Латвіі. Пасля ліквідацыі ў 1925 бел. аддзела дырэктар Дзвінскай беларускай гімназіі. У 1932 гімназія ліквідавана, а С. адпраўлены на пенсію. Пераехаў у Рыгу, актыўна заняўся гісторыкалітаратурнай працай, запісваў бел. фальклор Латгаліі. З 1935 да 1938 зрабіў гісторыкастатыстычнае апісанне «Православные церквн в

Латгалнн» (па заданні сінода Латвійскай Праваслаўнай Царквы) і даследванне «Народная творчасць латгальскіх і лукстэнскіх беларусаў». У 1940 вярнуўся да выкладчыцкай дзейнасці, працаваў у бел. і рускіх школах. Арыштаваны 9.7.1945. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі» і інш. Асуджаны да 5 гадоў ППК. Пакаранне адбываў у лагерах Карабас і Батык (Казахстан). Вярнуўся ў Латвію ў 1950 без права пражывання ў Рызе.

Тв.: Народное образованне в Юрьевском уезде. Юрьев, 1917; Город Лудза в прошлом н настоягцем: (Популярный очерк). Рнга, 1935; Рнжскне православные архнпастырн за сто лет (1836—1936). Рыга, 1937; Полацкі князь Усяслаў — нацыянальны беларускі асілак. Вільня, 1939; Православные церквн в Латгалнн: [Нсторнкостатнстнческое опнсанне]. Рнга, 1939.

Кр.: *Ліс А.* Збіральнік духоўных скарбаў // *ЛІМ.* 1980, 7 крас.; *Папар С.* (Панізнік С.). У зяленым садзе вятры гудзелі // *Голас Радзімы.* 1980, 23 кастр.; *БП,* т. 5; Мартнролог православных свяІценнослужнтелей Латвнн, репресснрованных в 1940—1952 гг. М., 1999; *ЭГБ,* т. 6—1; *Рэпрэсаваныя...*

**САЧКОЎСКІ** (**САЧКОВСКИЙ**) **Дзімітрый Паўлавіч** [1917, Гродзенская губ. — ?], іераманах. У 1939 рукапаложаны ў іерадыякана. У сак. 1940 высланы ў Казахстан. У 1945 асобай нарадай пры НКВД СССР асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Вызвалены ў снеж. 1954. У лют. 1955 паступіў ва Успенскі Жыровіцкі манастыр. 3 крас. 1955 да жн. 1956 настаяцель ПараскеваПятніцкай царквы в. Опаль Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. Потым вярнуўся ў манастыр.

Кр.: *Черегшца В.Н.* Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до наншх дней). Ч. 1. С. 164. Гродно, 2000.

**СВІДЗЕРСКІ (СВНДЕРСКИЙ) Гаўрьгіл Фёдаравіч. Гл.: ГАЎРЫІЛ (СВІДЗЕРСКІ).**



Kamunikat.org

**СВІДЗЕРСКІ (СВНДЕРСКИЙ) Міхаіл Фадзеевіч. Гл.: МІХАІЛ (СВІДЗЕРСКІ).**

**СВІРСКІ (СВНРСКИЙ) Іаан** [5.4.1870, в. Возера Мінскага пав., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. — ?], протаіерэй, сын Пятра Свірскага[1], брат Паўла *Свірскага,* сваяк блажэннай Валянціны Мінскай. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1892), выкладаў у 2класнай царкоўнапрыходскай школе ў мяст. Тураў Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер г. Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Епіскапам Мінскім і Тураўскім Сімяонам (Ліньковым) 18 (ці 29) жн. 1894 рукапаложаны ў іерэя Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Локніца Пінскага пав. Мінскай губ. (цяпер Ровенская вобл., Украіна), адначасова выкладаў у царкоўнапрыходскай школе, быў членам благачыннага савета цэркваў 3й акругі Пінскага пав. 3 1904 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма ў роднай вёсцы, дзе раней служыў яго бацька, настаўнік Азеранскай царкоўнапрыходскай школы. Быў жанаты, гадаваў дачок Марыю (н. ў 1899), Ірыну (1902), Ніну (1903?), сына Уладзіміра (1896). Узнагароджаны скуф'ёй (1907). Арыштаваны 18.11.1937. Асуджаны 2.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.4.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа С. № 22318с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НГАБ,* ф. 136, в. 1, с. 41145; ф. 2786, в. 1, с. 67; *Памятная КИНжка Мннской губертш; Пажятная КИНжка Мннской епархнн; Лнчный состав епархнального управленыя.*

**СВІРСКІ** (**СВИРСКИЙ**) **Павел** [1880, в. Возера Мінскага пав., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. — ?], брат Іаана *Свірскага,* сын Пятра *Свірскага,* сваяк блажэннай Валянціны Мінскай. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Кастрыца Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 10.2.1930. Асуджаны 3.3.1930 з шэрагам

Свята-роў Мінскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа С. № 23046с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

*Кр.: НАРБ, ІКБР.*

**СВІРЫД** (**СВИРИД**) **Ілья** [1885 — ?], протаіерэй. У 1920я г. настаяцель храма Святой Праведнай Анны в. Грэбень Ігуменскага пав., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 13.2.1930. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**СВІРЫДАЎ (СВИРИДОВ) Іаан Пахомавіч** [24.6.1876, в. Свісцёлкі Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З духоўнага саслоўя. Арыштаваны 10.3.1930 у в. Ройна (?) Полацкага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 14.3.1930 са Свята-рамі Міхаілам *Квятпкоўскім,* Іосіфам *ПІаткоўскім,* старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да высылкі (тэрмін не ўказаны). Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Жыў у Оршы, працаваў рознарабочым. Зноў арыштаваны 20.11.1937 у Оршы па адрасе: 2і Магілёўскі зав., д. 86. Прыгавораны тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 20982п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл) і па другой (№ 21239п; захоўваецца тамсама) рэабілітаваны 27.11.1989 УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СВІЦІН (СВИТИН) Міхаіл Карпавіч** [1900, в. Зарэчка Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў псаломшчыкам у Спаса-Праабражэнскай царкве в.

Папіна Драгічынскага рна. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Асуджаны 5.5.1950 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Хакаскі канцлагер МДБ Башкірскай АССР (Абакан, Ішымбай). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.12.1957 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа С. № 4177с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СЕКАЧ (СЯКАЧ) Грыгорый Якаўлевіч** [15.9.1904, в. Акулінка Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. — 2.5.1997], Свята-р. Скончыў народную школу ў Мазыры (1824). З 1927 псаломшчык Мазырскага Успенскага сабора. Арыштаваны ў 1929. Асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў Мурманскай вобл. Пасля датэрміновага вызвалення жыў у Рэчыцы. У 1937 ажаніўся з Гапонскай Ганнай Васілеўнай. Гадаваў чацвера дзяцей. 15.3.1943 архіепіскапам (абнаўленчым) Мікалаем (Аўтаномавым) рукапаложаны ў дыякана, 25.3.1943 — у іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Артукі, цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. 23.6.1944 архіепіскапам Калінінскім і Смаленскім Васіліем (Ратміравым) у Рэчыцкім Успенскім саборы перарукапаложаны. Працягваў служыць ў в. Артукі. 19.12.1946 прызначаны настаяцелем храма ў Лоеве, дзе за кароткі час адбудаваў новы храм, асвячоны ў 1949 у гонар Святой Троіцы. У 1952 перавёўся ў Чарнігаўскую епархію. З 1959 клірык Бранскай епархіі. У 1980я г. жыў у Стаўрапольскім краі на станцыі Зелянчукская. Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 603.

**СЕЛЬВІЧ (СЕЛЬВИЧ) Фёдар Сямёнавіч** [1890 — ?], стараста царквы в. Махнавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны і асуджаны ў 1930.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Мазырскага раена. Мн., 1997.

**СЕЛЯЗНЁЎ** (**СЕЛЕЗНЕВ**) **Фёдар Яфрэмавіч** [17.2.1879, в. ФокінаВіцебскага(?) пав., цяпер Віцебскі р-н — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту стараста царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 18.9.1937. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны ў ліст. 1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. № 21326п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД*.

**СЕМАШКЕВІЧ** (**СЕМАШКЕВИЧ**) **Антоній Станіслававіч** [1894, в. Лыскава (Лыскаў) Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Пружанскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля (?). Скончыў духоўную семінарыю. Ажаніўся, гадаваў двое дзяцей. Служыў на Брэстчыне. Арыштаваны 18.5.1940 у в. Шабрын Брэсцкага рна. Асуджаны 9.1.1941 з дыяканам Крыжаўздзвіжанскай царквы ў Лунінцы Брэсцкай вобл. Іаанам *Сабалеўскім* і інш. паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў ПаўночнаПячорскі канцлагер «Варкутбуда». Вызвалены 17.9.1941 па амністыі для польскіх грамадзян. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 15.8.1989 пракуратурай Брэсцкай вобл. Групавая справа С. і інш. № 9787с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СЕМЯНКОЎ** (**СЕМЕНКОВ**) **Васілій Юліянавіч** [1.3.1892, Магілёў — 20.10.1975, Полацк], протаіерэй. Беларус. З сям'і рабочага. Пасля смерці бацькі (1899) маці С. засталася з Васілём, яго братам Іванам (н. ў 1886) і сястрой Ганнай (1889). У 1900 прыняты ў Магілёўскі Богаяўленскі Брацкі манастыр. Скончыў манастырскую школу, духоўнае вучылішча пры Магілёўскай духоўнай семінарыі (1911), 2 курсы народнай кансерваторыі (настаўнік — прафесар Рубцоў), місіянерскія курсы (1912). Прыняты салістам у славутую капэлу Ю.СлавянскагаАгрэнева. Калі капэла

знаходзілася ў Омску (1913), епіскап Омскі і Паўладарскі Андранік (Нікольскі) прапанаваў С. застацца ў Омскай епархіі. Пасля згоды прызначаны архіварыусам Омскай духоўнай кансісторыі, рэгентам архіерэйскага хора. Падчас адступлення арміі Калчака на ўсход кансісторыя эвакуіравалася ва Уладзівасток (верас. 1919). 23.1.1920 ажаніўся з Нінай Дзям'янаўнай Уваравай (н. 1.1.1904). 5.4.1920 епіскапам Уладзівастоцкім Міхаілам (Багданавым) рукапаложаны ў дыякана, 20.4.1920 — у іерэя, прызначаны трэцім Свята-ром Успенскага сабора ва Уладзівастоку. 3.5.1921 прыняты ў ваеннае ведамства як свяшчэннік флоцкага экіпажа. З 30.11.1921 свяшчэннік пры штабе дывізіёна Уладзівастока. З 1922 настаяцель Уладзівастоцкай Мікалаеўскай царквы. Арыштаваны ў 1932. Асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь. У 1941 архіепіскапам Філафеем (Нарко) прызначаны настаяцелем Спаса-Праабражэнскага храма Шклова, благачынным. У кастр. 1953 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам (Свірыдавым) пераведзены ў Спаса-Праабражэнскую царкву Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, прызначаны сакратаром і благачынным тагачаснай Полацкай вобл. Узнагароджаны санам протаіерэя (6.5.1944), паліцай (9.5.1949), крыжам з упрыгожаннямі (17.4.1954), мітрай (23.4.1964). З 28.4.1965 за штатам.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 404, 548.

**СЕМЯНЮК (СЕМЕНЮК) Канстанцін Міронавіч** [1884, в. Падлессе Гродзенскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. З 1914 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Завішына (тагачасны паштовы адрас: ст. Плешчаніцы) Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. У 1920я г. служыў у Спаса-Праабражэнскім храме в. Карсакавічы (тагачасны паштовы адрас: ст. Зембін) Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Меў пяцера дзяцей. Арыштаваны 12.4.1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі

Мінскай епархіі Васіліем *Парфёнчыкам,* Канстанцінам *Радзівінавічам,* Пятром *Ражко,* Мікалаем *Тара новічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. 1.11.1933 пастановай калегіі АДПУ БССР высланы на 3 гады ў Паўночны край. Вызвалены ў 1936. Вярнуўся на радзіму. У 1941 зноў стаў служыць Свята-ром. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа С. і інш. № 27206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Сннодык за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мынской епархіш.*

**СЕМЯНЯКА (СЕМЕНЯКО) Мікалай Адамавіч. Гл.: ФЕАФАН (СЕМЯНЯКА).**

**СЕРАБРАКОЎ (СЕРЕБРЯКОВ) Уладзімір Георгіевіч** [1874 — 11.3.1938, Мазыр, НКВД]. Служыў у Мікалаеўскай царкве ў в. Шарэйкі Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Калінкавіцкі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны ў 1938. Асуджаны тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Калінкавіцкагараена. Мн., 1999.

**СЕРАПІЁН (ШАВАЛЕЎСКІ)** [Уладзімір Макаравіч; 3.7.1873 с. Параўка Кірсанаўскага пав. Тамбоўскай губ., Расія — 15.9.1937, Сыктыўкар, турма НКВД], епіскап. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1898 скончыў Казанскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя. Выкладаў у Кермісінскай царкоўнапрыходскай школе (Тамбоўская губ.), з 1899 — у Старааскольскім духоўным вучылішчы. Рукапаложаны ў іерэя (1902). Служыў у саборнай царкве Корач (Кароч) Курскай епархіі на пасадзе антысектанцкага місіянера. З 15.6.1905 — нам. назіральніка Белгарадскага духоўнага вучылішча, з 1907 назіральнік царкоўных школ у Гродзенскай і Цвярской епархіях. 13.7.1913 узведзены ў сан протаіерэя, накіраваны ў Віцебск на пасаду назіральніка царкоўнапрыходскіх школ

Полацкай епархіі. У 1917—18 прымаў удзел у Памесным саборы РПЦ, як нам. епіскапа Дзвінскага Панцеляімана (Ражноўскага), кіруючага Полацкай епархіяй. З 18.12.1917 выкладаў асноўнае і дагматычнае багаслоўе ў Віцебскай духоўнай семінарыі. 21.9.1928 хіратанісаны ў епіскапа Маршанскага, вікарыя Тамбоўскай епархіі. З сак. 1933 — епіскап Арзамаскі, вікарый Горкаўскай епархіі. Арыштаваны 2.3.1934. 1.3.1934 асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ва УсцьСысольск (цяпер Сыктыўкар) Комі АССР. 24.2.1937 узяты пад варту. 13.9.1937 тройкай НКВД Комі АССР асуджаны па справе «контррэвалюцыйнай групы царкоўнікаў «Свяшчэнная дружына» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.3.1989 пракуратурай Комі АССР.

Таксама рэпрэсаваны брат епіскапа Свята-р Міхаіл Макаравіч Шавалеўскі (н. ў 1875). У 1930я г. ў с. Ніжняя Матронка Хварасцянскага р-на (Расія) ён арыштаваны і асуджаны да 10 гадоў ППК. Далейшы яго лёс невядомы.

**СЕРАФІМ (АЛЯКСАНДРАЎ)** [Дзмітрый Аляксандравіч; 19.10.1865 або 1866, с. Нікіціна Корсунскага пав. Сімбірскай губ., Расія — 2.12.1937, Кустанай, Казахстан], мітрапаліт. З сям'і чыноўніка. У 1889 скончыў Саратаўскую духоўную семінарыю. З верас. 1889 да 1890 памочнік епархіяльнага місіянера Саратаўскай епархіі. У 1890 рукапаложаны ў дыякана, у 1891 — у Свята-ра. З 1894 — епархіяльны місіянер Саратаўскай епархіі. З сак. 1909 Свята-р Уваскрасенскай (Рынкавай) царквы (цяпер не існуе) у Віцебску. У 1910—14 епархіяльны антыраскольніцкі місіянер Арэнбургскай епархіі. У 1911 узведзены ў сан протаіерэя, 14.12.1914 у Арэнбургу епіскапам Арэнбургскім Мяфодзіем (Герасімавым) і епіскапам Пятроўскім Дзіянісіем (Празароўскім) хіратанісаны ў епіскапа Кустанайскага, вікарыя Арэнбургскай епархіі. З 24.3.1916 да 19.3.1918 епіскап Чалябінскі, вікарый Арэнбургскай епархіі, часова кіруючы Екацярынбургскай епархіей. У 1917—18 удзельнічаў у Паместным саборы РПЦ. З 9.3.1918 да 22.4.1918 епіскап Полацкі і Віцебскі. У крас. 1918

пераведзены ў Цвярскую епархію іда29.11.1919 епіскап Старыцкі, вікарый Цвярской епархіі. З ліст. 1919 епіскап Цвярскі і Кашынскі. З 1920 да 1921 член Свяшчэннага сінода пры Свяцейшым Патрыярху Ціхане. З архіепіскапамі Іларыенам (Троіцкім) і Ціханам (Абаленскім) удзельнічаў у перамовах з абнаўленцамі аб магчымасці аб'яднання. Першы раз арыштаваны Цвярской губ. ЧК у 1920. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці». У 1921 зноў арыштаваны, але неўзабаве вызвалены. У 1922 узведзены ў архіепіскапа Цвярскога і Кашынскага. 4.4.1922 у Маскве арыштаваны за «супраціў канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей». З чэрв. 1922 да лют. 1923 знаходзіўся ў Бутырскай турме. Пасля вызвалення жыў у Маскве без права выезда. 24.3.1924 узведзены ў сан мітрапаліта Цвярскога і Кашынскага. 21.12.1925 арыштаваны ў Цвяры і перавезены ў Маскву. 4.5.1926 вызвалены пад падпіску аб нявыездзе і ў ліст. 1926 адпраўлены ў ссылку ў Свярдлоўск. Вызвалены ў маі 1927. З 18.5.1927 — член Часовага патрыяршага Свяшчэннага Сінода пры мітрапаліце Сергіі (Страгародскім). З 15.6.1928 да 11.9.1933 мітрапаліт Саратаўскі. З верас. 1933 да ліст. 1936 мітрапаліт Казанскі і Свіяжскі. 26.12.1934 узнагароджаны правам нашэння крыжа на клобуку. 20.11.1936 арыштаваны НКВД у Казані. 27.2.1937 асуджаны да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны Казахстан (Петрапаўлаўск). 26.11.1937 тройкай НКВД ПаўночнаКазахстанскай вобл. прыгавораны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархн.*

**СЕРАФІМ (ПОЛАЗ)** [Серафім Грыгор'евіч; 1910 ці 1911, Борзна Чарнігаўскай губ., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна — ?], іераманах. Скончыў сямігодку (1925). З 1928 служыў псаломшчыкам. У 1932 у Кіеве пастрыжаны ў манашаства. У 1933 ухіліўся ў абнаўленчы раскол. Арыштаваны ў 1936. Асуджаны асобай нарадай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 6 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. У 1942 мабілізаваны ў працоўную армію і вывезены ў «Котласбуд» Комі АССР. З

1945 у дзеючай арміі. У канцы 1945 вярнуўся на радзіму. Прыняты ў зносіны з РПЦ. Епіскапам Чарнігаўскім і Нежынскім Барысам (Вікам) перарукапаложаны ў дыякана, Свята-ра і 1.12.1945 прызначаны настаяцелем Чарнігаўскага Свята-Троіцкага жаночага манастыра. У 1946 па ўласным прашэнні прызначаны настаяцелем Уваскрасенскай царквы мяст. Ічня Чарнігаўскай вобл., благачынным Ічнянскай акругі. Завочна вучыўся ў Ленінградскай духоўнай акадэміі. З 1.12.1953 Свята-р Куйбышаўскага Пакроўскага кафедральнага сабора. З 7.6.1955 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы Куйбышава. Узнагароджаны нагрудным крыжам. 18.6.1958 прыняты на службу ў Мінскую епархію, прызначаны настаяцелем Пакроўскага храма в. Асінагарадок Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. З 26.2.1959 служыў у Пакроўскім малітвенным доме ў Хойніках Гомельскай вобл. З 12.8.1959 клірык Ленінградскай епархіі. Далейшы лес невядомы.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 600.

**СЕРАФІМ (ШАХМУЦЬ)** [Раман Раманавіч; 15.7.1901, в. Падлессе Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Ляхавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — 5.3.1946 (?), ГУЛАГ], свяшчэннамучанік. Архімандрыт. Беларус. Са шматдзетнай сялянскай сям'і. З дзяцінства наведваў Свята-Духаву царкву, дзе настаяцелем служыў Іосіф Кезевіч[1]. У 1915 скончыў Ляхавіцкае 2класнае народнае вучылішча. У гэтым жа годзе памёр бацька, і маці засталася з дзецьмі адна. З 1916 паслушнік Мінскага Свята-Духава манастыра. У 1917 зза ваенных падзей вярнуўся ў родную вёску. У 1921 здаў экзамен на псаломшчыка, служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Вяляцічы Барысаўскага пав. З чэрв. 1922 паслушнік Успенскага манастыра ў мяст. Жыровічы Слонімскага пав. 1.4.1923 прыняў манашаскі пострыг з імем Серафім. Рукапаложаны ў іерадыякана (1926), іераманаха (1935). Накіраваны ў прыход в. Курашова тагачаснага Бельскага пав. Беластоцкага ваяв. Актыўна займаўся місіянерскай дзейнасцю сярод тутэйшых жыхароў, якія ў 1920я —

пачатку 1930х г. перайшлі да уніі. У канцы 1939 архіепіскапам Панцеляіманам (Ражноўскім) узведзены ў сан ігумена, потым архімандрыта. У жн. 1941 С. і айцу Грыгорыю *Кударэнку* была даверана высокая і адказная місія: на акупаванай тэрыторыі Беларусі арганізаваць прыходскае жыццё. Па дарозе ў Мінск місіянеры наведалі шэраг вёсак і мястэчак Капыльскага, Слуцкага, Уздзенскага рнаў, дзе збіралі на імя мітрапаліта прашэнні веруючых з просьбай аб адкрыцці царкоўных прыходаў. 3 ліст. 1941 да пачатку 1942 служыў у Мінску ў царкве былога Спаса-Праабражэнскага жаночага манастыра. У студз. 1942 з айцом Грыгорыем выехаў на Віцебшчыну, дзе зноў збіраў прашэнні аб адкрыцці храмаў, правіў богаслужэнні, хрысціў дзяцей. Пазней місіянеры наведалі Быхаў, Жлобін, Магілеў, Гомель. У Чонках Гомельскай вобл. адкрылі жаночы манастыр. Увосень 1943 вярнуліся ў Мінск. Служылі ў Свята-Духавай царкве (цяпер кафедральны сабор). У чэрв. 1944 прапаведнікі пераехалі ў Гродна. 6.9.1944 арыштаваны органамі НКВД і праз 5 дзён перавезены ў Мінскую турму. Абвінавачваліся ў «актыўным супрацоўніцтве з СД». 7.7.1945 архімандрыт Серафім і айцец Грыгорый асуджаны (з Іванам *ПЫшлам)* да 5 гадоў ППК. Этапаваны, хутчэй за ўсё, ва Унжэнскі канцлагер МДБ Горкаўскай вобл. (ст. Сухабязводная). С. загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны пракуратурай Беларусі 22.4.1994. Групавая справа архімандрыта і інш. № 35844с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай Праваслаўнай Царквы архімандрыт Серафім далучаны да ліку святых новапакутнікаў. У 2000 кананізаваны Архіерэйскім Саборам РПЦ.

Літ.: Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленныхгь святых н Подвнжннковт> Благочестія, вь Русской Православной Церквн просшвшнхгь (оі"ь царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); *Жнпгня свжценномученшсов Мннской епархіш;* Православный календарь на 2004 год. Сост. *Кулаженко Л.Е., Матрунчнк ТА.* Мн., 2003. С. 91; Мсгепшсу XX \уіе!ш Магіуго1о§іа

Рга№О5Іа\уІа \у Роізсе ш Ью§гайасЬ 5\уІ?ІусЬ ХУагегатга, 2004. С. 137—145.

**СЕРАФІМА (ЕДЗІНОВІЧ)** [Антаніна Фёдараўна; 1894, в. Рудня Мінскага пав., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. — ?], схіманахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Да арышту стараста Спаса-Праабражэнскай царквы ў Мінску. Арыштавана 17.12.1944 у Мінску па адрасе: вул. К.Цэткін, д. 40. Асуджана 29.12.1945 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» і «дапамогу архіепіскапу Філафею (Нарко) у арганізацыі царкоўнага жыцця падчас акупацыі» да 5 гадоў ППК. Этапавана ў ПаўночнаУральскі канцлагер МДБ Свярдлоўскай вобл. Вызвалена 10.9.1949. Служыла псаломшчыцай пры Мінскім кафедральным саборы. Рэабілітавана 26.10.1962 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Е. № 17032с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру п церковь Хрнстову пост радавшнх в Мннской епархіш.*

**СЕРГІЙ (ГАЛЬКОЎСКІ)** [Іван; ?, Віцебская губ. — 1917 або 1918], свяшчэннамучанік, іераманах. З 12.4.1900 да студз. 1910 жыў у Валаамскім Спаса-Праабражэнскім манастыры ў Выбаргскай губ. З 11.3.1908паслушнікманастыра. 23.12.1910 пастрыжаны ў манашаскі сан. З 1911 да 1917 манах, іерадыякан, іераманах у Носаўскім Спаса-Праабражэнскім манастыры. У 1917 (ці ў 1918) зладзейскі забіты. У 2000 кананізаваны Архіерэйскім Саборам РПЦ.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархн.*

**СЕРГІЙ (ДАБРАМЫСЛАЎ)** [Сяргей Мікалаевіч; 6.9.1862, Разанская губ., цяпер Разанская вобл., Расія — 7.10.1937, Віцебск, турмаНКВД], архіепіскап (абнаўленчы). Рускі. Сын Свята-ра Мікалая Дабрамыслава. Скончыў Разанскую духоўную семінарыю, Маскоўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (1887). Служыў у Смаленску. У 1915—20 інспектар Таўрычаскай духоўнай семінарыі ў

Сімферопалі. У 1918—20 у Белай арміі. Жонка С.(Д.) памерла ў 1920. Дачка Ніна ў 1920я г. жыла ў Севастопалі. Удава, працавала рахункаводам на кандытарскай базе. Сын Мікалай, былы афіцэр Белай арміі, расстраляны чэкістамі. Другі сын Грыгорый, таксама былы армейскі афіцэр, эміграваў у Балгарыю. Далейшы яго лёс невядомы. З 1921 С. у сане протаіерэя служыў у Сімферопалі і Севастопалі. Арыштаваны органамі ЧК у 1922. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці і сувязі з Врангелем». Асуджаны не быў. 14.2.1923 хіратанісаны ў абнаўленчага епіскапа Севастопальскай епархіі. З 1924 і да канца 1925 епіскап Запарожскі (цяпер Украіна), затым 6 месяцаў служыў у Разані, узведзены ў сан архіепіскапа і пераведзены ў Сталінград (цяпер Валгаград). З пачатку 1927 — архіепіскап у Мсціслаўі, са жн. 1927 — у Полацку. У ліп. 1928 на епархіяльным з'ездзе Магілёўскага духавенства па прапанове абнаўленчага мітрапаліта *Іосіфа* (Крэчатовіча) выбраны архіепіскапам Магілёўскай епархіі. З 1932 служыў у могілкавай царкве Магілёва, апошнім прытулку абнаўленцаў. 17.9.1932 пераведзены кіраваць Аршанскай кафедрай. З 17.7.1933 архіепіскап Віцебскай епархіі.

У снеж. 1935 в.а. старшыні Расійскага абнаўленчага сінода ў Маскве. У пачатку жн. 1935 прызначаны на Мазырскую кафедру, але адмовіўся ад службы па стане здароўя і за непадпарадкаванне ўказу звольнены за штат. Арыштаваны 18 (ці 20) верас. 1937 у Віцебску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 53. Асуджаны ва ўзросце 75 гадоў 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэннаі царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» і як «былы член Саюза рускага народа» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа С. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі; Шнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**СЕРГІЙ РАДАКОЎСКІ** [1882, мяет. Жыткавічы

Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. — пасля 21.3.1933, Мінск, турма АДПУ], свяшчэннамучанік. Протаіерэй. Сын Пятра Радакоўскага[1], сваяк блажэннай Валянціны Мінскай. У ліку лепшых скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя (1904). З 1905 служыў у Пакроўскай царкве ПаручынаЯсенецкага прыхода Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. З 1908 настаяцель Успенскага храма в. Лаўрышава Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. З пачаткам 1й сусветнай вайны выехаў у ПераслаўльЗалескі (цяпер Яраслаўская вобл., Расія), Свята-р санітарнага цягніка. У 1916—17 палкавы Свята-р. У канцы 1917 вярнуўся ў Мінск, прызначаны настаяцелем Свята-Троіцкай царквы в. Таль Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. Мясцовыя савецкія ўлады імкнуліся закрыць царкву і, знайшоўшы зручную прычыну — нясвоечасовую ўплату прыходам непамерных падаткаў, арыштавалі і накіравалі С.Р. на прымусовыя работы па нарыхтоўцы драўніны (1930). Праз 6 месяцаў вярнуўся ў в. Таль, але яго дом канфіскавалі, і Свята-р вымушаны быў з сям'ёй жыць, пераходзячы з хаты ў хату, у сваіх прыхаджанаў. Зноў арыштаваны 22.2.1933. Паводле пастановы калегіі АДПУ 21.4.1933 асуджаны з псаломшчыкам царквы Андрэем *Лутовічам* і старастам Аляксеем *Муравейкам* за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 23.11.1989. Групавая справа С.Р. і інш. № 29903с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

**СЕЎБА** (**СЕВБО**) **Павел Мікалаевіч** [1883, в. Цялуша Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — 14.3.1938, Мінск, турма НКВД], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Магілёўскай епархіі. Арыштаваны 10.12.1937 у в. Харошыя Бабруйскага рна. Асуджаны

16.2.1938 з шэрагам актыўных прыхаджан тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» і «ўдзел у контррэвалюцыйнай кулацкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.4.1960 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа С. і інш. № 7017сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

6.2.1935 у Смалявічах Мінскай вобл. арыштаваны дырэктар Смалявіцкай няпоўнай СШ Сеўба Анатоль Мікалаевіч (н. 27.12.1904; атрымаў вышэйшую адукацыю), верагодна, брат або сваяк Паўла Сеўбы. 11.5.1935 асуджаны да 10 гадоў ППК і этапаваны ў Брацкі канцлагер НКВД Іркуцкай вобл. Вызвалены 30.10.1946. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СЕЧКА** (**СЕЧКО**) **Віктар Іванавіч** [3.1.1898 в. Хорашава Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. — 29.4.1976], протаіерэй. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў пачатковае вучылішча в. Вераскава Навагрудскага пав. (1909), Навагрудскае гарадское вучылішча і настаўніцкія курсы (1915 ці 1916). Да канца 1920 у бежанстве ў Расіі, дапамагаў маці па гаспадарцы (бацька загінуў). У 1924—40 настаўнічаў у вёсках Хорашава, Фаховец, Зенявічы, Лешчанка, Макрэц Навагрудскага пав. У 1926 абвенчаны з Яўгеніяй Юльянаўнай Шашко (н. ў 1910), меў сына Вячаслава (1946). З другой паловы 1941 пісар валаснога праўлення ў в. Зенявічы, дапамагаў сувязным партызан. У 1942—44 слухач пастырскіх курсаў у Навагрудку. У канцы 1944 выкліканы ў Тулу для праходжання дзяржправеркі. Пакуль яна доўжылася, прымушаны быў працаваць у мясцовых шахтах. Асуджаны (1946) за «здраду радзіме» да 20 гадоў ППК. Этапаваны ў Варкуцінскі канцлагер МДБ Комі АССР. Працаваў на вугальных шахтах. Вызвалены ў 1956 са зняццем судзімасці і пазбаўлення правоў. Вярнуўся на радзіму. 4.3.1956 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам (Свірыдавым) рукапаложаны ў дыякана, 11.3.1956 — у іерэя і 19.3.1956 прызначаны настаяцелем

Мікалаеўскай царквы в. Турэйск Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. 11.8.1962 пераведзены ў Мікалаеўскі храм в. Лебяда Лідскага р-на Гродзенскай вобл. З 29.1.1969 настаяцель Ільінскай царквы в. Слаўнае Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл. З 17.3.1969 служыў у Свята-Троіцкім храме в. Туркі Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. У 1970 прыняты ў клір Смаленскай епархіі і 19.9.1970 прызначаны настаяцелем Пакроўскай царквы в. Княжына Сычоўскага рна. З 23.2.1971 служыў у Міхайлаўскім храме в. Студзянец Шумяцкага рна. З 25.6.1973 — у Мікалаеўскай царкве в. Ліпецы Новадугінскага рна. З 18.2.1975 — ва Успенскай царкве в. Голені Магілёўскага рна. Узнагароджаны набедранікам (1959), скуф'ёй (1961), камілаўкай (1963), нагрудным крыжам (1969), санам протаіерэя (1970 ці 1972). Пахаваны на могілках в. Лебяда Лідскага р-на Гродзенскай вобл.

Кр.: Архіў Мшскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**СЕЧКА** (**СЕЧКО**) **Ганна Восіпаўна** [1881, Мінская губ. — ?]. З сялянскай сям'і. Актыўная прыхаджанка храма падвор'я КіеваПячэрскай Лаўры. Падчас арышту кандуктар «Лентрамвая». Удава. Арыштавана 22.12.1933 у Ленінградзе па справе «еўлогіеўцаў». Асуджана 25.2.1934 да 3 гадоў ППК умоўна. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа С. № п66773 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: *Санкт Петербургской епархны Снноднк.*

**СІВАКОЎ** (**СИВАКОВ**) **Фока Іванавіч** [1866, в. Палкі Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў гарадское вучылішча, рукапаложаны ў іерэя. У 1910я г. настаяцель Пакроўскага храма в. Язёры Магілёўскага пав. Да арышту служыў у царкве в. СялецАнуфрыеўка (?) Мсціслаўскага пав. Арыштаваны 17.3.1932. Асуджаны з дыяканам храма Ціханам *Банбенкам* і інш. калегіяй АДПУ 11.5.1932 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі.

Kamunikat.org

Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 11.7.1989. Групавая справа С. і інш. № 10069 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная кныжка Могнлевской губерннн; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СІВІЦКІ** (**СИВИЦКИЙ**) **Міхаіл Іванавіч** [1874, Лепелынчына Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (?), рукапалажаны ў іерэя. З 1903 настаяцель Мікалаеўскага храма в. Рыбінішкі Дзвінскага пав. Віцебскай губ., цяпер Латвія. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 14.8.1931 у в. Бяскатава Гарадоцкага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 21.4.1932 са Свята-ром ПолацкаВіцебскай епархіі Кірам *Козыравым* асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 23.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі С.

Кр.: *Пажятная КИНжка Внтебской губерніш.*

**СІДАРЭНКА (СІДАРАКІН)** (**СИДОРЕНКО, СИДОРАКИН**) **Раман Кузьміч** [1883 — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. З духоўнага саслоўя. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Жалезнікі Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл., загадчык царкоўнапрыходскай школы. Арыштаваны, верагодна, у в. Ліскоўская Слабада, цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. Асуджаны ў 1930 да высылкі з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 5.

**СІЛЬВЯСТРОВІЧ** (**СИЛЬВЕСТРОВИЧ**) **Пётр Іосіфавіч** [1908, Віцебск — 19.5.1940, ГУЛАГ]. Беларус. З сям'і рабочага. З 1928 — дыякан Пакроўскай царквы ў Віцебску. Падчас арышту — вартаўнік гарадской лазні. Жонка: Зінаіда Васілеўна (н. 1909, працавала паліроўшчыцай на

мэблевай фабрыцы; дочкі: Раіса (9 гадоў) і Ларыса (6 месяцаў). Арыштаваны 24.9.1937 у Віцебску па адрасе: Набяражная Крапоткіна, д. 4а. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер НКВД. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД*.

**СІМАНОВІЧ** (**СИМОНОВИЧ**) **Іван Канстанцінавіч** [1861, в. Сукневічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — 20.11.1938, Магілёў, турма НКВД]. З сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета Мікалаеўскага храма ў мяст. Хатаевічы Барысаўскай акругі. Падчас арышту працаваў сталяром на Бабруйскім ільнокамбінаце. Арыштаваны 16.7.1938. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 15.11.1938 як «агент польскай разведкі» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 16.1.1989. Асабовая справа С. № 11444 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Беларусі. Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**СІМОНЧЫК (СИМОНЧНК) Герасім Цімафеевіч** [1892, мяст. Грозава Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. (паводле інш. звестак в. Герастаева Слуцкага пав.) — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчык Мікалаеўскага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, гадаваў трое дзяцей. Арыштаваны 10.1.1933. Асуджаны 8.2.1933 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Адначасова за межы БССР выслана сям'я С. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь. Працаваў рабочым на Аршанскім ільнокамбінаце. Зноў арыштаваны 18.11.1937. Прыгавораны тройкай НКВД за тое ж «злачынства» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 24771с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 30.6.1989 пракуратурай Мінскай вобл., па другой 31.10.1989 пракуратурай

Віцебскай вобл. *Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**СШКЕВІЧ** (**СИНКЕВИЧ**) **Грыгорый Лявонавіч** [1880, в. Ермалоўшчына (?) Віцебскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту дыякан царквы в. Таронкавічы Лепельскага р-на Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 7.2.1930. Асуджаны 24.2.1930 са Свята-рамі ПолацкаВіцебскай епархіі Міхаілам *Лаўрыновічам,* Мікалаем *Любарскім* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**СІНЯКОЎ** (**СИНЯКОВ**) **Парфірый Іванавіч** [1866, мяст. Горы Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. — сак. 1930 (?), Магілёў, турма НКВД], іерэй. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, верагодна, брат Іаана Сінякова[1]. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1900—20я г. настаяцель Свята-Іаанаўскай царквы ў родным мястэчку. Арыштаваны 17.2.1930. Асуджаны 3.3.1930 са Свята-ром Сергіем *Чатыркіным* калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.8.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 10509сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губертш.*

**СШЯЎСКІ** (**СИНЯВСКИЙ**) **Уладзімір Грыгор'евіч** [1881, в. Тупічана Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Арыштаваны 28.6.1942 у Куйбышаве. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі і прапагандзе». 29.9.1942 пастановай НКВД Куйбышаўскай вобл. справа спынена. У 2й палове 1940х г. — Свята-р Спаса-Еўфрасіннеўскай манастырскай царквы ў Полацку Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 26.11.1949. Асуджаны 9.9.1950 асобай нарадай МДБ як

«член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Ангарскі канцлагер МДБ Іркуцкай вобл. (Брацк). Вызвалены 23.5.1956. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.12.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. № 22892п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

У даваенны час, верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі С.

Кр.: *Белая кніга.*

**СІРАЦІНСКІ** (**СИРОТИНСКИЙ**) **Дзімітрый Іванавіч** [1892, в. Сабкоўка, цяпер Кіеўская вобл., Украіна — ?]. З сям'і ўкраінскага службоўца. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Свята-Духавай царкве в. Петухоўка, цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, гадаваў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 14.4.1935. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай прапаганды». 5.6.1935 пастановай Магілёўскага раённага аддзела НКВД БССР вызвалены і рэабілітаваны. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа № 5921 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД.*

**СІРАЦЮК** (**СИРОТЮК**) **Сцяфан Самуілавіч** [1883, Кіеўская губ., цяпер Украіна — 1.1.1943, ГУЛАГ], Свята-р. Арыштаваны 6.11.1939 у Гомелі. Асуджаны 29.1.1940 да 10 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 29.11.1991.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**СІЎКО** (**СИВКО**) **Марыя Сільвестраўна** [1880, в. Купіск Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер пас. Любча Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл. — ?]. З сялянскай сям'і. Паслушніца Іаанаўскага манастыра з 1908 да яго закрыцця (1923). Арыштавана ў 1924 па справе «Іаанаўскага манастыра». Асуджана ў 1925 да 3 гадоў ссылкі ў Комі АССР. Вярнулася ў Ленінград 8.6.1928. Жыла ў будынку манастыра. Зноў арыштавана 17.2.1932. Прыгаворана 22.3.1932 да 3 гадоў ссылкі з канфіскацыяй

маёмасці. Выслана ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Літ.: *Санкт Петербургской епархші Снноднк.*

**СКАРАБАГАТЫ (СКАРАБАГАТАЎ)** (**СКОРОБОГАТЫЙ, СКОРОБОГАТОВ**) **Іаан Кузьміч. Свята-**р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. З 1915 служыў у Ціханаўскай царкве в. Старыя Івакі (Івакі) (тагачасны паштовы адрас: ст. Насавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. настаяцель АляксандраНеўскага храма в. Ніўкі Гомельскага пав. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губертш;* Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 50, с. 80, л. 250.

**СКАРАБЕЦ** (**СКОРОБЕЦ**) **Міхаіл Фёдаравіч** [1888, в. Казіміраўка Рэчыцкага (?) пав. Магілёўскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913). У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Зазер'е (тагачасны паштовы адрас: ст. Пярэжыр) Ігуменскага пав., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 6.7.1937 у Асіповічах (цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл.). Асуджаны 20.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.9.1963 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа С. і інш. № 8901 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

**СКАРУБСКІ** (**СКАРУБСКИЙ, СКОРУБСКИЙ**) **Павел Уладзіміравіч** [1885, в. Івольск Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. — 29.9.1938, турма НКВД], протаіерэй (абнаўленчы). Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. З 1913—14 настаяцель Міхайлаўскай царквы в. Хальч Гомельскага пав., цяпер Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. Пасля Кастрычніцкага перавароту 1917 адрокся ад сана. У

1920я г. ўступіў у абнаўленчы рух. З 1931 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Рэчыца, цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Арыштаваны 28.4.1938. Асуджаны 20.9.1938 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.9.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерніш;* ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 19; Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998; *IПнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). Мн., 2006.

**СКАРУБСКІ (СКАРУБСКИЙ, СКОРУБСКИЙ) Уладзімір** [1880 — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Івольск (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1918, 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 3.

**СКВЯРНЮК (СКВЕРНЮК) Мікалай Лукіч** [30.5.1906, Мінск — ?], Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. З сям'і рабочага. Атрымаў сярэднюю або сярэднюю спецыяльную адукацыю. Служыў настаяцелем Мінскага АляксандраНеўскага храма на Вайсковых могілках. Арыштаваны 5.8.1935 у Мінску па адрасе: вул. Інтэрнацыянальная, д. 9, кв. 1. Асуджаны 27.10.1935 са Свята-рамі Мінскай епархіі Мікалаем *Умецкім,* Міхаілам *IПафраноўскім* і інш. паводле пастановы калегіі НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.7.1961 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа С. і інш. № 17146с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. (

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СКРАМНОЎ (СКРОМНОВ) Аляксандр Аляксандравіч** [1870, в. Беражкі, цяпер Калужская вобл., Расія — ?].

Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Георгіеўскім храме в. Рыдомля Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. З 1915 настаяцель Сафійскай царквы в. Расна Сенненскага пав., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. Падчас арышту служыў у храме в. Паўлавічы Бешанковіцкага р-на Віцебскай акругі. Арыштаваны 29.12.1929. Асуджаны ў 1930 за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. 11.3.1933 калегіяй АДПУ ЗаходнеСібірскага краю прыгавораны да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. 13.3.1930 у в. Паўлавічы арыштавана Таццяна Скрамнова (н. 1905 у в. Беражкі), дачка Аляксандра Скрамнова. 16.6.1930 асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 24.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа сям'і С. № 21055п захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерншi.*

**СКРЫПУНОЎ** (**СКРИПУНОВ**) **Парфеній Іванавіч** [1881, в. Скрыпліца Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. — 1930 (?), Магілёў, турма АДПУ]. З сям'і землеўласніка. Да арышту настаяцель царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 10.2.1930. Асуджаны 23.2.1930 са Свята-ром Лазарам *Чыстабаевым* асобай нарадай пры АДПУ за «тэрарыстычную і антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.6.1989. Групавая справа С. і інш. № 10060 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Разам з Парфёнам Скрыпуновым асуджаны яго браты Кірыл (н. ў 1896) і Ананій (1880) да ВМП, Панфіл (н. ў 1887) да 10 гадоў ППК. Далейшы яго лёс невядомы.

**СЛАБКОВІЧ** (**СЛАБКОВИЧ**) **Аляксей Мікалаевіч** [1865, в. Залессе Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — 14.10.1937, Полацк, турмаНКВД], — царкоўны староста.

Беларус. З сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 20.9.1937 у в. Бярозаўка тагачаснага Ветрынскага (цяпер Полацкі) р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 25.9.1937 са Свята-ром Дзімітрыем Александровічам тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *БНДЦЭД*.

**СЛАВЕЦКІ** (**СЛОВЕЦКИЙ**) **Сергій Грыгор'евіч** [1873, в. Студзянец Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл. — 1937, Магілёў, турма НКВД], протаіерэй. Беларус. З духоўнага саслоўя. Скончыў духоўнае вучылішча, рукапаложаны ў іерэя. Служыў другім Свята-ром у Свята-Троіцкім храме мяст. Расна Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дрыбінскі р-н Магілёўскай вобл. 31.1.1906 прызначаны настаяцелем храма. З 1909 служыў у Крыжаўздзвіжанскай царкве в. Чарнаручча Магілёўскага пав., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол. У 1930я г. протаіерэй могілкавай царквы ў Магілёве, часова кіруючы Магілёўскай епархіяй (абнаўленчай). Арыштаваны 10.11.1936. Асуджаны 25.1.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ППК. 28.9.1937 справа С. перагледжана, прыгавор заменены на ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 4885; захоўваецца ў архіве КДБ Магілеўскай вобл.) рэабілітаваны 7.8.1937 Магілёўскім абл. судом, па другой (групавой, № 9171) 9.4.1966.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерннн; Шнленок Д., свяіц.* Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**СЛАЙЧЭЎСКІ** (**СЛАЙЧЕВСКИЙ**) **Іаан Ермалаевіч** [1859 — ?], бацька Георгія Іванавіча Слайчэўскага[1]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Пакроўскай царкве в. Целяшы. Рэпрэсаваны ў 1929 з сестрамі (?) Верай (н. ў 1864)

і Надзеяй (1859). Далейшы лёс сям'і С. невядомы.

Кр.: *Памятная кныжка Могнлевской губерннн; НГАБ,* ф. 2257, в. 1, с. 19; Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 6.

**СЛІЖ** (**СЛИЖ**) **Платон** [1903, в. Лоск Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. — 19.4.1953, ГУЛАГ], протаіерэй. Беларус. Сын Вікенція Сліжа. Скончыў Віленскую духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя (1926). Служыў у Спаса-Праабражэнскім храме в. Суцькава Ашмянскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Смаргонскі р-н Гродзенскай вобл. З 1938 настаяцель царквы св. Іосіфа Абручніка ў Валожыне. З 1944 служыў у Спаса-Увазнясенскім храме, благачынны цэркваў Валожынскага рна. Арыштаваны 27.4.1951 у Валожыне па адрасе: вул. Навагрудская, д. 1. Асуджаны 5.9.1951 са Свята-ром Яўстафіем *Баслыком,* Паўлам *Кірыкам* асобай нарадай МДБ за «ўдзел у антысавецкай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Рачны канцлагер (Асоблаг № 6) МДБ Комі АССР (Варкута). Паводле некаторых звестак, забіты неўзабаве пасля вызвалення. Рэабілітаваны 28.11.1978 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа С. і інш. № 20622с захоўваецца з фотаздымкам ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархнн.*

**СЛУПСКІ** (**СЛУПСКИЙ**) **Павел Грыгор'евіч** [1870 (паводле інш. звестак 1874), в. Гарбачэва (?) Полацкага пав. Віцебскай губ. — 5.1.1938, Калінінская вобл., Расія, турмаНКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. дыякан Мікалаеўскай царквы в. Малое Сітна Полацкага р-на Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 27.11.1929. Асуджаны ў 1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Пасля вызвалення жыў у в. Валачанава Шахаўскога р-на Маскоўскай вобл., працаваў леснікомаб'ездчыкам. Зноў арыштаваны 2.1.1938. Тройкай

УНКВД Калінінскай вобл. 31.12.1937 прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 23213п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 1.10.1993 пракуратурай Віцебскай вобл., па другой — 28.6.1989 пастановай Цвярской абл. пракуратуры.

Кр.: *КИНга памлтп жертв полшпнческнх репресснй Калннннской областы.*

**СЛУПСКІ** (**СЛУПСКИЙ**) **Грыгорый** [студз. 1897, в. Горкі Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. — ?], сын Мікалая Слупскага[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Успенскай царквы в. Казімірава, Мікалаеўскай царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 15.10.1929. Асуджаны 13.1.1930 з шэрагам інш. Свята-роў Мінскай епархіі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа С. і інш. № 27155с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

29.11.1933 у Мінску арыштаваны эканаміст наркамата гаспадаркі БССР бацька дваіх дзяцей Слупскі Сяргей Мікалаевіч (н. ў 1892 у сям'і Свята-ра, атрымаў вышэйшую адукацыю), верагодна, брат Грыгорыя Слупскага. 10.2.1934 калегіяй АДПУ асуджаны за «шкодніцтва» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа С. і інш. супрацоўнікаў наркамата гаспадаркі № 28831с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; Памятная кныжка Мннской епархіш; Лычный состав епархнального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с. 67.

**СЛУЧАНОЎСКІ** (**СЛУЧАПОЎСКІ**) (**СЛУЧАНОВСКИЙ, СЛУЧАПОВСКИЙ**) **Дзімітрый Іванавіч** [1880, в. Бязводзічы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю.

Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у РаствaБагародзіцкай царкве в. Кулынычы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл. З 1910 настаяцель Свята-Троіцкага храма ў мяст. Расна Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дрыбінскі р-н Магілёўскай вобл. З 1913—14 служыў у Міхайлаўскай царкве в. Кулікова Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 18.9.1937 у Мсціславе. Асуджаны 5.11.1937 са Свята-рамі Магілёўскай епархіі Гаўрыілам *Мельячэнкам,* Антоніем *Сцяпанавым,* дыяканам Фамой *Казловым* і інш. тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Асабовая справа С. № 12700сн з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш.*

**СЛУЧАНОЎСКІ** (**СЛУЧАНОВСКИЙ**) **Уладзімір Мікалаевіч** [1871, мяст. Дашкаўка Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі р-н — 1930 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сям'і службоўца. Да арышту дыякан РаствaБагародзіцкай царквы ў родным мястэчку. Арыштаваны 6.2.1930. Асуджаны 21.3.1930 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа С. № 13254 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**СМАЛЕНЕЦ** (**СМОЛЕНЕЦ**) **Аляксандр Іванавіч. Гл.: АРСЕНІЙ (СМАЛЕНЕЦ).**

**СМАНЦАР** (**СМАНЦЕР**) **Дзімітрый Філімонавіч** [1867, в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. З сялянскай сям'і. З 1898 староста Спаса-Праабражэнскай царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны

31.1.1931. Асуджаны 4.7.1931 з настаяцелем царквы Аляксандрам *Юнацкевічам,* сынам настаяцеля псаломшчыкам Генадзем *Юнацкевічам,* псаломшчыцай Вольгай *Крук,* актыўнымі прыхаджанамі Верай Буднаю (1874), Дзмітрыем Багданоўскім (1883), Усцініяй Касмовіч (1890), Паўлам Паўлаўцом (1887), Яфімам Рашотнікавым (1878), Якімам Ярашам (1877) калегіяй АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 25.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа С. і інш. № 28026с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру н церковь Храстову пострадавшнх в Мннской епархіш.*

**СМЕЛЯК (СМЯЛЯК) Пётр Грыгор'евіч.** Дыякан. Беларус. У 1920я г. служыў у Мікалаеўскай царкве в. Прысно Рагачоўскага пав., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 6.

**СМІРНОЎ** (**СМИРНОВ**) **Васілій Нікіфаравіч** [1885, мяст. Янавічы Віцебскага пав., цяпер Віцебскага р-на — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў званаром у Свята-Троіцкай (?) царкве ў родным мястэчку. Быў жанаты, гадаваў сыноў: Леаніда (н. ў 1915), Мікалая (1916), Міхаіла (1922). Арыштаваны 11.3.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа С. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СМІРНОЎ** (**СМИРНОВ**) **Міхаіл** [1877, в. Езярышча Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], сын Свята-ра Георгія Фёдаравіча

Смірнова[1] і, верагодна, брат Свята-ра Сергія Георгіевіча Смірнова[2]. Рукапаложаны ў іерэя. З 1904 служыў у РаствaБагародзіцкім храме в. Лемяшэвічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. Забаронены ў свяшчэннаслужэнні. 10.2.1914 пераведзены на пасаду псаломшчыка РаствaБагародзіцкай царквы в. Вялікі Бор Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Хойніцкі р-н Гомельскай вобл. 15.3.1914 зноў дазволена свяшчэннаслужэнне і 25.3.1914 прызначаны настаяцелем Мікалаеўскага храма в. Маладуша Рэчыцкага пав. Мінскай губ., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. У 1920я г. настаяцель царквы в. Малыя Бясяды (Бясяды) (тагачасны паштовы адрас: ст. Радашковічы) Мінскага пав., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 26.10.1929. Асуджаны 1.12.1929 са Свята-ром Іаанам *Радзівіновічам* калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.2.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа С. № 33346с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Внтебской губерніш; Памятная КИНжка Мннской губерннн; Лнчный состав епархнального управ лення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**СНЫТКО** (**СНИТКО**) **Міхаіл Ксенафонтавіч** [1874, в. Лушновічы (?) Шклоўскага пав. Магілёўскай губ. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту дыякан царквы в. Зарэчная Шклоўскага рна. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 1.1.1933. Асуджаны 7.2.1933 з актыўнымі прыхаджанамі царквы Кастусём Іўкіным (1883), Васілём Кайданавым (1890), Іванам Самойлавым (1878) асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду супраць калгасаў» да 5 гадоў ППК (заменена ссылкай ў Казахстан). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989. Групавая справа С. і інш. № 10075 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, *ІКБР.*

**СОБАЛЬ** (**СОБОЛЬ**) **Ганна Васілеўна** [снеж. 1903, в.

Брадзец Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларуска. З сялянскай сям'і. Да арышту псаломшчыца Успенскай царквы ў роднай вёсцы. Арыштавана 23.8.1935. Асуджана 21.10.1935 з настаяцелем царквы Леанідам *Біруковічам* асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 4 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 22.12.1989 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа С. і інш. № 29321с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр..НАРБ, ІКБР.*

**СОБАЛЬ** (**СОБОЛЬ**) **Леанід Сямёнавіч** [1882, в. Караевічы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — ?], бацька Васілія Собаля[1]. З сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета храма Узнясення Гасподняга в. Несіна Лепельскага пав. Падчас арышту працаваў дзесятнікам у Каменскім леспрамгасе. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 4.12.191932. Асуджаны калегіяй пры АДПУ 30.12.1932 за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 12.6.1989. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67.

**СОЙЧАНКА (СОЙЧЕНКО) Пётр Васілевіч** [1882, в. Галяні Магілёўскага пав., цяпер Магілёўскі р-н — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. У 1920я г. настаяцель Троіцкай царквы в. Гарадзішча Быхаўскага пав., цяпер Магілёўскі рн. Арыштаваны 14.11.1932. Асуджаны 16.12.1932 тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 8 гадоў ППК.

Разам з С. арыштаваны і асуджаны яго сын Фёдар Сойчанка (н. ў 1912 у в. Галяны). Далейшы іх лес невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 пастановай прэзідыума Вярхоўнага суда СССР. Групавая справа сям'і С. і актыўных прыхаджан № 12237 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СОН (ЗОН) Наталля Фрыдрыхаўна. Гл.: АНГЕЛІНА СОН (ЗОН).**

**СТАДЮКАЎ (СТАДНИКОВ) Канстанцін Якаўлевіч** [1881, Вільня, цяпер Вільнюс, Літва — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Да арышту настаяцель Свята-Антоніеўскага храма ў мяст. Рубяжэвічы, цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 29.7.1950. Асуджаны 9.10.1950 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з канцлагераў МДБ Кіраўскай вобл. (п/с ОР2163). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.10.1993 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа С. № 35676с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *БНДЦЭД.*

**СТАЛЬМАКОЎ (СТАЛЬМАКОВ) Захар Васілевіч** [1877 або 1879, в. Гарадзішча Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. (паводле інш. звестак в. Карасі Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі рн) — 29.11.1938, Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да першага арышту стараста царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 10.3.1932 у Гарадзішчах. Асуджаны 23.7.1932 са Свята-ром *Міхаілам Пігулеўскім,* актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі і пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 12.7.1938. Прыгавораны 14.11.1938 тройкай НКВД як «удзельнік паўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 12982; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР, па другой (№ 3317; захоўваецца тамсама) — 16.7.1958 трыбуналам БВА.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СТАЛЯРОЎ (СТОЛЯРОВ) Іаан (?) Фёдаравіч**. Бе ларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель Екацярынінскай царквы в. Гадзічава Гомельскага пав., цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 55.

**СТАНКЕВІЧ (СТАНКЕВИЧ) Васілій Адольфавіч** [1864, мяст. Зембін Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 10.3.1938, Барысаў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Член царкоўнага савета храма св. Андрэя Юродзівага ў Барысаве. Падчас арышту пенсіянер, інвалід. Арыштаваны 5.2.1938 у Барысаве па адрасе: вул. Савецкая, д. 130. Асуджаны 14.2.1938 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай групы» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1957 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа С. і інш. № 10397с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.*

**СТАРАВОЙТАВА (СТАРОВОЙТОВА) Марына Кузьмінічна** [1883, в. Сядзіч Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 14.3.1932. 3.9.1932 калегіяй АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» і «антысавецкую агітацыю» пазбаўлена на 3 гады правоў жыць у вызначаных местах. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 31.10.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 10669 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СТАРАДОМСКІ (СТАРОДОМСКИЙ) Міхаіл** [1872, в. Антонаўка Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Караткавіцкі альбо Майскі сельсавет Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. — ?]. Сын Мікалая Старадомскага[1].

Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Увазнясенскай царкве в. Зубровічы Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. 3 1912 настаяцель Свята-Троіцкага сабора ў Чэрыкаве Магілёўскай вобл. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны 24.9.1937 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Вызвалены 29.12.1956 (?). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.12.1956 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа С. і інш. № 1531сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерннн;* Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Жлобіна і Жлобінскага раена. Мн., 2000; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Чэрыкаўскага раена. Мн., 1994.

**СТАРАДОМСКІ (СТАРОДОМСКИЙ) Міхаіл Міхайлавіч** [7.11.1882, в. Прыбыткі Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі р-н — студз. 1944], протаіерэй. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. У ліку лепшых скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1904). Выкладаў матэматыку ў 2класнай царкоўнапрыходскай школе в. Рыскова Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. Ажаніўся з дачкой Паўла Мядзведкава Ганнай (н. ў 1890; скончыла Магілёўскае жаночае духоўнае вучылішча; з 1907 працавала настаўніцай; у 1940я г. просвірня пры Гомельскім саборы). 15.8.1909 епіскапам Гомельскім Мітрафанам (Краснапольскім) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны ў Свята-Ціханаўскі храм в. Івакі Гомельскага пав., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. У 1911 пераведзены ў РаствaБагародзіцкую царкву мяст. Свержань Рагачоўскага пав. У 1920я г., верагодна, служыў у РаствaБагародзіцкім храме ў роднай вёсцы. 3 29.11.1933 жыў у Рагачове, працаваў рабочым. Арыштаваны ў 1933 (?). Асуджаны да 5 гадоў ППК. У зняволенні тэрмін пакарання працягнуты. Вызвалены 3.3.1943 невылечна хворым. 3 2.5.1943 знаходзіўся на пасяленні ў в. УзунАгач саўгаса «Кніж» Джамбульскага р-на АлмаАцінскай вобл., цяпер

Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губерши;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 56; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Гомельскага раена. У 2 кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**СТАРЫЧЭНКА (СТАРИЧЕНКО) Іван Кузьміч** [1.1.1880, в. Прамышляды Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту стараста Свята-Троіцкай царквы ў мяст. Янавічы Віцебскага рна. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 10.1.1937. Асуджаны 15.11.1937 з архіерэем Полацка-Віцебскай епархіі *Гаўрыілам* (Свідзерскім), настаяцелем Янавіцкай царквы Уладзімірам *Міцкевічам, Свята*-ром Полацка-Віцебскай епархіі Іосіфам *Гусаковым,* актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 20107п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СТАЎРОВІЧ (СТАВРОВИЧ) Канстанцін Іванавіч** [19.3.1868, в. Аздзяцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 9.2.1938, Мінск, турмаНКВД], протаіерэй. Беларус. Сваяк Іаана Стаўровіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894). 5.7.1894 накіраваны ў Дзімітрыеўскі храм аколіцы Сернікі Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Украіна. Рукапаложаны ў іерэя (1896). З 1897 настаяцель Успенскай царквы в. Мілашавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл., духоўны следчы 1й акругі. З 1907 настаяцель Мікалаеўскага храма в. Белічаны (тагачасны паштовы адрас: ст. Раванічы) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. Узнагароджаны нагрудным крыжам. Арыштаваны 5.1.1938. Асуджаны 9.1.1938 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны

27.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа С. № 22028с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; Памятная КИНжка Мннской епархші; Лычный состав епархнального управлення; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67;

**СТРАТАНОВІЧ (СТРАТАНОВИЧ) Іаан Іванавіч. Свята-**р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Не пазней чым з 1905 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Прысно Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл., благачынны 5й акругі цэркваў Гомельскага (?) пав. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш;* ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 6.

**СТРАТАНОВІЧ** (**СТРАТАНОВИЧ**) **Мікалай** [1880, в. Лучын Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. — ?], Свята-р (?), сын Іаана Фёдаравіча Стратановіча[1]. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту жыў з братам Яўгенам, сёстрамі Наталляй, Лізаветай, Верай. Арыштаваны 12.3.1923. Асуджаны калегіяй АДПУ 22.6.1923 за «нелегальны пераход дзяржаўнай мяжы» і як «падазроны ў шпіянажы» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. Вызвалены пастановай АДПУ 2.8.1926, але пазбаўлены права жыць у 12 вызначаных гарадах. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны ваенным пракурорам Беларусі 8.6.1992. Асабовая справа С. № 34162с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. *Кр..НАРБ, ІКБР.*

**СТРАТАНОВІЧ** (**СТРАТАНОВИЧ**) **Міхаіл Іванавіч** [1860 ці 1861, в. Старыя Шчаўры Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1885). З 10.2.1894 настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы пры Магілёўскім жаночым вучылішчы духоўнага ведамства, настаўнік,

сакратар праўлення гаспадарчага камітэту. Арыштаваны 17.2.1938 у Горках Магілёўскай вобл. Асуджаны тройкай НКВД 30.1.1938 (паводле інш. звестак 19.9.1938) за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППК. 19.2.1939 Магілёўскім абл. судом справа спынена «за адсутнасцю складу злачынства». Далейшы лёс Свята-ра, яго жонкі і шасці дзяцей невядомы. Рэабілітаваны 26.6.1990 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа С. № 13782сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: *Пажятная КИНжка Могнлевской губернын.*

**СТРАТАНОВІЧ** (**СТРАТАНОВИЧ**) **Сергій Аляксандравіч** [1865, мяст. Раманава Горацкага пав. Магілёўскай губ., з 1918 в. Леніна Горацкага р-на Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З духоўнага саслоўя. Скончыў духоўную семінарыю. Не пазней чым з 1905 другі Свята-р РаствaБагародзіцкай царквы ў родным мястэчку. Арыштаваны 12.2.1930. Асуджаны 9.3.1930 з актыўнымі прыхаджанамі калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да высылкі на Поўнач. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 23.6.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 9928 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Могылевской губерніш.*

**СТРАУС Карл Іванавіч** [1874, Ліфляндская губ., цяпер Латвія — ?], царкоўнаслужыцель. Латыш. З сялянскай сям'і. Служыў у Свята-Духавым храме в. Паддуб'е Віцебскага пав., цяпер Лёзненскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 15.3.1930. Асуджаны 16.6.1930 з шэрагам Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член шпіёнскадыверсійнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК (заменена высылкай у Сібір). Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 16.10.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа С. № 18529п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**СТРАХОВІЧ (СТРАХОВИЧ) Аркадзій** [6.1.1902 в. Вольніца Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілёўскай вобл. — 8.1.1938, Мінск, турма НКВД], сын Мікалая Страховіча[1]. Атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю. У першай палове 1930х г. дыякан Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай), служыў у АляксандраНеўскай царкве ў Мінску. Падчас арышту саліст хора Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Быў жанаты, гадаваў дзіцяў. Арыштаваны 19.11.1937 у Мінску па адрасе: вул. Старажоўская, д. 38, кв. 4. Асуджаны 27.12.1937 тройкай НКВД СССР як «агент польскай разведкі і член ПАВ, які служыў у арміі белапапякаў» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 14.10.1957 трыбуналам Ленінградскай ВА. Асабовая справа С. № 10944с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная кныжка Мннской губерннн; Памятная КИНж ка Мннской епархіш; Лычный состав епархнального управлення;* Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998; *Рэпрэсаваныя...*

**СТРОК Іван Матвеевіч. Гл.: ІОСІФ (СТРОК).**

**СТРУКОЎСКІ (СТРУКОВСКИЙ) Іаан** [1895, в. Старажоўцы Мазырскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл. — ?], сын Фёдара Анастасавіча Струкоўскага[1] і Сафіі Пятроўны (дачка Пятра Яхневіча[2] ), брат Мікалая і Сергія *Стпрукоўскіх.* Скончыў духоўную семінарыю. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў настаяцелем у Свята-Троіцкай царкве г.п. Целяханы, цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны 2.1.1949. Асуджаны 12.4.1949 асобай нарадай МДБ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 15 гадоў (пазней заменена на 10) ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ва УхтаІжэмскі канцлагер МДБ Комі АССР. Вызвалены 21.2.1956. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.4.1992 прэзідыумам Брэсцкага абл. суда. Асабовая справа С. № 10784с з фотаздымкам захоўваецца ў

Kamunikat.org

архіве КДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Мімской губерніш; Памятная КИНж$а Мннской губернш; Лнчньш состав епархнального управлення; БНДЦЭД.*

**СТРУКОЎСКІ** (**СТРУКОВСКИЙ**) **Мікалай** [25.12.1887 ці 25.12.1890, в. Старажоўцы Мазырскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл. — 1981], мітрафорны протаіерэй. Сын Фёдара Анастасавіча *Струкоўскага і* Сафіі Пятроўны *Яхневіч,* брат Іаана і Сергія *Струкоўскіх.* Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча (1906), Мінскую духоўную семінарыю (1913). Працаваў настаўнікам у 2класным народным вучылішчы в. Грозава (Грозаў) Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. У 1914 мабілізаваны ў армію. Удзельнічаў у 1й сусветнай вайне. Служыў псаломшчыкам у 85м апалчэнскім палку. Паранены (1916). Лячыўся ў Мінскім шпіталі. 22.7.1917 павенчаны з Нінай Вісарыёнаўнай Рубановіч (н. ў 1892). 12.9.1919 епіскапам Мінскім і Тураўскім (будучым мітрапалітам Мінскім і Беларускім) Мелхіседэкам (Паеўскім) рукапалажаны ў дыякана, 14.9.1919 у іерэя і прызначаны настаяцелем РастваБагародзіцкай царквы в. Амговічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з вікарным епіскапам Слуцкім *Мікалаем* (Шамяцілам) і 20 Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер АДТТУ Карэльскай АССР. У 1939 вызвалены і ў 1940 атрымаў дазвол выехаць у Сяміпалацінск Казахскай ССР, куды была выслана яго сям'я. Не маючы магчымасці служыць у царкве (усе мясцовыя храмы былі закрыты або разбураны), працаваў бухгалтарам у Сяміпалацінскім аптэкаўпраўленні. На радзіму вярнуўся ў 1945 з жонкай, але без дзяцей, якія загінулі падчас вайны ад малярыі. 30.1.1946 архіепіскапам Мінскім і Беларускім Васіліем (Ратміравым) накіраваны ў Георгіеўскую царкву в. Альба Косаўскага благачыння (цяпер Івацэвіцкі (?) р-н Брэсцкай

вобл.), але ў спаленай вёсцы не было дзе жыць і 12.9.1946 архіепіскапам Пінскім і Лунінецкім Даніілам (Юзьвюком) пераведзены ў РаствaБагародзіцкі храм в. Вавулічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. 16.3.1947 прызначаны ва Успенскі храм в. Ліпнікі таго ж рна. З 24.11.1955 настаяцель Стрэчанскай царквы Драгічына Брэсцкай вобл., благачынны Драгічынскай акругі (да яе ліквідацыі 5.7.1962). Узнагароджаны набедранікам (1922), скуф'ёй (1925), камілаўкай (1928), нагрудным крыжам (1930), санам протаіерэя (1933), паліцай (1949), крыжам з упрыгожаннямі (1953), мітрай (1960). 3.10.1964 зза хваробы выйшаў на пенсію. Рэабілітаваны 2.4.1965 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа С. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губертш;* Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 578.

**СТРУКОЎСКІ** (**СТРУКОВСКИЙ**) **Мікалай Іпалітавіч** [1875, в. Крывічы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. — 1930 (?), турма АДПУ]. Вучыўся ў Слуцкім духоўным вучылішчы. У 1900 псаломшчык Успенскага сабора ў мяст. Рэчыца Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы ў мяст. Рэчыца. Арыштаваны 24.8.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ 27.9.1930 да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.11.1989.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской епархіш;* Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раена. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**СТРУКОЎСКІ** (**СТРУКОВСКИЙ**) Сергій [1907, в. Старажоўцы Мазырскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жыткавіцкі р-н Гомельскай вобл. — ? ], сын Фёдара Анастасавіча *Струкоўскага і* Сафіі Пятроўны *Яхневіч,* брат Іаана і Мікалая *Струкоўскіх.* Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, верагодна, служыў у

Свята-Троіцкай царкве ў г.п. Целяханы Івацэвіцкага р-на Брэсцкай вобл. З восені 1944 працаваў у Целяханскім раённым прамысловым камбінаце. Арыштаваны 13.12.1944. Асуджаны 11.10.1946 як «пасобнік нямецкіх акупантаў» да 8 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў адзін з канцлагераў Краснаярскага краю. Вызвалены 11.12.1952. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.10.1959 калегіяй Вярхоўнага суда РСФСР. Асабовая справа С. № 4812с захоўваецца ў архіве УКДБ Брэсцкай вобл.

Кр.: *Памятная КИНжка Мннской губерніш; НАРБ, ІКБР.* .

**СТУКАЛА** (**СТУКАЛО**) **Мікалай Пятровіч** [1892, с. Янава, цяпер Украіна — ?], Свята-р. Украінец. З сялянскай сям'і. У 1920я г. асуджаны за «контррэвалюцыйную агітацыю» і этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР. Уцёк з канцлагера. Жыў у Слуцку. Зноў арыштаваны 24.12.1933. Прыгавораны 26.3.1933 за «антысавецкую прапаганду» і «ўцёкі з месца зняволення» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 29.8.1989. Асабовая справа С. № 31391с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

*Кр.:НАРБ, ІКБР.*

**СТУКАНАЎ** (**СТУКАНОВ**) **Максім Анісімавіч** [1880, в. Казінова Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 4.9.1937, Віцебск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1913). У 1920я г. настаяцель Увазнясенскай царквы в. Кабішы, цяпер Гарадоцкі рн, Георгіеўскай царквы в. Копцевічы, цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 15.4.1931. Асуджаны 27.8.1931 з інш. свяшчэннаслужыцелямі ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Зноў арыштаваны 25.7.1937 у Асташкаве Калінінскай вобл. па адрасе: Ленінскі праспект, д. 70. Прыгавораны 31.8.1937 з Мікалаем *Пашыным,* Сямёнам *Садаўнічым* і інш. тройкай

НКВД Калінінскай вобл. да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 19.10.1988, па другой — 10.9.1956.

7.2.1933 у в. Саўчанкі Гарадоцкага р-на арыштаваны селянінаднаасобнік, бацька чатырох дзяцей Стуканаў Сямён Анісімавіч (н. ў 1879), брат Максіма і Сцяпана Стуканавых. 15.3.1933 калегіяй АДПУ асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці і расстраляны. Дата смерці невядома. Рэабілітаваны 17.5.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Сям'я С. выслана ў Паўночны край. Справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

18.6.1937 у в. Саўчанкі арыштаваны селянінаднаасобнік Стуканаў Сцяпан Анісімавіч (н. ў 1878), брат Максіма і Сямёна Стуканавых. 23.8.1937 тройкай НКВД асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Яго справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: *Кнша пажятн жертв полнтнческнх репрессні Калннннской областн;* Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл., ф. 1070, в. 1, с. 32, л. 98—119; ф. 152, в. 5, с. 2, л. 40.

**СТЭФАНОЎСКІ (СТЕФАНОВСКИЙ) Міхаіл Арсеневіч** [1890, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 29.9.1937 у Холме Наўгародскай вобл. Асуджаны ў 1937 да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.*

**СУДАКОЎ (СУДАКОВ) Максім** [1865 — ?], Свята-р. Беларус. Да арышту жыў у в. Шарпілаўка, цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1933. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СУЛКОЎСКІ (СУЛКОВСКИЙ) Міхаіл**. Сваяк па мужу блажэннай Валянціны Мінскай. З духоўнага саслоўя. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. 16.9.1914 прызначаны настаяцелем ва Успенскую

царкву в. Заўшыцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны летам 1920. Праз некаторы час вызвалены па шматлікіх просьбах прыхаджан. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Лоеў Рэчыцкага пав., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памяпгная КИНжка Мннской губертш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1, с. 67; *Сшоднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мннской епархш.*

**СУРЖЫК** (**СУРЖИК**) **Платон Казіміравіч** [1884, мяст. Заслаўе Мінскага пав., цяпер Мінскі р-н — 1933 (?), турма АДПУ], Свята-р. Беларус. 3 рабочай сям'і. У 1920я г. настаяцель Свята-Духавай царквы в. Сава Горацкага пав., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 25.12.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 17.3.1933 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 28.4.1989.

Кр.: *НАРБ, ІКБР.*

**СУРМІЛА** (**СУРМИЛО**) **Дзяменцій (Дзімітрый) Грыгор'евіч** [1870 — ?], Свята-р. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. У 1900—20я г. настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Маркавічы (Новыя Маркавічы) Рагачоўскага пав., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. У 1930 асуджаны як кулак да высылкі з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: *Памятная КИНжка Могнлевской губертш; НГАБ,* ф. 2786, в. 1,с.67.

**СУХАБАЕЎСКІ** (**СУХОБАЕВСКИЙ**) **Кірыл Дзмітрыевіч** [1874 або 1879, в. Кацялёва Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. (паводле інш. звестак в. Клімацічы Магілёўскай губ., цяпер Горацкі рн) — 14.3.1938, Магілёў, турма НКВД], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г.

служыў у Спаса-Праабражэнскім храме ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 11.2.1930. Асуджаны 12.3.1930 са Свята-ром Максімам *Галубковым,* Фёдарам *Івановым,* Уладзімірам *Коршунавым,* Міхаілам *Піневічам* і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «агітацыю супраць калгасаў» да высылкі ў Паўночны край (тэрмін невядомы). Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Працаваў у калгасе імя Леніна Горацкага рна. Зноў арыштаваны 7.2.1938 у в. Марозава (?) Горацкага рна. Прыгавораны 14.2.1938 тройкай НКВД да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па першай справе (№ 10852; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. (дата невядома), па другой (№ 11448; захоўваецца тамсама) 16.1.1989 пастановай Вярхоўнага суда СССР.

Кр.: *НАРБ, ІКБР;БНДЦЭД.* ;

**СУХАРАЎ** (**СУХАРЕВ**) **Іларыён Сцяпанавіч** [1862, в. Худзяні Віцебскага пав., цяпер Віцебскі р-н — 26.9.1937, Віцебск, турмаНКВД], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 7.8.1937 у роднай вёсцы. Асуджаны 7.9.1937 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа С. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СУХОЙ Фёдар Трафімавіч** [1870, в. Даманы Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту старшыня савета царквы ў роднай вёсцы (?). Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа С. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: *НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.*

**СУЧКОЎ (СУЧКОВ) Афанасій** [1884 — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Чабатовічы (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскага пав., цяпер БудаКашалёўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 з жонкай Анастасіяй Піліпаўнай (н. ў 1886). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 7.

**СЦЯПАНАЎ (СТЕПАНОВ) Аляксандр Паўлавіч** [1892, Полацк Віцебскай губ., цяпер горад Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля (?). Да арышту настаяцель царквы в. Казакі (паводле інш. звестак, Мікалаеўскага храма ў в. Мядзеліна) Віцебскага рна. Быў жанаты, гадаваў дачок: Кацярыну, Любоў, Яўгенію. Арыштаваны 24.2.1932 ці 22.9.1932. Асуджаны 1.11.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» і як «кіраўнік антысавецкай групоўкі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 8.12.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. № 17484п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР.

**СЦЯПАНАЎ (СТЕПАНОВ) Антоній Ціханавіч** [1881, в. Вейна Магілёўскага пав., цяпер Магілёўскі р-н (паводле інш. звестак в. Гарадзішча Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл.) — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскім храме в. Гарадзішча. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 10.3.1932. Асуджаны 23.6.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 19.9.1937. Прыгавораны са Свята-рамі Магілёўскай епархіі Гаўрыілам Мельячэнкам, Дзімітрыем Случаноўскім, дыяканам Фамой Казловым 5.11.1937 тройкай НКВД як

«член контррэвалюцыйнай арганізацыі». Мера пакарання невядома. Па першай справе (№ 12982; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Па другой (№ 14144; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) 22.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл.

Кр.: Памяпгная КИНжка Могылевской губернгш.

**СЦЯПАНАЎ (СТЕПАНОВ) Гаўрыіл Грыгор'евіч. Гл.: ДАСІФЕЙ (СЦЯПАНАЎ).**

**СЦЯПАНАЎ (СТЕПАНОВ) Міхаіл Сцяпанавіч** [1893, в. Падтаполле Наўгародскай губ., Расія — ?], царкоўнаслужыцель. Рускі. З сялянскай сям'і. Служыў у Мінскай духоўнай семінарыі. Арыштаваны 28.4.1921. Асуджаны 4.10.1921 калегіяй АДПУ за «супрацоўніцтва з дэфензівай» да высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.8.1992 пракуратурай БВА. Групавая справа С. і інш. № 34451с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**СЦЯПАНАЎ (РУСАК) (СТЕПАНОВ) Уладзімір** [н. 17.6.1949, в. Звёздная Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.], протадыякан, журналіст. Скончыў Маскоўскую духоўную акадэмію. Падрыхтаваў трохтомнае даследаванне «Свндетельство обвнннення» пра ўзаемаадносіны РПЦ і савецкай улады, дзе раскрываліся рэпрэсіі супраць Царквы. За свой рукапіс пазбаўлены работы ў рэдакцыі час. «Журнал Московской патрнархнн», адпраўлены ў Віцебск. У 1983 у пропаведзі адкрыта сказаў пра пакутнікаў за веру ў СССР. Напісаў ліст да делегатаў VI Генеральнай Асамблеі Сусветнай Рады Цэркваў у Ванкуверы, за што забаронены ў свяшчэннаслужэнні. Пра маладога протадыякана стала вядома на Захадзе. Архіепіскап Кентэрберыйскі прачытаў яго ліст на прэсканферэнцыі асамблеі. Арыштаваны ў 1985. 10.9.1986 Маскоўскім гарадскім судом асуджаны да 7 гадоў ППК. Падчас выхаду 1га тома сваёй працы (1993) яшчэ знаходзіўся ў зняволенні.

Тв.: Свндетельство обвнненння. Т. 1.

**СЦЯПУК (СТЕПУК) Іаан Аўксенцевіч** [1875 — ?], дыякан. Беларус. З сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў дваіх непаўналетніх дзяцей. Арыштаваны ў 1929 (?) у мяст. Чашнікі, цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіўВіцебскай вобл., ф. 152, в. 5, с. 2, л. 11—12.

**СЦЯПУРА (СТЕПУРО) Васілій Львовіч** [1872 ці 30.1.1874, в. Вялікія Лукі Навагрудскага пав. Мінскай. губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — ?], протаіерэй. З сям'і псаломшчыка, брат Іаана Сцяпуры. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1895?). Служыў псаломшчыкам ва Уваскрасенскай царкве в. Вялікая Слабада Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1901) КасмаДаміянаўскага храма в. Тонава Слабада (тагачасны паштовы адрас: Койданава) Мінскага пав. З 1908 настаяцель Свята-Троіцкай царквы в. Туркі (тагачасны паштовы адрас: ст. Цялуша) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. У 1920я г. настаяцель РаствaБагародзіцкага храма в. Новыя Дарогі, цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 30.12.1928. Асуджаны 29.3.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі на Урал. Пасля вызвалення жыў у Слуцку Мінскай вобл. Зноў арыштаваны 14.3.1933. Прыгавораны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. 20.10.1937 тройкай НКВД асуджаны да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Карагандзінскі канцлагер МДБ Казахскай ССР. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 31972с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 28.2.1992, па другой (групавой, № 27605с; захоўваецца тамсама) 17.7.1989.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губертш; Лнчный

соспгав епархнального управленыя; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Правяіцые архнерен Мннской епархіш.

**СЦЯПУРА (СТЕПУРО) Іаан Львовіч** [1862, в. Малыя Жухавічы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — ?], брат Васілія Сцяпуры. Беларус. З сям'і псаломшчыка. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту псаломшчык (?) Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Івань Слуцкага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 14.3.1933 у Слуцку. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа С. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**СЧАНСНОВІЧ (СЧЕНСНОВИЧ) Іосіф Антонавіч** [7.6.1886, в. Жыровічы Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Слонімскі р-н Гродзенскай вобл. — 21.11.1937, Масква, турма НКВД], дыякан. Беларус. Скончыў Жыровіцкае духоўнае вучылішча, курсы псаломшчыкаў у Гродне (1903). Служыў у царкве в. Вялікі Лес Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Камянецкі (?) р-н Брэсцкай вобл. З 1916 псаломшчык храма ў Рагожскай Слабадзе ў Маскве. Скончыў пастырскія курсы ў Старабельску (1921), цяпер Украіна. З 1924 дыякан царквы ў пас. Высокае Харкаўскай губ. З 1929 служыў у ПетраПаўлаўскім храме каля Яўзскіх варот у Маскве. З 1930 — у Свята-Троіцкай царкве ў пас. Купаўна Нагінскага р-на Маскоўскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 12.11.1937 у пас. Купаўна па адрасе: 2я Грамадзянская вул., д. 6. Асуджаны 19.11.1937 са Свята-ром Ільёй Рылько (Рылькам) тройкай УНКВД Маскоўскай вобл. за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.11.1957. Кр.: Бутповскый Полшон.

**СЧАНСНОВГЧ (СЧЕНСНОВИЧ) Іакаў Аляксандравіч**

[1866, в. Дзедзіна Себежскага пав. Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Багародзіцкай царквы в. Скрыдлева Сенненскага пав., цяпер Віцебскі рн. Ухіліўся ў абнаўленчы раскол. Арыштаваны 3.12.1933. Асуджаны 25.2.1934 з інш. свяшчэннаслужыцелямі ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**СЫРНІКАЎ (СЫРНИКОВ) Аляксій Мікітавіч** [15.2.1875, пас. Варанок Старадубскага пав. Чарнігаўскай губ., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна — пасля 14.2.1930, Полацк (?), турма АДПУ], свяшчэннаслужыцель. Беларус. З мяшчанскай сям'і. У 1920я г., верагодна, служыў у царкве ў пас. Арэхаўна Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 12.1.1930. Асуджаны 14.2.1930 са Свята-ром Пятром Зільбергам асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.8.1989. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**СЯЛІЦКІ (СЕЛИЦКИЙ) Данііл Іванавіч** [1870, в. Карсакавічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. старшыня царкоўнага савета Спаса-Праабражэнскага храма ў роднай вёсцы. Падчас арышту староста Міхайлаўскай (?) царквы ў мяст. Зембін Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 12.4.1933. Асуджаны 19.7.1933 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуроромБССР. Групавая справа С. і інш. № 27206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; БНДЦЭД; Снноднк за веру

н цер ковь Хрыстову пострадавшнх в Мннской епархіш.

**СЯМЁНАЎ (СЕМЕНОВ) Васілій Іванавіч** [1894 — 1938, Гомель, турма НКВД], протаіерэй. Рукапаложаны ў дыякана (1920). Служыў у Віцебскім Успенскім саборы. У 1922 пасвячоны ў іерэя, прызначаны ва Успенскі храм в. Міткавічы Полацкага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. З 1924 настаяцель прыпісной царквы в. Забалацце Лукаўскай вол. Рагачоўскай акругі, цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны 5 (ці 25) сак. 1938. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 14.11.1957. Асабовая справа С. захоўваецца ў архіве УКДБ Гомельскай вобл.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 592.

**СЯРНІНСКІ (СЕРНИНСКИЙ) Ігнацій Іосіфавіч** [1869, в. Бялавіна (Баранава) Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Смаленская (?) вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Рукапаложаны ў іерэя (1891). Служыў у Спаса-Праабражэнскім храме ў мяст. Чашнікі Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. Арыштаваны 24.11.1929. Асуджаны 13.1.1930 з шэрагам Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.10.1993 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа С. і інш. № 23220п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Вытебской губертш.

**СЯЎРУК (СЕЎРУК) (СЕВРУК) Іаан** [1875, в. Дубнавічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Сын Іосіфа Сеўрука[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1900). Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Малыя Гарадзяцічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. З 1905 настаяцель Сімяонаўскага храма в. Баславічы Слуцкага пав. Мінскай губ. Узнагароджаны скуср'ёй (1914).

З 1917 благачынны цэркваў 1й акругі Слуцкага пав. Падчас арышту настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы ў мяст. Любань. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і як член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК (заменена высылкай). Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа С. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской епархнн; Лнчный состав епархыального управленыя; Памятная кнажка Мннской губертш.

**СЯЧКОЎ (СЕЧКОВ) Цярэнцій Тарасавіч** [1884, в. Рудкі (?) Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — 26.10.1937, Мінск, турма НКВД], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў у ЗарэччаШклоўскім храме, цяпер Шклоўскі рн. Арыштаваны 8.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 як «член контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Пасля сканчэння тэрміну вярнуўся на радзіму. 9.10.1937 тройкай НКВД прыгавораны за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Па першай справе (27605с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР, па другой (№ 11749) 16.1.1989 Вярхоўным судом БССР.

Кр.: НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ТАЛСТОЙ (ТОЛСТОЙ) Васіль Іванавіч** [1887, в. Бачэйкава Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту стараста Ільінскага храма ў мяст. Бешанковічы Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 8.3.1932 у роднай вёсцы. Асуджаны 5.6.1932 з псаломшчыцай Бешанковіцкай царквы Аленай Магер, Свята-ром ПолацкаВіцебскай епархіі Андрэем Кошалевым і інш. асобай нарадай пры АДПУ за

«антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.10.1988 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа Т. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТАЛЮШ Уладзімір Дзмітрыевіч. ,., Гл.: УЛАДЗІМІР ТАЛЮШ.**

**ТАМАШОЎ (ТОМАШЕВ) Аляксей Конанавіч. Гл.: АРСЕНІЙ (ТАМАШОЎ).**

**ТАМАШЧЫК (ТОМАЩИК) Уладзімір Данілавіч. Гл.: ВАСІЛІЙ (ТАМАШЧЫК).**

**ТАМЧУК (ТОМЧУК) Нікіта Трафімавіч** [14.9.1888, в. Старакорнін Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — 11.6.1955, Гродна], протаіерэй. З сялянскай сям'і. Скончыў народнае вучылішча ў роднай вёсцы (1900), вучыўся ў Драгічынскай 2класнай царкоўнапрыходскай школе. З 1903 настаўнік СтараБучыцкай царкоўнапрыходскай школы ХолмскаВаршаўскай епархіі, з 1904 — Ягаднінскай царкоўнапрыходскай школы Бельскага пав. (цяпер тэрыторыя Польшчы), з 1905 — Канстанцінаўскай царкоўнапрыходскай школы ХолмскаВаршаўскай епархіі. 23.11.1906 вытрымаў экзамен на званне псаломшчыка пры Гродзенскай духоўнай кансісторыі. 15.1.1907 прызначаны ў Мікалаеўскі храм в. Пяскі Ваўкавыскага пав., цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. 18.8.1909 пераведзены ў Крыжаўздзвіжанскую царкву в. Вярстак, цяпер Полынча. 7.6.1914 вытрымаў экзамен і 14.5.1915 епіскапам Беластоцкім Уладзімірам (Ціханіцкім) рукапаложаны ў дыякана. 25.6.1915 накіраваны ў Старакорнінскі храм. 4.9.1918 часова прызначаны дыяканам Краснастоцкага жаночага манастыра, эвакуіраванага ў Маскоўскую губ. Вярнуўся на радзіму ў 1921. 14.11.1921 епіскапам Бельскім Сергіем (Каралёвым) рукапаложаны ў іерэя. 26.11.1921 накіраваны памочнікам

настаяцеля Старакорнінскага прыхода. З 1925 другі Свята-р Свята-Троіцкага сабора ў Бельску (Польынча), з 1926 — у Міхайлаўскім храме ў Скідзелі Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі рн, з 1928 настаяцель Пакроўскай царквы в. Дубічы Бельскага пав. (Польіпча). З ліст. 1931 настаяцель Гродзенскага жаночага манастыра. Быў жанаты на Вользе Раманаўне (1.12.1891 — 28.12.1977), меў дачку Лідзію (н. 11.3.1916), і двух сыноў (старэйшы загінуў падчас 2й сусветнай вайны; малодшы ў першай палове 1950х г. быў студэнтам). Арыштаваны 26.9.1944. Асуджаны 12.3.1945 трыбуналам войск НКВД Гродзенскай вобл. па артыкуле 63—1 КК БССР за «здраду радзіме» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Азёрны канцлагер МУС Іркуцкай вобл. (Тайшэт, Брацк). Вызвалены 27.9.1954. Вярнуўся на радзіму невылечна хворым. Рэабілітаваны ў 1956.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 577.

**ТАРАНОВІЧ (ТАРАНОВИЧ) Мікалай** [1860, в. Белае Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Украіна — ?]. Беларус. Сын Васілія Тарановіча. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1885). 9.8.1885 прызначаны служыць у ПараскеваПятніцкую царкву в. Качанавічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1886). Пераведзены ў Ільінскі храм в. Мхерына Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. З 1894—95 і да арышту настаяцель Пакроўскай царквы в. Ратуцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны ў крас. 1933. Асуджаны 19.7.1933 са Свята-рамі Мінскай епархіі Канстанцінам Радзівіновічам, Васіліем Парфёнчыкам, Пятром Ражко, Канстанцінам Семянюком, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале і высланы ў Казахстан (?). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны

31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Т. і інш. № 27206с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губертш; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управленыя; ЯГАВ.ф. 2786, в. 1,с.67.

**ТАРАНОВІЧ (ТАРАНОВИЧ) Яўстафій**. Архімандрыт. Служыў у Бабруйску. Арыштаваны ў 1930я г. Высланы ў Сібір (?). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Сннoднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархнн.

**ТАРАТКЕВІЧ (ТАРАТКЕВИЧ) Васілій** [1881, в. Пышна (Забалацце) Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Лепельскі р-н Віцебскай вобл. — ?], сын Аляксандра Парфір'евіча Тараткевіча[1], сваяк Лукі Парфір'евіча Тараткевіча[2]. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель царквы в. Чэрсвяты, дзе раней служыў яго бацька. Арыштаваны 1.3.1930. Асуджаны 14.3.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 13.12.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Т. № 11704п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

30.12.1932 ў в. Чэрсвяты арыштавана маці пяці дзяцей Тараткевіч Алена Пахомаўна (н. ў в. Хвошна Гарадоцкага пав. Віцебскай губ.), жонка Васілія Тараткевіча. 26.1.1933 асуджана калегіяй АДПУ за тое ж «злачынства» што і яе муж да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 28.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Яе асабовая справа захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Внтебской губерніш.

**ТАРУШКА (ТАРУШКО) Севасцян Рыгоравіч** [1874, в. Гілі Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. У 1920я г. старшыня царкоўнага савета Свята-ПетраПаўлаўскага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей.

Арыштаваны 27.3.1931. Асуджаны калегіяй АДПУ 27.8.1931 як «удзельнік контррэвалюцыйнай кулацкацаркоўнай арганізацыі» да высылкі з сям'ёй на Урал. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Віцебскім абл. судом 19.10.1988. Асабовая справа Т. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ТАРЫМА (ТАРИМА) Міхаіл Лук'янавіч** [1893 — 30.1.1970], мітрафорны протаіерэй. Беларус. З духоўнага саслоўя. З 1921 псаломшчык храма в. Вялікі Лес Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Украіна. Скончыў духоўную семінарыю і ваеннае вучылішча. Рукапаложаны ў іерэя (1926). Служыў другім Свята-ром у Сімяонаўскім саборы ў Брэсце. З 1944 настаяцель Брэсцкай Мікалаеўскай царквы. Арыштаваны ў 1948. Абвінавачваўся ў правядзенні «антысавецкай агітацыі». Асуджаны да 10 гадоў ППК. Вызвалены ў 1955 са зняццем судзімасці. Вярнуўся на радзіму. Служыў другім Свята-ром Крыжаўздзвіжанскага храма ў Лунінцы Брэсцкай вобл. З 1956 настаяцель ПараскеваПятніцкай царквы г.п. Дзівін Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл. З 1958 і да апошніх дзён настаяцель Казанскага храма ў ДавыдГарадку той жа вобл.

23.12.1930 арыштаваны сялянінаднаасобнік Мікалай Лук'янавіч Тарыма (н. ў 1898 у в. Вістычы Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Брэсцкі рн), брат Міхаіла Тарымы. 3.10.1931 асобай нарадай АДПУ асуджаны за «парушэнне дзяржаўнай мяжы СССР і пераход на савецкі бок з мэтай шпіянажу на карысць буржуазнай Полыпчы» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БВА. Яго асабовая справа № 26943с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 611; НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТАЎРЫЁН (БАТОЗСКІ)** [Ціхан Данілавіч; 28.7.1898, Краснакуцк Харкаўскай губ., цяпер Украіна — 13.9.1978], архімандрыт. З сям'і казначэя гарадской управы. Быў

дзясятым, апошнім дзіцём у сям'і. У 15 гадоў паслушнік Глінскай РаствaБагародзіцкай пустыні ў Курскай губ. У 1921 прыехаў у Маскву, пасяліўся ў Новаспаскім манастыры, дзе працягваў займацца іконапісаннем. Прыняў манашаскі пострыг ад епіскапа Паўліна (Крошачкіна). У 1923 па благаславенні свяціцеля Ціхана рукапаложаны епіскапам Паўлінам у іерадыякана. Ім жа ў 1925 у храме пры Маскоўскім Новаспаскім манастыры пасвячоны ў іераманаха. У 1925, калі Новаспаскі манастыр закрылі, пераехаў да епіскапа Паўліна ў Курск. З 1926 — настаяцель Свята-Троіцкага Маркава мужчынскага манастыра ў Віцебску. У 1927 пасвячоны ў сан архімандрыта, прызначаны настаяцелем храма прападобнага Феадосія ў Пермі. У 1930—31 служыў у Калузе катакомбна — у дамах веруючых. Арыштаваны ў 1931. Асуджаны да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР, потым — у Салікамскі канцлагер АДПУ КоміПярмяцкай аўтаномнай акругі і Інцімскі (Мінеральны) канцлагер Комі АССР. Пасля вызвалення (1935) жыў у Калузе, Курску, працаваў мастаком, выкладаў у мастацкай школе. 27.12.1940 зноў арыштаваны і прыгавораны да 15 гадоў ППК. Этапаваны (1941) у Турынскі канцлагер НКВДМДБ Свярдлоўскай вобл. У 1953 высланы ў Кустанайскі край Казахскай ССР. Пасля вызвалення (25.5.1956) служыў у Пермскім кафедральным саборы, ва Успенскай Пачаеўскай Лаўры, нам. Глінскай РаствaБагародзіцкай пустыні, настаяцелем Уфімскага Пакроўскага храма, сакратаром епархіяльнага ўпраўлення. Ва Уфу прыехаў па запрашэнні епіскапа Нікана (Лысенкі). Адразу ж стаў няўгодны мясцовым уладам, бо «аказваў адмоўны ўплыў на епіскапа, супрацьдзейнічаў закрыццю цэркваў», і быў высланы з Уфы. З 1961 настаяцель царквы ў с. Някрасава Яраслаўскай вобл. У 1962 патрыярх Аляксій I намерваўся рукапалажыць Т. ў епіскапа Курскага, але Савет па справах рэлігій не дазволіў гэтаму адбыцца. З 1964 настаяцель храма с. Некоўз Яраслаўскай вобл. З 7.3.1969 духаўнік Рыжскага ТроіцаСергіева манастыра, настаяцель Спаса-

Праабражэнскай пустыні. Узнагароджаны Патрыяршым крыжам і ордэнам св. Уладзіміра II ступені. Пахаваны ў Спаса-Праабражэнскай пустыні, каля Праабражэнскага сабора. Кр.: Афіцыйны сайт Віцебскай епархп.

**ТКАЧОЎ (ТКАЧЕВ) Яфім Мацвеевіч** [1883, Смаленск — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 27.4.1931 у Віцебску як «вандроўны прапаведнік і гандляр рэчамі царкоўнага ўжытку». Асуджаны 14.7.1932 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Т. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТОЎЦІН (ТОВТИН?) Аляксандр Васілевіч** [1909 — 27.9.1937, Мазыр, турма НКВД]. Паводле некаторых звестак служыў у Свята-ІаанаБагаслоўскай царкве в. Хобнае, цяпер Калінкавіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Калінкавіцкага раена. Мн., 1999.

**ТРАХАНОВІЧ (ТРОХАНОВИЧ) Іакаў Арцем'евіч** [1883, в. Астражанка Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. — 28.4.1942, ГУЛАГ], свяшчэннаслужыцель. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г., верагодна, служыў у Георгіеўскай царкве в. Прылепы Мінскага пав., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 9.1.1933. Асуджаны 16.1.1933 з настаяцелем царквы Яўфіміем Паўлоўскім, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з канцлагераў АДПУ Іванаўскай вобл. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Т. і інш. № 25544с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКВР;

БНДЦЭД.

**ТРАШУЦІН (ТРАШУТИН) Карнілій Фёдаравіч** [24.9.1882, в. Глушкава Шумячыцкай вол. Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — пасля 1955]. Беларус. З сялянскай сям'і. Пасля сканчэння Глушкаўскай царкоўнапрыходскай школы (1897) працаваў у ёй настаўнікам пачатковага класа. З верас. 1898 выкладаў у царкоўнапрыходскай школе в. Панятоўка Клімавіцкага пав., цяпер Смаленская вобл. У 1899 паступіў у настаўніцкую семінарыю ў мяст. Маладзечна Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер горад Мінскай вобл. Пасля сканчэння (1903) выкладаў у народнай школе в. Гародзькі Ашмянскага пав. Віленскай губ., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Скончыў Другія пастырскія курсы ў Маскве, вытрымаў экзамен на званне Свята-ра (20.2.1911). 27.2.1911 епіскапам Уладзімірам, настаяцелем Маскоўскага Спаса-Андроніеўскага (?) манастыра, рукапаложаны ў дыякана, 6.3.1911 — у іерэя. 2.7.1911 Іркуцкай духоўнай кансісторыяй прызначаны настаяцелем Георгіеўскага храма с. Броды Ніжнеўдзінскага пав. Іркуцкай губ., Расія. 22.12.1916 пераведзены ў Літоўскую епархію і накіраваны ў Пакроўскі прыход в. Гародзькі. 7.12.1918 камандзіраваны ў царкву РаствaБагародзіцы в. Малое Мажэйкава Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Шчучынскі р-н Гродзенскай вобл. 2.9.1919 прызначаны настаяцелем Мікалаеўскага храма в. Турэйск Лідскага пав., цяпер Шчучынскі рн. 9.7.1924 пераведзены ва Успенскі прыход в. Хаценчыцы Вілейскага пав., цяпер Вілейскі р-н Мінскай вобл. З кастр. 1925 памочнік настаяцеля Ільінскай царквы ў мяст. Ілля Вілейскага пав., цяпер Вілейскі рн. З 26.10.1925 часова кіруючы прыпісной Іосіфаўскай царквой таго ж мяст. 2.5.1928 прызначаны на пасаду адміністратара Крыжаўздзвіжанскага прыхода в. Цвеціна Дзісенскага пав. Віленскага ваяв., цяпер Мёрскі р-н Віцебскай вобл. З 9.5.1929 другі Свята-р РаствaБагародзіцкай царквы в. Лужкі Дзісенскага пав., цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. 17.2.1932 пазбаўлены ўладамі месца як не

маючы польскага грамадзянства. Служыў псаломшчыкам у Свята-Троіцкім храме в. Стары Мядзел, цяпер рай-цэнтр Мядзел Мінскай вобл. З 4.3.1932 настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Даўбені, цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. 1.3.1934 пераведзены ў РаствaБагародзіцкі храм мяст. Турэц, цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. 17.4.1934 пазбаўлены месца як палітычна нядобранадзейны. Працаваў на гаспадарцы. 24.12.1939 загадам ГродзенскаНавагрудскага епархіяльнага ўпраўлення прызначаны настаяцелем Дзімітрыеўскага прыхода в. Шчорсы, цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. 2.4.1940 пераведзены ў Мікалаеўскую царкву в. Нягневічы таго ж рна. 9.2.1946 епіскапам Гродзенскім Варсанофіем (Грыневічам) прызначаны другім Свята-ром Спаса-Праабражэнскага храма мяст. Дзярэчын, цяпер Зэльвенскі р-н Гродзенскай вобл., памочнік благачыннага. З 28.4.1947 памочнік Васілія Вержбаловіча, протаіерэя Мікалаеўскага храма ў Лагойску Мінскай вобл. З 5.4.1949 настаяцель Еўфрасіннеўскай царквы ў мяст. Івянец Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй, каміламкай (1940), нагрудным крыжам (1948). Арыштаваны 8.2.1951. Асуджаны 21.4.1951 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў Чалябінскі канцлагер МДБ (п/с 48). 3.9.1955 амнісціраваны. Пасля вызвалення вярнуўся ў Еўфрасіннеўскую царкву мяст. Івянец. Паводле ўласнага жадання пераведзены ў Курскую епархію, куды раней пераехала яго дачка. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 3.3.1993 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Т. № 35472с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 579.

**ТРОЦ Георгій Іосіфавіч** [1900, Беласток, цяпер Польшча — 22.9.1937, Томск, турма НКВД], протадыякан. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў у Іванаўскай царкве

Kamunikat.org

ў Томску. Арыштаваны 15.8.1937. Асуджаны 27.8.1937 як «член контррэвалюцыйнай кадэцкаманархісцкай і эсэраўскай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 2.11.1960.

**ТРОШЧАНКА (ТРОЩЕНКО) Раман Яфімавіч** [1899, в. Заполле Веліжскага пав. Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 12.1.1930. Асуджаны 16.6.1930 з шэрагам інш. Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.6.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Т. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТРУНІН (ТРУНИН) Барыс Вячаслававіч** [19.10.1917, Брэст — 1.12.1971, Маларыта Брэсцкай вобл.], Свята-р, службовец. Беларус. З сям'і рабочага. Скончыў 3класную рускую пачатковую школу (1927), 7класную польскую школу (1931), Брэсцкую рускую гімназію (1936). Адначасова вучыўся псаломшчыцкай службе ў місіянера Палескай епархіі Уладзіміра Палякова. У 1936 прызначаны псаломшчыкам Мялецкага манастыра Ковельскага пав. Валынскага ваяв. 14.10.1943 у Барысаўскім Уваскрасенскім саборы епіскапам Смаленскім і Бранскім Сцяфанам (Сеўбам) рукапаложаны ў дыякана, 15.11.1943 — у іерэя і прызначаны настаяцелем Мікалаеўскага прыхода ў мяст. Крупкі Мінскай вобл., потым у царкву Нараджэння Багародзіцы в. Худаўцы, цяпер Крупскі рн. 27.9.1944 пераведзены ў ПетраПаўлаўскі храм мяст. КартузБяроза (цяпер Бяроза, рай-цэнтр Брэсцкай вобл.), благачынны. Быў жанаты на Валянціне Мікалаеўне Пратаповіч (н. ў 1920), меў сына Віталія (1944). Арыштаваны і 21.12.1944 асуджаны асобай нарадай НКВД за «здраду радзіме» і «сувязь з бандэраўцамі» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з паўночных канцлагераў ГУЛАГа. У 1948—49 працаваў горным майстарам камбіната «Інтавугаль» МДБ

Архангельскай вобл. Канчаткова вызвалены 15.12.1955 са зняццем судзімасці. Вярнуўся на радзіму. 2.3.1956 мітрапалітам Мінскім і Беларускім Піцірымам (Свірыдавым) прызначаны настаяцелем Пакроўскага храма в. Жукаў Барок Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. З 8.5.1957 служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Хацілаў Маларыцкага рна. Узнагароджаны набедранікам (15.2.1944), скуф'ёй (28.5.1944), камілаўкай (1958). Неаднаразова выклікаўся і дапытваўся супрацоўнікамі КДБ, якія прымушалі яго адрачыся ад сана. 19.8.1959 не вытрымаў націску і перайшоў на грамадзянскую працу. Працаваў галоўным інжынерам Маларыцкага райпрамкамбіната.

Кр.: Архіў Мшскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 579.

**ТРУС Андрэй Пятровіч** [1878, в. Стары Быхаў Магілёўскай губ., цяпер Быхаў, рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Тубушкі Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. 25.10.1906 пераведзены ва Успенскі храм у мяст. Астроўна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў дзесяцярых дзяцей. Арыштаваны 14.3.1931. Асуджаны 16.4.1931 з манахам Марціянам Марозавым асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.7.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Т. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр. Памятпная КИНжка Могылевской губерннн.

**ТРУСЕВІЧ (ТРУСЕВИЧ) Аляксандр Мікалаевіч** [1884, Стары Быхаў Магілёўскай губ., цяпер Быхаў, рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю. З 1908 настаяцель Успенскай царквы в. Славені Магілёўскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 20.6.1929.

Асуджаны 3.9.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Т. № 22061п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Пажятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ТРУСЕВІЧ (ТРУСЕВИЧ) Іаан Васілевіч** [1878, мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — 1931 (?), Віцебск (?), турма НКВД]. Беларус. 3 духоўнага саслоўя, сваяк Аляксія Трусевіча[1]. Скончыў духоўную семінарыю. Выкладаў у царкоўнапрыходскай школе ў мяст. Сухары Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Магілёўскі рн. Рукапаложаны ў іерэя. 3 1912 настаяцель Свята-Троіцкай царквы ў мяст. Шклоў Магілёўскага пав., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. У 1920я г. служыў у Мікалаеўскім храме ў мяст. Коханава Аршанскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 16.10.1930. Асуджаны 26.1.1931 асобай нарадай АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.7.1989. Асабовая справа Т. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ТРЫДЗЕНСКІ (ТРИДЕНСКИЙ) Феафіл** [1873, в. Чмялевічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Сын Антонія Трыдзенскага. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894). Рукапаложаны ў іерэя (1897). Служыў у Міхайлаўскай царкве в. Жодзіна Барысаўскага пав. Мінскай губ, цяпер горад Смалявіцкага р-на Мінскай вобл., член Барысаўскага аддзялення вучылішчнага савета пры епархіяльным Мікалаеўскім брацтве, благачынны (з 1908) цэркваў 1й акругі Барысаўскага пав., узнагароджаны набедранікам (да 1901), скуф'ёй, санам протаіерэя (29.6.1917). Арыштаваны 28.2.1931. Асуджаны 17.5.1931 са

Свята-ром Фёдарам Яжгуновічам асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.7.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Т. № 26073с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Огшсанне церквей ы прнходов Мннской епархнн; Памялгная КИНжка Мннской губершш; Памятпная КИНжка Мннской епархнн; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ТРЫЗОНАЎ (ТРНЗОНОВ) Іван Антонавіч** [1890, в. Чарапы Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — 7.10.1937 (?), Віцебск, турмаНКВД], царкоўны стараста. Беларус. Арыштаваны ў верас. 1937 (?). Асуджаны 28.9.1937 з 40 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Т. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТУМЕР (ТУМАНАЎ) (ТУМАНОВ) Гаўрьгіл Іванавіч** [1882, в. Малыя Жаберычы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — 1975], протаіерэй. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1911 атрымаў пасведчанне аб паспяховым заканчэнні курса багаслоўскіх прадметаў у Магілёўскай духоўнай семінарыі. З 1912 настаяцель Ануфрыеўскай царквы в. Восаў (Восава) Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў трох дачок і двух сыноў. Арыштаваны 15.10.1929. Асуджаны 15.12.1929 са Свята-ром Іаанам Духоўскім, дыяканам Яўграфам Рыжыкавым і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Групавая справа Т. і інш. № 9688 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Тв.: Памятная кныжка Могнлевской губерннн; Полымя. 1994. № 1.

**ТУРАЎ (ТУРОВ) Максім Данілавіч** [13.8.1876, мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?], братблізня Мітрафана Турава. Беларус. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (?), рукапаложаны ў іерэя. Да арышту служыў настаяцелем у РаствaБагародзіцкай царкве в. Цёплая, цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 22.4.1935. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі і ўдзеле ў контррэвалюцыйнай арганізацыі». 22.5.1935 пастановай Магілёўскага аддзела НКВД БССР вызвалены і рэабілітаваны. Далейшы лёс невядомы. Групавая справа Т. і інш. № 5051 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТУРАЎ (ТУРОВ) Мітрафан Данілавіч** [13.8.1876, мяст. Дуброўна Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?], свяшчэннаабо царкоўнаслужыцель, братблізня Максіма Турава. Беларус. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (?). Служыў у адной з цэркваў Магілёва. Арыштаваны 20.10.1936. Асуджаны 8.4.1937 тройкай НКВД за «шкодніцтва» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.8.1990 прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Т. і інш. № 13867сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД. , '

**ТУРЫН (ТУРИН) Сергій Васілевіч** [1879, мяст. Мядзеліна (Старое Сяло) Віцебскага пав., цяпер Віцебскі р-н — ?]. Беларус. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы ў родным мястэчку. Арыштаваны 18.8.1931. Асуджаны 14.7.1932 з 15 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Т. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай

вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ТУТОРСКІ (ТУТОРСКИЙ) Аляксандр Васілевіч** [1874, с. Абабкава Ніжагародскай губ., цяпер Паўлаўскі р-н Ніжагародскай вобл., Расія — 28.11.1937, турма НКВД], Свята-р. З духоўнага саслоўя. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1910), рукапаложаны ў іерэя. Да арышту настаяцель царквы с. ПІарсціна (Шэрсціна) Арзамаскага р-на Ніжагародскай вобл. Арыштаваны 6.11.1937 у с. Пятніцкае Арзамаскага рна. Асуджаны 19.11.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

15.2.1938 арыштаваны, верагодна, былы Свята-р, а на той час бухгалтар Магілёўскай псіхалячэбніцы Міхаіл Васілевіч Туторскі (н. ў 1881), брат Аляксандра Туторскага. 21.9.1938 тройкай НКВД асуджаны за «шпіянаж» да ВМП і расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Т. і інш. № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: КИНга памятн жертв полшпнческых репрессый в Ннжегородской областн.

**ТЭРАЎСКІ (ТЕРРАВСКИЙ) Уладзімір** [11(23). 11.1871, мяст. Раманава Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Леніна Слуцкага р-на Мінскай вобл. — 10.11.1938, Мінск, турма НКВД], дырыжор, кампазітар, фальклярыст, царкоўнаслужыцель. Беларус. Малодшы сын Васілія Тэраўскага. Скончыў Слуцкае духоўнае вучылішча (1889). У 1892—95 служыў у войску. З 1895 дзяржаўны кантралёр ЛібаваРоменскай чыгункі. З 1897 працаваў на Уральскіх заводах графа Строганава, служыў рэгентам, настаўнікам у Пермскай губ. З 1900 супрацоўнік Мінскага аддзялення дзяржаўнага банка. З 1901 канцылярскі чыноўнік 2га разраду Мінскай кантрольнай палаты, адначасова настаўнік спеваў і гімнастыкі Губернскага папячыцельства дзіцячых прытулкаў. У 1904 епіскапам Міхаілам (Цемнарусавым) прызначаны псаломшчыкам Мінскага

ПетраПаўлаўскага кафедральнага сабора. Адначасова памочнік рэгента Мінскага архіерэйскага хора. Потым псаломшчык царквы св. Марыі Магдаліны на вул. Старажоўскай, настаўнік спеваў 3га Мінскага прыходскага вучылішча. У 1914 стварыў Мінскі беларускі хор, які ў 1917 увайшоў у склад Першага Беларускага таварыства драмы і камедыі. У 1918—19 кіраваў харавой капэлай у Беларускім савецкім тэатры; уваходзіў у склад Таварыства працаўнікоў беларускага мастацтва. Улетку 1920 арыштаваны польскімі акупацыйнымі ўладамі ў Асіповічах. Пасля ўтварэння Беларускага дзяржаўнага тэатра ў Мінску (БДТ1) яго галоўны хормайстар. Арыштаваны 3.9.1921 з жонкай Надзеяй Прохараўнай (н. 19.9.1878 у Мінску). Праходзіў па адной справе з артыстамі Усевападам Фальскім, Уладзімірам Кубарам, яго жонкай Надзеяй Кубар (н. ў 1880), загадчыкам дэзінфекцыйнага аддзела наркамата аховы здароўя Сямёнам Валачковічам (1878), старшым механікам Мінскага тэлеграфа Герасімам Раманчыкам (1886), тэлеграфістамі Міхаілам Бакуном (25.10.1895) і Ганнай Бруевіч (1896), медсястрой Мінскага шпіталя Сінкліцікіяй Малчанавай (1895). Паводле пастановы калегіі АДПУ СССР ад 23.9.1921 У.Кубар і Г.Бруевіч асуджаны да ВМП і 19.10.1921 расстраляны. М.Бакун, С.Валачковіч, Н.Кубар, С.Малчанава, Г.Раманчык прыгавораны да 2 гадоў ППК. Т. і У.Фальскі да ВМП (заменена на 5 гадоў ППК) і этапаваны ў Смаленскі папраўчы дом. Жонку Т. асудзілі да года зняволення ў Мінскім працоўным лагеры. Пасля вызваленя 24.5.1923 кіраваў харавымі калектывамі БДУ, МБПТ, саюза паштавікоўтэлеграфістаў. Стварыў музыку да спектакляўБДТ1: «Бязвінная кроў» У.Галубка(1918), «Кавальваявода» Е.Міровіча (1925) і інш. Найбольш вядомай стала музыка да спектакля «На Купалле» М.Чарота (1921). Напісаў песні і рамансы на словы Я.Купалы, Я.Коласа, З. Бядулі, М.Чарота і інш. Запісваў і гарманізаваў народныя песні, частка якіх апублікавана ў зборніках «Беларускі спеўнік з нотамі на тры галасы паводле народных мелодый» (1921), «Беларускі лірнік» (1922), «Вайсковы зборнік» (1926). Браў удзел у рабоце музычнай секцыі Інбелкульта. Пасля

1930 звольнены з работы, абвінавачаны ў нацыяналдэмакратызме. Служыў псаломшчыкам у царкве св. Марыі Магдаліны. Зноў арыштаваны 17.8.1938 у Мінску па адрасе: вул. Старажоўская, д. 74, кв. 4. Прыгавораны 1.11.1938 тройкай НКВД як «агент польскай разведкі» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (групавая, № 20479с; захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай БВА 6.8.1996, па другой (№ 10927с; захоўваецца тамсама) трыбуналам БВА 1.10.1957.

Кр.: НГАБ, ф. 136, в. 1, с. 41145; Памягпная КИНжка Мннской губерннн; Травень М. Уладзімір Тэраўскі — ахвяра бальшавізму //' Бацькаўшчына. 1956. № 30; Гесь А., Ляхоўскі У. «Калі песня жыве беларуса, будзе жыць беларускі народ!»: Жыцце і творчы шлях Уладзіміра Тэраўскага // Мастпацтва. 1966, № 12; ЭГБ, т. 6—1.

**УЛАДЗІМІР ЗУБКОВІЧ** [1863, мяст. Смалявічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — 31.1.1938, Мінск, турмаНКВД], свяшчэннамучанік. Протаіерэй. Беларус. Сын Гаўрыіла Зубковіча[1]. У ліку лепшых скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Служыў псаломшчыкам у Спаса-Праабражэнскай паркве в. Старыца Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. 8.1.1888 пераведзены ў Спаса-Праабражэнскі храм мяст. Заслаўе Мінскага пав., цяпер Мінскі рн. Рукапаложаны ў іерэя (17.6.1888). 3 1889 другі Свята-р Мікалаеўскага храма ў родным мястэчку, дзе да 1896 настаяцелем быў яго бацька. У 1900 служыў ва Уваскрасенскай царкве пры Мінскім жаночым вучылішчы, адначасова законанастаўнік вучылішча, член праўлення Мінскай духоўнай семінарыі. 3 1901 настаяцель Мікалаеўскага храма ў родным мястэчку. 3 1904 2ім Свята-ром храма быў Уладзімір Зенюк[1]. 3 1907 памочнік інспектара Мінскай духоўнай семінарыі, у якой праслужыў да 1916. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй (да 1903), ордэнам св. Анны 3й ступені (1914). Пасля Кастрычніцкага перавароту вярнуўся ў Смалявічы. Зноў з У.Зенюком служыў у Мікалаеўскім храме. У канцы 1920х — пачатку

1930х г. настаяцель прыхода. 2ім Свята-ром стаў Дзімітрый Плышэўскі. У.З. неаднаразова выклікаўся ў НКВД, дзе ад яго патрабавалі адмовіцца ад сану. У 1935 храм у Смалявічах быў закрыты, але Свята-р працягваў тайна здзяйсняць трэбы. Арыштаваны раённым аддзелам НКВД 29.12.1937. Абвінавачаны ў прыналежнасці да «шпіёнскай контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі», якую, быццам, узначальваў епіскап Бабруйскі Філарэт (Раменскі). У час допытаў вінаватым сябе не прызнаў. Асуджаны 31.12.1937 са Свята-ром Аляксандрам Нікалаевічам тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 19.4.1989. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку святых новапакутнікаў. Асабовая справа У.З. № 29503с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памяпгная КИНжка Мннской губерніш; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення; Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленных'ъ святых н Подвнжннковь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявшнхь (отт, царствованія царямученнка Ннколая II АлександровІча і до напшх'ъ дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); Жнтня свяіценномученнков Мннской епархші.

**УЛАДЗІМІР ПАСТЭРНАЦКІ** [2.7.1885, в. Дудзічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл.— 21.1.1938, Смаленск, турмаНКВД]. свяшчэннамучанік. Беларус. Сын Іларыёна Пастэрнацкага[1]. Пасля сканчэння Мінскай духоўнай семінарыі рукапаложаны ў іерэя (1908). Служыў у Пакроўскай царкве ў мяст. Пясочнае Ігуменскага пав., цяпер вёска Капыльскага р-на Мінскай вобл. З 25.7.1914 памочнік, з 1917 благачынны цэркваў 2й акругі Ігуменскага пав. Духавенствам акругі на 3 гады выбраны дэпутатам на Мінскі акруговы вучылішчны з'езд. З восені 1932 настаяцель Спаса-Увазнясенскага храма ў мяст. Капыль, цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. У сак. 1933 балыпавіцкія

ўлады храм закрылі, а Свята-ра неаднаразова выклікалі ў НКВД. Арыштаваны ў сак. 1936. Жонка Наталля (дачка Феафана Сасіноўскага[1]) засталася з васмярымі дзецьмі. Асуджаны 24.3.1936 да 2 гадоў ППК. У снеж. 1937 нечакана вызвалены, прыехаў у Раслаў Смаленскай вобл., але 14.12.1937 зноў арыштаваны. 5.1.1938 прыгавораны тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» і як «агент нямецкай разведкі» да ВМП. Расстраляны. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губерніш; Смоленскый мар тнролог; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Жнтія н Жнзнеопнсашя новопрославленныхъ святых н Подвнжннковъ Благочестія, вгь Русской Православной Церквн просіявшнхь (оть царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча I до наіішхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); Жшгшя. свяіценномученнков Мннской епархіш; СмоленсКИЙ мартнролог.

**УЛАДЗІМІР ПІШЧУЛІН** [Уладзімір Фёдаравіч; 6.7.1889, Віцебск — 10.2.1938, Сімферопаль, турма НКВД], свяшчэннамучанік. Іераманах. З дваранскай сям'і. Меў трох братоў і дзве сястры. Скончыў Віцебскую гімназію. Паступіў на юрыдычны фт Маскоўскага ун-та. У 1914 перайшоў на гісторыкафілалагічны фт СанктПецярбургскага ун-та. Адначасова выкладаў у гімназіі, быў лектарам народнага ун-та. З 1917 у Віцебску, на працягу некалькіх месяцаў сакратар губернскага камітэта кадэцкай партыі. Кастрычніцкі пераварот сустрэў варожа. У 1918 вярнуўся ў Петраград. Дацэнт Петраградскага ун-та. У 1920 рукапаложаны ў іерэя, служыў у храме Святых Захарыі і Елісаветы, Мікалаеўскай царкве на вул. Махавой у Доме сляпых у Петраградзе. Член Дома вучоных. З 27.2.1921 сябра філасофскага таварыства. З 30.8.1921 асістэнт кафедры педагогікі Петраградскага Багаслоўскага інстытута. Арганізаваў матэрыяльную дапамогу асуджаным Свята-рам. У 1922 ухіліўся ў абнаўленцтва. Арыштаваны 31.5.1922. Праходзіў па справе мітрапаліта Веніяміна.

Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай агітацыі і супраціўленні канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей». 26.9.1922 асуджаны Петраградскім губернскім аддзелам ГПУ як «сацыяльнанебяспечны элемент» да 3 гадоў ссылкі ў Арэнбург. Пасля вяртання ў Ленінград 9.12.1924 пастрыжаны ў манашаскі сан, узведзены ў сан архімандрыта. Выкладаў дагматычнае багаслоўе ў Ленінградскім багаслоўскім інстытуце. 8.3.1925 хіратанісаны ў абнаўленчага епіскапа Ахценскага. Удзельнік абнаўленчага Памеснага сабора 1925. У ліст. 1925 прызначаны епіскапам Пскоўскім, але ад пасады адмовіўся. 4.9.1926 за пераход у «ціханаўшчыну» выключаны са спіса абнаўленчых епіскапаў. 14.9.1926 у царкве Спаса- на водах прынёс пакаянне і быў прыняты ў зносіны з РПЦ у сане іераманаха. Служыў у Казанскім саборы. У 1928 арыштаваны як «член брацтва Серафіма Сароўскага» і высланы ў Казахстан. Пасля вызвалення ў 1934 жыў у Сімферопалі на вул. Лазарэтнай, д. 17, кв. 10 у мужа нябожчыцысястры. З вясны 1935 працаваў у кнігасховішчы фундаментальнай бібліятэкі Сімферопальскага педагагічнага інстытута. Зноў арыштаваны 5.7.1937. Пад следствам знаходзіўся ў сімферопальскай турме НКВД. На адным з допытаў заявіў: «Я з'яўляюся праціўнікам антыхрысціянскай палітыкі савецкай улады, якая адмаўляе ідэю рэлігіі». Асуджаны 10.12.1937 тройкай НКВД да ВМП. Расстраляны. Кананізаваны Свяшчэнным Сінодам Украінскай праваслаўнай царквы (1998) і Архіерэйскім Саборам РПЦ (2000).

Кр.: Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі; Снноднк СанктПетербургской епархші. XX столетне. СПб., 1999. С. 90.

**УЛАДЗІМІР ТАЛЮШ** [1891, в. Залужжа (тагачасны паштовы адрас: ст. Горкі) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. (паводле інш. звестак в. Карсакавічы Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл.) — студз. 1938, ГУЛАГ], свяшчэннамучанік. Сын Дзмітрыя Талюша, брат Анатолія Талюша. Скончыў

Мінскую духоўную семінарыю (1913). Мабілізаваны ў армію (1914), удзельнік 1й сусветнай вайны. У 1920 рукапаложаны ў іерэя, прызначаны настаяцелем Свята-Георгіеўскай царквы ў в. Залужжа, дзе раней служыў яго бацька. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 19.4.1933. Праходзіў па адной справе з актыўнымі прыхаджанамі царквы Пятром Гейсікам (н. ў 1876), Васілём Дражыным (1873), Фёдарам Дражыным (1881), Грыгорыем Кулешам (1912), Іванам Мельнікам (1871), Ціханам Мышко (1876), Юрыем Ралько (1884), Сямёнам Свірыным (1886), Антонам Субцельным (1891), Ігнатам Цыганковым (1878), Мікалаем Шыбко (1895). Асуджаны 7.6.1933 асобай нарадай пры АДПУ як «кіраўнік контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаПячорскі канцлагер НКВД Комі АССР і Архангельскай вобл. Узяты пад варту 1.12.1937. Прыгавораны 2.1.1938 лагернай тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю сярод зняволеных» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.10.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа У.Т. і інш. № 29956с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы далучаны да ліку святых новапакутнікаў.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской епархіш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленныхь святых н Подвнжннковь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявшнхгь (оть царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); Жытня свяіценномученнков Мннской епархыа; тлг\у\у.ре1;ег§еп.сот; Покаянне.

**УЛАДЗІМІР ХІРАСКА** [Уладзімір Грыгор'евіч; 11.1.1874, КамянецПадольскі, цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна — 1933, Гжацк Смаленскай вобл., цяпер Гагарын, Расія], свяшчэннамучанік. Протаіерэй. Рускі. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У ліку лепшых скончыў Падольскую духоўную семінарыю (чэрв. 1895). Выехаў у Мінскую губ. З 2.10.1895 выкладаў Закон Божы ў аднакласнай

царкоўнапрыходскай школе ў в. Кіявец Мінскага пав., цяпер Валожынскі р-н Мінскай вобл., 2класнай царкоўнапрыходскай школе ў мяст. Тураў Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер горад Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (17.1.1899) Увазнясенскай царквы в. Омельна Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл., адначасова выкладаў у Амяльнянскім народным вучылішчы, з 1903 загадчык і законанастаўнік царкоўнапрыходскай школы ў суседняй в. Сінча таго ж рна. З 1906 служыў у Георгіеўскай царкве в. Юравічы Ігуменскага пав., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл., выкладаў у царкоўнапрыходскай школе. З 16.10.1909 настаўнік Калодзежскага і Вялікапольскага земскіх вучылішч Ігуменскага пав. З 3.2.1911 у Мінску, настаяцель царквы ў гонар вобраза Божай Маці «Усіх смуткуючых радасць» пры вучылішчы сляпых. З 26.8.1911 адначасова выкладаў у прыватнай мужчынскай гімназіі К.Фальковіча, Марыінскай жаночай гімназіі. З 1913 загадчык і законанастаўнік мужчынскай 2класнай (з 3 дадатковымі класамі) царкоўнапрыходскай школы, член праўлення Мінскай духоўнай семінарыі ад духавенства, казначэй і справавод Мінскага Епархіяльнага Папячыцельства пра бедных духоўнага звання. 25.7.1914 духавенствам Мінска выбраны членам благачыннага савета горада. З 1916 служыў у Казанскай прывакзальнай царкве, выбраны благачынным Мінскіх храмаў, адначасова выкладаўу 1класнай жаночай царкоўнапрыходскай школе пры чыгуначнай ст. Мінск. Узнагароджаны набедранікам (1903), медалём у памяць пра 25годдзе існавання царкоўнапрыходскіх школ, сярэбраным медалём Чырвонага Крыжа, скуф'ёй (1906), каміла ўкай (1914). Быўжанаты, меў дачок Любоў (н. ў 1900), Аляксандру (1902), Юлію (1906), Ксенію (1912), сына Віктара (1904). Арыштаваны ў 1919 за сувязь з эсэрамі. Неўзабаве вызвалены. Зноў арыштаваны падчас польскай акупацыі, але таксама хутка вызвалены. У трэці раз арыштаваны 29.12.1925 у Мінску па адрасе: вул. Савецкая, д. 9. Асуджаны 26.11.1926 асобай нарадай пры АДПУ за «шпіянаж на карысць Польшчы» да 3 гадоў

пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. Высланы ў Арол. Вярнуўся ў Мінск 12.3.1929. Зноў арыштаваны 26.3.1929. Падчас следства вінаватым сябе не прызнаў. Асуджаны 26.7.1929 са Свята-рамі Юліянам Астроўскім і Елісеем Панурыным, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Пасля сканчэння тэрміну зноў пазбаўлены правоў жыць у 12 населеных пунктах. У зняволенні амаль аслеп. Памёр неўзабаве пасля вызвалення. Па першай справе (№ 33935с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 6.6.1992 пракуратурай БВА. Па другой (№ 32934с; з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) 28.8.1989 пракуратурай БССР. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку новапакутнікаў.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губернын; Памятная КИНж ка Мннской епархіш; Лнчнын состав епархаального управлення; НГАБ, ф. 136, в. 1, с. 41145; Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленныхᴦь святых н Подвнжннков'ь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявпшх'ь (оть царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (август'ьдекабрь);

**УЛАДЗІМІР ХРЫШЧАНОВІЧ** [Уладзімір Іванавіч; 1875 ці 1876, в. Гезгалы Лідскага пав. Віленскай губ., цяпер Дзятлаўскі р-н Гродзенскай вобл. — 1933, турма НКВД], свяшчэннамучанік. Беларус. З сялянскай сям'і. Скончыў Слуцкае духоўнае вучылішча (1911). Служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскай царкве в. Горкі Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. У 1930 епіскапам Слуцкім Мікалаем (Шамяцілам) рукапаложаны ў іерэя. Арыштаваны 17.12.1932. Праходзіў па адной справе з псаломшчыкам Спаса-Праабражэнскай царквы суседняй в. Языль Бабруйскага пав. (цяпер Старадарожскі р-н Мінскай вобл.) Васіліем Капачэнем, старастам Якавам Палаўчэнем, актыўнымі прыхаджанамі Мікалаеўскай і Праабражэнскай

цэркваў Варварай Паўлаўнай Сасіноўскай (н. ў 1870), Сямёнам Сцяпанавічам Жуком (1900), Сцяпанам Ігнатавічам Капачэнем (1891), Іосіфам Антонавічам Корзунам (1868), Уладзімірам Станіслававічам Насовічам (1868), Яўсеем Іосіфавічам Палаўчэнем (1892), Лявонам Міхайлавічам Палаўчэнем (1874). Асуджаны 12.2.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 28.3.1989. Групавая справа У.Х. і інш. № 22818с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. У 1999 Сінодам Беларускай праваслаўнай царквы кананізаваны і далучаны да ліку новапакутнікаў.

Кр.: Жнтія н Жнзнеопнсанія новопрославленныхъ святых н Подвнжннковь Благочестія, вь Русской Православной Церквн просіявшнх'ь (оть царствованія царямученнка Ннколая II Александровіча і до нашнхь дней). СПб., 2001. Т. 2 (августьдекабрь); Жнтня свяіценномученнков Мннской епархіш.

**УЛАДЗІМІРАЎ (ВЛАДИМИРОВ) Георгій Ігнатавіч** [1888, Нарва, Эстонія — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Рускі. Верагодна, служыў у адной з цэркваў Магілёўскай епархіі. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа У. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**УМЕЦКІ (УМЕЦКИЙ) Мікалай Мікалаевіч** [14.3.1885, Бабруйск Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Беларус. З сям'і рабочага. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (?). Да арышту служыў у ПетраПаўлаўскім кафедральным саборы. Арыштаваны 5.8.1935 у Мінску па адрасе: вул. Інтэрнацыянальная, д. 9, кв. 1. Асуджаны 27.10.1935 паводле пастановы калегіі

НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Вызвалены ў 1943. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.7.1961 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа У. і інш. № 17146с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**УСІКАЎ (УСИКОВ) Фёдар Андрэевіч**. Свята-р. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1920я г. жыў у в. Дубраўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл,, ф. 896, в. 1, с. 43, л. 61, с. 80, л. 274.

**УСЦІНОВІЧ (УСТИНОВИЧ) Мікалай Канстанцінавіч** [27.9.1916, Мсцера, цяпер Уладзімірская вобл., Расія — 25.3.1979], протаіерэй. Беларус. Сын службоўца. Нарадзіўся, калі сям'я знаходзілася ў бежанстве. У 1921 Усціновічы вярнуліся на радзіму ў Ліду. Скончыў 4 класы Лідскай пачатковай школы (1928), Лідскую дзяржаўную гімназію імя К.Хаткевіча (1936). Каля года працаваў прыватным настаўнікам, збіраў грошы на далейшую вучобу. Паступіў на багаслоўскі фт Варшаўскага ун-та (1937). Скончыў два курсы, бо з нападам Германіі на Польшчу заняткі спыніліся (1939). З прыходам Чырвонай арміі служыў сакратаром у Лідскім часовым упраўленні. З 1940 працаваў у Лідскай беларускай школе, інтэрнаце, дзіцячай тэхнічнай станцыі, загадчыкам гаспадаркі 1й бел. СІП ў Лідзе. Пасля прыходу немцаў выехаў у Жыровічы (Слонімскі рн), дзе 17.8.1941 ва Успенскім манастыры епіскапам Гродзенскім і Брэсцкім Венедзіктам (Бабкоўскім) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Пакроўскай царквы в. Ганчары, цяпер Лідскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты на Таццяне Паўлаўне Мацюкевіч (н. ў 1908), гадаваў сыноў Ігара (1942), Георгія (1944). Арыштаваны 15.8.1943 нямецкай аховай чыгуначнага раз'езда ЛідаГанчары па падазрэнні ў сувязях з партызанамі. Праз 3 дні дастаўлены ў Лідскую гарадскую

турму. 1.9.1943 пасля допыту мясцовым начальнікам СС вызвалены. Пэўную ролю адыграла валоданне нямецкай мовай. Зноў арыштаваны 14.8.1950. Асуджаны 14—15.11.1950 за «здраду радзіме» і «захоўванне зброі» да 25 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з канцлагераў Комі АССР. У 1955 з прысуду выключана абвінавачванне ў здрадзе радзіме і тэрмін пакарання зніжаны да 7 гадоў ППК і 3 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены 26.1.1956 са зняццем судзімасці. Вярнуўся на радзіму 2.9.1956. З 8.3.1956 служыў у Раства-Багародзіцкай царкве в. Гудзевічы, цяпер Мастоўскі р-н Гродзенскай вобл. 9.7.1956 пераведзены ў Міхайлаўскі храм мяст. Ізабелін Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. 331.9.1957 таксама абслугоўваў Пакроўскі прыход в. Харашэвічы тагачаснай ВаўкавыскаПоразаўскай благачыннай акругі, цяпер Гродзенскай вобл., з 13.5.1958 — ПараскеваПятніцкую царкву в. Сідзельнікі Ваўкавыскага рна. З 31.7.1959 настаяцель ПараскеваПятніцкай царквы. З 6.11.1970 — РаставаБагародзіцкага храма в. Дакудава Лідскага р-на Гродзенскай вобл. З 8.12.1976 за штатам, але працягваў служыць у Мікалаеўскай царкве в. Дубна Мастоўскага рна. Узнагароджаны скуф'ей (1945), камілаўкай (1948), залатым нагрудным крыжам (1957), санам протаіерэя (1.4.1964), паліцай (24.4.1967). Пахаваны на Лідскіх могілках.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 310; Черетшца В Н Очеркн нсторня Православной Церквн на Гродненгцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Гродно, 2005. Ч. 2. С. 242—247.

**ФАЛЕВІЧ (ФАЛЕВИЧ) Пётр** [12.6.1875, мяст. Пагост Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. — 1937, Ліпецк, турма НКВД], протаіерэй. Сын Апалінарыя Фалевіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1896). Служыў псаломшчыкам ва Успенскай царкве ў мяст. Смалявічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. З 6.5.1898 псаломшчык УваскрасенскагасабораўБарысаве. З 11.6.1898 справавод

Барысаўскага павятовага аддзялення Мінскага епархіяльнага вучылішчнага савета. 3.8.1899 рукапаложаны ў іерэя Успенскай царквы ў мяст. Новы Свежань Мінскага пав., цяпер Стаўбцоўскі р-н Мінскай вобл., адначасова выкладаў у царкоўнапрыходскай школе. Узнагароджаны набедранікам (1903), скуф'ей (1907), камілаўкай (1914). Быў жанаты, меў дачок Людмілу (н. ў 1900), Кацярыну (1903), Марыю (1905), Таісію (1906), Ніну (1912), сына Аляксандра (1910). 14.10.1914 пераведзены ў Ільінскі храм мяст. Любча Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. У 1920я г. вязень Салавецкіх канцлагераў. У 1930я г. настаяцель царквы в. Дзевіца Усманскага р-на Ліпецкай вобл., Расія. Зноў арыштаваны і 11.8.1937 пастановай тройкі НКВД Варонежскай вобл. асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской епархіш, Лнчныш состав епархнального управлення, Пажятная КИНжка Мынской губер ніш; НГАБ, ф. 136, в. 1, с. 41145; Помннть понменно. КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй Лнпецкого края с ноября 1917 года. Лнпецк, 1997. Т. 1;

**ФЕАДОСІЙ (ВАШЧЫНСКІ)** [Дзмітрый Васілевіч; 15.5.1876, мяст. КітайГорад Палтаўскай губ., цяпер Украіна — 22.10.1937, ГУЛАГ], епіскап. Украінец. З сям'і протаіерэя Васілія Вашчынскага. Пасля сканчэння Палтаўскай духоўнай семінарыі (1897) служыў у царкве с. Ярэмічы, потым у прыходзе с. Астап'е і ў храме ў ваколіцах Падольскіх хутароў Харольскага пав. (Палтаўская губ., цяпер Украіна). Трымаў уласную гаспадарку. У 1910 раздаў усю маёмасць беднаце і выехаў у Казань, дзе ў 1912 паступіў у Казанскую духоўную акадэмію (скончыў са ступенню кандыдата багаслоўя ў 1916). Накіраваны выкладчыкам у Чарнігаўскую духоўную семінарыю, з верас. 1918 яе назіральнік. З крас. 1919 служыў у царкве в. Верасочча Нежынскага пав. Чарнігаўскай губ., з 1922 — у Васільеўскім храме Нежына. Пражываў з дачкой Марыяй (н. ў 1900) і ўнукам Дзмітрыем (1931). Неаднаразова

арыштоўваўся супрацоўнікамі АДПУ. 3.8.1926 у Ніжнім Ноўгарадзе мітрапалітам Сергіем (Страгародскім) пастрыжаны ў манашаскі сан з імем Феадосій і 5.8.1926 хіратанісаны ў епіскапа Вініцкага, вікарыя Падольскай епархіі. У чарговы раз арыштаваны 10.10.1926 па справе архіепіскапа Курскага Ануфрыя (Гагалюка). Пад следствам знаходзіўся ў Харкаўскай турме АДПУ, потым перавезены ў Маскву. Абвінавачваўся ў супрацíве абнаўленчаму руху. У ліст. 1926 высланы ў с. Банцюг Уральскай вобл. Вызвалены ў лют. 1928. З 9.5.1928 епіскап Лугаўскі, вікарый Ленінградскай епархіі. З 24.4.1929 епіскап Магілёўскі. Увосень 1932 двойчы сустракаўся з епіскапам Мінскім Феафанам (Семенякам) з мэтай вярнуць у лона кананічнай Царквы епіскапа Беларускай Аўтакефальнай Царквы Філарэта (Раменскага), але безвынікова. Зноў арыштаваны 28.2.1933. Асуджаны 9.6.1933 калегіяй АДПУ як «арганізатар і кіраўнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 5 гадоў ПІЖ з канфіскацыяй маёмасці. Этапаваны ў адзін з лагпунктаў АДПУ КамсамольсканаАмуры Далекаўсходняга краю. 11.9.1937 лагернай тройкай НКВД прыгавораны за «антысавецкую агітацыю і прапаганду сярод зняволеных» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа Ф.В. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Крнвонос Ф., свяіц. МученнчесКИЙ н нсповедннчесКИЙ подвнг Могнлевскнх святнтелей XX века: Феодосня (Вагцннского), сіцмч. Павлнна (КрошечКИНа), Александра (Раевского). Мн., 2002;

**ФЕАФАН (СЕМЯНЯКА)** [Мікалай Адамавіч; 6(18).1.1879, мяст. Дзятлава Слонімскага пав. Гродзенскай губ., цяпер рай-цэнтр Гродзенскай вобл. — 10.11.1937, Дальлаг, Хабараўск], архіепіскап, публіцыст, паэт. Рускі. З сям'і настаўніка. Скончыў Жыровіцкае духоўнае вучылішча, Літоўскую (Віленскую) духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (14.11.1905). Служыў у храмах Гродзенскай губ. Адначасова (са жн. 1911 (?) і, верагодна, па запрашэнні

Свята-ра Яраслава Савіцкага) выкладаў Закон Божы ў сіроцкім прытулку Гродзенскага Чырвонастоцкага РаствaБагародзіцкага жаночага манастыра Сакольскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Кбапузіоіі, тэрыторыя Полынчы. Займаўся гісторыяй краю, манастыра, пісаў вершы, якія друкаваў у час. «РуссКИЙ паломннк». У пачатку 1й сусветнай вайны з жонкай, сынам і дачкой — у бежанстве ў Ціфлісе (цяпер Тбілісі, Грузія). З 1916 служыў у царкве на Брацкіх могілках Севастопаля (цяпер Украіна), потым у Міннай школе. У 1921 пераехаў з сям'ёй у Маскву. Служыў у храме свяціцеля Аляксія ў Глінішчаўскім зав., у царкве Екацярынінскай бальніцы ля Пятроўскіх варот, у БарысаГлебскай царкве на вул. Вароўскага. Арыштаваны 30.11.1925 супрацоўнікам АДПУ Чацкім і інш. па ордэры, падпісаным Ягодай. Праходзіў па адной справе з мітрапалітам Пятром (Палянскім). 21.5.1926 асуджаны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 2 гадоў пазбаўлення волі і высланы ва УсцьСысольск (Удмурцкая АССР). Падчас зняволення аўдавеў. Пасля вызвалення жыў у Маскве, служыў настаяцелем БарысаГлебскай царквы. 13.12.1930 па благаславенні мітрапаліта Сергія (Страгародскага) хіратанісаны ў Пакроўскім саборы ў епіскапа Мінскага і ў лют. 1931 выехаў у Мінск. Богаслужэнні адпраўляў у Мікалаеўскай царкве ў пас. Козырава (прыгарад Мінска, цяпер у межах горада). 9.7.1934 узведзены ў сан архіепіскапа. Па ўспамінах протаіерэя Барыса Васільева Ф. заваяваў сярод людзей вялікую папулярнасць і павагу. Арыштаваны 9.4.1935. Абвінавачваўся НКВД як «адзін з кіраўнікоў антысавецкай арганізацыі ў пас. Козырава»[1]. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 10.8.1935 з інш. Свята-рамі, старастам і актыўнымі прыхаджанамі Козыраўскай царквы за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў Далёкаўсходні канцлагер НКВД Хабараўскага краю. У зняволенні прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Па першай справе пытанне аб рэабілітацыі разглядаецца Генеральнай пракуратурай РФ, па другой (№ 31424с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР

4.4.1990, па трэцяй — пракуратурай Хабараўскага краю 16.1.1989.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Правяіцне архаерен Мннской епархнн; Черегшца В.Н. Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 2. Гродно, 2005. С. 146—150.

**ФЕАФАН (ШАМЯЦІЛА**) [1880, в. Плотніца Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Столінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], архімандрыт, сын Іаана Шамяцілы, брат Мікалая (Шамяцілы). Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. У 1920я г. настаяцель Свята-Іаанаўскай царквы ў мяст. Пагост Слуцкага пав., цяпер Салігорскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 15.2.1931. Асуджаны 7.2.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Вызвалены 28.2.1933. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 13.6.1969 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. (усяго каля 80 чалавек) № 27941с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Шнленок Д., свяш,. Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**ФЕДАРОВІЧ (ФЕДОРОВИЧ) Аляксандр Грыгор'евіч** [1875, мяст. Цяцерын Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. — 21.8.1937, Магілёў, турма НКВД], селянінаднаасобнік, староста або актыўны прыхаджанін Параскевінскай царквы ў родным мястэчку, брат Івана і Мікалая Федаровічаў. Арыштаваны 18.7.1937 у в. Шупені Круглянскага рна. Асуджаны 14.8.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» і за тое, што «казаў пра хуткую пагібель савецкай улады» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.10.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Ф. і інш. № 10682 захоўваецца ў архіве КДБ Магілеўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД. ~

**ФЕДАРОВІЧ (ФЕДОРОВИЧ) Іван Грыгор'евіч** [1879,

мяст. Цяцерын Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілеўскай вобл. — 8.10.1937, Магілеў, турма НКВД], брат Мікалая і Аляксандра Федаровічаў. У пачатку 1900х г. служыў псаломшчыкам ва Успенскім храме в. Лабанаўка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чэрыкаўскі рн. У 1920я г. — у Свята-Троіцкай царкве в. Саматэвічы Чэрыкаўскага пав., цяпер Касцюковіцкі рн. Арыштаваны 9.3.1930. Асуджаны 25.11.1930 са Свята-ром Яўлампіем Карышавым, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Сібір. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 8.8.1937. Прыгавораны 18.9.1937 тройкай НКВД за «заклік да звяржэння сацыялістычнага ладу» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 13555сн; захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.) рэабілітаваны 20.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл., па другой (№ 12165) 21.11.1989. .....

Кр.: БНДЦЭД.

**ФЕДАРОВІЧ (ФЕДОРОВИЧ) Мікалай Грыгор'евіч** [1875, мяст. Цяцерын Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель, брат Аляксандра і Івана Федаровічаў. У пачатку 1900х г. — псаломшчык РастваБагародзіцкай царквы в. Новыя Маркавічы Рагачоўскага пав. Магілеўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. 24.3.1906 пераведзены ў Свята-Троіцкі храм в. Белая Цэрква Сенненскага пав. Магілёўскай губ. (тагачасны паштовы адрас: ст. Чарэя), цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. У 1920я г. служыў у ПараскеваПятніцкім храме ў родным мястэчку. Арыштаваны 24.3.1931 са старастам і актыўнымі прыхаджанамі. Асуджаны 17.5.1931 асобай нарадай пры АДТТУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.10.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Ф. і інш. № 13508сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ФЁДАР (БЕКАРЭВІЧ) [**11.8.1962 — жн. 1932, Чавусы], архіепіскап (абнаўленчы). Сын дыякана Ігнація Бекарэвіча, бацька Васілія Бекарэвіча і, верагодна, брат Афанасія Ігнацієвіча Бекарэвіча. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю (1886). Рукапаложаны ў іерэя, прызначаны настаяцелем Мікалаеўскай царквы в. Вуць Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. (1887), адначасова выкладаў у жаночай царкоўнапрыходскай школе. З 1903 служыў у Георгіеўскім храме ў Чавусах Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. З 1910 благачынны цэркваў 1й акругі Чавускага пав. У 1913 аўдавеў. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй, нагрудным крыжам, санам протаіерэя (1918). Ухіліўся ў абнаўленчы раскол (1922). 23.2.1923 у Маскве хіратанісаны ў епіскапа Магілёўскай епархіі (абнаўленчай). З чэрв. 1925 вікарны епіскап Чавускі, настаяцель Георгіеўскага храма. У 1927 узведзены ў сан архіепіскапа. У 1930 асуджаны за «затрымку выплаты падаткаў» да года зняволення. Пасля вызвалення атрымаў прызначэнне ў Оршу (снеж. 1931), але па стане здароўя на месца службы не выехаў.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губертш; БНДЦЭД; Шнленок Д., свяіц, Нз нсторнн Православной Церквн в Белоруссні (1922—1939). М., 2006. ..

**ФЁДАРАЎ (ФЕДОРОВ) Леанід Андрэевіч** [1866, в. Забалацце Рагачоўскі пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і службоўца. Да арышту «слухач рэлігійнага вучылішча культа» (так у справе). Арыштаваны 9.3.1938 у в. Лужок Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Асуджаны 28.3.1939 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.8.1991 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Асабовая справа Ф. № 14708 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ,ІКБР; БНДЦЭД. , , . ,

**ФІЛАРЭТ (РАМЕНСКІ)** [Феадосій Яўграфавіч; 25.3.1880,

в. Старая Рудня Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. — 1.11.1937, Мінск, турма НКВД], архіерэй Мінскай епархіі, рэлігійны і грамадскі дзеяч. Беларус. Скончыў гісторыкафілалагічны фт Маскоўскага ун-та (1911). Служыў сакратаром епархіяльнага вучылішчнага савета ў Мінску. У 1916—17 памочнік Аляксандра Міхайлавіча Панова, інспектара Мінскай духоўнай семінарыі. З 1918 выкладаў у Мінскай чыгуначнай гімназіі, інш. навучальных установах. У1921 пастрыжаны ў манашаскі сан з імем Філарэт і рукапаложаны ў іераманаха. Служыў у АляксандраНеўскім храме ў Мінску. Узнагароджаны санам протаіерэя. З сак. 1923 мітрапалітам Мелхіседэкам (Паеўскім) хіратанісаны ў епіскапа Бабруйскага. Старшыня з'езда прадстаўнікоў духавенства і вернікаў Беларускай праваслаўнай епархіі (9—10.8.1927; прынялі ўдзел прадстаўнікі 333 прыходаў), на якім было аб'яўлена аб стварэнні аўтакефаліі Беларускай царквы. Да 1930 служыў у Мікалаеўскім саборы ў Бабруйску. Потым у Екацярынінскім саборы на Нямізе ў Мінску, Свята-Іаанаўскай царкве в. Вялікая Сляпянка (цяпер у межах Мінска). З 1934 у храме св. Марыі Магдаліны на вул. Старажоўскай. У сярэдзіне 1935 даў згоду архіепіскапу Магілёўскаму Паўліну (Крошачкіну) на аб'яднанне з кананічнай Царквой, прынёс пакаянне і мітрапалітам Сергіем (Страгародскім) прыняты ў зносіны з РПЦ. Пасля закрыцця вясной 1937 у Мінску апошняга каталіцкага храма дазволіў вернікамкатолікам маліцца ў царкве св. Марыі Магдаліны. Арыштаваны 28.7.1937 у Мінску па адрасе: вул. Пажарная, д. 8. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей і актыўных прыхаджан тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 31.3.1989 пракуратурай БВА. Групавая справа Ф. і інш. № 23379с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

3.9.1937 у Мінску па адрасе: вул. Пажарная, д. 8 арыштавана Раменская Марыя Яўграфаўна (н. 24.10.1882), сястра епіскапа Філарэта. 25.10.1937 тройкай НКВД

асуджана за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці і 1.11.1937 расстраляна з братам і інш. Рэабілітавана 11.3.1958 трыбуналам БВА.

Кр.: Пгмоп/сош/сі К. Ьоау сіцс1іо\уіеп5(луа Ісаі:о1іс1:іе§о ш 238К, 1917— 1937: Магіугоіоёшт. ЫЫіп, 1998; СагЬтМ /., Тыгопеіс 7. Втіогаай гасЬ сЬггезсцаЙБЙ XX шіеісц; Правяіцне архнереы Мннской епархіш; Шнленок Д., свяіц. Нз нсторнн Православной Церквн в Белоруссии (1922—1939). М., 2006.

**ФІЛІМАНЮК (ФИЛИМОНЮК) Мяфодзій Філіпавіч** [1862, в. Кожына Бельскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Польшча — ?], іераманах. Беларус. У 1920я г. настаяцель Пакроўскай царквы в. Гаравец (тагачасны паштовы адрас: ст. Плешчаніцы) Барысаўскага пав., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 29.10.1929. Асуджаны 15.12.1929 са Свята-ром Канстанцінам Будолем, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.12.1993 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа Ф. № 6246с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ФЛОР (ГАНЧАРЭНКА)** [Фрол Фёдаравіч; 1868, Магілёў (паводле інш. звестак в. Меруполле Чаркаскага пав. Кіеўскай губ., цяпер Украіна) — 2.4.1938, Магілёў, турма НКВД]. Архімандрыт. Украінец. З сялянскай сям'і. У 1930я г. ў Магілёўскай епархіі. Арыштаваны 17.2.1938. Асуджаны 9.3.1938 з шэрагам інш. свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю супраць Савецкай улады» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.9.1965 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Ф.Г. і інш. № 9105 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ФРАЛОЎ (ФРОЛОВ) Ігнацій Мітрафанавіч**

Kamunikat.org

[28.5.1870, Віцебск — ?]. Беларус. З сям'і службоўца. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя. Служыў настаяцелем у Пакроўскай царкве ў Полацку Віцебскай вобл. Арыштаваны 18.11.1937 у Полацку па адрасе: вул. Пушкінская, д. 8. Асуджаны 29.11.1937 са Свята-рамі Паліеўктам Валюжынічам, Ільёй КораньКарнеўскім і інш. тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ф. № 21221п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХАДУНАЙ (ХОДУНАЙ) Мікалай Аляксеевіч** [23.11.1909 в. Вярцелішкі Гродзенскага пав., цяпер Гродзенскі р-н — 18.3.1982]. Беларус. З сям'і псаломшчыка Вярцелішскага АляксандраНеўскага храма. У 1930я г. — служыў у царкве мяст. Свіслач, цяпер рай-цэнтр Гродзенскай вобл. Ажаніўся з Нінай Мацвееўнай Пяцельскай (н. ў 1911 у сям'і Свята-ра). Гадаваў сыноў Расціслава (1936), Мікалая (1937), дачку Алену (1944). 21.9.1934 рукапалажаны ў дыякана, прызначаны ў храм мяст. Стары Корнін (Старакорнін) (Зіагу Когпіп Бельскага пав., цяпер Полыпча). 11.11.1939 архіепіскапам Панцеляіманам (Ражноўскім) рукапалажаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Успенскай царквы в. Ляўшова, цяпер не існуе.

У 1940—46 служыў ва Успенскім храме в. Дабраволя, потым пераведзены ў РаствaБагародзіцкую царкву в. Позарава Свіслацкага рна. Скончыў пастырскія курсы ў Гродне (1946). У 1948 настаяцель Міхайлаўскага храма в. Адрыжын Іванаўскага р-на Брэсцкай вобл. Арыштаваны і асуджаны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Вызвалены пастановай прэзідыума Вярхоўнага савета СССР 9.5.1956 датэрмінова са зняццем судзімасці як беспадстаўна асуджаны. Вярнуўся на радзіму. Служыў у Пакроўскай царкве в. Палонка Свіслацкага рна. З 1959 — у Міхайлаўскім храме в. Пераналока, з 1968 — у Мікалаеўскай

царкве в. Азярніца Слонімскага рна. З 16.3.1978 за штатам. Пахаваны ў Пеpавалоцы.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 796.

**ХАЛЯЎКА (ХОЛЯВКО) Іаан Фёдаравіч** [1872, Чавусы Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Арыштаваны ў 1937 у Чавусах. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Х. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХАРКЕВІЧ (ХАРКЕВИЧ) Павел Якаўлевіч** [1870, Брэст — 21.4.1938, ГУЛАГ], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сям'і рабочага. Да арышту служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Быстрыца Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДТТУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Зноў арыштаваны, верагодна, у 1937. Этапаваны ў Тайшэцкі канцлагер НКВД Іркуцкай вобл. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Х. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХАРЫК (ХАРНК) Анатолій Аляксандравіч** [1902 — пасля 1956], псаломшчык. Пачаў служэнне ў 1927 у РаствaБагародзіцкай царкве в. Востраў, цяпер Пінскі рн. З 1938 у РаствaБагародзіцкім храме в. Лукава, цяпер Маларыцкі р-н Брэсцкай вобл. Арыштаваны ў 1944. Пасля вызвалення (1947) служыў у Мікалаеўскім храме ў Маларыце. З 1955 за штатам зза хваробы. Апошнія гады жыў у в. Дамачава Брэсцкага рна.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**ХАРЫЦІНА (ДАНІЛЬЧАНКА**) [1879, в. Папоўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер тэрыторыя Гомельскага (?) р-на Гомельскай вобл. — ?], манахіня. Беларуска. З сялянскай сям'і. Арыштавана 3.4.1932 у Оршы Віцебскай вобл. Асуджана 9.8.1932 з інш. манахінямі, манахамі, царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 9.2.1959 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Д. і інш. № 6739п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: БНДЦЭД. .

**ХАЦКОЎ (ХАЦКОВ) Афанасій**. Свяшчэннаслужыцель. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я г., верагодна, служыў у Пакроўскай царкве в. Карма Гомельскага пав., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 896, в. 1, с. 43, л. 40.

**ХАЦЯТОЎСКІ (ХАТЕТОВСКИЙ) Аляксандр Аляксандравіч** [1867, в. Кузькавічы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў псаломшчыкам у Благавешчанскай царкве ў роднай вёсцы. Арыштаваны 5.10.1937. Асуджаны тройкай НКВД 31.10.1937 як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Магілёўскай вобл. 17.11.1989. Асабовая справа Х. № 12008 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, ІКБР.

**ХАЧАНКОЎ (ХОЧЕНКОВ) Максім Калістратавіч** [1899, в. Петухоўка Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў

псаломшчыкам у адной з цэркваў Чавускага пав. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Х. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХВАЛЬКО Міхаіл Максімавіч** [1884, в. Гарадзішча Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. — ?], абнаўленчы Свята-р. Беларус. З сям'і сяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у Свята-Троіцкай царкве в. Цялядавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл. Арыштаваны 31.5.1948. Асуджаны 18.8.1948 асобай нарадай МДБ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.12.1993 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Х. № 35697с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.:НАРБ,ІКБР; БНДЦЭД.

**ХВАЛЕБНАЎ (ХВАЛЕБНОВ) Аляксандр Васілевіч** [1876, в. Фошня Масальскага пав. Калужскай губ., цяпер Масальскі р-н Калужскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і сяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель Уваскрасенскай царквы ў Слуцку, цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. Арыштаваны 1.7.1927. Асуджаны 7.10.1927 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Марыйскую АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 10.9.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Х. № 31177с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХЕРАВЕЦ Васіль Цітавіч** [1877, в. Аздзяцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н



Kamunikat.org

Мінскай вобл. — 17.12.1937, ГУЛАГ]. З сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета РаstваБагародзіцкай прыходскага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны тройкай НКВД 16.9.1937 за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Кулойскі канцлагер НКВД Архангельскай вобл. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 21.6.1989. Асабовая справа Х. М 24184с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ХІРАСКА (ХИРАСКО) Уладзімір Грыгор'евіч Гл.: УЛАДЗІМІР ХІРАСКА.**

**ХЛУДОК Яўстафій Васілевіч** [1871, Віцебская губ. — ?], Свята-р, верагодна, брат Савація Васілевіча Хлудкі. Арыштаваны 17.7.1931 у в. Бярозаўка Большаглушыцкага р-на тагачаснага СярэднеВолжскага краю (цяпер Куйбышаўская вобл.). Асуджаны 18.8.1931 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» і «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ссылкі ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 Куйбышаўскай абл. пракуратурай.

Кр.: Памятная КИНжка Внтебской губернш; Белая кныга; Новые мученнкн н нсповеднннкн Самарского края. Самара, 1996. С.299.

**ХЛЯБЦЭВІЧ (ХЛЕБЦЕВИЧ) Уладзімір** [1874, в. Востраў Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Ш-нскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], псаломшчык. Беларус. Сын Ігната Хлябцэвіча[2]. У 1900я г. псаломшчык Свята-Успенскай царквы в. Яромічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 14.3.1933 у Слуцку па адрасе: вул. 2я Гасціная, д. 35. Асуджаны 9.6.1933 з 20 Свята-рамі Слуцкага вікарыяцтва асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989

пракуратурай БССР. Групавая справа Х. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Статастыческце сведення о церкеах н прычтах Мннской епархіш; Опнсанне церквей а прнходов Мннской епархіш; Лнчный состав епархыального управлення.

**ХЛЯБЦЭВІЧ (ХЛЕБЦЕВИЧ) Яўгеній** [5.6.1895, в. Даўгінічы (Даўгінава) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Ільі Хлябцэвіча[1]. Скончыў Мінскае духоўнае вучылішча (1913), Мінскую духоўную семінарыю (1917?). У 1920я г. настаяцель Ільінскай царквы в. Ячанка Ігуменскага пав., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 3.11.1929. Асуджаны асобай нарадай пры АДПУ 13.1.1930 з маці Аленай Іванаўнай (н. ў 1869), сёстрамі Варварай[1] (1895, верагодна, блізня Х.) і Надзеяй (1909), братамі Вячаславам (1910?) і Іванам (1911), шэрагам Свята-роў Мінскай епархіі і актыўнымі прыхаджанамі як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны з сям'ёй 13.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа сям'і Хлябцэвічаў № 27238с з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная кнііжка Мннской губернші; Лнчный состав епархнального управлення; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ХРАМЕНКОЎ (ХРОМЕНКОВ) Данііл Данілавіч** [1874, в. Малыя Немкі Рагачоўскагапав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турмаНКВД], Свята-р (абнаўленчы). Беларус. З сялянскай сям'і. У 1900—10я г. дыякан (?) Пакроўскай царквы в. Чырвоная Буда (тагачасны паштовы адрас: ст. Насавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл., выкладаў у царкоўнапрыходскай школе пры царкве. У 1930я г. служыў ва Уваскрасенскім і Георгіеўскім храмах у Чавусах Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй

маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Х. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХРОЛ Юліян Іванавіч** [1869, мяст. Лужкі Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Скончыў духоўную семінарыю. Арыштаваны 29.12.1929 у мяст. Беразіно, цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. Асуджаны 14.2.1930 са Свята-ром Аляксандрам Акулічам і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 23.8.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Х. № 27985с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

24.2.1921 у мяст. Лужкі арыштаваны чыноўнік Ваеннага ведамства Хрол Іван Іванавіч (н. ў 1888 у мяст. Лужкі), брат Юльяна Хрола. 3.4.1921 асуджаны за «шпіянаж» да года пазбаўлення волі і вывезены ў Смаленск. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.12.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Яго асабовая справа № 22942п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

У 1937 у Арле (Расія) арыштаваны і асуджаны тройкай НКВД да ВМП касір чыгуначнай станцыі Арол Хрол Антон Іванавіч (н. ў 1878 у мяст. Лужкі), брат Юльяна Хрола. Дата смерці невядома.

Кр.: НАРБ, ІКБР; Реквнем: КИНга памятн жертв полнтпнче скнх репресснй на Орловіцнне.

**ХРЫСТАФОРАЎ (ХРИСТОФОРОВ) Іларыён Хрыстафоравіч** [1873, в. Каралі Віцебскай губ. — 1.11.1937, Мінск, турмаНКВД], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў у адной з цэркваў Лепеля Віцебскай вобл. Арыштаваны 25.2.1937 у Лепелі па адрасе: вул. Вакзальная, д. 16. Асуджаны 25.10.1937 з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны

31.8.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Х. і інш. з фотаздымкамі захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ХРЫШЧАНОВІЧ (ХРНІЦЕНОВИЧ) Уладзімір Іванавіч. Гл.: УЛАДЗІМІР ХРЫШЧАНОВІЧ.**

**ЦАРАНКОЎ (ЦАРЕНКОВ) Антон Іванавіч** [5.2.1887, в. Вусце Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл. — 24.11.1971, Мінск], протадыякан, спявак (басактава). Беларус. З сялянскай сям'і. У 1897 паступіў у Народнае вучылішча ў Магілёве (дзякуючы клопатам архіепіскапа Магілёўскага Мітрафана (Краснапольскага). Пачаў спяваць у хоры Магілеўскай Брацкай царквы. Пасля сканчэння вучобы (1900) працаваў бібліятэкарам. У час знаходжання імператара Мікалая II у Магілёве атрымаў ад яго Чырвоную стужку — узнагароду Свяшчэннага Сінода. Па запрашэнні ўладыкі Мітрафана пераехаў у Мінск, служыў протадыяканам у Мінскім праваслаўным кафедральным саборы, спяваў у хоры пад кіраўніцтвам вядомага дырыжора С.Кнігі. Пасля Кастрычніцкага перавароту 1917 Ц. пазбаўлены грамадзянскіх правоў, а яго сын выключаны з гімназіі. Падчас прыезду ў Мінск Дз.Меражкоўскага і яго жонкі З.Гіпіус з мэтай нелегальна перайсці савецкапольскую мяжу прытуліў іх у сваей кватэры. У сярэдзіне 1920х г. служыў у Пакроўскай царкве в. Семежава, цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Першы раз арыштаваны 27.3.1927. Асуджаны 17.6.1927 са Свята-рамі Мінскай епархіі М.Лукашэвічам, дыяканам А.Крыкуновым і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. На этапе і ў канцлагеры некаторы час знаходзіўся з біскупам Мікульскім, ксяндзом С.Віткоўскім, галоўным Свята-ром нямецкай кірхі ў Мінску В.Кранцам, рабінам галоўнай сінагогі ў Мінску З.Зільберглейтам, мулам татарскай мячэці У.Мазалевічам, акадэмікам

С.Некрашэвічам. Пасля сканчэння тэрміну (23.3.1930) у сувязі з забаронай НКВД выязджаць за межы Архангельскай вобл. Жыў у Кемі. Неўзабаве да Ц. прыехала жонка. Паступова пасяленцы стварылі невялікі прыход, дзе па сведчанні ўнука Яўгена служыў Ц. Неўзабаве царкву закрылі, а яго з жонкай адправілі ў канцлагер. Вызвалены ў сак. 1933 па амністыі для будаўнікоў БеламорскаБалтыйскага канала. Вытрымаў экзамен прыёмнай камісіі Вялікага тэатра, у складзе якой былі В.Давыдава, І.Казлоўскі, С.Лемешаў, Л.Собінаў, А.Сцяпанаў, браты Піраговы і залічаны ў яго штат. Удзельнічаў у гастролях тэатра па Эстоніі і Украіне, але пасля выкліку ў АДПУ вырашыў пакінуць Вялікі тэатр і пераехаць у Кіеў (1934). Працаваў салістам хора Кіеўскага радыё. Атрымаў запрашэнне ад Мінскага тэатра оперы і балета і пераехаў у Мінск (1935). У час 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, працаваў у Камісарыяце па харчаванні (пад кіраўніцтвам пазней вядомага польскага камуніста, як потым высветліцца, буйнога рэзідэнта савецкай разведкі Б.Берута). Дапамог стаць на харчовае забеспячэнне акадэміку М.Нікольскаму, прафесарам Маславу, В.Тэміну, кампазітару А.Туранкову, артыстам Мінскага опернага тэатра Саладуху, Лабко і інш. Зноў арыштаваны 20.7.1944 падчас адной з рэпетыцый у памяшканні тэатра Я.Купалы. Асуджаны 19.4.1945 трыбуналам войск НКВД Мінскай вобл. за «дапамогу нямецкім акупантам і антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Некаторы час у зняволенні знаходзіўся з кампазітарам А.Туранковым. Вызвалены 14.7.1954. Прыехаў у Брэст да сына, загадчыка кафедры Брэсцкага педагагічнага інстытута. Са жн. 1954 артыст Дзяржаўнай харавой капэлы БССР. Пасля смерці жонкі выйшаў на пенсію, але ад удзелу ў канцэртах не адмаўляўся амаль да самай смерці. Па першай справе (№ 28843с; захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 28.12.1989 пракуратурай Мінскай вобл., па другой (№ 11904с) — 29.6.1963 Вярхоўным судом БССР.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Царанкоў Я. Загублены талент. Мн., 1998.

**ЦАРЭЎСКІ (ЦАРЕВСКИЙ) Сергій Фёдаравіч** [1887, Мінск — ?], протадыякан. З 1915 супрацоўнік Заалагічнага музея Расійскай акадэміі навук. У 1923 рукапалажаны ў дыякана. Служыў у Маісееўскай царкве на вул. Парахавых (?) у Ленінградзе. Арыштаваны 28.12.1930 па «царкоўнай справе». Асуджаны 8.10.1931 да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Асабовая справа Ц. № п83017 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Літ.: СанктпПетпербургской епархнн Снноднк.

**ЦЕЛЯНКОЎ (ТЕЛЕНКОВ) Ісак Дзянісавіч** [1881, в. Любіж Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. служыў у Пакроўскай царкве в. Збышын Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 6.2.1930. Асуджаны 9.3.1930 са Свята-рамі Пятром Цэрбалёвым, Аляксіем Шубадзёравым і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Групавая справа Ц. і інш. № 13496 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЦЕРАНЕЦКАЯ (ТЕРАНЕЦКАЯ) Таціяна Пятроўна** [1883, в. Цярэшкавічы (Старыя Цярэшкавічы) Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], манахіня. З сялянскай сям'і. З 1917 насельніца Іаанаўскага манастыра ў Петраградзе, пеўчая манастырскага хора. Арыштавана ў 1924 па справе «Іаанаўскага манастыра». Асуджана да 3 гадоў ссылкі ва УсцьСысольск Комі АССР. З 1927 жыла ў Гомелі. Вярнулася ў Ленінград у 1930, пасялілася ў будынку Іаанаўскага манастыра. Са жн. 1931 працавала санітаркай у бальніцы

імя Філатава. Зноў арыштавана 17.2.1932 і 22.3.1932 асуджана да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: СанктПетербургской епархіш Снноднк. ,,

**ЦЕЦЕРВЯНОК (ТЕТЕРВЕНОК) Гардзей Майсеевіч** [1884, в. Мазалеўшчына Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер тэрыторыя Верхнядзвінскага р-на Віцебскай вобл. (вёска спалена немцамі падчас 2й сусветнай вайны) — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Да арышту стараста Увазнясенскай царквы в. Стралкі Верхнядзвінскага рна. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 27.4.1933. Асуджаны 26.5.1933 са Свята-ром Палікарпам Шшчанкам і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 25.4.1989 пракуратурай БВА. Асабовая справа Ц. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ЦІВА (ТИВА) Пётр Пятровіч** [1897, мяст. Смаляны Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай. вобл. — 22.5.1942, ГУЛАГ]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Служыў дыяканам у ПетраПаўлаўскай царкве в. Абольцы Аршанскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 5.8.1937 у в. Жакі Талачынскага рна. Асуджаны 15.9.1937 са Свята-ром царквы Мікалаем Пяскоўскім тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. 3 1942 (?) у Беразнікоўскім канцлагеры НКВД Архангельскай вобл. Загінуў у зняволенні. Верагодна, расстраляны. Рэабілітаваны 20.10.1959 Віцебскім абл. судом. Групавая справа Ц. і інш. № 8637п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКВР; БНДЦЭД.

**ЦІМАФЕЕЎ (ТИМОФЕЕВ) Уладзімір Аляксандравіч** [1864, Віцебская губ. — 13.9.1937, Ленінградская вобл., турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 7.9.1937 на хут. Папоўка Ленінградскай вобл. Асуджаны 13.9.1937 тройкай

НКВД Ленінградскай вобл. за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Леннноградскый мартнролог.

**ЦІМІНСКІ (ТИМИНСКИЙ) Мікалай Васілевіч** [1870, Пружаны Гродзенскай губ., цяпер рай-цэнтр Брэсцкай вобл. — 1937 (?), Віцебск, турма НКВД]. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. У 1900—10я г. настаяцель Успенскай царквы в. Ляўшова Свіслацкай вол. Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ. У 1920я г., верагодна, служыў у Пакроўскім храме в. Барань Барысаўскага пав., цяпер Барысаўскі рн. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 6.8.1937 у в. Трасцянка Талачынскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 29.8.1937 са Свята-ром Іосіфам Пракопавым тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Звестак пра выкананне прысуду няма. Рэабілітаваны 12.4.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ц. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Гродненской губернші; НГАБ, ф. 2786, в. 1,с.67.

**ЦІМІНСКІ (ТИМИНСКИЙ) Мікалай Мітрафанавіч** [1869, в. Еўе Трокскага пав. Віленскай губ., цяпер Літва — 1937 ці 1938, Арол, турма НКВД]. Беларус. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў у Віленскай губ. У пачатку 1930х г. Свята-р Мікалаеўскай царквы ў пас. Козырава, цяпер у межах Мінска (паводле інш. звестак — АляксандраНеўскай царквы на Вайсковых могілках). Арыштаваны 25.1.1932 у Мінску па адрасе: 1ы Бондараўскі зав., д. 9. Вызвалены 23.5.1932 з улікам тэрміну папярэдняга зняволення. Зноў арыштаваны 4.4.1933. Асуджаны 7.6.1933 з інш. свяшчэннаслужыцелямі і манахінямі Мінскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення правоў жыць у 12 населеных пунктах і на Урале. У трэці раз арыштаваны ў 1937 у Арле. Прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 25770с; захоўваецца ў

архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 20.7.1989, па другой (№ 24819с; захоўваецца тамсама) 12.6.1989.

Кр.: Памятная КИНжка Внленской губерніш; Реквнем: кныга памятн жертв полнтнческнх репресснй на Орловіцнне.

**ЦІМІНСКІ (ТИМИНСКИЙ) Мітрафан Іванавіч** [1877, в. Няньковічы Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер тэрыторыя Украіны — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную семінарыю. З 1905 настаяцель Свята-Іаанаўскай царквы в. Цараўцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 14.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК (заменена высылкай). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ц. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

26.7.1933 у в. Цараўцы арыштавана маці траіх дзяцей Цімінская Наталля Ігнатаўна (н. ў 1882), верагодна, жонка Мітрафана Цімінскага. 9.9.1933 асобай нарадай пры АДПУ асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 31.5.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Ц. № 26945с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губертш.

**ЦІТОВІЧ (ЦИТОВИЧ) Аляксандр Афанасевіч** [1872, в. Бярозкі Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. З духоўнага саслоўя. У 1900—10я г. настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Бель Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 15.9.1932 у в. Вільгорт УсцьКуломскага р-на Комі АССР. Асуджаны 16.4.1933 паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Покаянне.

**ЦІТОВІЧ (ЦИТОВИЧ) Грыгорый Паўлавіч** [1878 — 28.09.1937, Смаленск, турма НКВД]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Міхайлаўскай царкве в. Кулікова Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. З 1911 настаяцель Успенскага храма ў мяст. Новы Быхаў (Быхаў) Магілёўскага пав., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 10.3.1937 у Смаленску. Асуджаны 17.9.1937 з інш. свяшчэннаслужыцелямі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; СмоленсКИЙ мартнролог.

**ЦІТОВІЧ (ЦИТОВИЧ) Іакаў**. Протаіерэй. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1901). З 1902 настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Парэчча Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл. З 1905 настаяцель Свята-Троіцкага храма в. Смілавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 26.10.1919. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці». Праз некаторы час вызвалены па шматлікіх просьбах прыхаджан. Далейшы лёс невядомы.

26.3.1931 у Смілавічах арыштаваны рабочы саўгаса «Вызваленне» Леанід Цітовіч (н. ў 1908 у мяст. Смілавічы), сын Іакава Цітовіча. 26.7.1931 калегіяй АДПУ асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ц. і інш. № 26668с захоўваецца з фотаздымкамі ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Пажятная КИНжка Мннской епархіш; Памятная КИНж ка Мішской губерніш; Лнчный состав епархнального управле ння; Снноднк за веру н церковь Хрыстову пострадавыш в Мннс кой епархші.

**ЦІТОВІЧ (ЦИТОВИЧ) Мікалай Пятровіч** [1878, в.

Завідаўка Клімавіцкага (?) пав. Магілёўскай губ., цяпер Касцюковіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Пакроўскай царкве в. Горы Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Горацкі р-н Магілеўскай вобл., адначасова законанастаўнік царкоўнапрыходскай школы. З 1912 настаяцель КасмаДаміянаўскага храма в. Ліцвінавічы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кармянскі р-н Гомельскай вобл. З 1915 другі Свята-р Свята-Троіцкай саборнай царквы ў Чэрыкаве, благачынны цэркваў 1й акругі Чэрыкаўскага пав. У 1920я г. настаяцель Пакроўскага храма в. Брацькавічы, цяпер Касцюковіцкі рн. Арыштаваны 12.3.1931. Асуджаны 14.7.1931 з жонкай, сваякамі і актыўньші прыхаджанамі калегіяй АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.1.1993 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Ц. і інш. № 10744 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Пажятная КИНжка Могнлевской губертш; БНДЦЭД.

**ЦІТОВІЧ (ЦИТОВИЧ) Уладзімір Іванавіч** [1876, в. Глешчыцы (?) Магілёўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў у Горках, цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. Арыштаваны 18.11.1937 у Горках па адрасе: вул. Шянерская, д. 15. Асуджаны 25.11.1937 з актыўнымі прыхаджанамі Фёдарам Малашэўскім (н. ў 1877), Якавам Масляковым (1863) тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.3.1960 пастановай прэзідыума Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Ц. і інш. № 6992сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ЦІТОЎ (ТИТОВ) Савелій Іванавіч** [11.1.1883 в. Земцы Віцебскай губ. — 30.5.1976]. Беларус. З сялянскай сям'і.

Скончыў настаўніцкія курсы пры Віцебскай духоўнай семінарыі (1900). Служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскім кафедральным саборы ў Віцебску. З 1907 псаломшчык 16га Сібірскага стралковага палка. У 1910 пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў Віцебск, працягваў служыць у кафедральным саборы. У 1912 павенчаны з Верай Пятроўнай Фурман, меў сыноў Леаніда (н. ў 1921), Валянціна (1923). У 1913 пераведзены ў Свята-Троіцкую царкву в. Маклакі (Маклак) Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Віцебскі рн. Удзельнічаў у 1й сусветнай вайне. Дэмабілізаваны 1.1.1918. Вярнуўся на ранейшае месца службы. 12.4.1922 рукапаложаны ў дыякана. 29.12.1929 арыштаваны органамі АДПУ і асуджаны за «антысавецкую агітацыю» (тэрмін невядомы). Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Вызвалены ў 1937. Пасля вяртання — дыякан Віцебскай Пакроўскай царквы. 13.5.1942 мітрапалітам Мінскім Панцеляіманам (Ражноўскім) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Увазнясенскага храма ў Ліёзна, цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. У 1951 набыў ва ўласнасць для царквы хату, куды перанёс малітоўны дом. Узнагароджаны скуф'ёй (1949), камілаўкай (1951), нагрудным крыжам (1955), санам протаіерэя (1960). Са студз. 1961 за штатам. Апошнія гады жыў у Магілёве.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 790.

ЦІУМБУФАЛАЎ (ТИУМБУФАЛОВ) Марк Фёдаравіч [1885, Гродзенская губ. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. З сям'і службоўца. Скончыў духоўную семінарыю. Служыў у РаствaБагародзіцкай царкве в. Чыгірынка Быхаўскага пав., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 17.7.1937. Асуджаны 7.8.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Ц.Б. № 9794 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ЦІХАМІРАЎ (ТИХОМИРОВ) Лазар Дзмітрыевіч** [1882, в. Сяднёўка (Седневка) Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. З 1910 служыў псаломшчыкам. У 1911 атрымаў пасведчанне аб паспяховым сканчэнні курса багаслоўскіх прадметаў у Магілёўскай духоўнай семінарыі. Рукапаложаны ў іерэя. З 1913—14 настаяцель Крыжаўздзвіжанскай царквы в. Замачак Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чашніцкі р-н Віцебскай вобл. Узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй, камілаўкай. У 1920я г. Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Быў жанаты, меў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 27.2.1932 у в. Камянец Чашніцкага рна. Асуджаны 5.6.1932 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.2.1964 Віцебскім абл. судом. Асабовая справа Ц. № 12821п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губершш; НГАБ, ф. 2786, в. 1,с. 67.

**ЦІХАН (ШАРАПАЎ**) [Канстанцін Іванавіч; 7(19).4.1866, Тула, Расія — 10.11.1937, АлмаАта, турма НКВД], архіепіскап. З сям'і ўпраўленца Тульскага зброевага завода. Скончыў СІН, працягваў адукацыю па праграмах духоўных акадэмій у манастыры. У 1882 паступіў у Білеўскую Увядзенскую Макар'еўскую пустынь Тульскай епархіі, дзе праз 2 гады пастрыжаны ў расафор, манашаства (1904). Рукапапожаны ў іерадыякана, затым іераманаха. У 1911 пераведзены ў Працоўнае Друкарскае брацтва пры Свята-Успенскай Пачаеўскай лаўры. Прызначаны нам. рэдактара, з 1914 рэдактарам час. «РуссКИЙ ннок». Пісаў духоўныя павучанні. Падчас 1й сусветнай вайны Свята-р 177 пяхотнага Ізборскага палка. Узнагароджаны залатым нагрудным крыжам і двума ордэнамі. Пасля вяртання з фронту прызначаны ў Здалбунаў, цяпер Ровенская вобл., Украіна. У 1918 рэдактар і выдавец час. «Праваслаўе». Арыштоўваўся «пятлюраўцамі», у сак. — маі 1919 узяты

пад варту з мітрапалітам Антоніем (Храпавіцкім). 6.2.1922 узведзены ў сан архімандрыта, накіраваны настаяцелем Жыровіцкага Успенскага манастыра, благачынным манастыроў Гродзенскай епархіі і Быценьскай акругі (цяпер частка Брэсцкай і Гродзенскай вобл.). Быў праціўнікам аўтакефаліі Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Для дакладу па гэтым пытанні тайна ездзіў у Маскву для сустрэчы з Патрыярхам Ціханам (Бялавіным). Прывёз з Масквы і вярнуў ва Успенскі манастыр Жыровіцкую цудадзейную ікону Божай Маці, вывезеную падчас 1й сусветнай вайны. У 1923 арганізаваў пры манастыры брацтва міран. У чэрв. 1924 за «агітацыю супраць польскай дзяржаўнасці» пад ціскам польскіх уладаў епіскапам Гродзенскім Аляксіем (Грамадскім) забаронены ў свяшчэннаслужэнні і 17.10.1924высланыўГерманію. Праз 3 месяцывярнуўся ў Расію. 22.3.1925 патрыярхам Ціханам хіратанісаны ў епіскапа Гомельскага, вікарыя Магілёўскай епархіі. Пасля яго прыезду амаль усё гомельскае абнаўленчае духавенства прынесла пакаянне і вярнулася ў кананічныя зносіны з патрыяршай царквой. Праз некалькі месяцаў абнаўленчы ўпаўнаважаны дакладваў: «Абнаўленцтва ў епархіі знаходзіцца ў плачэўным стане. Засталося толькі 9 прыходаў. Іншыя, якіх налічваецца да 150, належаць ціханаўцам». Арыштаваны 30.11.1925 па справе мітрапаліта Пятра (Палянскага). Знаходзіўся ў турмах АДПУ Гомеля, Магілёва, Масквы. Асуджаны за «антысавецкую прапаганду» да 3 гадоў ссылкі ў Казахстан. Пасля вызвалення (1927) зноў арыштаваны і прыгавораны да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер. Пасля сканчэння тэрміну (1930), заставаўся на пасяленні ў Паўночным краі. У 1934 прызначаны епіскапам Чарапавецкім, але ва ўпраўленне епархіяй уступіць не змог: арыштаваны і высланы ў Самарканд. 17.7.1936 прызначаны епіскапам АлмаАцінскім. Зноў арыштаваны ў ноч з 18 на 19 жн. 1937. Асуджаны тройкай НКВД як «кіраўнік манархісцкай тэрарыстычнай арганізацыі царкоўнікаў» да ВМП. Расстраляны.

Тв.: АлмаАтннская епархня Московского патрнархата в

1937 году // Мапгерналы по нсторші русской нерархші. Статьн н документы. М., 2002. С. 211—213, 215—235.

Кр.: Нх страданнямп очнсггштся Русь. М., 1996. С. 76; тлпкпу.йлісі.ш; Жыровіцкая Абіцель. 2000, № 5 (18); Шнленок Д., свяіц. Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**ЦІХАНАЎ (ТИХОНОВ) Іаан Ціханавіч [1864,** мяст. Астроўна Сенненскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. Да арышту дыякан Свята-Троіцкай царквы ў родным мястэчку. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 22.12.1931. Асуджаны 14.7.1932 з 15 свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ц. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЦІХАНОВІЧ (ТИХАНОВИЧ) Іосіф Аўсенцевіч** [1877, в. Хатынічы Шнскага пав. Мінскай губ. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1898?). Служыў у Магілёўскай губ. Арыштаваны 19.9.1937 ув. Вярэйцы Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл. Праходзіў па адной справе са Свята-рамі Мікалаем Вярыгам, Даніілам Каржанеўскім, Мікалаем Заўсцінскім, Сімяонам Зяленскім, старастам і актыўнымі прыхаджанамі. Асуджаны 20.10.1937 з інш. Свята-рамі тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.9.1963 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Ц. і інш. № 8901 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЦІЦЯНКОЎ (ТИТЕНКОВ) Лаўр Афанасевіч** [1885, в. Палошкава Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Віцебскай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапалажаны ў іерэя.

Служыў у Магілёўскай епархіі. Быў жанаты, меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 30.1.1931 у в. Якаўлевічы Аршанскага р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 11.3.1931 са Свята-ром Іакавам Жоравым і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 3.2.1962 Віцебскім абл. судом. Групавая справа Ц. і інш. № 11121п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Верагодна, былі рэпрэсаваны жонка і сваякі Ц.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЦІШКО (ТИШКО). Гл.: АНДРЭЙ (ЦІШКО).**

**ЦЫПКЕВІЧ (ЦИПКЕВИЧ) Васілій Іосіфавіч** [1883, в. Усая Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Ушацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], дыякан. З духоўнага саслоўя. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 28.9.1933 у в. Ноўка Віцебскага рна. Асуджаны з шэрагам Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі 25.2.1934 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ц. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. І

Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ЦЭРБАЛЁЎ (ЦЕРБАЛЕВ) Пётр Панцеляіманавіч** [1874, в. Валкавічы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель. Рускі. З духоўнага саслоўя. Да арышту служыў у адной з магілёўскіх цэркваў. Арыштаваны 11.2.1930 у в. Шастакі, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Асуджаны 9.3.1930 са Свята-рамі Ісакам Целянковым, Аляксіем Шубадзёравым, дыяканам Фамой Казловым, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю і ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.7.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Ц. і інш. № 10338сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЦЯРНОВЕЦ (ТЕРНОВЕЦ). Гл.: ВАСІЯН (ЦЯРНОВЕЦ).**

**ЦЯРНОЎ (ТЕРНОВ) Аляксандр Ермалаевіч** [1885, в. Горы Чавускага пав. Магілёўскай губ. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], Свята-р. Беларус. З дваранскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. З 1908 служыў у Свята-Духавай царкве в. Вядзец Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. З 1911 настаяцель Свята-Троіцкага храма в. Доўгі Мох Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў 1937 у Магілёве. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Ц. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі Ц.

Кр.: Памяпгная КИНжка Могнлевской губернгш.

**ЦЯСЕЛЬСКІ (ТЕСЕЛЬСКИЙ) Мікалай Нікіфаравіч** [1901, в. Тамашаўка, цяпер Уманскі р-н Чаркаскай вобл., Украіна — ?]. Украінец. Скончыў духоўную семінарыю (?). Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў настаяцелем у АляксандраНеўскай царкве ў Мінску. Быў жанаты, гадаваў двое дзяцей. Арыштаваны 24.12.1944 у Мінску па адрасе: вул. Малеўшчынская, д. 26, кв. 1. Асуджаны 15.12.1945 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю і служэнне Свята-ром у час нямецкай акупацыі» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў ГУЛАГа. Пасля вызвалення (6.9.1952) працаваў інжынерам. Рэабілітаваны 8.9.1967 судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Ц. № 19803с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: БНДЦЭД; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшых в Мннской епархшi.

**ЦЯСЛЕНКА (ТЕСЛЕНКО) Кузьма Антонавіч** [1886, в. Дахноўка, цяпер Чаркаская вобл., Украіна — 1933 (?), Магілёў, турма НКВД], Свята-р. Украінец. З сялянскай сям'і. У 1920я г., верагодна, служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Паўлавічы Магілёўскага пав., цяпер Бялыніцкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 1.12.1932. Асуджаны 7.3.1933 з актыўнымі прыхаджанамі Пятром Абложкіным (1865), Дарафеем Баравіковым (1880), Фёдарам Гапонавым (1882), Ягорам Гвоздзевым (1894), Яфімам Дзеруновым (1881), Пятром Завадскім (1906), Трафімам Мініным (1873), Мікалаем Немыцько (1910), Аляксеем Патапавым (1867), Мітрафанам Трусавым (1877), Данілам Філімонавым (1902), Марцінам Філімонавым (1906), Раманам Філімонавым (1903) асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 3.6.1961 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Ц. і інш. № 7419сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЧАЛЬЦОЎ (ЧЕЛЬЦОВ) Павел Міхайлавіч** [верас. 1903, СанктПецярбург — 1943, Віцебскі рн], службовец. Арыштаваны ў крас. 1922 з бацькам, айцом Міхаілам, за «супраціў канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей». Пад следствам знаходзіўся ў турме Петраграда на вул. Гарохавай. 5.7.1922 вызвалены пастановай Петраградскага губ. рэвалюцыйнага трыбунала. Скончыў Петраградскі сельска-гаспадарчы інстытут. Працаваў заатэхнікам у Ленінградскай вобл. У лют. 1935 пазбаўлены права работы ў Ленінградзе і Ленінградскай вобл. Пазбягаючы арышту пераехаў на Урал. З 1935 загадчык апорнага пункта НіжнеТагільскай станцыі па жывёлагадоўлі ў вёсцы Пячоркіна Свярдлоўскай вобл. У лют. 1942 прызваны ў Савецкую армію, малодшы сяржантсувязіст. Загінуў пад Віцебскам. Пахаваны ў брацкай магіле каля в. Вымна Віцебскага р-на.

Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі Ч.

Кр.: Афіцыйны сайгп Віцебскай епархіі.

**ЧАРАПНІН (ЧЕРЕПНИН) Уладзімір Дзмітрыевіч** [1874, в. Агрызкава Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — ?]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. 3 1911 — 12 настаяцель АляксандраНеўскай царквы в. Зябкі Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 22.6.1927. Асуджаны 7.11.1927 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ссылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 7.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ч. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памяпгная КИНжка Ватебской губернш.

**ЧАРВІНСКІ (ЧЕРВИНСКИЙ) Вячаслаў Грыгор'евіч** [1895, в. Галоўлі, цяпер Валынская вобл., Украіна — ?]. Украінец. 3 сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў духоўную акадэмію, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Уладзімірскай (?) царкве ў мяст. Любча Навагрудскага пав., цяпер Навагрудскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, гадаваў дачку. Арыштаваны 15.12.1939. Асуджаны 4.9.1940 асобай нарадай МДБ як «сацыяльна небяспечны элемент» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ў Каргопальскі канцлагер МДБ Архангельскай вобл. (станцыя Няньдом). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.3.1989 пракуратурай Гродзенскай вобл. Асабовая справа Ч. № п9076 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

14.12.1944 у Баранавічах Брэсцкай вобл. арыштавана Чарвінская Клаўдзія Сцяфанаўна (н. ў 1904 у Здалбунава, цяпер Ровенская вобл., Украіна, у сям'і Свята-ра), верагодна, жонка Вячаслава Чарвінскага. 10.6.1944 асобай нарадай МДБ асуджана за «пасобніцтва нямецкім акупацыйным уладам» да 5 гадоў ППК. Этапавана ў Омскі канцлагер НКВД. Вызвалена 17.6.1949. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 10.12.1993 пракуратурай Гродзенскай вобл. Яе асабовая справа № п19725 з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.:ЯАРБ, ІКБР.

**ЧАРВЯКОЎСКІ (ЧЕРВЯКОВСКИЙ) Сергій Аляксандравіч** [19.4.1889 мяст. Заблудава Беластоцкага пав. Гродзенскай губ. — 12.11.1937, Ленінград, турма НКВД], протаіерэй. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Пасля сканчэння духоўнай семінарыі (13.6.1913) — місіянер Холмскай епархіі. З 21.2.1914 настаяцель палкавой царквы 21га пяхотнага Мурамскага палка. Падчас Ій сусветнай вайны ўдзельнічаў у баях. З 1914 да 8.9.1918 знаходзіўся ў палоне, абслугоўваў як Свята-р 5 лагераў рускіх ваеннапалонных. Пасля вызвалення вярнуўся ў Петраград. З 1919 да 17.4.1920 служыў у Царскасельскай царкве Чырвонага Крыжа. З крас. 1920 настаяцель Спаса-Праабражэнскага храма ў пас. Цярлёва (?). Арыштаваны ў верас. 1937. Асуджаны да ВМП. Расстраляны. Сын Ч. Валянцін Чарвякоўскі, нягледзячы на трагічны лёс бацькі, прыняў свяшчэнны сан. Літ.: СанктПетпербургской епархіш Снноднк.

**ЧАРНАВУСАЎ (ЧЕРНОУСОВ) Сцяфан Фядотавіч** [2.8.1865, мяст. Хаславічы Мсціслаўскага пав. Магілёўскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. З 1910 служыў у Екацярынінскай царкве в. Маркавічы Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна. З 1913—14 настаяцель Мікалаеўскага храма в. Глухі Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Быхаўскі р-н Магілёўскай вобл. У 1930я г. служыў у Пакроўскай царкве в. Кішчыцы, цяпер Шклоўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 2.10.1935. Абвінавачваўся ў «антысавецкай дзейнасці». 10.12.1935 справа Ч. (№ 9394; захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.) спынена «ў сувязі са старым узростам падсуднага».

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ЧАРНІЦКІ (ЧЕРНИЦКИЙ) Міхаіл Емяльянавіч** [1869, Палтаўская губ., цяпер Украіна — ?]. Украінец. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. У 1930я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Благавічы, цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл.

Арыштаваны 9.3.1938. Абвінавачваўся ў «антысавецкай агітацыі». 23.1.1939 справа Ч. была спынена «зза адсутнасці склада злачынства», а ён вызвалены. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.1.1994 прэзідыумам Магілёўскага абл. суда. Асабовая справа Ч. № 15569 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр.:ЯАРБ, ІКБР;БНДЦЭД.

**ЧАРНЫШ (ЧЕРНЫШ) Пётр Цярэнцевіч** [1873, в. Палашчанкоў Чарнігаўскай губ., цяпер Украіна — ?]. Украінец. У 1930я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Камаровічы, цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 8.1.1935. Асуджаны 1.4.1935 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 14.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Ч. № 13720сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Чэрыкаўскага раена. Мн., 1994.

**ЧАРТКОЎ (ЧЕРТКОВ) Георгій Цітавіч** [1872, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 18.3.1931 у в. Зарэчча Невельскага р-на Пскоўскай вобл. Асуджаны 12.11.1931 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны 18.7.1995

Кр.: Афіцыйны сайпг Віцебскай епархіі; Не предать забвенню. Псков.

**ЧАТЫРКІН (ЧЕТЫРКИН) Сергій Сцяпанавіч** [1878, мяст. Горы Чавускага пав. Магілёўская губ., цяпер Горацкі р-н Магілёўскай вобл. — сак. 1930 (?), Магілёў, турма АДПУ]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Верагодна, брат Леаніда Сцяпанавіча Чатыркіна[1]. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Мікалаеўскай царкве ў родным мястэчку. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 17.2.1930. Асуджаны 3.3.1930 са Свята-ром Парфірыем Сіняковым калегіяй АДПУ за «антысавецкую

агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.8.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Групавая справа Ч. і інш. № 10509сн захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губернші.

**ЧУДАКОВІЧ (ЧУДАКОВИЧ) Уладзімір Пятровіч** [1873, в. Хатовіж Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Клімавіцкі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. Скончыў духоўную акадэмію, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель РаствaБагародзіцкай царквы в. Галоўчыцы Чэрыкаўскага пав., цяпер Чэрыкаўскі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 29.10.1929. Асуджаны 15.12.1929 калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.6.1991. Асабовая справа Ч. № 15219 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЧУДОВІЧ (ЧУДОВИЧ) Іаан Пятровіч**, [1876, мяст. Славяны Магілёўскага пав. — ?], протаіерэй. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Браздзечына Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. З 1910 настаяцель РаствaБагародзіцкага храма в. Кульшыгчы Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл. З 1913— 14 у Георгіеўскай царкве в. Хізы Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. У 1930я г. — у Мікалаеўскім храме пас. Сабліна Тосненскага р-на Ленінградскай вобл. У 1941—44 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы ў пас. Сіверскі Ленінградскай вобл. Арыштаваны 1.6.1944 за незадавальненне ціскам на Царкву пасля ўзнаўлення савецкай улады. Асуджаны да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губертш; СанктПетербургской епархіш Снноднк.

**ЧУЛКЕВІЧ (ЧУЛКЕВИЧ) Уладзімір Фёдаравіч** [1870 — 14.10.1937, Мазыр, турма НКВД]. Верагодна, сын Фёдара Ісакавіча Чулкевіча. Скончыў Магілёўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў другім Свята-ром, з 1908 настаяцелем Міхайлаўскай царквы в. Кашалёва (БудаКашалёва) Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл., з 1911 благачынны цэркваў 2й акругі Рагачоўскага пав. У 1920я г. настаяцель РаствaБагародзіцкага храма в. Валосавічы (тагачасны паштовы адрас: ст. Азарычы) Бабруйскага пав., цяпер Акцябрскі р-н Гомельскай вобл. Узнагароджаны нагрудным крыжам (1924). У першай палове 1930х г. настаяцель царквы в. Балажэвічы Мазырскага р-на Гомельскай вобл. Арыштаваны ў Мазыры ў сярэдзіне 1930х г. Асуджаны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць: Гісторыкадакументальная хроніка Мазыра і Мазырскага раёна. Мн., 1997.

**ЧУЛКЕВІЧ (ЧУЛКЕВИЧ) Федар Ісакавіч** [1878, в. Чыгірынка Быхаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў у ПетраПаўлаўскай царкве в. Нічыпаровічы Горацкага пав. Магілеўскай губ., цяпер Шклоўскі р-н Магілеўскай вобл. Арыштаваны 5.2.1930. Асуджаны 22.3.1930 са Свята-ром Яўгеніем Кастрыцтм І старастам царквы Паўлам Рымкевічам і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Роабілітаваны 31.5.1989 пракуратурай Магілеўскай вобл. Асабовая справа Ч. № 10146сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілеўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ЧЫРКОЎ (ЧИРКОВ) Яфім Іларыёнавіч** [1895, в. Патапава, цяпер Шклоўскі р-н Магілеўскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілеў, турма НКВД], селянінаднаасобнік, член савета царквы ў роднай весцы. Беларус. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за

«контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілеўскага абл. суда. Групавая справа Ч. і Інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілеўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЧЫСТАБАЕЎ (ЧИСТОБАЕВ) Лазар Елісеевіч** [1873, в. Капусціна Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілеўскай вобл. — ?], царкоўнаслужыцель. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 10.2.1930 з прыхаджанамі (групавая справа № 10060; захоўваецца ў архіве КДБ Магілеўскай вобл.). 23.2.1930 асуджаны са Свята-ром Парфёнам Скрыпуновым асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 8.6.1989 указам прэзідыума Вярхоўнага савета БССР. Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі Ч.

Кр.: НАРБ, ІКБР, БНДЦЭД.

**ЧЫСЦЯКОЎ (ЧИСТЯКОВ). Гл.: АНАСТАСІЙ (ЧЫСЦЯКОЎ)**

**ШАВАЛЕЎСКІ (ШЕВАЛЕВСКИЙ) Уладзімір Макаравіч. Гл.: СЕРАПІЁН (ШАВАЛЕЎСКІ).**

**ШАВЕЛЕШСА (ШЕВЕЛЕНКО) Анастасія Іванаўна** [1888, Віцебская губ. — 13.4.1977, Караганда, Казахстан], схіманахіня, спадзвіжніца прападобнага схіархімандрыта Севасціяна (Фаміна). Да Кастрычніцкага перавароту 1917 паслушніца Полацкага манастыра. Арыштавана ў Калузе (верагодна, у другой палове 1940х г.), этапавана ў Какчатаўскі канцлагер. Пасля вызвалення — пры РаствaБагародзіцкай царкве ў Карагандзе. У 1977 пастрыжана ў схіму. Пахавана на Міхайлаўскіх могілках. Кр.: Афіцыйны сайтп Віцебскай епархіі.

**ШАВЕЛЬСКІ (ШАВЕЛЬСКИЙ) Матфей Мітрафанавіч** [1872, Віцебскі пав. (?) — ?], псаломшчык адной з цэркваў Усвяцкага р-на Пскоўскай вобл. Арыштаваны 12.11.1937.

Асуджаны 14.12.1937 тройкай НКВД СССР па тагачаснай Зах. вобл. за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 7.4.1958.

31.7.1937 у в. Мішкава Віцебскага рна, цяпер у межах Віцебска, арыштаваны Шавельскі Іван Мітрафанавіч (н. ў 1868 у сям'і Свята-ра), верагодна, брат Матфея Шавельскага. 17.8.1937 асуджаны тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай антысавецкай арганізацыі» да ВМП і 26.8.1937 расстраляны ў Віцебскай турме НКВД. Рэабілітаваны 5.5.1959 Віцебскім абл. судом. Яго асабовая справа № 949 5п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Не предать забвенпю. Псков.

**ШАВЯКОЎ (ШЕВЯКОВ) Пётр Пятровіч** [1895, в. Богава (?) Тульскай губ., цяпер Яфрэмаўскі р-н Тульскай вобл., Расія — ?], Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Рускі. З сялянскай сям'і. Да арышту настаяцель царквы в. Траскоўшчына тагачаснага Заслаўскага р-на (з 1978 у межах Мінска). Арыштаваны 19.7.1935. Асуджаны 13.11.1935 паводле пастановы калегіі НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.9.1962 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Ш. і інш. № 17931с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШАКАЛА (ШЕКАЛО) Аляксій Мікалаевіч** [1874, в. Частнікі Люблінскага ваяв., цяпер Польшча — ?]. Украінец. З сялянскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю. Да арышту настаяцель Уваскрасенскай царквы ў Віцебску. Быў жанаты, меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 24.4.1931. Асуджаны 14.7.1932 з 15 святарамі і царкоўнаслужыцелямі асобай нарадай пры АДПУ як «член антысавецкай групы» да 3 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.9.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД. .

**ШАЛАЙ Аляксандр Сямёнавіч. Гл.: АЛЯКСАНДР ШАЛАЙ.**

**ШАЛЕПІН (ШЕЛЕПНН) Аляксандр** [4.1.1874, в. Дваранінавічы (Старыя Дваранінавічы) Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. Сын Мануіла Шалепіна[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1895?), ру

[1] У ліку лепшых скончыў Магілеўскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1871). Да 1896 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Пацава Слабада Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілеўскай вобл. З 1897 служыў у КасмаДаміянаўскім храме ў мяст. Любошчы Бабруйскага пав., цяпер Кіраўскі рн. Узнагароджаны набедранікам (да 1880), скуф'ей, камілаўкай, нагрудным крыжам (да 1900), паліцай (1917), капаложаны ў іерэя (1900). Служыў настаяцелем Свята-Троіцкай царквы в. Нача Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. З 1912 настаяцель Пакроўскайга храма в. Паляны (Узляны) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. У сярэдзіне 1920х г., верагодна, служыў у Пакроўскай царкве в. Саламарэчча Мінскага пав., цяпер Мінскі рн. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 8.5.1929 у в. Калоніцы (?) Мінскага рна. Асуджаны 18.6.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР (Кем). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.3.1992 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа Ш. № 33620с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мгшской епархіш; Лнчный состав епархыального управлення; Пажятная КИНжка Мннской губерннн;НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ШАЛЕПІН (ШЕЛЕПИН) Васілій Арцёмавіч** [1872, в. Барань Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі

р-н Мінскай вобл. — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД]. У пачатку 1900х г. служыў псаломшчыкам у Магілёўскім Іосіфаўскім кафедральным саборы. 8.1.1906 рукапаложаны ў дыякана, у пачатку 1910х г. — у іерэя. З 1913—14 настаяцель Свята-Духава храма в. Хацетава Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чавускі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны ў верас. 1937 у Магілёве (?). Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 Магілёўскім абл. судом. Групавая справа Ш. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губертш.

**ШАЛУПАЕЎ (ШАЛУПАЕВ) Нікіта** [1890 — ?]. Беларус. З сям'і царкоўнаслужыцеля. У 1920я г. дыякан Мікалаеўскай царквы в. Старая Беліца (тагачасны паштовы адрас: ст. Уваравічы) Гомельскі пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929 з жонкай Еўдакіяй (н. ў 1904). Далейшы лёс сям'і Ш. невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 9.

**ШАЛЬКОЎСКІ (ШАЛЬКОВСКИЙ, ШЕЛЬКОВСКИЙ) Адам Канстанцінавіч** [1908, Мінская губ. — ?]. Скончыў Люблінскую школу сельскагаспадарчай каапераціі (1934). З 1936 працаваў аграномам на Гродзеншчыне. Арыштаваны і ў снеж. 1944 асуджаны асобай нарадай НКВД да 10 гадоў ППК. Вызвалены ў 1953. З 1955 паслушнік Успенскага Жыровіцкага манастыра, адначасова вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі.

Кр.: Черегшца В.Н. Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 164. Гродно, 2000.

**ШАЛЮТА Фёдар Фаміч** [1873, в. Гаспія (?) Полацкага пав. Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Беларус. Атрымаў хатнюю адукацыю. У пачатку 1900х г. дыякан Магілёўскага

Іосіфаўскага кафедральнага сабора. 5.1.1906 рукапаложаны ў іерэя, прызначаны настаяцелем Пакроўскага храма в. Плоскае Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Друцк Магілёўскага пав., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 4.11.1929. Асуджаны 15.12.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 7.5.1992 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памяпгная КИНжка Могнлевской губернан.

**ШАМКО Кліменцій Ігнатавіч** [1889, в. Данілавічы Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — 1.11.1937, Гомель, турма НКВД]. У 1914 вольны слухач 6 класа Мінскай духоўнай семінарыі, адначасова служыў дыяканам у АляксандраНеўскай царкве в. Сталовічы (Стваловічы) Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Баранавіцкі р-н Брэсцкай вобл. 28.10.1914 рукапаложаны ў іерэя, прызначаны другім Свята-ром у Пакроўскі храм в. КнязьВозера Мазырскага пав. Мінскай губ. Арыштаваны 18.8.1937 у Гомелі. Асуджаны тройкай НКВД 30.10.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.7.1973.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**ШАМЯЦІЛА (ШЕМЕТИЛЛО) Барыс** [1900, Слуцк Мінскай губ., цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. — ?], сын Мікалая (Шамяцілы). Служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскім саборы ў Слуцку. Арыштаваны 26.5.1929. Асуджаны 10.11.1929 калегіяй АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Зноў арыштаваны і 28.6.1932 высланы на 3 гады ў Зах. Сібір. Пасля вызвалення жыў у Астрахані. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 2.3.1992 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа Ш. № 31969с захоўваецца з фотаздымкам у архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; Сннодык за веру н церковь Хрнстову

пострадавшнх в Мннскон епархіш.

**ШАМЯЦІЛА (ШЕМЕТНЛЛО) Мікадай Іванавіч. Гл.: МІКАЛАЙ (ШАМЯЦІЛА).**

**ШАМЯЦІЛА (ШЕМЕТНЛЛО) Феафан Іванавіч. Гл.: ФЕАФАН (ШАМЯЦІЛА).**

**ШАПЧЫЦ (ШАПЧИЦ) Андрэй Яфімавіч** [1876, в. Вялікая Ухалода, цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. — 10.3.1938, Барысаў, турма НКВД], селянінаднаасобнік, стараста Андрэеўскага храма ў Барысаве. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 5.2.1938. Асуджаны 14.2.1938 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай групы царкоўнікаў» і за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 1.6.1957 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа Ш. І інш. № 10397с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШАРАПАЎ (ШАРАПОВ) Канстанцін Іванавіч. Гл.: ЦІХАН (ШАРАПАЎ).**

**ШАРКОЎСКІ (ШАРКОВСКИЙ) Фёдар** [1875, мяст. Станькава Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Беларус. Сын Іаана Шаркоўскага[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1897?), рукапаложаны ў іерэя (1899). 3 1900 настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Нясята Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Клічаўскі р-н Магілеўскай вобл. 3 1909 настаяцель КасмаДаміянаўскага храма ў мяст. Гарадок Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Глускі р-н Магілеўскай вобл., благачынны (1910—15) цэркваў 4й акругі Бабруйскага пав. 3 1916 настаяцель Спаса-Праабражэнскай царквы в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ. 3 1917 благачынны цэркваў 2й акругі Барысаўскага пав. Апошняе месца службы — Мікалаеўскі храм в. Папоўшчына, цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл.

Быў жанаты, меў дачок Кацярыну (н. ў 1905) і Любоў (1920). Арыштаваны 18.2.1931. Абвінавачваўся ў тым, што «ведаў пра дзейнасць контррэвалюцыйнай групоўкі, але не даклаў пра яе ў АДПУ». Асуджаны 4.7.1931 калегіяй АДПУ да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Сібір. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, служыў у Барысаве. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 25.8.1989. Групавая справа III. і інш. № 28026с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губерннн; Пажятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархыального управленпя; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш.

**ШАТКОЎСКІ (ШАТКОВСКИЙ) Іосіф Мінавіч** [1879, мяст. Веліж Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Смаленскай вобл. — ?]. Беларус. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Мяніца тагачаснага Ветрынскага (цяпер Полацкага) р-на Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 19.1.1930. Асуджаны 14.3.1930 са Свята-рамі Міхаілам Квяткоўскім, Іаанам Свірыдавым, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Групавая справа Ш. і інш.

**ШАЎКОВІЧ (ШОЛКОВИЧ) Аляксандр Мікалаевіч** [7.12.1895 — 10.10.1942, ГУЛАГ], Свята-р, унук Максіма Шаўковіча, сын Мікалая Шаўковіча[2]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю. Рукапаложаны ў іерэя (1920). Прызначаны ў Пакроўскі храм у мяст. Капаткевічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл., дзе раней служыў яго бацька. Арыштаваны 4.3.1938. Асуджаны тройкай НКВД 30.9.1938 да 10 гадоў ППК. Памёр у зняволенні. Рэабілітаваны. Справа Ш. перагледжана трыбуналам БВА і спынена зза недаказанасці абвінавачання (1958). Жонка Свята-ра

Марыя Віктараўна з 1948 жыла ў Пінску, дзе і памерла.

Кр.: Опнсанне церквей н прнходов Мннской епархіш; Памяпгная КИНжка Мннской губернын; Статнстнческня сведення о церквах н прнчтах Мннской епархіш; Памятная КИНжка Мынской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення; Распнсанне городскнх н сельскнх прнходов, церквей н прычтов по Мннской епархын; Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2.

**ШАЎЧУК (ШЕВЧУК) Аляксей Сцяпанавіч** [1886, в. Камень Шляхецкі Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., з канца 1939 в. Акцябр, цяпер Кобрынскі р-н Брэсцкай вобл. — 10.3.1938, Барысаў, турма НКВД]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Член царкоўнага савета Андрэеўскага храма ў Барысаве. Да арышту працаваў пажарнікам. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 26.12.1937 у Барысаве па адрасе: вул. Сенная, д. 15. Асуджаны 30.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 19.9.1956 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Групавая справа Ш. і інш. № 7096с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД. , .,,.,,

**ШАЎЧУК (ШЕВЧУК) Кесарый Сямёнавіч** [1875 ці 1878, в. Ардынцы Валынскай губ., цяпер Украіна — ?]. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Маладушы Рэчыцкага пав., цяпер Рэчыцкі р-н Гомельскай вобл. Арыштаваны 19.6.1931. Асуджаны калегіяй АДПУ 26.7.1931 да 5 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся ў Мікалаеўскую царкву. 2.11.1937 зноў арыштаваны і 28.11.1937 прыгавораныда 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе рэабілітаваны 14.11.1989, па другой 8.9.1989.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рэчыцкага раёна. У 2х кн. Кн. 1. Мн., 1998.

**ШАФРАНОЎСКІ (ШАФРАНОВСКИЙ) Міхаіл** [3.11.1873, в. Комсенічы Магілёўскага пав., цяпер Круглянскі р-н Магілёўскай вобл. — 15.1.1938, ГУЛАГ], абнаўленчы

протаіерэй. Беларус. Сын Сімяона Шафраноўскага[1]. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1900). Прызначаны другім Свята-ром, потым настаяцелем Мікалаеўскай царквы ў г. Сянно Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл., благачынны цэркваў 1й акругі Сенненскага пав. 3 1912 настаяцель Пакроўскага храма в. Нямойта Сенненскага пав., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. 3 1914 служыў ва Уваскрасенскай царкве мяст. Лукомль Сенненскага пав., цяпер вёска Чашніцкага р-на Віцебскай вобл., благачынны цэркваў 2й акругі Сенненскага пав. 3 1927 настаяцель ПетраПаўлаўскага кафедральнага сабора ў Мінску, Свята-р Беларускай аўтаномнай праваслаўнай царквы (абнаўленчай). Быў жанаты, меў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 3.9.1935 у Мінску па адрасе: вул. Інтэрнацыянальная, д. 9, кв. 1. Праходзіў па адной справе са старастам або актыўным прыхаджанінам сабора

Паўлам Лабаноўскім і інш. Асуджаны 27.10.1935 са Свята-рамі Мінскай епархіі Мікалаем Сквярнюком, Мікалаем Умецкім паводле пастановы калегіі НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і за антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 26.7.1961 пленумам Вярхоўнага суда БССР. Асабовая справа Ш. № 17146с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

17.3.1948 у Мінску па адрасе: Чыгуначны зав., д. 16 арыштаваны вартаўнік СІП № 36 Мінска Шафраноўскі Сяргей Міхайлавіч (н. ў 1898), верагодна, сын Міхаіла Шафраноўскага. 28.7.1948 асуджаны затое, што «працаваў паліцэйскімвахцёрам у турме ў перыяд нямецкай акупацыі» да 25 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены ў другой палове 1955. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 23.5.1959 калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Асабовая справа Ш. № 14520с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятпная КИНжка Могнлевской губерніш; НГАБ, ф. 2 786, в. 1, с. 67; Снноднк за веру н церковь Хрнстпову пострадавшых в Мынской епархіш.

**ШАФРАНОЎСКІ (ШАФРАНОВСКИЙ) Пётр Васілевіч** [20.12.1876, в. Азяраны Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Рагачоўскі р-н Гомельскай вобл. — 18.10.1938, Магілёў, турмаНКВД]. Беларус. Верагодна, сын Васілія Шафраноўскага. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Увазнясенскай царкве в. Залессе Гомельскага пав., цяпер Чачэрскі р-н Гомельскай вобл. У 1914 пераведзены ў КасмаДаміянаўскі (?) храм у мяст. Асіповічы Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер райцэнтр Магілёўскай вобл., з 31.10.1914 благачынны цэркваў 3й акругі Бабруйскага пав. Арыштаваны 3.6.1938. Асуджаны 10.10.1938 тройкай НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі і шпіён» да ВМП. Загінуў у турме. Рэабілітаваны 26.5.1958 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. № 6289 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губершш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Рагачоўскагараена. Мн., 1992.

**ШАФРАНОЎСКІ (ШАФРАНОВСКИЙ) Сцяфан Сцяпанавіч** [1875, в. Ніжняе або Новае Грудскае Мінскай губ. — 1938 (?), Магілёў, турма НКВД]. Беларус. З духоўнага саслоўя. З 1908 настаяцель РаստваБагародзіцкай царквы в. Скіток Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Гомельскі рн. Пакінуў службу (верагодна, у 1935) у сувязі з тым, што «царкоўны савет не выплаціў страхоўку і інш. падаткі, накладзеныя на царкву савецкімі ўладамі». Арыштаваны 15.2.1938 у Магілёве. Асуджаны 21.9.1938 з шэрагам Святароў Магілёўскай епархіі паводле пастановы калегіі НКВД як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. Свята-роў № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная кнажка Могылевской губертш; НГАБ. Ф. 2786, в. 2, с. 10.

**ШАФРАНСКІ (ШАФРАНСКИЙ) Нікіта Філіпавіч** [1875,

в. Кіявец (паводле інш. звестак — Кіеўка або Кіявічы) Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — ?], дыякан. Беларус. З мяшчанскай сям'і. Служыў у адной з цэркваў Магілёва. Быў жанаты, меў дачку Алімпіяду (н. ў 1907) і сына Аляксея (1919). Арыштаваны 27.1.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў ППК. 8.9.1937 тройкай НКВД Смаленскай (?) вобл. прыгавораны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа Ш. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.:НАРБ,ІКБР.

**ШАФРАНСКІ (ШАФРАНОЎСКІ) (ПІАФРАНСКИЙ, ШАФРАНОВСКИЙ) Ціхан Іванавіч** [16.6.1879, в. Анэліна Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. — пасля 1958], іерэй. Скончыў Полацкую настаўніцкую (1897) і Магілёўскую духоўную (1904) семінарыі. Працаваў настаўнікам у царкоўнапрыходскай школе в. Малое Савіна (Савіна) Горацкага пав., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. 9.3.1905 у Іосіфаўскім кафедральным саборы ў Магілёве рукапаложаны ў дыякана, 11.3.1905 — у іерэя. Прызначаны настаяцелем Пакроўскай царквы в. Ляцягі Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Слаўгарадскі р-н Магілёўскай вобл. Адначасова выкладаў Закон Божы ў царкоўнапрыходскай школе (да 1918). Узнагароджаны нагрудным крыжам (1921). Пасля закрыцця 1.1.1930 Пакроўскай царквы служыў ва Уваскрасенскім саборы ў Чавусах. У 1930—38 працаваў цесляром. Быў жанаты (з 7.1.1905) на дачцы Васілія Юдзеніча[1] Аляксандры (н. 25.3.1885), меў дачок Наталлю (1910), Яўгенію (1912), сыноў Віталя (1908), Васіля (1915). Арыштаваны 9.3.1938 у Чавусах па адрасе: вул. Чырвонаармейская, д. 18. Пад следствам знаходзіўся ў Магілёўскай і Гомельскай турмах НКВД. Абвінавачваўся ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці супраць савецкай улады». Асуджаны не быў. Вызвалены і рэабілітаваны 5.4.1939

пастановай пракурора Магілёўскай вобл. З 20.10.1941 служыў ва Успенскай царкве мяст. Сухары, цяпер Магілёўскі рн. З 20.12.1943 да 5.5.1947 — у Мікалаеўскім храме в. Благавічы, цяпер Чавускі рн. З 8.4.1948 да 12.1.1949 — у Свята-Троіцкім прыходзе в. Барсукі Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл. З 11.4.1949 ва Успенскай царкве в. Гарадзец Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. 14.9.1949 звольнены за штат. Памёр і пахаваны ў Чавусах. Асабовая справа Ш. захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памягпная КИНжка Могнлевской губерннн; БНДЦЭД; Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 576.

**ШАХЛЕВІЧ (ШАХЛЕВИЧ) Пётр Васілевіч** [1885 — 26.1.1977, Пінск]. У 1919—26 псаломшчык Свята-Фёдараўскага сабора ў Пінску. З 1926 служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Моталь, цяпер Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл., з 1927 — у Георгіеўскім храме ў Нясвіжы, з 1934 — у Белавежы, цяпер Полынча, з 1936 — у г. п. Камянец, цяпер Брэсцкай вобл., з 1939 — у в. Антопаль, цяпер Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл., з 1940 — зноў у Пінскім саборы. Арыштаваны ў 1950. Асуджаны да 5 (?) гадоў ППК. Вызвалены ў 1955. Вярнуўся на радзіму. Служыў у Свята-Варварынскай царкве ў Пінску. З 1975 за штатам. Пахаваны на гарадскіх могілках.

Кр.: Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўленяя, ф. 1, в. 2, с. 821.

**ШАХМУЦЬ (ШАХМУТЬ) Раман Раманавіч. Гл.: СЕРАФІМ (ШАХМУЦЬ).**

**ШАХОЎЦАЎ (ШЕХОВЦЕВ) Фёдар Афанасевіч** [1867, Полацк Віцебскай губ., цяпер горад Віцебскай вобл. — 7.10.1937, Віцебск, турмаНКВД], Свята-р. Рускі. З мяшчанскай сям'і. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1888). Да 1905 служыў другім Свята-ром у Мікалаеўскім саборы, БарысаГлебскай могілкавай

царкве ў Дрысе Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінск Віцебскай вобл. Потым настаяцель Сімяонаўскага храма ў Віцебску. Быў жанаты на Алене Фёдараўне (дачка палкоўніка царскай арміі), меў дачку Таццяну (працавала настаўніцай; была замужам за былым афіцэрам царскай арміі Ота Іванавічам Брыцам, рэпрэсаваным у 1932 за «контррэвалюцыйную дзейнасць»). Арыштаваны 19.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. 4я Свярдлова, д. 33. Асуджаны 28.9.1937 з 40 інш. свяшчэнна і царкоўнаслужыцелямі і актыўнымі прыхаджанамі тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і як арганізатар антысавецкай арганізацыі» да ВМП з канфіскацыяй маемасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Групавая справа Ш. і інш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр. : Памяпгная КИНжка Вшпебской губершш; Афіцьшны сайт Віцебскай епархп.

**ШАХРАЙ *Мікалай Мікалаевіч*** [1873, Крычаў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г. старшыня або член царкоўнага савета адной з цэркваў Крычава. Быў жанаты, меў сына Пятра (н. ў 1910) і дачку Алену (1921). Арыштаваны 14.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа Ш. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

**ШАШКО Канстанцін**. Протаіерэй. Быў жанаты на сястры архіепіскапа Філафея (Нарко). Падчас 2й сусветнай вайны настаяцель царквы св. Марыі Магдаліны на вул. Старажоўскай у Мінску. У 1944 (?) арыштаваны і асуджаны да 10 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся ў Беларусь.

Кр.: Сннодык за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх е Мнн ской епархіш.

**ШВЯДКО (ШВЕДКО) Аляксандр Іванавіч** [1894 — 27.10.1937, Смаленск, турмаНКВД]. Беларус. Да арышту настаяцель царквы в. Пакроўскае тагачаснага ХолмЖыркаўскага р-на Смаленскай вобл. Арыштаваны 20.8.1937. Асуджаны камісіяй НКВД і пракуратуры СССР 21.10.1937 за «шпіянаж» і «антысавецкую агітацыю» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: СмоленсКИЙ мартнролог.

**ШКЛЕНСКІ (ШКЛЕНСКИЙ) Данііл Ільіч** [1881, в. Ігрушка Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крупскі р-н Мінскай вобл. — 8.10.1937, Магілёў (?), турма НКВД], Свята-р. Беларус. Служыў у Магілёўскай епархіі. Арыштаваны 2.9.1937 у Бабруйску. Асуджаны 30.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 5.5.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Ш. № 9998 захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЛЯХЦІЦ (ШЛЯХТИЦ) Іаан Кірылавіч** [22.6.1892, в. Сідараўка Магілёўскай губ. — 30.9.1937, Віцебск, турма НКВД]. З бел. шляхецкай сям'і. У 1920я г. настаяцель Свята-Мітрафанаўскага храма в. Казловічы Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 1.3.1932. Асуджаны 19.6.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Працаваў бондарам у арцелі «Працамэбля». Зноў арыштаваны 9.8.1937 у Оршы. 15.9.1937 прыгавораны тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» даВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 20879п; захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) рэабілітаваны 27.11.1989, па другой — 24.4.1989.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШМЫГЛЕЎСКІ (ШМЫГЛЕВСКИЙ) Антоній Васілевіч** [1876, в. Перавалачная Аршанскага пав. Магілёўскай губ.,

цяпер Талачынскі р-н Віцебскай вобл. — ?], дыякан. Беларус. З сялянскай сям'і. Служыў у Крычаве Магілёўскай вобл. Быў жанаты, меў пяцера дзяцей (н. ў 1904—17). Арыштаваны 14.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.6.1933 за «антысавецкую агітацыю» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай арганізацыі» да 3 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай БССР 17.7.1989. Групавая справа Ш. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР.

**ШПАК Грыгорый Якаўлевіч** [1883, мяст. Чашнікі Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сям'і службоўца. Скончыў Віцебскую духоўную семінарыю (?), рукапаложаны ў іерэя. Служыў у адной з цэркваў Лепеля. Арыштаваны 22.10.1933. Асуджаны 25.2.1934 з інш. святчэннаслужыцелямі ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ш. з фотаздымкам захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШПАКОЎСКІ (ШПАКОВСКИЙ) Аляксандр Францавіч** [15.7.1874 або 1975, в. Андрушы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. (паводле інш. звестак в. Магільна Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл.) — 19.8.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. У 1920я г. стараста Ільінскага храма ў мяст. Шацк Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Паводле некаторых звестак першы раз арыштаваны 3.11.1933 на хут. Голае Балота тагачаснага Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. Асуджаны 19.12.1933 калегіяй АДПУ як «член ПАВ» да 8 гадоў ППК. Пасля датэрміновага вызвалення вярнуўся на радзіму. Зноў арыштаваны 17.7.1937 на хут. Голае Балота. Асуджаны 12.8.1937 з настаяцелем царквы Міхаілам Плышэўскім, Свята-ром Іаанам Варанцом і інш. тройкай НКВД за

«антысавецкую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Па першай справе (№ 16637с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 22.8.1960, па другой (групавая, № 21266с; захоўваецца з фотаздымкам тамсама) пракуратурай БССР 21.3.1989.

Кр.: БНДЦЭД; Саноднк за веру н церковь Хрнстоеу пострадавшнх е Мннской епархіш.

**ШПАКОЎСКІ (ШПАКОВСКИЙ) Віктар Аляксандравіч** [1886 в. Віцкаўшчына Мінскага пав., цяпер Дзяржынскі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Падчас арышту стараста Свята-Іаанаўскай царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 21.7.1929. Асуджаны 20.11.1929 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 22.11.1991 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа К. і інш. № 31910с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру н церковь Хрнстпову поспградавшых в Мннской епархіш.

**ШПАКОЎСКІ (ШПАКОВСКИЙ) Эраст Іосіфавіч** [1876, в. Якшыцы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Бярэзінскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Сваяк Іосіфа ПІпакоўскага[1]. 29.11.1894 накіраваны псаломшчыкам у РаствaБагародзіцкі храм в. Гаць Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. У 1910я г. псаломшчык храма мяст. Пясочнае Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. Падчас арышту настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Магільна, цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 24.4.1933. Асуджаны 26.5.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК (заменена высылкай). Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Рэабілітаваны 21.7.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Ш. № 27128с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Пажятная КИНжка Мннской епархш; Лнчный состав

епархнального управлення.

**ШУМАН Іосіф Вікенцевіч** [1881, в. Більдзюгі (Новы Пагост) Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Шаркаўшчынскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. У 1920я г. служыў катакомбна — у дамах веруючых. З 1932 вартаўнік МіколаБогаяўленскага сабора ў Ленінградзе. Арыштаваны 24.11.1932 па «царкоўнай справе» (№ п80743; захоўваецца ў архіве УФСБ па СанктПецярбургу і Ленінградскай вобл.). Асуджаны 8.12.1932 да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Санкт Петербургской епархіш Сннодак.

**ШУСТАЎ (ШУСТОВ) Фёдар** [7 — 1937 (?), турма НКВД], настаяцель царквы в. Градзянка, цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 18.7.1937 (?). Хутчэй за ўсё асуджаны да ВМП і расстраляны.

Верагодна, былі рэпрэсаваны і сваякі ТТТ.

Кр.: Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархші.

**ШЧЭРБА (ЩЕРБА) Дзімітрый Якаўлевіч** [1881, в. Бяседавічы Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Хоцімскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], іерэй. Беларус. Скончыў духоўнае вучылішча. Служыў у РаствaБагародзіцкай царкве ў роднай вёсцы. Арыштаваны 27.12.1932. Асуджаны 1.9.1933 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Дапейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 13.10.1989 Магілёўскай абл. пракуратурай. Асабовая справа ІІІ. № 10561сн захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ШЧЭРБА (ЩЕРБА) Іакаў Малахавіч** [1882, Магілеў — 1.10.1939, Магілёў, турма НКВД], Свята-р. Беларус. У 1920я г. служыў у Магілёўскай епархіі. Арыштаваны 26.2.1938. Асуджаны 21.9.1938 тройкай НКВД як «удзельнік шпіёнскапаўстанцкай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны.

Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр,:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ШЧЭРБА (ЩЕРБА) Пётр** [1888, в. Новая Ельня Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], сын Георгія Фёдаравіча Шчэрбы[1]. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920я г. настаяцель Мікалаеўскай царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 26.1.1933. Асуджаны 15.5.1933 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989. Групавая справа Ш. і актыўных прыхаджан № 11262 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.:НАРБ,ІКБР;БНДЦЭД.

**ШЧЭРБАЎ (ЩЕРБОВ) Іаан Паўлавіч** [1873, Віцебскі пав. (?) — 13.4.1925, Ленінград], іерэй. Верагодна, сын Паўла Васілевіча Шчэрбава[1]. Скончыў Віцебскую духоўную семінарію (1894), СанктПецярбургскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (1898). З 15.6.1890 выкладаў у акадэміі асноўнае, дагматычнае багаслоўе. Таксама чытаў лекцыі ў Педагагічнай семінарыі. З 30.9.1918 — загадчык Багаслоўскапастырскага вучылішча пры АляксандраНеўскай Лаўры Петраграда. З 13.10.1919 да 13.2.1920 член Камісіі духоўнавучэбных устаноў Петраградскай епархіі. З 1919 сябра АляксандраНеўскага Брацтва. Арыштаваны 1.6.1922. Да 18.9.1922 знаходзіўся пад следствам у турме ў Петраградзе. Асабовая справа Ш. № п88399 захоўваецца ў архіве УФСБ па СанктПецярбургу і Ленінградскай вобл. Кр.: Афіцыйны сайт Віцебскай епархіі.

**ШЫДЛОЎСКІ (ШИДЛОВСКИЙ) Ціхан Васілевіч** [1886, в. Карзуны (Корзуны) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. — 26.3.1938, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту стараста

царквы ў роднай вёсцы. Арыштаваны 7.2.1938. Асуджаны 14.2.1938 паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа ТТТ. № 22245с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЫЛОВІЧ (ШИЛОВИЧ) Васілій Якаўлевіч** [лют. 1879, в. Мялешкавічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Мазырскі р-н Гомельскай вобл. — ?]. Беларус. У 1920я г. настаяцель Георгіеўскай царквы в. Макраны, цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 4.12.1929 у в. Красная Горка, цяпер Капыльскі рн. Асуджаны 20.1.1930 з інш. Свята-рамі, старастам і актыўнымі прыхаджанамі царквы асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Карэльскай АССР (Котлас). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.6.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Ш. № 23923с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЫМАНОЎСКІ (ШИМАНОВСКИЙ) Іаан Сямёнавіч** [1866, в. Любязь Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Валынская вобл., Украіна — ?]. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1892). З 1893 настаяцель ІаанаБагаслоўскай царквы в. Міхалёва Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Бабруйскі р-н Магілёўскай вобл., узнагароджаны набедранікам, скуф'ёй, нагрудным крыжам (1917). Арыштаваны 21.9.1929 у роднай вёсцы. Асуджаны калегіяй АДПУ 1.12.1929 за «распаўсюджванне правакацыйных чутак» да 3 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці. Высланы ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.11.1992 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа Ш. № 15195 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губернын; Памятная кнпж ка Мннской епархші; Лычный состав епархнального управленш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ШЫМАНОЎСКІ (ШИМАНОВСКИЙ) Мікалай** [1871, мяст. Дукора Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер вёска Пухавіцкага р-на Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Сын Грыгорыя Шыманоўскага[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, Служыў псаломшчыкам у Мікалаеўскай царкве в. Дуброва Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Жлобінскі р-н Гомельскай вобл. 28.2.1894 пераведзены ў Свята-Троіцкі храм мяст. Смілавічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1898). З 1899 настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы ў родным мястэчку. Узнагароджаны набедранікам, камілаўкай (1914). Арыштаваны 2.9.1930. Асуджаны 25.4.1931 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Варкуцінскі канцлагер НКВД Архангельскай вобл. і Комі АССР. Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Рэабілітаваны 26.9.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Асабовая справа Ш. № 29933с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губерніш; Памятная КИНж ка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ШЫМКОВІЧ (ШИМКОВИЧ) Іосіф Васілевіч** [1872, в. Данілавічы Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўкі р-н Гомельскай вобл. — ?], іерэй. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, брат Пятра ПІымковіча. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1892). З 1904 служыў ва Увазнясенскім храме в. Сватошыца Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл., благачынны цэркваў 2й акругі Горацкага пав. Арыштаваны 31.7.1937 у в. Навасёлкі Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую прапаганду» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы.

Kamunikat.org

Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда Групавая справа Ш. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерніш. ' "

**ШЫМКОВІЧ (ШИМКОВИЧ) Пётр Васілевіч** [1868, в. Данілавічы Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Веткаўкі р-н Гомельскай вобл. — 1938, Магілёў, турма НКВД], протаіерэй абнаўленчы. Беларус. З сям'і свяшчэннаслужыцеля, брат Іосіфа ПІымковіча. Да 1907 настаяцель ПетраПаўлаўскага храма в. Гарадзец Чавускага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дрыбінскі р-н Магілёўскай вобл. У 1908—12 служыў у Казанскай царкве в. Прыволле Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія, член павятовага аддзялення Магілёўскага епархіяльнага вучылішчнага савета. Адмовіўся ад Свята-рскага сана па прычыне асабістага характару. У 1920я г. ўваходзіў у групу «жывацаркоўнікаў», адноўлены імі ў сане. Актыўна прапагандаваў абнаўленчы раскол у Оршы, за што ўзнагароджаны санам протапрасвітара. З 1924 настаяцель захопленага абнаўленцамі ПетраПаўлаўскага храма в. Гарадзец. У 1925 член абнаўленчага Сінода. Адзін з ініцыятараў правядзення ўстаноўчага з'езда Аршанскай абнаўленчай епархіі (18.5.1926), прызначаны ўпаўнаважаным епархіі. Арыштаваны 4.1.1930 у в. Гарадзец. Вызвалены 24.3.1930. Зноў арыштаваны 1.3.1938 у Магілёве. Асуджаны 21.9.1938 з шэрагам Свята-роў Магілёўскай епархіі як «рэзідэнт польскай разведкі і кіраўнік пгпіёнскай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.12.1957 трыбуналам БВА. Групавая справа Ш. і інш. № 5070 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; Шнленок Д., свяіц. Нз нсторнн Православной Церквн в Белорусснн (1922—1939). М., 2006.

**ШЫМКОВІЧ (ШИМКОВИЧ) Сергій Фёдаравіч** [1865, в. Барсукі Магілёўскага пав. цяпер Магілёўскі р-н — ?].

Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. Служыў ва Уваскрасенскай царкве в. Чырына Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. З 1909 настаяцель Благавешчанскай царквы в. Малое Савіна (Савіна) Горацкага пав., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. Арыштаваны 13.2.1930. Асуджаны 9.3.1930 са Свята-рамі Аляксандрам Браўковічам, Іаанам Данькіным і інш. асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ш. № 20991п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: Памятпная КИНжка Могнлевской губерніш.

**ШЫНКЕВІЧ (ШИНКЕВИЧ) Васіль Восіпавіч** [1893, в. Вілейка Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Докшыцкі р-н Віцебскай вобл. — ?]. З сялянскай сям'і. У 1920я г. член царкоўнага савета Спаса-Праабражэнскага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 31.12.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 27.4.1933 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да высылкі за межы БССР (тэрмін не пазначаны). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 10.10.1989. Асабовая справа Ш. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.гНГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67. ю

**ШЫНКЕВІЧ (ШИНКЕВИЧ) Мікалай**. Свята-р. Беларус. У 1920я г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Свяцілавічы Гомельскага пав., цяпер Веткаўскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 8а; ф. 1379, воп. 4, сп. 6, л. 6, 15,16.

**ШЫРАЕЎ (ШИРЯЕВ) Сімяон Дзмітрыевіч** [6.6.1885, мяст. Вула Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Бешанковіцкі р-н Віцебскай вобл. — 9.1.1956], Свята-р,

верагодна, брат Андрэя Дзімітрыевіча Шыраева[1]. У 1920я г. жыў ва Усевалажску Ленінградскай вобл. Да 1931 арыштоўваўся 5 разоў. Тройчы асуджаны да ссылкі. Зноў арыштаваны 21.4.1931. 8.10.1931 прыгавораны да 3 гадоў ППК. Вызвалены 22.7.1933 (датэрмінова). З 25.11.1948 другі Свята-р царквы пры Рыжскім ТроіцаСергіевым жаночым манастыры. 23.5.1949 прызначаны ў Спаса-Праабражэнскую пустынь. Пахаваны на Шувалаўскіх могілках у Ленінградзе. Асабовая справа Ш. № п83017 захоўваецца ў архіве УФСБ СанктПецярбурга і Ленінградскай вобл.

Кр.: СанктПетербургской епархіш Снноднк.

**ШЫРКЕВІЧ (ШИРКЕВИЧ) Аляксандр** [30.8.1887, в. Варонічы Лепельскага пав. Віцебскай губ., цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], дыякан. Беларус. Сын Іаана Іосіфавіча Шыркевіча. Скончыў Полацкае духоўнае вучылішча (1908). Служыў у Ільінскім храме в. Жаробычы (тагачасны паштовы адрас: ст. Шуміліна) Віцебскага пав. Быў жанаты, гадаваў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 24.4.1931 у в. Слабада Сіроцінскага (цяпер Шумілінскага) р-на Віцебскай вобл. Асуджаны 27.8.1931 з шэрагам Свята-роў ПолацкаВіцебскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «правядзенне агітацыі сярод сялян, накіраванай на звяржэнне савецкай улады» да 3 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 24.7.1989. Асабовая справа ТТТ. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НГАВ, ф. 2597. в. 1. с. 23; Дзяржаўны архіў Віцебскай вобл., ф. 1070, в. 1.,с. 30, л. 173—174.

**ШЫРКІН (ШИРКИН) Ляонцій Андрэевіч** [1870, мяст. Баева Горацкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту дыякан Увазнясенскага храма ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 10.1.1930. Асуджаны 3.3.1930 са старастам царквы асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 6 месяцаў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны

27.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Ш. № 20993п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

**ШЫШЛА (ШЫШЛО) (ШИШЛО) Іаан Васілевіч** [1915, СанктПецярбург, Расія — ?]. Беларус. З сям'і рабочага. Падчас 2й сусветнай вайны дыякан Свята-ПетраПаўлаўскага сабора на Нямізе. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 16.8.1944 у Мінску па адрасе: пл. Свабоды, д. 19. Асуджаны 7.7.1945 з Серафімам (Шахмуцем) і Грыгорыем (Кударэнкам) паводле пастановы калегіі НКВД за «антысавецкую агітацыю» і «супрацоўніцтва з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ва Унжэнскі канцлагер НКВД Горкаўскай чыгункі (ст. Сухабязводная). Вызвалены 3.7.1952. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.4.1989 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Асабовая справа Ш. № 21952с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЭБЕКА (ШЕБЕКО) Феадосій Аляксандравіч** [1867, в. Александрыя Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?]. Беларус. З духоўнага саслоўя. Да арышту псаломшчык царквы в. Новая Ельня Краснапольскага р-на Магілёўскай вобл. Арыштаваны 6.2.1930. Асуджаны 21.3.1930 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі ў Сібір з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 24.11.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа № 14264 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЭЛЕГ (ШЕЛЕГ) Аляксандр Максімавіч** [1897, в. Русаковічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — ?], селянінаднаасобнік. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. стараста або актыўны прыхаджанін царквы ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 22.2.1930. Асуджаны 5.3.1930

калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да высылкі (тэрмін невядомы). Рэабілітаваны 25.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ш. і інш. № 26857с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ШЭЛЕГ (ШЕЛЕГ) Антоній Мікалаевіч** [1872, в. Русаковічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., япер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. — ?], свяшчэннаслужыцель. Беларус. З духоўнага саслоўя. Скончыў настаўніцкую семінарыю. Падчас першага арышту працаваў цесляром. Арыштаваны 10.2.1931. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай дзейнасці». Асуджаны не быў. Вызвалены 11.3.1931. Служыў у царкве ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў траіх сыноў і дзвюх дачок. Арыштаваны 25.9.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ 25.2.1934 як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнапаўстанцкай нацыяналфашысцкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (М 26667с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны пракуратурай БССР 20.7.1989, па другой (захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.) пракуратурай Віцебскай вобл. 11.10.1989. 4.4.1938 у в. Русаковічы арыштаваны бацька чацвярых дзяцей Шэлег Антон Антонавіч (н. ў сак. 1905, атрымаў сярэднюю спецыяльную адукацыю), верагодна, сын Антона Шэлега. Асуджаны 14.5.1940 асобай нарадай НКВД як «член антысавецкай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў ПаўночнаУсходні канцлагер НКВД Амурскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.9.1964 Вярхоўным судом БССР. Асабовая справа ТТ. № 19027с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЮДЗЕНІЧ (ЮДЕНИЧ) Іосіф Васілевіч** [1874, в. Заселле Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — кастр. 1937 (?), Магілёў, турма НКВД], Свята-р. Беларус. З духоўнага саслоўя. У сярэдзіне 1920х г. настаяцель РастваБагародзіцкай царквы в. Прылукі Мінскага пав., цяпер Мінскі рн. Арыштаваны ў 1937.

Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.4.1966 пастановай Магілёўскага абл. суда. Групавая справа Ю. і інш. № 9171 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Клімавіцкага раена. Мн., 1995.

**ЮДЗЕНІЧ (ЮДЕНИЧ) Кліменцій Уладзіміравіч** [1875, в. Бель Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Крычаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], псаломшчык. З духоўнага саслоўя. Служыў у адной з цэркваў Мсціслава. Арыштаваны 23.9.1937. Праходзіў па адной справе з епіскапам Аляксандрам (Раеўскім). Асуджаны 31.10.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 16.1.1989. Асабовая справа Ю. № 13226 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл. Кр..НАРБ, ІКБР.

**ЮЗЬВЮК Мікалай Парфір'евіч. Гл.: ДАНІІЛ (ЮЗЬВЮК).**

**ЮНАЦКЕВІЧ (ЮНАЦКЕВИЧ) Аляксандр** [1865, в. Вуйвічы Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. — ?], сын Ільы Юнацкевіча[1], бацька Генадзя Юнацкевіча. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя (1903). Служыў у ПараскеваПятніцкай царкве в. Бастынь Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. З 1911 настаяцель Свята-Троіцкага храма в. Месткавічы Пінскага пав., цяпер Пінскі рн. У 1920я г. служыў у Спаса-Праабражэнскай царкве в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны 31.1.1931. Асуджаны 4.7.1931 з сынам Генадзем, псаломшчыцай Вольгай Крук, старастам і актыўнымі прыхаджанамі асобай нарадай пры АДПУ за

«антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 25.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ю. і інш. № 28026с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губерніш; Лнчный состав епархгіального управлення.

**ЮНАЦКЕВІЧ (ЮНАЦКЕВИЧ) Андрэй** [1873 — 1938, Гомель], протаіерэй. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894). Рукапаложаны ў іерэя (1897). З 1901 настаяцель ПараскеваПятніцкай царквы в. Сіманічы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Лельчыцкі р-н Гомельскай вобл. З 1909 настаяцель Георгіеўскага храма в. Юр'ева Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. Арыштаваны ў 1933. Пасля вызвалення (1935) жыў у Гомелі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской губершш; Памятная кныжка МІІнской епархын; Лнчный состав епархыального управлення; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мннской епархіш.

**ЮНАЦКЕВІЧ (ЮНАЦКЕВИЧ) Генадзь** [1904, в. Бастынь Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. — ?], сын Аляксандра Юнацкевіча. Беларус. Атрымаў сярэднюю адукацыю. У 1920я г. псаломшчык Спаса-Праабражэнскай царквы в. Вяляцічы Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Барысаўскі р-н Мінскай вобл Арыштаваны 31.1.1931. Асуджаны 4.7.1931 з бацькам, старастам і актыўнымі прыхаджанамі паводле пастановы калегіі АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 25.8.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ю. і інш. № 28026с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЮРАШКЕВІЧ (ЮРАШКЕВИЧ) Канстанцін** [1868, в. Вічын Пінскага пав. Мінскай губ., цяпер Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. Сын Фёдара Юрашкевіча[1]. Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча. Прызначаны

псаломшчыкам Успенскага храма в. Хатынічы Пінскага пав., цяпер Пінскі р-н Брэсцкай вобл. З 5.11.1899 псаломшчык Мікалаеўскай царквы в. Старае Сяло Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Ровенская вобл., Украіна. З 28.2.1901 (?) служыў у КасмаДаміянаўскім храме в. Тонава Слабада (тагачасны паштовы адрас: ст. Койданава). Арыштаваны 19.9.1937 у мяст. Лагойск, цяпер рай-цэнтр Мінскай вобл. Асуджаны 31.10.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 22.8.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Ю. № 27760с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Мннской епархнн; Лнчный состав епархнального управленыя; НГАБ, ф. 136, в. 1, с. 41145.

Псаломшчык Свята-Троіцкага храма в. Вічын.

**ЮРКЕВІЧ (ЮРКЕВИЧ) Адам**, Свята-р. Беларус. У 1920я г., верагодна, служыў ва Успенскай царкве в. АчосаРудня Гомельскага пав., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929 або ў 1930. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ДА Гомельскай вобл., ф. 1379, воп. 1, сп. 2, л. 6.

**ЮРКЕВІЧ (ЮРКЕВИЧ) Сімяон Андрэевіч** [1885, в. Чапліцы Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер в. Чаплічы Слуцкага р-на Мінскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. У 1920я г. настаяцель ПетраПаўлаўскай царквы в. Навасёлкі Слуцкага пав., цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў дзіця. Арыштаваны 26.10.1930. Асуджаны 11.1.1931 са Свята-ром Яўгеніем Гаворскім асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.9.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Ю. № 28031с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЮРЭВІЧ (ЮРЕВИЧ) Мікалай** [1893 — ?]. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1920я г. псаломшчык Пакроўскай

царквы в. Целяшы Гомельскага пав., цяпер Гомельскі рн. Рэпрэсаваны ў 1929 з сястрой Лізаветай (н. ў 1901). Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл., ф. 735, в. 1, с. 221, л. 6.

**ЮШКО Уладзімір Антонавіч** [1888, в. Вялікія або Малыя Жухавічы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — ?]. Беларус. Скончыў духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. З 1916 настаяцель Мікалаеўскага храма ў мяст. Хатаевічы (тагачасны паштовы адрас: ст. Плешчаніцы) Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер в. Акцябр Лагойскага р-на Мінскай вобл. Падчас арышту настаяцель Мікалаеўскай царквы ў мяст. Грозава, цяпер Капыльскі р-н Мінскай вобл. Меў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 24.3.1933. Асуджаны 9.6.1933 з 20 інш. Свята-рамі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую дзейнасць» да 5 гадоў ППК. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 17.7.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Ю. і інш. № 27605с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Памятная КИНжка Манской губерннн; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЯГОРАЎ (ЕГОРОВ) Вячаслаў Міхайлавіч. Гл. ГУРЫЙ (ЯГОРАЎ).**

**ЯГОРАЎ (ЕГОРОВ) Мікалай Іосіфавіч** [1907 (?), Гомель — ?], псаломшчык. Беларус. З сям'і царкоўнаслужыцеля. Да арышту актыўны прыхаджанін БарысаГлебскай царквы ў Ленінградзе. Арыштаваны ў снеж. 1934 па справе «еўлогіеўцаў». Асуджаны 25.2.1934 да ППК умоўна. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: Санкт Петербургской епархіш Снноднк.

**ЯЖГУНОВІЧ (ЯЖГУНОВИЧ) Фёдар** [1888, в. Бабровічы Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Івацэвіцкі р-н Брэсцкай вобл. — ?]. Беларус. Сын Феадосія Яжгуновіча[1]. Скончыў

Мінскую духоўную семінарыю (?), рукапаложаны ў іерэя. З 1912 настаяцель Пакроўскай царквы в. Пагарэлае (паштовы адрас: ст. Лапічы) Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Асіповіцкі р-н Магілёўскай вобл. Арыштаваны 25.2.1931. Асуджаны 17.5.1931 са Свята-ром Феафілам Трыдзенскім і шэрагам актыўных прыхаджан асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.5.1960 калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Групавая справа Я. і інш. № 7440сн з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: Памягпная кшіжка Мннской губерніш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЯЗВІЦКІ (ЯЗВИЦКИЙ) Іаан** [1869, Расія (?) — 1936], протаіерэй, апошні рэктар Мінскай духоўнай семінарыі да яе закрыцця ў 1918. Падчас арышту настаяцель царквы св. Марыі Магдаліны ў Мінску на вул. Старажоўскай. Паводле некаторых звестак арыштаваны ў 1927, асуджаны да зняволення і этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. Пасля вызвалення жыў (верагодна, у сваякоў) ва Уладзімірскай вобл., Расія.

Кр.: Снноднк за веру н церковь Хрнстову пострадавшнх в Мпнской епархіш.

**ЯКАЎЛЕЎ (ЯКОВЛЕВ) Аляксандр Дзмітрыевіч** [1880, СанктПецярбург — ?], Свята-р. Рускі. З мяшчанскай сям'і. Да арышту служыў у Бабруйску. Арыштаваны 25.12.1937. Пад следствам знаходзіўся ў Бабруйскай турме НКВД. Асуджаны 30.12.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК з канфіскацыяй маёмасці. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 22.9.1989 пракуратурай Магілёўскай вобл. Асабовая справа № 12032 захоўваецца ў архіве УКДБ Магілёўскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЯЛЕНСКІ (ЕЛЕНСКИЙ) Міхаіл Антонавіч** [1882, в. Даўгаполле Гарадоцкага пав. Віцебскай губ., цяпер

Гарадоцкі р-н Віцебскай вобл. — 30.10.1939, ГУЛАГ], вайсковец, педагог. Беларус. З сям'і сьвяшчэннаслужыцеля. Пасля сканчэння Віцебскай духоўнай семінарыі (1905), верагодна, служыў у Віцебску. Падчас 1й сусветнай вайны і да Кастрычніцкага перавароту 1917 афіцэр у арміі. У 1930я г. настаўнік Віцебскай СПІ № 5. Арыштаваны 18.9.1937 у Віцебску па адрасе: вул. Урыцкага, д. 39. Асуджаны 28.9.1937 тройкай НКВД за «дзейнасць у складзе антысавецкай групы» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў БеламорскаБалтыйскі канцлагер НКВД Архангельскай вобл. Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 28.7.1956 прэзідыумам Віцебскага абл. суда. Асабовая справа Я. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл. Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД.

**ЯНУКОВІЧ (ЯНУКОВИЧ) Пётр Цімафеевіч. Гл.: ПАІСІЙ (ЯНУКОВІЧ).**

**ЯРАШЭВІЧ (ЯРАШЕВИЧ) Сцяфан Антонавіч** [1880 в. Верхмень Ігуменскага пав., Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. — 11.11.1937, Мінск, турма НКВД]. Беларус. З духоўнага саслоўя. У 1908—28 псаломшчык Мікалаеўскай або АляксандраНеўскай (на могілках) царквы ў Смалявічах. У 1930я г. працаваў у калгасе «Добрая воля» ў роднай вёсцы. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Арыштаваны 28.9.1937. Асуджаны 31.10.1937 тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» да ВМП з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.4.1989 пракуратурай Мінскай вобл. Групавая справа Я. і інш. № 22214с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НАРБ, ІКБР; Снноднк за веру п церковь Храстову пост радавшнх в Мннской епархіш.

**ЯРОЦКІ (ЯРОЦКИЙ) Іаан Філімонавіч** [1901 — ?], Свята-р. Арыштаваны 3.2.1949 у Гомелі. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ 3.6.1949 да 25 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.6.1992.

Кр.: Памяць. Гісторыкадакументальная хроніка Гомеля. У 2 кн. Кн. 1я. Мн., 1998.

**ЯСІЕВІЧ (ЯССИЕВИЧ) Афанасій Аўтаномавіч** [3.7.1890, в. Свіцязь УладзімірВалынскага пав. Валынскай губ., цяпер Валынская вобл., Украіна — 3.5.1977]. Украінец. 3 сям'і псаломшчыка. Скончыў Клеванскае духоўнае вучылішча (1905), 2 класы Жытомірскай духоўнай семінарыі. Да 1912 выкладаў у царкоўнапрыходскіх школах Ровенскага пав. Валынскай губ. 3 1921 да 1934 служыў псаломшчыкам у цэрквах на Валыні, Беласточчыне, Гродзеншчыне. У стане цэлібату 25.6.1945 архіепіскапам Мінскім Васіліем (Ратміравым) рукапаложаны ў іерэя і прызначаны настаяцелем Навадворскай царквы Ваўкавыскага благачыння. 18.10.1946 пераведзены на месца памочніка, з 20.5.1950 настаяцеля храма в. Сядзельнікі таго ж благачыння. Арыштаваны 25.9.1951. Асуджаны 18.1.1952 як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў адзін з канцлагераў Іркуцкай вобл. Вызвалены 22.6.1956 пастановай прэзідыума Вярхоўнага савета СССР. Вярнуўся на радзіму. Атрымаў прызначэнне на месца настаяцеля Дзятлавіцкай царквы на Гродзеншчыне, дзе адрамантаваў храм, купіў для прычта дом. 17.10.1957 пераведзены на настаяцельскае месца ў царкву Св. Жанчын Міраносіц в. Калантай (Калантаева) Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. 3 1961 да 1976 служыў настаяцелем ПетраПаўлаўскай царквы в. Волпа Ваўкавыскага рна. Меў высокі аўтарытэт сярод веруючых за бездакорны высокамаральны лад жыцця і дар прапаведніцтва. 3 1976 за штатам па хваробе. Узнагароджаны набедранікам (1946), скуф'ёй (1948), залатым нагрудным крыжам (1957). У 1963 узведзены ў сан протаіерэя. Апошнія гады жыў у Волпе, дзе і памёр. Рэабілітаваны 25.9.1992 Гродзенскім абл. судом. Асабовая справа Я. № п14939 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення, ф. 1, в. 2, с. 44; Черепнца ВЛ. Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 259. Гродно, 2000.

**ЯСІНСКІ (ЯСИНСКИЙ) Аляксандр** [1892 — ?], Свята-р. Беларус. У 1919 пазбаўлены выбарчых правоў. У 1920я г. служыў у Лоеве, цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Рэпрэсаваны ў 1929. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Пажятная КИНжка Мннской губернші; ДА Гомельскай вобл. ф. 509. в. 1. с. 20. л. 24.

**ЯСІНСКІ (ЯСИНСКИЙ) Барыс Аляксандравіч** [1908, в. Астроўкі Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Нясвіжскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. Скончыў 2 курсы багаслоўскага фта Варшаўскага ун-та. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Міхайлаўскай царкве в. Ізабелін, цяпер Ваўкавыскі р-н Гродзенскай вобл. Быў жанаты, меў двое дзяцей. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі, працаваў старшынёй валаснога камітэта Беларускай народнай самапсшачы. Увесну 1943 на пахаванні забітага савецкімі партызанамі Свята-ра М.Белюсціна выступіў з антысавецкай прамовай, заклікаў весці «актыўную барацьбу з ляснымі сталінскімі бандытамі». У ліп. 1944 выехаў з сям'ёй у Ваўкавыск, потым у Варшаву. У студз. 1945 затрыманы каля Варшавы. Дастаўлены ў Гродна. Падчас следства дапытваўся 23 разы, але вінаватым сябе не прызнаў. 26.8.1947 справа адпраўлена на даследванне. Асуджаны 11.12.1947 ваенным трыбуналам тагачаснай Баранавіцкай вобл. як «старшыня антысавецкай арганізацыі БНС» да 10 гадоў ППК і 5 гадоў пазбаўлення правоў. 7.6.1955 тэрмін пакарання зніжаны да 7 гадоў ППК і 2 гадоў пазбаўлення правоў. Вызвалены ў 1954. У пачатку 1990х г. жыў у Мінску. 24.2.1993 пастановай прэзідыума Мінскага гарадскога суда ў рэабілітацыі адмоўлена. Рэабілітаваны 30.12.1993 Вярхоўным судрм Беларусі. Асабовая справа Я. № п20486 захоўваецца ў архіве УКДБ Гродзенскай вобл.

Кр.: НАРБ, ІКБР; БНДЦЭД; Черепнца В.Н. Очеркн нсторнн Православной Церквн на Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 1. С. 259. Гродно, 2000; Яго ж. Очеркн нсторнн Православной Церквн на

Гродненіцнне (с древнейшнх времен до нашнх дней). Ч. 2. Гродно, 2005. С. 247—256.

**ЯСІНСКІ (ЯСИНСКИЙ) Валянцін** [4.3.1890, в. Лучыцы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — 4.3.1938, Мінск, турма НКВД], Свята-р, службовец, сын Міхаіла Аляксандравіча Ясінскага[1], брат Аляксандра, Іосіфа, Мікалая, Міхаіла Ясінскіх і Наталлі ЯсінскайЛукашэвіч. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1912), Петраградскую духоўную акадэмію (1916). У 1930я г. старшы бухгалтар «Галоўлесхімзабеспячэння». Арыштаваны 31.10.1937 у Мінску па адрасе: вул. Сухая, д. 28, кв. 1. Асуджаны 15.2.1938 за «шпіёнскую дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны пракуратурай БВА 30.4.1989. Асабовая справа Я. № 24480с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. Кр.: Памятная кныжка Мннской губерніш; Памятная КИНжка Мннской епархіш; НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; Рэпрэсаваныя...

**ЯСІНСКІ (ЯСИНСКИЙ) Іосіф Міхайлавіч** [1888, в. Лучыцы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — ?], протаіерэй. Брат Аляксандра, Валянціна, Мікапая, Міхаіла Ясінскіх і Наталлі ЯсінскайЛукашэвіч. Беларус. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1912 змяніў бацьку на пасадзе настаяцеля Пакроўскай царквы в. Волма Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Чэрвеньскі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 18.2.1930. Асуджаны 18.3.1930 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 28.4.1989 пракуратурай БССР. Асабовая справа Я. № 22766с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

5.1.1933 у в. Волма арыштавана маці траіх дзяцей Наталля Міхайлаўна ЯсінскаяЛукашэвіч (н. ў 1892 у в. Лучыцы), сястраАляксандра, Валянціна, Іосіфа, Мікалая і Міхаіла Ясінскіх. 14.1.1933 калегіяй АДПУ асуджана за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі.

Далейшы яе лёс невядомы. Рэабілітавана 31.1.1959 прэзідыумам Мінскага абл. суда. Яе асабовая справа № 13787с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

16.3.1933 у в. Рачэнь Любанскага р-на Мінскай вобл. арыпггаваны загадчык Рачэнскай амбулаторыі (?) Ясінскі Аляксандр Міхайлавіч (н. 4.3.1895 у в. Лучыцы; атрымаў вышэйшую медыцынскую адукацыю), брат Валянціна, Іосіфа, Мікалая, Міхаіла Ясінскіх і Наталлі ЯсінскайЛукашэвіч. 17.5.1933 асуджаны за «антысавецкую дзейнасць» і як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы яго лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Мінскай вобл. 31.5.1989. Асабовая справа Я.

№ 23087с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі. 19.11.1937 у Багушэўску (з 1938 г.п. Сенненскага р-на Віцебскай вобл.) арыштаваны настаўнік Багушэўскай чыгуначнай школы, бацька дваіх дзяцей Ясінскі Міхаіл Міхайлавіч (н. ў 1897 у в. Лучыцы; скончыў Мінскую духоўную семінарыю), брат Аляксандра, Валянціна, Іосіфа, Мікалая Ясінскіх і Наталлі ЯсінскайЛукаІнэвіч. 29.11.1937 тройкай НКВД СССР асуджаны як «агент польскіх разведвальных органаў» да ВМП і 21.12.1937 расстраляны ў Аршанскай турме НКВД. Рэабілітаваны пракурорам БВА 9.10.1989. Асабовая справа Я. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67; НАРБ, ІКБР; Рэпрэсаваныя...

**ЯСІНСКІ (ЯСИНСКИЙ) Мікалай Міхайлавіч** [1884, в. Лучыцы Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер Петрыкаўскі р-н Гомельскай вобл. — 22.9.1948, ГУЛАГ], брат Аляксандра, Валянціна, Іосіфа, Міхаіла Ясінскіх і Наталлі ЯсінскайЛукашэвіч. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, рукапаложаны ў іерэя. У 1920 г. настаяцель Успенскай царквы в. Забелы, цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. Быў жанаты, меў трое дзяцей. Арыштаваны 10.2.1933. Асуджаны 9.6.1933 калегіяй АДПУ як «член контррэвалюцыйнай арганізацыі» і за «антысавецкую агітацыю» да 5 гадоў ППК (заменены на 5 гадоў высылкі).

Пасля вызвалення вярнуўся на радзіму. Падчас 2й сусветнай вайны служыў настаяцелем у ПетраПаўлаўскім (Екацярынінскім) саборы ў Мінску на Нямізе, потым пры царкве св. Сафіі ў Бабруйску. Выдаваў газ. «Церковный благовест», заснаваў спецыяльны фонд для падтрымкі сем'яў Свята-роў, рэпрэсаваных савецкай уладай. Зноў арыштаваны 22.7.1944 у Мінску па адрасе: вул. Астроўскага, д. 8, кв. 5. Прыгавораны 4.7.1945 з дыяканам Мікалаем Драгуном паводле пастановы калегіі НКВД за «супрацоўніцтва з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі» і за «антысавецкую дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні. Па першай справе (№ 35599с; захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі) рэабілітаваны 27.1.1994 пракуратурай Беларусі, па другой (групавая, № 27605с) 17.7.1989.

6.4.1949 у Мінску па адрасе: вул. Мяснікова, д. 91, кв. 1 арыштаваны таваразнаўца Галоўгандлю БССР Усевалад Мікалаевіч Ясінскі (н. ў 1923 у Еўпаторыі Крымскай вобл., цяпер Украіна), верагодна, сын Мікалая Ясінскага. 31.8.1949 асуджаны за «сувязь з органамі германскай разведкі» да 10 гадоў ППК і этапаваны ў Сцяпны канцлагер МДБ Карагандзінскай вобл. Казахскай ССР (пас. Джэзказган). Вызвалены 29.7.1954. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.8.1992 пракуратурай Беларусі. Асабовая справа Я. № 34578с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: НГАБ, ф. 2786, в. 1, с. 67.

**ЯСТРАБАЎ (ЯСТРЕБОВ) Ілья. Гл.: ІНАКЕНЦІЙ (ЯСТРАБАЎ).**

**ЯХНЕВІЧ (ЯХНЕВИЧ) Аляксандр** [1874, мяст. Грозаў Слуцкага пав. Мінскай. губ., цяпер в. Грозаў (Грозава) Капыльскага р-на Мінскай вобл. — ?], протаіерэй. Сын Пятра Яхневіча[1]. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1894), служыў псаломшчыкам у РаствaБагародзіцкім храме в. Літвяны Мінскага пав., цяпер Уздзенскі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя. З 1905 настаяцель Мікалаеўскай царквы в. Любязь Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер

тэрыторыя Украіны. Падчас арышту настаяцель Мікалаеўскага храма ў пас. Козырава (цяпер у межах Мінска). Арыштаваны ў крас. 1933 у Мінску па адрасе: пас. Козырава, Пушкінскі зав., д. 5. Асуджаны 7.6.1933 з інш. свяшчэннаслужыцелямі і манахінямі Мінскай епархіі асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў ППК. Дапейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.6.1989 пракуратурай БССР. Групавая справа Я. і інш. № 24819с захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

30.7.1938 у Мінску па адрасе: вул. Камсамольская, д. 56, кв. 2 арыштаваны бухгалтар Інстытута Прамысловасці Яхневіч Міхаіл Пятровіч (н. ў 1880 у мяст. Грозаў; скончыў Мінскую духоўную семінарыю), брат Аляксандра Яхневіча. 1.11.1938 тройкай НКВД асуджаны як «агент польскай разведкі» да 10 гадоў ППК і этапаваны ў Цемнікаўскі канцлагер НКВД Мардоўскай АССР. Загінуў у зняволенні 23.4.1940. Рэабілітаваны 26.2.1959 трыбуналам БВА. Асабовая справа Я. № 13869с з фотаздымкам захоўваецца ў архіве КДБ Беларусі.

Кр.: Опнсанне церквей н прнходов Мннской епархіш; Памят ная КИНжка Мннской губерніш; Памятная КИНжка Мннской епархіш; Лнчный состав епархнального управлення.

**ЯЦКЕВІЧ (ЯЦКЕВИЧ) Васіль Вікенцевіч** [1903, в. Восава (?) Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. — ?], стараста адной з Аршанскіх цэркваў. Беларус. З сялянскай сям'і. Падчас арышту працаваў на Аршанскай чыгуначнай станцыі. Быў жанаты, гадаваў дзіця. Арыштаваны 9.3.1932 у Оршы Віцебскай вобл. Асуджаны 13.4.1932 асобай нарадай пры АДПУ за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў высылкі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 30.11.1989 пракуратурай Віцебскай вобл. Асабовая справа Я. № 20433п захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Верагодна, рэпрэсаваны і сваякі Я.

## ДАДАТАК

**АБУХОЎСКІ (ОБУХОВСКИЙ) Сергій Андрэевіч** [1882, Гродзенская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны ў с. Гарадок ПаўлаваПасадскага р-на Маскоўскай вобл. Асуджаны. Мера пакарання і далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**АЗАРОНАК (АЗАРЕНОК) Дзімітрый Цітавіч** [1884, в. Грышаны Аршанскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Аршанскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Арыштаваны 8.9.1930 у с. Віцім Ленскага р-на Якуцкай АССР. Асуджаны калегіяй АДПУ 3.1.1931 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 23.6.1989 пркуратурай Якуцкай АССР.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**АЛІПІЙ АНДРАЮК** [1868, Гродзенская губ. — ?], архімандрыт. Да арышту настаяцель Невельскага Свята-Троіцкага манастара. Арыштаваны 6.4.1931. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 18.10.1991. Асабовая справа А. № АА7368 захоўваецца ў архіве ФСБ РФ.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**АЛЯКСАНДРАВА (АЛЕКСАНДРОВА) Марыя Аляксандраўна** [1878, Віцебская губ. — ?], царкоўная вартаўніца. Арыштавана 23.3.1931 у в. Зарэчча Невельскага р-на Пскоўскай вобл. Асуджана не была. 13.7.1931 справа спынена, а А. вызвалена і рэабілітавана. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову

в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**АНДАРАЛ (АНДОРАЛ) Іаан Іванавіч** [1880, Полацк Віцебскай губ., цяпер рай-цэнтр Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 20.2.1933 у в. Салдаманава Лукаянаўскага рна. Асуджаны калегіяй АДПУ 25.3.1933 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Вызвалены датэрмінова зза хваробы. У 1932 высланы на 3 гады ў СярэднеВолжскі край. Пасля вызвалення вярнуўся ў в. Салдаманава. Зноў арыштаваны 24.4.1935 і прыгавораны 14.8.1935 за тое ж «злачынства» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: КИНга памятп жертв полнтпческнх реіресспй в Ннжегородской областн.

**АНДРАЮК (АНДРЕЮК) Аліпій. Гл.: АЛІПІЙ АНДРАЮК.**

**АНТОНАВА (АНТОНОВА) Ксенія Кірылаўна. Гл.: СЕРАФІМА АНТОНАВА.**

**АНТОНАВА (АНТОНОВА) Марыя Кірылаўна. Гл.: АРСЕНІЯ АНТОНАВА.**

**АРСЕНІЯ АНТОНАВА (АНТОНОВА**) [Марыя Кірылаўна; 1874, Віцебская губ. — ?], манахіня, сястра Серафімы Антонавай. 3 1900 паслушніца Сурскага ІаанаБагаслоўскага манастыра (цяпер Архангельская вобл.). Прыняла манашаскі пострыг. Пасля закрыцця манастыра жыла на яго тэрыторыі. Удзельнічала ў тайных богаслужэннях. Арыштавана 16.11.1941. Асуджана асобай нарадай пры НКВД 27.5.1942 за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Комі АССР. Вызвалена ў 1946. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 10.4.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк.

Архангельск, 2006.

**АЎСЯНКА (ОВСЯНКО) Аляксандр Іванавіч** [1878, Віцебская губ. — 1936, НКВД], Свята-р. Арыштаваны 29.4.1936 у в. Сафронава Вялікалукскага рна. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі і прапаганды». 1.8.1936 справа спынена, А. вызвалены і рэабілітаваны.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**БАБОЎСКІ (БАБОВСКИЙ) Сцяфан Іванавіч** [1874, Гродна — 16.1.1938, турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны і асуджаны асобай нарадай пры НКВД да ВМП у 1938. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**БАЛБУЦКІ (БАЛБУЦКИЙ) Васілій Савіч** [1880 ці 1883, мяст. Тураў (?) Мазырскага пав. Мінскай губ., цяпер г.п. Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. — 27.10.1937, ГУЛАГ], Свята-р, служыў у адным з храмаў Мінскай ці Магілёўскай епархій. У 1929 арыштаваны з сынам Леанідам (н. ў 1914) і этапаваны ў Нарымскі край. Маёмасць сям'і канфіскавана. У 1935 зноў арыштаваны і высланы (таксама з сынам) у Паўночны край (спецпас. Шабунь Вінаградскага рна). У трэці раз арыштаваны 28.9.1937. Прыгавораны 23.10.1937 тройкай НКВД Паўночнай вобл. як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі царкоўнікаў» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 18.7.1958.

Сын Свята-ра чарговы раз арыштаваны 27.8.1941. Асуджаны 20.6.1942 асобай нарадай НКВД за «сістэматычную антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Загінуў у зняволенні 24.6.1942. Рэабілітаваны 17.10.1989.

Кр.: ПоморсКИЙ Меморнал: КИНга памятн жертв полнтнческнх репресснй. Архангельск, 1999. У 3х т. Т. 1; За

веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006; Мір://уІ82.п1г.пІ.

**БЕЙЦУК (БЯЙЦУК) Зінаіда Раманаўна** [1899, в. Мазанава Гродзенскай губ. — ?], манахіня. Арыштавана ў Казельску Калужскай вобл. Асуджана калегіяй АДПУ 27.11.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**БЕХАЎ (БЕХОВ) Ільья Якаўлевіч** [1877, в. Яконы (?) Чавускага пав. Магілёўскай губ. — ?], царкоўны стараста. Арыштаваны 26.3.1948 у Томску. Асуджаны асобай нарадай пры МДБ 30.7.1948 як «удзельнік контррэвалюцыйнай манархісцкай царкоўнай арганізацыі» да 9 гадоў ППК і 4 гадоў пазбаўлення правоў. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны ў верас. 1962.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**БРЫЛЬ (БРИЛЬ) Ігнацій Антонавіч** [20.12.1900 (2.1.1901), в. Загор'е Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 16.4.1960, Алапаеўск, Свярдлоўская вобл., Расія], протаіерэй, брат Уладзіміра Брыля і Народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля. Беларус. З сям'і чыгуначніка. Скончыў Загорскую царкоўна-прыходскую школу, Мірскае гарадское вучылішча, Адэскую класічную гімназію, 2 курсы Адэскага сельскагаспадарчага інстытута, Адэскую духоўную семінарыю (1922; экстэрнам). Некаторы час выкладаў у бел. школе ў Адэсе. Рукапаложаны ў іерэя. Прызначаны настаяцелем царквы в. Візірка каля Адэсы. Ажаніўся з Верай Раманаўнай Лейка (1901—82), гадаваў сына Аляксанлра. Арыштаваны 31.10.1931. Асуджаны калегіяй АДПУ да 5 (?) гадоў ППК. Этапаваны ў Сібірскі канцлагер

АДПУ (Марыінск Кемераўскай вобл., Расія). Праз некаторы час пераведзены ў Беламорска-Балтыйскі канцлагер АДПУ Карэла-Фінскай АССР. Вызвалены ў 1933 датэрмінова. Спрабаваў вярнуцца да Свята-рскага служэння, але атрымаў папярэджанне ад органаў Дзяржбяспекі. Выехаў на Урал да сябра, які ў зняволенні выратаваў яму жыццё, — Аляксандра Пятровіча Увядзенскага. Выкладаў рускую мову і літаратуру на рабфаку Ветэрынарнага інстытута ў Троіцку. У 1938 да Б. прыехалі жонка і сын. У 1947 звольніўся з працы. Зноў пачаў служыць Свята-ром, спачатку ў храме Златауста Чалябінскай вобл., з 27.2.1958 у Алапаеўску. Завочна скончыў Ленінградскую духоўную акадэмію. Узнагароджаны санам протаіерэя. Пахаваны ля Алапаеўскага храма. Пакінуў паэтычную спадчыну (пакуль не друкавалася). Рэабілітаваны.

Кр.: З асабістага архіва Таццяны Аляксандраўны Лейка[1].

**БЯЗМЕНАВА (БЯЗМЕН) (БЕЗМЕНОВА, БЕЗМЕН) Алена Фамінічна. Гл.: ЕПІФАНІЯ БЯЗМЕНАВА (БЯЗМЕН).**

**БЯЛЯЕЎ (БЕЛЯЕВ) Дзімітрый Іванавіч** [1884, Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны ў пас. Суражаўка Амурскай вобл. Асуджаны калегіяй пры АДПУ 17.2.1928 да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Сібір. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**БЯРОЗАЎ (БЕРАЗОЎ) (БЕРЕЗОВ) Іакаў Калістратавіч** [1872, в. Барскае Валынскай губ., цяпер Украіна — ?], Свята-р. Служыў у адным з храмаў Магілёўскай епархіі. Арыштаваны і 16.9.1926 асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Паўночны край (Вельск). Зноў арыштаваны 5.8.1937. Прыгавораны да 10 гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаПячорскі канцлагер НКВД Комі АССР. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 15.9.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н

мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ВАСІЛЕНКА (ВАСИЛЕНКО) Леанід Віктаравіч** [1899, Віцебск — ?], Свята-р. Арыштаваны 13.2.1930 у в. Аполле Касплянскага р-на Смаленскай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 21.4.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 9.9.1959.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ВАСІЛЬЕЎ (ВАСИЛЬЕВ) Фёдар Сямёнавіч** [1870, Мінская губ. — ?], царкоўны стараста. Арыштаваны 3.4.1929 ва Уладзівастоку. Асуджаны калегіяй АДПУ 7.6.1929 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 26.7.1990.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**ВІГУРА (ВИГУРО) Цімафей Міхайлавіч** [1876, в. Пірагова Магілёўскай губ., цяпер Мсціслаўскі р-н Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 14.2.1930 у в. Пскі Шымскага р-на Наўгародскай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 11.3.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: КИНга памятн жертв полнтыческнх репрессый в Ннжегородской областп; Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**ВІЦЮГОЎ (ВИТЮГОВ) Сямён Мацвеевіч** [1874, Магілёўская губ. — ?], псаломшчык. Арыштаваны 28.11.1937 у с. Усцьянск Абанскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 9.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 8 гадоў ППК.

Kamunikat.org

Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ВОЛКАЎ (ВОЛКОВ) Іаан Фёдаравіч** [1882, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 27.9.1937 у в. Пясчанка Пустошкінскага р-на Пскоўскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 27.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.3.1999.

Кр.: ПсковсКИЙ сннoднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяiценноцерковнослужнтелей, монашествуюiцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ВЯНСЯЦКІ (ВЕНСЯЦКИЙ) Лука Міхайлавіч** (Мінеевіч) [31.10.1879, в. Завідаўка Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. — пасля 1954, в. Абакумава Петушынскага р-на Уладзімірскай вобл., Расія], протаіерэй. 3 сям'і псаломшчыка Успенскай царквы в. Завідаўка. Скончыў Пінскае духоўнае вучылішча (1897), духоўную семінарыю (?). Працаваў настаўнікам у мяст. Чачэрск Рагачоўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Гомельскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1905). Прызначаны настаяцелем Свята-Дзімітрыеўскай царквы в. Выдранка Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Краснапольскі р-н Магілёўскай вобл., адначасова быў загадчыкам і выкладчыкам царкоўнапрыходскай школы. 31912—13 служыў у Свята-Троіцкім храме в. Батунь Магілёўскага пав., цяпер Магілёўскі рн. У 1921 пераведзены ў Свята-Троіцкую царкву в. Конева Сенненскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Сенненскі р-н Віцебскай вобл. 3 1930 служыў ва Успенскім кафедральным саборы ў Невелі, цяпер Пскоўская вобл., Расія, благачынны Невельскай акругі. Арыштаваны ў 1934. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі». Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Паўночны край (Архангельск). Без дазволу ўладаў служыў у Кузнячэўскай і Саламбольскай могілкавых

цэрквах і ў хатах вернікаў. Зноў арыштаваны 14.6.1938. Прыгавораны 22.6.1940 асобай нарадай НКВД як «удзельнік контррэвалюцыйнай групы царкоўнікаў» да 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Вызвалены ў 1943. Працаваў рахункаводам у калгасе імя Молатава, бухгалтарам у Бірулюскай раённай лясной гаспадарцы Краснаярскага краю. 3 лют. 1946 жыў у Аляксандраве Уладзімірскай вобл. 8.4.1947 прызначаны настаяцелем царквы в. Горкі Камешкаўскага р-на той жа вобл. 3 5.4.1949 служыў у храме в. Абакумава таго ж рна. 26.2.1954 звольнены за штат.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губерннн; Ыір://ІшгІ.рзіЫ.ссаз.т; За Хрнста пострадавшне в земле Владнмнрской: Снноднк н бнографнчесКИЙ справочннк. Александров, 2000; За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюшне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ГАБРЫЯННІК (ГАБРИНЯННИК) Аляксій Іванавіч** [1895, в. Манчыцы Ваўкавыскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Свіслацкі р-н Гродзенскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Атрымаў вышэйшую адукацыю. Паводле некаторых звестак першы раз арыштаваны ў 1928 і прыгавораны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Зноў арыштаваны 18.3.1933 у Паўлаўску ЦэнтральнаЧарназёмнай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 9.7.1933 як «удзельнік контррэвапюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 2 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны пракуратурай Варонежскай вобл. 30.9.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ГАЛЬЧЭНЯ (ГАЛЬЧЕНЯ) Якім Філіпавіч** [1884, в. Пласток Бабруйскага пав. Мінскай губ., цяпер Любанскі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. 3 сялянскай сям'і. У 1920я г. царкоўны староста, верагодна, РаствaБагародзіцкай царквы в. Асавец (тагачасны паштовы адрас: ст. Любань). У

першай палове 1930х г. працаваў у калгасе «Нскра» Любанскага рна. З жонкай Ксеніяй Іванаўнай гадаваў дочак Антаніну (н. ў 1925), Вольгу (1935), сыноў Аркадзя (1930), Уладзіміра (1928), Яўгена (1932). Арыштаваны і 30.7.1935 асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да пазбаўлення волі (тэрмін невядомы). Этапаваны (з сям'ёй) у Паўночны край (спецпас. Зара, Рожава і інш. Халмагорскага рна). Зноў арыштаваны 16.8.1937. Прыгавораны 7.10.1937 за «антысавецкую агітацыю сярод зняволеных» і як «удзельнік контррэвалюцыйнай групы царкоўнікаў» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Па першай справе (№ 5932) рэабілітаваны пракуратурай Беларусі 5.10.1992, па другой (№ 38621) УУС Архангельскай вобл. 27.3.1958.

Жонка Якіма Гальчэні загінула ў зняволенні 3.7.1942. Дачка Вольга памерла ў ссылцы. Сын Яўген 18.2.1939 змешчаны ў дзіцячы дом.

Кр.: БНДЦЭД; НАРБ, ІКБР; За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ГАНЧАРОЎ (ГОНЧАРОВ) Фёдар Мікалаевіч** [1880, Мінская ці Віцебская губ. (?) — ?], Свята-р. З сялянскай сям'і. Арыштаваны 8.8.1937 у в. Лакушы Пустошкінскага р-на Пскоўскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 20.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.10.1999.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ГАРБАРУК Аляксей Міхайлавіч** [1878, Гродзенскай губ. — 19.9.1937, турма НКВД], царкоўны стараста. Арыштаваны 28.7.1937. Асуджаны асобай нарадай пры

НКВД 20.8.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.5.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ГАРДЗЕЙЧУК (ГОРДЕЙЧУК) Кандрат Васілевіч** [1879, Мінская губ. (?) — 1937 (?), турма НКВД], псаломшчык. Арыштаваны 6.11.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 18.11.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

ГАРДЗІЛОЎСКІ (ГРАДЗІЛОЎСКІ) (ГОРДИЛОВСКИЙ, ГРАДИЛОВСКИЙ) Ульян Васілевіч [1896 — ?], дыякан. Беларус. Арыштаваны 7.7.1930. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да 8 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 12.9.1975.

Кр.: КИНга памятн жертв полшгшческнх репресснй Республнкн Башкортостан; Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе шд. М., 2004.

ГРАНКОЎ (ГРАНКОВ) Цімафей Давыдавіч [1878, Магілёўская губ. — 1937, турма НКВД], царкоўны стараста. Арыштаваны ў с. Аляксандраўка НіжнеІнгашскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 17.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 29.12.1956.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ГРЫНКЕВІЧ (ГРИНКЕВИЧ) Карнілій Фролавіч** [1871, Гродзенская губ. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны ў с. Тапарніно Мікалаеўскага р-на Ульянаўскай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 8.7.1931 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Паўночны край. Далейшы

лёс невядомы. Рэабілітаваны ў маі 1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**ДАНІЛАВА (ДАНИЛОВА) Аляксандра Данілаўна** [1884, Віцебская губ. — ?]. У 1907—19 паслушніца Сурскага ІаанаБагаслоўскага манастыра. Пасля закрыцця манастыра жыла на яго тэрыторыі, пасля ў в. Сура Шнежскага рна. Арыштавана 16.11.1941. Асуджана асобай нарадай пры НКВД 27.5.1942 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Вызвалена 25.4.1944. Дапейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 10.4.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ДАНІЛЬЧУК (ДАНИЛЬЧУК) Леў Акімавіч** [1870, в. Дабранеж (?) Гродзенскай губ. — ?], царкоўны староста. Арыштаваны 23.10.1930 у Есентуках Стаўрапольскага краю. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**ДЗЯМЕНЦЕЎ (ДЕМЕНТЕВ) Мікалай Іванавіч** [1890, Мінская (?) губ. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны 19.11.1937 у с. Берута Новаржэўскага р-на Пскоўскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 5.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 16.1.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ДРАЛАЎ (ДРАЛОВ) Васілій Сямёнавіч** [1872, Магілёўская (?) губ. — 1937 (?), турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 10.3.1937 у Белгарадзе. Асуджаны асобай

нарадай пры НКВД 4.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны ў маі 1990.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ДУБРОЎСКАЯ (ДУБРОВСКАЯ) Анна Лаўрэнцеўна** [1904, Быхаў Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], манахіня. Арыштавана ў Казёльску Калужскай вобл. Асуджана калегіяй АДПУ 27.11.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**ЕКАЦЯРЫНА КАТКО (КАШКО)** [1867, Невель Віцебскай губ., цяпер Пскоўская вобл. — ?], ігуменння Полацкага манастыра. Арыштавана 19.3.1931 у г. Тарапец. Асуджана калегіяй АДПУ як «удзельніца контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 18.10.1991.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ЕЛЯНЕЎСКІ (ЕЛЕНЕВСКИЙ) Уладзімір** [7.6.1872 ці 7.6.1874, в. Плоскае Веліжскага пав. Віцебскай губ., цяпер Смаленская вобл., Расія — 8.4.1954, Віцебск], праваабаронца. Беларус. Сын протаіерэя Мікалая Елянеўскага[1]. Скончыў Віцебскае духоўнае вучылішча (1890), Віцебскую духоўную семінарыю (1896), Імператарскі Юр'еўскі унт (1904) (цяпер у Тарту, Эстонія). Працаваў следчым Віцебскага акруговага суда ў Дзвінску Віцебскай губ. (цяпер Даўгапілс, Латвія) і Дрысе Віцебскай губ. (з 1962 Верхнядзвінск Віцебскай вобл.). Ажаніўся з Верай Віктараўнай, гадаваў сына і дзвюх дачок. У 1917 у сувязі з

набліжэннем лініі фронта пераехаў з сям'ёй у Віцебск. Вярнуўся на пасаду следчага Віцебскага акруговага суда. Жонка Е. ўладкавалася настаўніцай у школу № 28 першай ступені. У 1919 выбраны ў епархіяльнае ўпраўленне ПолацкаВіцебскай епархіі. Пасля яго закрыцця (1921) служыў у Віцебскай гарадской управе, потым следчымінструктарам губернскага крымінальнага вышуку. Арыштаваны і 9.9.1922 прыгавораны да года зняволення. Жонку Е. асудзілі на той жа тэрмін (умоўна). Неўзабаве пасля прысуду яна памерла. 29.11.1922 Е. быў вызвалены датэрмінова. Да 1.10.1925 — народны следчы Віцебскага павятовага бюро юстыцыі. Пасля звальнення спрабаваў уладкавацца (лют. 1926) у органы юстыцыі Крыма, але беспаспяхова. Займаўся прыватнай юрыдычнай дзейнасцю. У 1926 зноў выбраны ў епархіяльны савет ПолацкаВіцебскай епархіі. Паўторна арыштаваны 1.6.1931 у Віцебску па адрасе: вул. 1я Ветраная, д. 25. Пад следствам знаходзіўся ў Віцебскай унутранай турме АДПУ. Абвінавачваўся ў «правядзенні антысавецкай агітацыі» і ва «ўдзеле ў групе «ІсцінаПраваслаўная Царква». 14.7.1932 пастановай калегіі АДПУ вызвалены зпад аховы, але пазбаўлены правоў жыць у 12 вызначаных месцах і на Урале. Высланы ў Арлоўскую вобл. Вызвалены ў 1934. Вярнуўся у Віцебск. Падчас 2й сусветнай вайны заставаўся на акупаванай тэрыторыі. Выбраны членам акруговага благачыннага ўпраўлення, выкладаў на пастырскіх курсах пры ПолацкаВіцебскай епархіі. У пасляваенны час па просьбе мітрапаліта Мінскага і Беларускага Піцірыма (Свірыдава) напісаў нарыс па гісторыі Віцебскай епархіі 1920—30х г. Рэабілітаваны пракуратурай Віцебскай вобл. 12.9.1989. Асабовая справа Е. захоўваецца ў архіве УКДБ Віцебскай вобл.

Кр.: БНДЦЭД; ллг.реіегеп.сот; Преображенне. № 11 (150), ноябрь, 2006.

**ЕПІФАНІЯ БЯЗМЕНАВА (БЯЗМЕН) (БЕЗМЕНОВА, БЕЗМЕН)** [Алена Фамінічна; 1884, Віцебская губ. — 15.6.1942, ГУЛАГ]. У 1901—20 паслушніца Сурскага

ІаанаБагаслоўскага манастыра. Пасля закрыцця манастыра жыла на яго тэрыторыі, пасля ў в. Сура Шнежскага рна. Арыштавана 17.11.1941. Асуджана 27.5.1942 асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Этапавана ў Комі АССР. Загінула ў зняволенні. Рэабілітавана 10.4.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ЖУКОЎСКІ (ЖУКОВСКИЙ) Сцяфан Якаўлевіч** [1870, Магілёўская губ. — 1931 (?), турма АДПУ], псаломшчык. Беларус. Арыштаваны ў с. Ачуры Бейскага р-на Хакаскай аўтаномнай вобл. Краснаярскага краю. Асуджаны калегіяй АДПУ 7.7.1931 як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 13.3.1965 Краснаярскім краявым судом.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**ЖУРКО Сцяфан Іванавіч** [1893, в. Гомецы (Голіцы) (?) Гродзенскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 10.9.1937 у с. НоваГрыгор'еўскае Стаўрапольскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ЗАЛЕСКІ (ЗАЛЕССКИЙ) Аляксандр Мартынавіч** [1894 — 1934]. З сялянскай сям'і. З 1915 служыў псаломшчыкам ва Успенскай царкве в. Грэбень Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Пухавіцкі р-н Мінскай вобл. Рукапаложаны ў дыякана (1919). Пераведзены ва Успенскі храм у мяст. Дукора Ігуменскага пав., цяпер вёска Пухавіцкага рна. З 1925 служыў у КасмаДаміянаўскай царкве в. Выдрыца Барысаўскага р-на Мінскай вобл. Рукапаложаны ў іерэя (1931). Арыштаваны і высланы за межы БССР. Загінуў у

зняволенні.

Жонка Свята-ра Наталля Адамаўна (н. ў 1894) жыла ў 1970я г. ў Мінску. Памерла ў 1979.

**ЗАРЭЦКАЯ (ЗАРЕЦКАЯ) Елена Андрэеўна** [1875, Гродзенская губ. — 1938, турма НКВД], манахіня. Арыштавана 27.2.1938 у Ноўгарадзе. Асуджана асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**ЗЕЛЯНКОЎ (ЗЕЛЕНКОВ) Логвін Лявонавіч** [1886, в. Жгунская Буда Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Добрушскі р-н Гомельскай вобл. — 31.12.1937, ГУЛАГ]. 3 сялянскай сям'і. Актыўны прыхаджанін аднаго з храмаў Гомельскага пав. Арыштаваны 23.12.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 2.1.1933 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Этапаваны ў Варкуцінскі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. і Комі АССР. Прымаў удзел у тайных богаслужэннях, арганізаваных святарам Аляксандрам Макаравічам Пратасавым[1]. Узяты пад варту і 29.9.1937 тройкай НКВД Паўночнага краю прыгавораны да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 22.11.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ЗЫКАЎ (ЗЫКОВ) Іосіф Сямёнавіч** [1869, мяст. Прапойск Быхаўскага пав. Магілеўскай губ., цяпер г. Слаўгарад Магілёўскай вобл. — 20.11.1937, турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 14.9.1937 у Лыскава Ніжагародскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД як «удзельнік контррэвалюцыйнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ІАКАЎ ЛІЁРКА (ЛИОРКО)** [1875, Віцебск — 1938], манах. Перад арыштам служыў псаломшчыкам у Спаса-Праабражэнскім храме в. Грывы Астроўскага рна. Як служыцель рэлігійнага культу пазбаўлены выбарчых правоў. Арыштаваны 12.3.1938. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 22.4.1938 як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 9.7.1958.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодпк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ІАНІКІЯ ШАПКІНА (ШАПКИНА)** [1863, Полацк Віцебскай губ. — 23.8.1937, Цвярская вобл., турма НКВД], манахіня. З духоўнага саслоўя. У 1880 паступіла ў Пакроўскі Вярбілаўскі жаночы манастыр, у якім падвізалася болын за 40 гадоў. Арыштавана ў 1931. Асуджана калегіяй АДПУ як «удзельніца контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да высылкі з памежнай тэрыторыі. Зноў арыштавана 12.8.1937. Прыгаворана 21.8.1937 тройкай НКВД Калінінскай вобл. да ВМП. Расстраляна з шэрагам свяшчэнна і царкоўнаслужыцелей. Рэабілітавана 22.9.1989.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодпк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх II мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ІВАНОЎ-БЯЗЗУБАЎ (ИВАНОВ-БЕЗЗУБОВ) Марцініян Іванавіч** [1872, Віцебская губ. — 1937, турма НКВД], Святар. Арыштаваны 24.10.1937 у г. Старая Руса Ноўгарадскай вобл. Асуджаны да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004. , •

**КАВЯРА (КОВЯРО) Аляксандр Мікалаевіч** [1895 — ?], псаломшчык. Беларус. Арыштаваны 8.12.1937 у с. Налючы

Дзямянскага р-на Наўгародскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**КАЛАДКО (КАЛОДКА) (КОЛОДКО) Антоній Антонавіч** [1882, мяст. Хораш Беластоцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Полынча — 11.12.1937, турма НКВД], Свята-р. Беларус. У 1929 прыгавораны за «антысавецкую агітацыю» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Зноў арыштаваны 10.11.1937 у в. Мярлінаўка Лукаянаўскага рна. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 20.11.1937 за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Кнша памятн жертв полнтнческнх репресспй в Ннжегородской областн; Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**КАНАРСКІ (КАНАРСКИЙ) Сямён Ігнатавіч. Гл.: СІМЯОН КАНАРСКІ**.

**КАНДРАЦЕНКА (КОНДРАТЕНКО) Іван Паўлавіч** [1867, Магілёўская губ. — ?], псаломшчык. Арыштаваны 25.11.1937 у с. Астаф'еўка Партызанскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 9.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду». Мера пакарання і далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск.

Зензд. М., 2004. ...

**КАРАЛЁЎ (КОРОЛЕВ) Кузыма Пятровіч** [1879, Магілёўская губ. — 3.11.1937, турма НКВД], псаломшчык. Беларус. Арыштаваны 9.9.1937 у с. Ніжняя Паліваха Краюшкінскага р-на Алтайскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 29.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 24.5.1989 пракуратурай Алтайскага краю.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**КАРВЕЦКІ (КАРВЕЦКИЙ) Пётр Мікалаевіч** [1892, Мінская ці Віцебская губ. (?) — ?], Свята-р. Арыштаваны 27.12.1937 у Невелі. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 21.3.1938 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 6.2.1958.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свягценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**КАРЭЙША (КОРЕЙШО) Фоцій Антонавіч** [1862 ці 1865, Вільня — ?], протаіерэй. Сын дыякана. Скончыў духоўную семінарыю (1899—1900). Служыў псаломшчыкам у храме пры Віцебскім шпіталі. Потым інспектар царкоўнапрыходскіх школ Вільні. З 1915 законанастаўнік аднаго з рэальных вучылішч Віцебскай губ. З 1917 настаяцель Казанскага Георгіеўскага храма, адначасова выкладаў у школах горада 1й і 2й ступеняў. Арыштаваны 25.5.1929. Асуджаны калегіяй АДПУ 20.11.1929 за «контррэвалюцыйную агітацыю» і як «арганізатар выступленняў супраць закрыцця цэркваў» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Сольвычагодскі (?) канцлагер АДПУ. 13.1.1931 узяты пад варту і прыгавораны да 8 месяцаў штрафнога ізалятара. Далейшы лес невядомы. Рэабілітаваны 26.7.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951) БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**КАТКО (КАШКО) (КОТКО, КОШКО) Екацярына. Гл.: ЕКАЦЯРЫНА КАТКО.**

**КІРЫЛ ПІЛЮГА [**Кірыл Георгіевіч; 1876, в. Пятровічы Ігуменскага пав. Мінскай губ., цяпер Смалявіцкі р-н Мінскай вобл. — ?], схіархімандрыт. У 1894—1904

паслушнік Сяндзебскай Успенскай пустыні Аланецкага пав. Аланецкай губ. У 1904—13 паслушнік АляксандраСвірскага манастыра таго ж пав. Прыняў манашаскі пострыг з імем Трыфан. З 1914 паслушнік Каргапольскага Спаса-Праабражэнскага манастыра. Рукапаложаны ў іерадыякана, потым іераманаха. З 1916 настаяцель КірылаЧалмагорскай пустыні Каргапольскага пав. Быў яе ігуменам да закрыцця. Узведзены ў сан архімандрыта. У 1928 прыняў схіму з імем Кірыл. Арыштаваны 1.9.1932. Асуджаны калегіяй АДПУ 26.11.1932 як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 8 гадоў ППК. Этапаваны ва УхтаПячорскі канцлагер АДПУ Комі АССР. 4.9.1937 узяты пад варту. 29.9.1937 прыгавораны за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 8.8.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репрессннрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**КІРЭЙ (КИРЕЙ) Міхаліна Грыгор'еўна** [1863, Мінская губ. — ?], манахіня. Першы раз арыштавана і асуджана ў 1919. Зноў арыштавана 1.6.1931 у с. Заполак Завідаўскага р-на Маскоўскай вобл. Прыгаворана калегіяй АДПУ 10.6.1931 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК (заменена на высылку ў Казахскую ССР). Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана ў верас. 1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**КЛАЎСУЦ (КЛАВСУЦ) Яўгеній Антонавіч** [1886, мяст. Ярэмічы Навагрудскага пав. Мінскай губ., цяпер Карэліцкі р-н Гродзенскай вобл. — 1937 (?), турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 2.11.1937 у с. Альхоўка Курагінскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 27.11.1937 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**КОСАЎ (КОСОВ) Аляксандр Фёдаравіч** [1893, в. Фільянова Барысаўскага пав. Мінскай губ., цяпер Лагойскі р-н Мінскай вобл. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны ў Каломне Маскоўскай вобл. Асуджаны. Мера пакарання і далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**КРАЎЧЭЎСКАЯ (КРАВЧЕВСКАЯ) Фёкла Ігнатаўна** [1896, Віцебская губ. — ?], манахіня. Арыштавана 1.4.1936 у с. Зайцава Красцецкага р-на Наўгародскай вобл. Абвінавачвалася ў правядзенні «антысавецкай агітацыі». 17.12.1936 справа спынена, а К. вызвалена. Далейшы лес невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**КРЭСТОЎНІКАЎ (КРЕСТОВНИКОВ) Павел Самсонавіч** [1883, мяст. Крычаў Чэрыкаўскага пав. Магілёўскай губ., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — 27.2.1938, Іркуцк, турма НКВД], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 3.2.1937 у г. Зіма Іркуцкай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 25.2.1938 за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны трыбуналам Забайкальскай ВА 19.12.1958.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**КУНЦЭВІЧ (КУНЦЕВИЧ) Васілій Лявонцевіч** [1887, мяст. Бялынічы Магілёўскага пав., цяпер рай-цэнтр Магілёўскай вобл. — ?], Свята-р. Скончыў Таганрогскую гімназію. Арыштаваны ў 1929 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду». Высланы ў в. Федароўская Вялікаўсцюгскага р-на Валагодскай вобл. Зноў арыштаваны 5.5.1932. Прыгавораны як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.5.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ЛАПЕНКА (ЛАПЕНКО) Васілій Фёдаравіч** [1878, в. Гараўкі, цяпер Полацкі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Арыштаваны ў 1930. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Комі АССР (в. Візінка Сысольскага рна). Зноў арыштаваны ў 1933. Праходзіў па справе «Саюз вызвалення сялянства». Прыгавораны да года ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Рогачев М.В. Репресснрованное православное духовенство н монашество Комн края (БнографнчесКИЙ справочннк). Сыктывкар,2005.

**ЛІЁРКА (ЛИОРКО) Іакаў. Гл.: ІАКАЎ ЛІЁРКА.**

**ЛІСІЧ (ЛИСИЧ) Сяргей Пятровіч** [1877, Мінская губ. — 28.10.1937, НКВД], Свята-р. Арыштаваны 2.8.1937. Асуджаны тройкай НКВД Зах.Сібірскага краю 25.9.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» даВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.6.1989 пракуратурай Алтайскага краю.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ЛУЗГІН (ЛУЗГНН) Міхаіл Сяргеевіч** [1893, Віцебская губ.— ?], Свята-р. Арыштаваны 8.6.1935 у Вялікіх Луках. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 17.10.1935 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 7 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 15.4.1999.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ЛУПАШАЎ (ЛУПАШЕВ) Ціхан Фаміч** [1875, Віцебская

губ. — 1937, турма НКВД], царкоўны стараста. Арыштаваны 29.11.1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 7.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004. —

**МАЖАРОЎСКІ (МОЖАРОВСКИЙ) Аляксандр Іванавіч** [1890, Бабруйскі пав. Магілёўскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 13.6.1931 ва Уладзівастоку. Асуджаны калегіяй АДПУ 15.2.1932 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 25.12.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**МАКАРАНКА (МАКАРЕНКО) Сцяфан Андрэевіч** [1880, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 26.5.1944 у в. Міхайлаў Пагост Дноўскага рна. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 22.7.1944 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 15 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 19.5.1998.

Кр.: ПсковсКИЙ сннocéнк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свягценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**МАЛЯЎКА (МОЛЯВКО) Феафан. Гл.: ФЕАФАН МАЛЯЎКА.**

**МАРШАЛАЎ (МАРШАЛОВ) Пімен Фёдаравіч** [1874, в. Харламаўка (?) Магілёўскай губ. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны ў с. Пятроўка Жэрдзеўскага р-на Тамбоўскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 28.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**МАТРОНА ПАРАЕВА** [1890, Віцебская губ. — ?], манахіня. Насельніца Новадзявочага манастыра ў СанктПецярбургу. Арыштавана 17.4.1932. Асуджана калегіяй АДПУ да 3 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Казахстан. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн ХХ столетня. Москва — Псков, 2005.

**МАЧАЛА (МОЧАЛО) Павел Емяльянавіч** [1874, Віцебск — 1938, турма НКВД], дыякан. 3 сялянскай сям'і. Арыштаваны 9.2.1938 у Вялікалукскім рне. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 16.1.1989.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свягценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн ХХ столетня. Москва — Псков, 2005.

**МЕЛЬНІКАЎ (МЕЛЬНИКОВ) Яўфімій (Яфім) Міхайлавіч** [1884, Магілёўская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 17.6.1931 у в. Курылава Ідрыцкага рна. Асуджаны капегіяй АДПУ 1.9.1931 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 31.8.1999.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн ХХ столетня. Москва — Псков, 2005. —

**МІНІН (МИНИН) Нікіта Адрыянавіч** [1868, в. Пліса Дзісенскага пав. Віленскай губ., цяпер Глыбоцкі р-н Віцебскай вобл. — 1937 (?), турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 17.11.1937 у с. Уяр Краснатурскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 17.11.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да

ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**МІХАЛЕВІЧ (МИХАЛЕВИЧ) Пётр Іванавіч** [1874, в. Піёўна Шнскага пав. Мінскай губ., цяпер Украіна — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны 9.3.1932 на ст. Гаеўскі Ізабільненскага р-на Стаўрапольскага краю. Асуджаны калегіяй АДПУ 14.8.1932 да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**МІХЕЕВА (МИХЕЕВА) Праскоўя Ціханаўна** [1866, Мінская (?) губ. — ?], манахіня. Арыштавана 4.1.1932. Асуджана за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 18.7.1989.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**НЕБЫЛОЎ (НЕБЫЛОВ) Васілій Мацвеевіч** [1891, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 17.3.1929 у Невельскім рне. Асуджаны калегіяй АДПУ 26.6.1929 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Сібір. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.10.1997.

Кр.: ПсковсКИЙ сннoднк пострадавпшх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свягценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**НЕСЦЕРАЎ (НЕСТЕРОВ) Дзімітрый Мікалаевіч** [1877, Віцебск — ?], Свята-р. 3 1909 служыў у Мікалаеўскай царкве в. Галоўчыцы Полацкага пав. Віцебскай губ. У 1913—14 пераведзены ў ПараскеваПятніцкі храм в. Язна Невельскага пав. Віцебскай губ. У 1930я г. жыў у в. Сяльцо (Сельца) Лакнянскага р-на Калінінскай вобл. Арыштаваны

8.8.1938. Асуджаны асобай нарадай НКВД 20.9.1938 за «антысавецкую агітацыю» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.8.1958.

Кр.: ПсковсКИЙ сннoднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**НІЖНІКАЎ (НИЖНИКОВ) Зіновій Ігнатавіч** [1879, Віцебск — 20.3.1938, НКВД], Свята-р. Арыштаваны ў в. Семкіна Малаяраславецкага р-на Калужскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 11.3.1938 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**НІКАЛАЕВІЧ (НИКОЛАЕВИЧ) Якім Мікалаевіч** [1870, Слуцкі пав. Мінскай губ. — 26.1.1938, ГУЛАГ], дыякан. Беларус. 3 сялянскай сям'і. Арыштаваны ў 1935. Высланы на 3 гады ў Паўночны край (спецпас. Рожава Халмагорскага рна). Зноў арыштаваны 7.1.1938 і 11.1.1938 асуджаны тройкай НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 10.11.1989.

Кр.: МЬр://Чу«г№.уіз2.п1г.гн; За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репрессянрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**НОС Іосіф Паўлавіч** [1882, Гродзенская губ. — ?], царкоўны староста. Арыштаваны 1.9.1937 у с. Лакіна Вялікамурцінскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 30.11.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 11.9.1965.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ПАРАЕВА Матрона. Гл.: МАТРОНА ПАРАЕВА.**

**ПІГАЛЬСКІ (ПИГАЛЬСКИЙ) Міхаіл Платонавіч** [1889, в. Груздава Віленскай губ., цяпер Пастаўскі р-н Віцебскай вобл. — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 11.1.1930 у Калінінскай вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 22.1.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

**ПІЛІНКЕВІЧ (ПИЛИНКЕВИЧ) Леанід Антонавіч** [1879, Гродзенская губ. — 10.11.1937, Барнаул, турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 30.7.1937 у с. УсцьМасіха Рабрыхінскага р-на Алтайскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 31.10.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» Рэабілітаваны 10.7.1989. п

Кр.: Жертвы полнтнческого терр(ора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**ПІЛЮГА (ПИЛЮГА) Кірыл Георгіевіч. Гл.: КІРЫЛ ПІЛЮГА.**

**ПІСКАНОЎСКІ (ПИСКАНОВСКИЙ) Мікалай Акімавіч** [1887, в. Сцяпанкі Кобрынскага пав. Гродзенскай губ., цяпер Жабінкаўскі р-н Брэсцкай вобл. — 1932 (?), ГУЛАГ], протаіерэй. Скончыў Віленскую (Літоўскую) духоўную семінарыю. Рукапаложаны ў іерэя. Служыў у Гродзенскай епархіі. У 1914 пераведзены ў царкву в. Іванаўка Александрыйскага пав. Херсонскай губ., цяпер Украіна. Узведзены ў сан протаіерэя. Прызначаны настаяцелем Успенскага сабора г. Александрыя. Арыштаваны ў 1923. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Палтаву. У 1925 зноў прыгавораны да высылкі. У трэці раз арыштаваны і асуджаны ў 1927. 3 чэрв. 1927 у высылцы ў Варонежы. 10.5.1928 у чарговы раз арыштаваны і 30.8.1928 прыгавораны за «контррэвалюцыйную дзейнасць» да 3 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДГТУ Архангельскай вобл. 12.10.1931 пасля сканчэння тэрміну

пакарання асуджаны да высылкі ў Паўночны край (Котлас). Загінуў у зняволенні. Рэабілітаваны 19.10.1992.

Жонка Свята-ра Клаўдзія Пятроўна н. ў 1888. Скончыла Віленскае епархіяльнае вучылішча. Працавала настаўніцай. Арыштавана 12.2.1930. Асуджана 28.7.1930 да 5 гадоў ППК. Этапавана ў Салавецкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. 8.3.1934 вызвалена з канцлагера і адпраўлена ў ссылку ў Архангельск. У 1937 прыгаворана з дачкой Ксеніяй да 10 гадоў ППК. Этапавана ва УсцьВымскі канцлагер НКВД. У 1943 вызвалена смяротна хворай. Памерла ў 1944. Яе асабовая справа захоўваецца ў архіве УФСБ Архангельскай вобл.

Дачка Свята-ра Ксенія н. ў 1915. У зняволенні правяла больш за 20 гадоў. Вызвалена 1.11.1955. Рэабілітавана, як і маці, 9.1.1958.

Кр.: Мір:/Дн2І.рзіЬі.ссаз.ш; За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**ПРЫШЧЭПАЎ (ПРИЩЕПОВ) Максіміліян Мяфодзевіч** [1882, в. Вежкі Магілёўскай губ., цяпер Дубровенскі р-н Віцебскай вобл. — 15.12.1937, Ноўгарад, турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 19.11.1937 у с. УсцьКаІпырскае Малавішэрскага р-на Ленінградскай вобл. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 10.12.1937 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**ПЯТРОЎ (ПЕТРОВ) Платон Паўлавіч** [1883, в. Капусціна Бабруйскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Кіраўскі р-н Магілёўскай вобл. — 1937 (?), турма НКВД], Свята-р. Арыштаваны 17.11.1937 у с. Уяр Краснатуранскага р-на Краснаярскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 27.11.1937 да ВМП. Расстраляны.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**РАМАНЧУК (РОМАНЧУК) Арцемій Андрэевіч** [24.3.1873, в. Раманава Брэсцкага пав. Гродзенскай губ., цяпер Брэсцкі р-н — 17.1.1938, турма НКВД]. Беларус. З сялянскай сям'і. Да арышту актыўны прыхаджанін аднаго з храмаў Варонежскай епархіі. Арыштаваны ў 1932. Абвінавачваўся ў «правядзенні контррэвалюцыйнай агітацыі». Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення правоў. Этапаваны ў Паўночны край (Архангельск). Працаваў на будаўніцтве фельчарскай школы. 11.12.1937 узяты пад варту і 9.1.1938 прыгавораны за «правядзенне тайных богаслужэнняў» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 11.7.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**РАЧЫЦКАЯ (РАЧИЦКАЯ) Анастасія Андрэеўна** [1888, Віленскі пав. — ?], манахіня. Арыштавана ў Валакаламску Маскоўскай вобл. Асуджана. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**РУДАМІНА (РУДОМИНА) (РУДОМИНО) Антон Іванавіч** [1889, Мінская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны ў Калузе, Расія. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 9.12.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**САМУСЕВІЧ (САМУСЕВИЧ) Аляксей Дзянісавіч** [1878, в. Сліва Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — 6.6.1938, ГУЛАГ]. Беларус. З сялянскай сям'і. Актыўны прыхаджанін аднаго з храмаў Слуцкага пав. Арыштаваны ў 1935. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Паўночны край (спецпас. Зара Халмагорскага

рна). Маёмасць канфіскавана. 28.8.1937 узяты пад варту.

Рэпрэсаваныя. 7.10.1937 прыгавораны як «удзельнік контррэвапюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 27.3.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюпдне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918 — 1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**САМУСЕВІЧ (САМУСЕВИЧ) Яфрэм Яфімавіч** [1891, в. Сліва Слуцкага пав. Мінскай губ., цяпер Слуцкі р-н Мінскай вобл. — ?]. Беларус. З сялянскай сям'і. Актыўны прыхаджанін аднаго з храмаў Слуцкага пав. Арыштаваны ў 1935. Асуджаны да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Паўночны край (спецпас. Арлецы (Орлецы) Халмагорскага рна). Маёмасць канфіскавана. 28.8.1937 узяты пад варту. 7.10.1937 прыгавораны як «удзельнік контррэвалюцыйнай царкоўнай арганізацыі» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 27.3.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918 — 1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**САФРАНОВІЧ (САФРОНОВИЧ) Пётр Віктаравіч** [1895 — ?], Свята-р. Беларус. Арыштаваны 5.8.1937 у Бежаніцкім рне, Расія. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 25.8.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Не предать забвенню. Псков; Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зе нзд. М., 2004.

**СЕРАФІМА АНТОНАВА (АНТОНОВА)** [Ксенія Кірылаўна; 1872, Віцебская губ. — 31.5.1942, ГУЛАГ], манахіня, сястра Ксеніі Антонавай. З 1900 паслушніца Сурскага ІаанаБагаслоўскага манастыра (цяпер Архангельская вобл.). Прыняла манашаскі пострыг. Пасля закрыцця манастыра жыла на яго тэрыторыі. Удзельнічала ў тайных

богаслужэннях. Арыштавана 16.11.1941. Асуджана 27.5.1942 асобай нарадай пры НКВД за «контррэвалюцыйную агітацыю» да 5 гадоў пазбаўлення волі. Выслана ў Комі АССР. Загінула ў зняволенні. Рэабілітавана 10.4.1958.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуютцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006,

**СІКОРСКІ (СИКОРСКИЙ) Мікалай Іванавіч** [1877, Мінская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 22.8.1936. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «шпіянаж». Далейшы лёс невядомы.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. Зензд. М., 2004.

**СІМАНАЎ (СИМОНОВ) Іаан Грыгор'евіч** [1876, Магілёўская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 4.12.1932 у в. Асколкава Алейскага рна. Асуджаны калегіяй АДПУ Зах.Сібірскага краю 23.2.1933 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 29.12.1992.

**СІМЯОН КАНАРСКІ** [15.11.1873, Магілёўская губ. — 10.12.1937, турма НКВД], архіепіскап (абнаўленчы). Скончыў СанктПецярбургскую духоўную семінарыю са ступенню кандыдата багаслоўя (1900), СанктПецярбургскі археалагічны інстытут. Рукапаложаны ў іерэя (1901). Служыў у Пецярбургскай епархіі. У 1919 пераведзены на Магілёўскую кафедру. У 1922—23 ухіліўся ў абнаўленчы раскол. 8.5.1924 хіратанісаны ў абнаўленчага епіскапа Сарапульскага Вяцкай епархіі, потым быў епіскапам Гомельскім, а з верас. таго ж года зноў епіскап Сарапульскі. Са студз. 1925 кіраваў Пскоўскай епархіяй. У 1926 узведзены ў сан архіепіскапа. Са студз. 1927 кіраваў ВерхняДонскай епархіяй Каўказскай мітраполіі. 3 кастр. 1927 архіепіскап Арэнбургскі, зкрас. 1929 — Троіцкі

Уральскай мітраполіі. 3 верас. 1930 за штатам. Арыштаваны 7.11.1937. Асуджаны асобай нарадай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 17.1.1958.

Кр.: Міp://«гте"№.реЬег§еп.сот; М1;р://\у«г№.огЬІІоггІз.:пІ; Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**СКАЛПЕШКШ (СКОЛПЕШКИН) Павел Яфімавіч** [1888, Гомельскі пав. Магілёўскай губ. — ?], Свята-р, педагог. 3 духоўнага саслоўя. У 1907—22 працаваў настаўнікам у Гомельскім пав. Рукапаложаны ў іерэя (1922). Служыў у адным з храмаў Гомельскай акругі. Арыштаваны і 21.9.1930 асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую контррэвалюцыйную дзейнасць» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Салавецкі канцлагер АДПУ Архангельскай вобл. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 4.8.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюіцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**СКУРАТАЎ (СКУРАТОВ) Дзімітрый Іаанавіч** [1875, Віцебская губ. — 1937, турма НКВД], Свята-р. У 1920я г. служыў дыяканам у храме в. Дубраўка Себежскага пав. Рукапаложаны ў іерэя. Падчас арышту служыў у Себежскім Свята-Троіцкім саборы. Арыштаваны 17.4.1933. Асуджаны калегіяй АДПУ за «антысавецкую агітацыю і пралаганду» да 3 гадоў ППК. Зноў арыштаваны 1.11.1937. Прыгавораны 27.12.1937 да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 13.8.1989.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодннк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**СТАРАВОЙТАЎ (СТАРОВОЙТОВ) Міхаіл Баніфацевіч** [1877, Магілёўская губ. — 31.10.1937, турма НКВД], псаломшчык. Арыштаваны 14.9.1937 ус. Пурысева

Краюшкінскага р-на Атлайскага краю. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД 9.10.1937 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 25.5.1989 пракуратурай Алтайскага краю.

Кр.: Жертвы полнтнческого террора в СССР. Компактднск. 3е нзд. М., 2004.

**СУВОРАЎ (СУВОРОВ) Ануфрый Кандратавіч** [1881, Магілёўская губ. — ?]. 3 1900 працаваў настаўнікам. Рукапаложаны ў іерэя (1913). Служыў у Мікалаеўскай царкве в. Азарычы (тагачасны паштовы адрас: ст. Чуровічы Чарнігаўскай губ.) СтараЮркавіцкай вол. Гомельскага пав. Магілёўскай губ., цяпер Чарнігаўская вобл., Украіна. Арыштаваны ў 1930. Высланы ў Паўночны край. Маёмасць канфіскавана. Працаваў на лесанарыхтоўках у Карпагорскім рне. 20.6.1931 узяты пад варту і 6.10.1931 прыгавораны за «ўдзел у тайных богаслужэннях» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 1.12.1992.

Кр.: Памятная КИНжка Могнлевской губернны; За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуювдне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**СУШЧЫНСКАЯ (СУЩИНСКАЯ) Вера Іванаўна** [1874, Мінская губ. (?) — ?]. Беларуска. 3 сям'і Свята-ра. Скончыла Мінскую жаночую гімназію. Працавала настаўніцай, была актыўнай прыхаджанкай аднаго з храмаў Мінскай епархіі. Арыштавана ў 1930. Асуджана калегіяй АДПУ да высылкі ў Паўночны край. Маёмасць канфіскавана. У цягніку на шляху да месца высылкі выказвала незадавальненне савецкай уладай. 7.2.1931 прыгаворана да 3 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітавана 24.10.1989.

Кр.: За веру Хрнстову. Духовенство, монашествуюгцне н мнряне Русской Православной Церквн, репресснрованные в Северном крае (1918—1951). БнографнчесКИЙ справочннк. Архангельск, 2006.

**СЦЕХ (СМЕХ) (СТЕХ, СМЕХ) Хрысціна. Гл.: ХРЫСЦІНА СЦЕХ (СМЕХ).**

**ТАНКАВІТ (ТОНКОВИТ) Фёдар Канстанцінавіч** [1885, в. Забелле Віцебскай губ. — 7.8.1942]. З сялянскай сям'і. Маці Т. памерла рана, і бацька аддаў сына на выхаванне ў Маркаў Свята-Троіцкі першакласны мужчынскі манастыр у Віцебску. Скончыў духоўную семінарыю. Ажаніўся з Еўфрасінняй Андрэеўнай (1893—1973). Рукапаложаны ў дыякана, іерэя (1911). Служыў у прыходзе каля Невеля Віцебскай губ., потым ва Успенскай царкве в. Белахвостава Невельскага пав. Удзельнічаў у выступленні сялян супраць савецкай улады (1918), якое было жорстка падаўлена, але Свята-ру ўдалося пазбегнуць расправы. У 1920 у сям'і нарадзіўся сын (імя невядома), у 1924 дачка Ніна. У 1929 у Т. канфіскавалі дом і маёмасць, а яго перавялі служыць у Пакроўскую царкву в. Стайкі Невельскага рна. Арыштаваны ў верас. 1932. Вывезены ў турму АДПУ ў Вялікіх Луках. На судзе Свята-ру прапанавалі адрачыся ад Бога ці перайсці ў абнаўленцтва, але ён адмовіўся. Асуджаны калегіяй АДПУ 22.11.1932 да 5 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Паўночны край (Каргопаль). Сям'я Свята-ра пераехала ў Віцебск. Вызвалены ўвосень 1937. Прыехаў да сям'і, працаваў на абутковай фабрыцы. Увосень 1941 прызначаны ў Свята-Троіцкі храм былога Маркава манастыра. У 1942 па запрашэнні прыхаджан пераехаў служыць ва Успенскую царкву в. Ловец Невельскага рна. У пачатку жн. 1942 да Свята-ра прыехала жыхарка в. Ступішча таго ж р-на і папрасіла пасабораваць і прычасціць яе хворага дзядзьку. Дачка Ніна, адчуваючы небяспеку, прасіла бацьку не ехаць, але ён адказаў, што не можа адмовіць жанчыне ў такі цяжкі для яе час. Па дарозе Свята-р убачыў сямера ўзброеных людзей, якія перагарадзілі дарогу. Свята-ра распранулі, звязалі і доўгі час катавалі, а перад тым як застрэліць выкалалі вочы. Праз 6 дзен прыхаджане знайшлі знявечанае цела Свята-ра і пахавалі яго каля алтара Ловецкай царквы.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодник пострадавпшх за веру Хрнстову

в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюгцнх нмнрян Псковской епархнн XX століетня. Москва — Псков, 2005.

**ТАРАБУХ Фёдар Ісакавіч** [1881, в. Дуб'е (?) Віцебскай губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 21.2.1930 у в. Рыкшына Зах. вобл. Асуджаны калегіяй АДПУ 8.4.1930 за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 5 гадоў ППК. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 20.8.1999.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодпк пострадавпшх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**УСАВІК (УСОВИК) Антон Пракопавіч** [1886, Віцебская губ. — ?], Свята-р. Арыштаваны 29.7.1929 у в. Кошкіна Усвяцкага рна. Асуджаны калегіяй АДПУ 3.11.1929 за «антысавецкую агітацыю і пра

паганду» да 3 гадоў пазбаўлення волі. Высланы ў Паўночны край. Далейшы лёс невядомы. Рэабілітаваны 21.3.2000.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодпк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужятелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ФАЛЬКОЎСКІ (ФАЛЬКОВСКИЙ) Віктар Васілевіч** [1887 — 1937, турма НКВД], псаломшчык. Арыштаваны і асуджаны 21.7.1937 тройкай НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да ВМП. Расстраляны. Рэабілітаваны 30.3.1956.

Кр.: ПсковсКИЙ сннодпк пострадавншх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ФЕАФАН МАЛЯЎКА (МОЛЯВКО)** [5.4.1913, мяст. Асвея Дрысенскага пав. Віцебскай губ., цяпер Верхнядзвінскі р-н

Віцебскай вобл. — 25.1.2001], архімандрыт. Беларус. З сялянскай сям'і. З 1934 служыў псаломшчыкам у Казанскай царкве в. Печнікава Каменскага р-на Цвярской вобл. 5.5.1937 прыняў манашаскі пострыг з імем Феафан. Арыштаваны ў 1937. Асуджаны асобай нарадай пры НКВД за «антысавецкую агітацыю і прапаганду» да 10 гадоў ППК. Этапаваны ў Яраслаўскую вобл. Вызвалены датэрмінова ў 1944. Выехаў у Ташкент, дзе працаваў у ваенным шпіталі. Неўзабаве прызваны ў армію. Служыў у пяхоце, быў паранены. У маі 1945 вярнуўся ў Цвярскую епархію. З 1951 паслушнік ПскоўскаПячорскага манастыра. 7.10.1951 рукапалажаны ў іераманаха. З 30.4.1955 благачынны акругі. Узнагароджаны нагрудным крыжам (1957), паліцай (1963), нагрудным крыжам з упрыгожаннямі (1973), ордэнам Св. Уладзіміра (1976), узведзены ў сан архімандрыта. У 1988 узнагароджаны другім нагрудным крыжам з упрыгожаннямі. Пахаваны ў Богамзданых пячорах Пскоўскага манастыра.

Кр.: ПсковсКИЙ снноднк пострадавшнх за веру Хрнстову в годнну гоненнй свяіценноцерковнослужнтелей, монашествуюіцнх н мнрян Псковской епархнн XX столетня. Москва — Псков, 2005.

**ХРУЛЬХРУЛЬКЕВІЧ (ХРУЛЬХРУЛЬКЕВИЧ) Пётр Андрыянавіч** [1864, Гродзенская (?) губ. — ?], свяшчэнна або царкоўнаслужыцель. Арыштаваны ў Серпухаве Маскоўскай вобл. Асуджаны. Мера пакарання і дапейшы лес невядомы. Рэабілітаваны ў 1989.

